Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

# САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ І ІХ КАДРАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2012

УДК [021+023]-047.37(476)
ББК [78.001+78.34п+78.349](4Беи)
С226

А ў т а р ы:
У. А. Акуліч, (гл. 3.6), В. М. Бігеза (гл. 4.1), Ю. М. Галкоўская (гл. 4.5), Л. А. Дзямешка (гл. 1.1), С. В. Зыгмантовіч (гл. 2.1; 4.1; 4.2), А. Ю. Казленка (гл. 2.2; 4.2), В. А. Какшынская (гл. 3.4), Н. У. Клімянкова (гл. 1.2; 1.3), А. І. Кукета (гл. 1.4), Л. І. Манукян (гл. 4.4), І. А. Марозава (гл. 3.3), С. А. Паўлава (гл. 3.2), Ю. А. Пераверзева (гл. 2.4), Н. Я. Петушка (гл. 3.1), Л. І. Ракавецкая (гл. 2.5), І. А. Сталярова (гл. 2.3), І. А. Чупракова (гл. 3.5), І. В. Юрык (гл. 4.3)

Р э ц э н з е н т ы:
*Р. С. Матульскі*, доктар педагагічных навук, прафесар;
*В. І. Саітава*, кандыдат педагагічных навук

Н а в у к о в ы я р э д а к т а р ы:
*С. В. Зыгмантовіч*, кандыдат педагагічных навук;
*Н. У. Клімянкова*, кандыдат педагагічных навук

*Рэкамендавана да выдання навукова-тэхнічным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (пратакол № 10 ад 31.03.2011 г.)*

**Сацыяльна-**педагагічныя аспекты дзейнасці бібліятэк
С226 Беларусі і іх кадравае забеспячэнне : [манаграфія] / У. А. Акуліч [і інш.] ; навук. рэд. С. В. Зыгмантовіч, Н. У. Клімянкова ; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 234 с.
ISBN 978-985-522-069-6.

У калектыўнай манаграфіі прадстаўлены вынікі навукова-даследчай работы кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы па вывучэнні сучаснага стану бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ў краіне. Аналізуюцца тэарэтыка-метадычныя асновы бібліятэчнай педагогікі, прыярытэтныя кірункі педагагічнай дзейнасці бібліятэк Беларусі, вялікая ўвага надаецца педагагічным аспектам работы бібліятэк па развіцці асобы карыстальніка (чытача). Праблемы кадравага забеспячэння бібліятэк разглядаюцца з пункту гледжання ўдасканалення прафесійнай педагагічнай падрыхтоўкі бібліятэчнага спецыяліста ў сістэме вышэйшай адукацыі, фарміравання яго прававой і камунікатыўнай кампетэнтнасці, прафесійнай адаптацыі і самарэалізацыі.

Выданне адрасавана навукоўцам, выкладчыкам, спецыялістам, аспірантам, магістрантам і студэнтам навучальных устаноў інфармацыйна-дакументнай сферы.

**УДК [021+023]-047.37(476)**
**ББК [78.001+78.34п+78.349](4Беи)**

**ISBN 978-985-522-069-6**

© Афармленне. УА «Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў», 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## З М Е С Т

**Уводзіны** ……………………………………………… 5

**1. ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ПЕДАГОГІКІ** ……………………………………...… 9

1.1. Уплыў педагагічнай навукі на развіццё бібліятэказнаўства і бібліятэчнай справы ………………………… 9
1.2. Канцэпцыі бібліятэчнай педагогікі, задачы, прынцыпы, катэгорыі: сутнасць і перспектывы развіцця …….. 18
1.3. Зносіны як неад'емны элемент педагагічнага працэсу ў бібліятэцы ……………………………………………... 28
1.4. Падыходы да вызначэння паняцця «культура чытання» як асноўнай катэгорыі бібліятэчнай педагогікі ….. 42

**2. КІРУНКІ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ** ……………………………………………………….. 52

2.1. Педагагічныя аспекты бібліяграфічнай дзейнасці … 52
2.2. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял біябібліяграфічнай інфармацыі ……………………………………………. 68
2.3. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял бібліятэрапіі і яго рэалізацыя ў абслугоўванні асобных катэгорый карыстальнікаў бібліятэк …………………………………………... 77
2.4. Праектная дзейнасць бібліятэк: сацыяльна-педагагічны патэнцыял ………………………………………… 86
2.5. Арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць бібліятэк: сацыяльна-псіхалагічныя і сацыяльна-педагагічныя аспекты …………………………………………………………... 95

**3. ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ РАБОТЫ БІБЛІЯТЭК ПА РАЗВІЦЦІ АСОБЫ КАРЫСТАЛЬНІКА (ЧЫТАЧА)** ……. 104

3.1. Бібліятэчнае абслугоўванне сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў (на прыкладзе інвалідаў па зроку) ……………………………………………………………….. 104
3.2. Псіхолага-педагагічныя прынцыпы гуманізацыі бібліятэчнай работы з малодшымі школьнікамі ………… 117

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3.3. Педагагічныя ўмовы развіцця чытацкай дзейнасці падлеткаў у бібліятэцы …………………………………….. 124
3.4. Экалагічнае выхаванне падлеткаў-чытачоў як педагагічная праблема ……………………………………….. 136
3.5. Сацыяльна-педагагічныя аспекты фарміравання прававой культуры падлеткаў у бібліятэцы ……………… 146
3.6. Педагагічныя асновы фарміравання інфармацыйнай культуры ва ўмовах бібліятэкі …………………... 159

**4. КАДРАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ БІБЛІЯТЭЧНА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ** …………………….. 169

4.1. Прафесійная педагагічная падрыхтоўка бібліятэчнага спецыяліста ў сістэме вышэйшай адукацыі ………… 169
4.2. Матывацыя бібліятэчнай дзейнасці ў структуры прафесійнага самавызначэння будучых спецыялістаў бібліятэчнай справы ……………………………………... 183
4.3. Педагагічныя праблемы прафесійнай адаптацыі бібліятэчнага персаналу ………………………………… 196
4.4. Фарміраванне камунікатыўнай кампетэнтнасці як фактар прафесійнай самарэалізацыі бібліятэкара ……….. 202
4.5. Фарміраванне прававой кампетэнцыі будучага бібліятэкара-бібліёграфа вышэйшай кваліфікацыі ……… 216

**Заключэнне** ……………………………………………... 232

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

Распрацоўка канцэптуальных падыходаў да сацыяльна-педагагічнай дзейнасці бібліятэк і іх кадравага забеспячэння ў Рэспубліцы Беларусь прадугледжвае глыбокае і шматаспектнае вывучэнне ўплыву інфарматызацыі грамадства і сацыяльна-культурнай інтэграцыі на ўсе бакі ўзаемадзеяння бібліятэкі з карыстальнікамі. Аналіз механізму ўзаемадзеянняў бібліятэкі ў сацыякультурным асяроддзі, выяўленне спецыфічных форм сацыяльна-педагагічнага складніка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці патрабуюць вывучэння сацыяпедагагічнай праблематыкі ў педагогіцы і бібліятэказнаўстве.

Тэарэтыка-метадычныя асновы бібліятэчнай педагогікі разумеюцца з пункту гледжання яе ўплыву на развіццё бібліятэказнаўства і бібліятэчнай справы. Гісторыя і сучаснасць сведчаць аб значным станоўчым узаемадзеянні педагагічнай навукі і бібліятэказнаўства. Бібліятэчная педагогіка разглядаецца намі як навука аб сутнасці фарміравання і развіцця чалавека, які імкнецца набываць веды, пазнаваць свет і самога сябе праз чытанне, у шматбаковасці ўзаемадзеяння з інфармацыяй і бібліятэчным асяроддзем.

Бібліятэчныя зносіны вывучаюцца як неад’емны элемент педагагічнага працэсу ў бібліятэцы, адзін з найбольш істотных аспектаў прафесійнай дзейнасці бібліятэкара.

Акцэнтуецца ўвага на псіхолага-педагагічных падыходах да вызначэння паняцця «культура чытання» як асноўнай катэгорыі бібліятэчнай педагогікі. Яна разумеецца як падмурак, на якім будуюцца бібліятэчна-бібліяграфічнае пісьменства і інфармацыйная культура асобы.

Кірункі педагагічнай дзейнасці бібліятэк Беларусі вызначаюцца з пункту гледжання вывучэння педагагічных аспектаў бібліяграфічнай дзейнасці, біябібліяграфічнай інфармацыі, рэалізацыі сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу бібліятэрапіі, праектнай і арганізацыйна-кіраўніцкай дзейнасці.

Падкрэсліваецца, што педагагічныя складнікі бібліяграфічнай дзейнасці заключаюцца ў імпліцытнай прысутнасці адукацыйнай функцыі ў бібліяграфічнай інфармацыі. Асобай увагі патрабуе ўдасканаленне прафесійнага майстэрства бібліёгра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фаў, якія сёння выступаюць не проста складальнікамі, а аўтарамі рэкамендацыйна-бібліяграфічных крыніц, папулярызатарамі, асветнікамі.

У даследаванні таксама сцвярджаецца, што біябібліяграфічная інфармацыя садзейнічае чалавечай самарэалізацыі і ідэнтыфікацыі ў шырокім сэнсе і дазваляе нацыянальнай грамадзе інтэгравацца ў сусветную навуковую, мастацка-творчую супольнасць і акрэсліць межы і значнасць свайго ўнёску.

Бібліятэрапеўтычная практыка набывае ўсё большае распаўсюджванне ў нашых бібліятэках. Найбольш актыўна яна ўжываецца ў дачыненні дзяцей з дэвіянтнымі паводзінамі і асаблівасцямі развіцця.

Педагагічны кірунак праектнай дзейнасці разглядаецца ў святле педагагічных ведаў, якія дапамагаюць раскрыць адметнасці асобы чытача, вызначыць заканамернасці працэсу выхавання, неабходнасць педагагічнага ўздзеяння і на гэтай аснове мадэліраваць змест і структуру праграм пазабюджэтнага фінансавання.

Важнымі фактарамі эфектыўнага кіравання становяцца сацыяльна-псіхалагічныя і сацыяльна-педагагічныя кампаненты. Іх спецыфіка заключаецца ў выкарыстанні нефармальных фактараў, уліку інтарэсаў асобы, групы і калектыву ў цэлым.

Педагагічныя аспекты работы бібліятэк па развіцці асобы карыстальніка раскрываюцца на прыкладзе бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку, прыцягнення да чытання малодшых школьнікаў, падлеткаў, іх экалагічнага выхавання, фарміравання прававой і інфармацыйнай культуры.

Пэўнае месца адведзена навуковаму асэнсаванню педагагічных праблем бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку, пабудове інтэграванай сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання сляпых у працэсе ўстанаўлення сувязей паміж бібліятэкамі розных тыпаў і відаў для дасягнення адзінай мэты: забеспячэння роўнага доступу да інфармацыі.

Спецыфіка чытацкага развіцця дзяцей і падлеткаў традыцыйна знаходзіцца пад пільнай увагай даследчыкаў. Спалучэнне форм індывідуальнай і групавой бібліятэчнай работы, адпаведным чынам арганізаванае інфармацыйна-прадметнае асяроддзе выступаюць сродкамі выхавання дзяцей і падлеткаў у найбольш камфортных для іх умовах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Экалагічнае выхаванне падлеткаў-чытачоў разглядаецца з апорай на тэарэтыка-метадалагічныя падыходы, прынцыпы дзейнасці бібліятэкі, улікам узроўняў сфарміраванасці экалагічнай культуры, адаптаваннем мадэлі экалагічнага выхавання да дзейнасці дзіцячай бібліятэкі.

Як суб'ект фарміравання прававой культуры падлеткаў бібліятэка выконвае сацыяльны заказ грамадства. Рэалізацыя бібліятэкай адпаведнага сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу садзейнічае стварэнню базавых пачаткаў, якія забяспечваюць далейшае сацыяльна-пазітыўнае развіццё асобы.

Педагагічныя асновы фарміравання інфармацыйнай культуры і інфармацыйнага пісьменства школьнікаў і студэнтаў выступаюць грунтам інфармацыйнага самазабеспячэння дзейнасці, якая поўнасцю ўпісваецца ў працэс, накіраваны на развіццё чалавека.

Кадравае забеспячэнне бібліятэчна-педагагічнай галіны прадугледжвае вывучэнне сучаснага стану і перспектыў прафесійнай педагагічнай падрыхтоўкі бібліятэчнага спецыяліста ў сістэме вышэйшай адукацыі Беларусі, яго матывацыі, прафесійнай адаптацыі, фарміравання камунікатыўнай і прававой кампетэнтнасці.

Пры падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў значная ўвага павінна ўдзяляцца педагагічна-прафесійнай падрыхтоўцы, якая базіруецца на авалоданні псіхолага-педагагічнымі кампетэнцыямі. Гэта павысіць запатрабаванасць спецыяліста, прэстыж прафесіі і адукацыі наогул.

Праблема матывацыі бібліятэчнай працы з'яўляецца адной з найбольш складаных у бібліятэчнай прафесіялогіі. Сёння цікавасць да вышэйшай адукацыі сярод моладзі мае прагматычную аснову і не можа ў поўнай меры спрыяць фарміраванню вучэбна-прафесійнай матывацыі і прафесійнай накіраванасці будучых спецыялістаў. Дыплом аб вышэйшай адукацыі набывае для студэнтаў усё большую самастойную каштоўнасць, безадносную да каштоўнасці ведаў, якая падае.

Мы разумеем прафесійную адаптацыю бібліятэкараў як актыўны працэс прыстасавання асобы да новых і зменлівых умоў рэчаіснасці.

Камунікатыўная кампетэнтнасць з'яўляецца ключавым элементам прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкара. Зносіны вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значаюць уласны асобасны рост бібліятэкара, а здольнасць да самарэалізацыі адбіваецца на якасці і паспяховасці зносін.

Фарміраванне і развіццё прафесійна-арыентаванай бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі выпускніка ВНУ, як паказала даследаванне, не можа быць рэалізавана выключна праз выкладанне адпаведных адукацыйных дысцыплін. Значнымі складнікамі гэтага працэсу з’яўляюцца тэхналогіі, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку ведаў, набыццю ўменняў і кіраванню гэтым пошукам, якія даюць магчымасць набыць вопыт прыняцця самастойных рашэнняў.

Эфектыўнае навучанне будуецца на сучасных дасягненнях педагогікі дарослых. Дадзенае тэарэтычна-метадычнае даследаванне арганізацыі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці і сацыяльна-педагагічнай работы бібліятэк краіны мае вынікам звесткі аб сучасным стане разнастайных кірункаў бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, тэхналогій падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў і гэткім чынам можа быць выкарыстана ў вучэбным працэсе, а таксама бібліятэкарамі-практыкантамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ПЕДАГОГІКІ

## 1.1. Уплыў педагагічнай навукі на развіццё бібліятэказнаўства і бібліятэчнай справы

У прафесійнай літаратуры вызначана каля 40 навук і навуковых дысцыплін, якія маюць сувязі з бібліятэказнаўствам і бібліятэчнай справай, – філасофія, тэорыя культуры, логіка, лінгвістыка, педагогіка, сацыялогія, псіхалогія, кнігазнаўства, бібліяграфазнаўства, інфарматыка, эканоміка, менеджмент, маркетынг, фандрэйзінг, эстэтыка, гісторыя, музеязнаўства, правазнаўства і інш. З аднымі навукамі бібліятэказнаўства звязваюць тэарэтычныя палажэнні і метадалагічныя прынцыпы, з другімі – фактычны матэрыял, з трэцімі – метады даследавання і г. д.

Асаблівы інтарэс бібліятэказнаўцаў і бібліятэчных спецыялістаў назіраецца да педагагічнай навукі, што сведчыць аб значнасці педагагічных ведаў для тэорыі і практыкі бібліятэчнай справы і адначасова аб неабходнасці вызначэння суадносін і ўзаемадзеяння бібліятэказнаўства і педагогікі.

Сувязі бібліятэчнай справы з педагогікай абазначыліся на мяжы XIX–XX стст., калі ў тэорыі педагогікі былі выдзелены дашкольная, школьная і пазашкольная адукацыя. Асноўным сродкам пазашкольнай адукацыі стала самаадукацыя, адным з цэнтраў – бібліятэка. На Беларусі шырокае распаўсюджанне атрымалі бібліятэкі, створаныя пры розных педагагічна-адукацыйных аб’яднаннях: Гродзенскім педагагічным таварыстве, Слонімскім таварыстве па распаўсюджанні асветы сярод жыхароў г. Слоніма і яго павета (1907), Слуцкім таварыстве адукацыі (1909), Таварыстве Полацкай бібліятэкі (1912), Віцебскім таварыстве адукацыі (1913) [2]. Менавіта пры гэтых таварыствах бібліятэкары набывалі першы педагагічны вопыт. Галоўнай мэтай дзейнасці бібліятэк была ліквідацыя непісьменнасці (каля паловы насельніцтва Беларусі заставалася непісьменным), развіццё беларускамоўнай адукацыі, выхаванне ў дзяцей і моладзі высокіх грамадскіх і эстэтычных ідэалаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Характэрны вопыт работы бібліятэкі пры Гродзенскім педагагічным таварыстве. Разам з настаўнікамі бібліятэкары правodзілі педагагічныя чытанні, актыўна ўдзельнічалі ў выданні часопіса «Педагагічная справа» (вышла 13 нумароў), мясцовай газеты «Наша раніца», вялі гурткі для непісьменных.

Перспектыўнымі формамі дзейнасці бібліятэк таварystваў лічыліся чытанне ўслых педагагічнай літаратуры, выкарыстанне, у прыватнасці, распрацовак перадавых педагогаў і асветнікаў Беларусі Д. А. Сцяпуры, К. І. Ціхамірава, Ф. А. Кудрынскага, Е. Р. Раманава, абмеркаванні твораў беларускіх пісьменнікаў, лекцыі, вечарыны сямейнага чытання [8; 9]. На Беларусі ў той час не існавала ўстаноў, якія б рыхтавалі бібліятэкараў сярэдняй і вышэйшай адукацыі. Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум быў адкрыты ў 1946 г.; вышэйшая бібліятэчная адукацыя звязана з адкрыццём кафедры бібліятэказнаўства пры Мінскім педагагічным інстытуце ў 1944 г. Таму педагагічны вопыт бібліятэкары пасля кароткатэрміновых курсаў набывалі непасрэдна на практычнай рабоце, працуючы побач з настаўнікамі, а тэарэтычнымі распрацоўкамі ў галіне бібліятэказнаўства займаліся расійскія навукоўцы.

Паколькі адной з частак народнай асветы з'яўлялася пазашкольная адукацыя, у тым ліку і бібліятэчная справа, вучонымі ў пачатку XX ст. быў зроблены вывад, што бібліятэказнаўства ўваходзіць у склад педагогікі. Аднак фарміравалася і разуменне, што бібліятэказнаўства цесна звязана з педагогікай, але не з'яўляецца яе часткай, як спецыяльная навуковая дысцыпліна знаходзіцца на стыку бібліятэказнаўства і педагогікі. Таму Б. П. Гушчыным быў прапанаваны тэрмін «бібліятэчная педагогіка» (Библиотекарь. – 1915. – № 3-4), тэарэтычныя асновы якой распрацоўвалі і педагогі, і бібліятэказнаўцы: У. А. Неўскі, В. А. Зялёнка, М. А. Корф, Я. М. Мядынскі, М. Ф. Фёдараў і інш. [7].

Асаблівая ўвага даследчыкаў і прафесіяналаў-бібліятэкараў была звернута на тэорыю Д. А. Балікі, абгрунтаваўшага паняцце «кіраўніцтва чытаннем» як пастулата бібліятэчнай педагогікі і як самастойную педагагічную функцыю бібліятэкі [1]. Д. А. Баліка лічыў, што методыка чытання ўяўляе сабой «бібліятэчную дыдактыку», якая ўключае парады чытачу, метады арганізацыі работы з кнігай. Ён прапанаваў ужываць прамыя і ўскосныя, пастаянныя і кароткачасовыя формы ўздзеяння на чытача, асаблівую ўвагу надаваў бібліятэчным урокам, сістэма-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тычнаму навучанню навыкам работы з кнігай. Д. А. Баліка акцэнтаваў увагу на асобе бібліятэкара, які павінен валодаць педагагічнымі метадамі «планава арганізаванага» выхавання, прыёмамі непрыкметнага кіраўніцтва чытаннем. Кіраўніцтва чытаннем, на думку вучонага, павінна здзяйсняцца як мэтанакіраваны шлях у выхаванні чытачоў, з самым шырокім выкарыстаннем бібліяпедагагічных сродкаў. Прыкладна такіх жа поглядаў прытрымліваліся У. А. Неўскі і М. Н. Куфаеў.

Такая канцэпцыя дазваляла не толькі творча абапірацца на прынцыпы і метады педагогікі, але і тэарэтычна распрацоўваць педагагічныя аспекты бібліятэчнага абслугоўвання. «Савецкае бібліятэказнаўства не магло б даследаваць пытанні тэорыі чытання, прапаганды кнігі і кіраўніцтва чытаннем, не выкарыстоўваючы палажэнні педагогікі аб тэарэтычных асновах выхавання, аб аб’ёме і змесце ведаў, характарызуючых розныя ступені культурнага развіцця чалавека», – лічыў А. С. Чубар’ян [цыт. па: 7]. Кіраўніцтва чытаннем дзяцей справядліва лічылася часткай педагогікі дзіцячага чытання. Такая пазіцыя адлюстроўвалася ў вучэбным курсе «Бібліятэчная педагогіка» і ў дзейнасці аднайменнай кафедры Ленінградскага палітасветінстытута імя Н. К. Крупскай.

Праз пэўны час у навуковай і практычнай дзейнасці адбылася падмена бібліятэчнай педагогікі тэорыяй кіраўніцтва чытаннем, якое трактавалася як «мэтанакіраванае ўздзеянне на змест і характар чытання з дапамогай розных форм і метадаў дзейнасці бібліятэк» [4, с. 900].

Тэорыя і практыка кіраўніцтва чытаннем, сістэма арганізацыі самаадукацыйнага чытання ў розныя перыяды існавання грамадства набывалі розны змест і трактоўку. М. А. Рубакін, прапанаваўшы сістэму самаадукацыі, падкрэсліваў, што яна «нічога не павінна навязваць і нікога не павінна сціскаць, яна павінна толькі раскрываць перад чытачом, па-першае, па магчымасці поўную і абгрунтаваную сістэму ведаў; па-другое, даваць па магчымасці поўны спіс адносна добрых кніг» [цыт. па: 8, с. 149]. Падобнае разуменне выказалі А. А. Пакроўскі, Л. Б. Хаўкіна, Я. М. Мядынскі. Увогуле на педагагічных заканамернасцях і прынцыпах педагогікі здзяйснялася дзейнасць бібліятэк у дапамогу ўсеагульнай бесперапыннай адукацыі і самаадукацыі. Асаблівае значэнне педагагічныя заканамернасці і дасягненні педагагічнай навукі мелі для распрацоўкі тэорыі і практыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кіраўніцтва чытаннем – уздзеянне на змест і характар чытання па прынцыпу добраахвотнасці, зацікаўленасці, уліку інтарэсаў чытачоў. Л. Б. Хаўкіна, напрыклад, бачыла ролю бібліятэкара ў якасці педагога, актыўнасць якога павінна быць накіравана на развіццё асобы чытача праз выяўленне і праяўленне яго інтарэсаў.

Аднак з умацаваннем жорсткага агітацыйна-прапагандысцкага дыктату такая трактоўка крытыкавалася як апалітычная і буржуазная. Быў сфармуляваны прынцып партыйнасці бібліятэчнай дзейнасці, цалкам распаўсюджаны на кіраўніцтва чытаннем, якое стала часткай ідэалагічнай работы партыі і спалучалася з партыйнай прапагандай. Да 1970-х гг. аб'ектам уплыву ў гэтым працэсе з'яўляўся толькі чытач, інфармацыйны і педагагічны патэнцыял якога, яго карэктуючае ўздзеянне на сістэму бібліятэчнага абслугоўвання амаль не ўлічваліся. Па гэтай прычыне прынцыпы педагогікі ў асноўным выкарыстоўваліся для распрацоўкі аўтарытарнага з боку бібліятэкара працэсу кіраўніцтва чытаннем.

Знакамітыя расійскія вучоныя выказвалі розныя погляды на такое становішча, спрабавалі згладзіць ідэалагічны ўціск, азначыць перспектывы развіцця бібліятэказнаўства ва ўзаемадзеянні з педагогікай. З розных пазіцый і ў розны час абгрунтоўвалі свае погляды А. С. Чубар'ян, Ю. У. Грыгор'еў, Л. В. Белякоў, А. М. Ванееў, Б. Р. Умноў, М. С. Карташоў, Н. І. Цюліна, Р. П. Фонатаў і інш. У іх навуковай спадчыне, якая пэўным чынам не страціла дыскусійнага характару і ў XXI ст., можна вылзеліць некалькі пунктаў гледжання. Адзін з іх – бібліятэказнаўства з'яўляецца педагагічнай навукай. І хоць такую пазіцыю падтрымлівалі і некаторыя прадстаўнікі педагогікі, само паняцце «бібліятэказнаўства» не ўключалася ў педагагічныя энцыклапедыі і слоўнікі, падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па педагогіцы. Характэрна, што Н. К. Крупская лічыла аднясенне бібліятэказнаўства да педагогікі часовай з'явай і нават прапанавала ўстанавіць для бібліятэчных работнікаў вучоныя ступені доктара і кандыдата бібліятэчных навук.

Другі пункт гледжання грунтуецца на тым, што прадмет бібліятэказнаўства не супадае з прадметам педагогікі, хоць педагагічныя метады выкарыстоўваюцца ў абслугоўванні чытачоў. Напрыклад, Н. І. Цюліна, прызнаючы цесны кантакт з педагагічнай навукай у кірунку камуністычнага выхавання і адукацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народа, адзначала толькі частковасць педагагічных пытанняў у складзе бібліятэчнай навукі. Супраць аналогіі паміж педагогікай і бібліятэказнаўствам выступаў Л. В. Белякоў, абгрунтоўваючы сваё бачанне тым, што педагогіка ўяўляе сабой навуку аб выхаванні падрастаючага пакалення і таму яе рэкамендацыі адрасаваны школе. Функцыі ж бібліятэкі ў многім адрозніваюцца ад функцый школы, што абумоўлівае і іншы змест работы, і іншую методыку. У той жа час бясспрэчна, што работа бібліятэкі мае педагагічную накіраванасць. Таму, на думку вучонага, выкарыстоўваючы дасягненні педагогікі і педагагічны вопыт, неабходна стварыць сваю педагагічную тэорыю ўздзеяння праз кнігу на чытача ва ўмовах бібліятэкі.

Трэці пункт гледжання: педагогіка ўяўляе сабой самастойны раздзел бібліятэказнаўства. Так, А. С. Чубар’ян падкрэсліваў, што ў распрацоўцы педагагічных аспектаў бібліятэчнай справы ініцыятыва належыць бібліятэказнаўцам, якія ўнеслі істотны ўклад у раскрыццё выхаваўчай функцыі бібліятэк. Яшчэ адно меркаванне: бібліятэказнаўства выступае як грамадская навука ў цэлым і як педагагічная навука ў прыватнасці. Аднак педагагічныя праблемы бібліятэчнай справы патрабуюць спецыяльнай распрацоўкі з улікам спецыфікі задач, форм, сродкаў і метадаў педагагічнага ўздзеяння, уласцівых бібліятэкам. Забяспечыць увесь комлекс неабходных ведаў шляхам запазычання агульных педагагічных палажэнняў не ўяўляецца магчымым. Аб неабходнасці распрацоўкі спецыяльнай галіны педагогікі – педагогікі бібліятэчнай справы – ставіць пытанне Л. І. Бяляева [3].

Сумуючы розныя падыходы да праблемы, можна вызначыць, што ўсе яны маюць агульную канстанту: бібліятэказнаўства суадносіцца з педагогікай не як з навукай у цэлым, а з тымі яе элементамі, тэарэтычны змест якіх прымяняльны да бібліятэчнай справы.

У ходзе дэмакратызацыі грамадства, з адыходам у мінулае ідэалагізацыі бібліятэчнай дзейнасці і ліквідацыяй ідэалагічнай афарбоўкі бібліятэказнаўства як навукі, з іншых пазіцый распрацоўваецца бібліятэчная педагогіка. У бібліятэчнай энцыклапедыі яна вызначаецца як «міждысцыплінарны раздзел бібліятэказнаўства, які фарміруецца на падставе яго сінтэзу з педагогікай. Прадметам бібліятэчнай педагогікі з’яўляюцца педагагічныя аспекты бібліятэчнай дзейнасці» [4, с. 175].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэчная педагогіка прысутнічае ва ўсіх відах дзейнасці бібліятэкі і спрыяе ажыццяўленню больш мэтанакіраванага і адпавядаючага інтарэсам чытачоў доступу да ведаў і інфармацыі. Бібліятэка ўяўляецца педагагічнай сістэмай, накіраванай на выхаванне і адукацыю карыстальнікаў.

Уплыў педагагічнай навукі асабліва яскрава праяўляецца ў сферы інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў. Азначым некаторыя, у мэтах нашага даследавання, напрамкі ўзаемадзеяння і інтэграцыі.

На сучасным этапе бібліятэка вызначаецца як інфармацыйная, культурная, адукацыйная ўстанова, а бібліятэчная справа адпаведна як галіна інфармацыйнай, культурна-асветніцкай, адукацыйнай дзейнасці. Сярод шматлікіх функцый бібліятэчнага абслугоўвання: сацыяльных (светапоглядных, інфармацыйных, культурна-асветных), псіхалагічных (каштоўнасна-арыентаваных, пазнавальна-камунікатыўных, эмацыянальна-кампенсаторных, рэкрэацыйных, эстэтычных, рэфлексійных) – значнае месца займаюць педагагічныя: адукацыйныя і самаадукацыйныя, выхаваўчыя і самавыхаваўчыя, навучальныя і саманавучальныя, развіваючыя.

Педагагічныя функцыі бібліятэк прызнаны айчыннымі і замежнымі спецыялістамі бібліятэчнай справы. Значны ўклад у іх распрацоўку ўнеслі В. Гофман, А. Бухгольц, П. Ладзевіч, Д. Х. Шыра, Ф. Махлуп, К. Боўлдзінг і інш. Распрацоўка педагагічных функцый у бібліятэказнаўстве сведчыць аб творчым падыходзе да тэарэтычных асноў бібліятэчнай педагогікі, у якім выключаецца механічны перанос прынцыпаў школьнай педагогікі ў бібліятэчны працэс.

Рэалізацыя педагагічных функцый у практычнай дзейнасці бібліятэк садзейнічае дасягненню вынікаў у інфармацыйнай сацыялізацыі, што ўяўляецца асабліва важным у кантэксце жыццяздольнасці асобы. Такім чынам, сацыялізуючая функцыя бібліятэк рэалізуецца ў значнай ступені праз педагагічныя функцыі ў бібліятэчным абслугоўванні як сацыяпедагагічнай сістэме.

У спецыяльнай літаратуры існуюць розныя погляды на сістэму прынцыпаў бібліятэчнага абслугоўвання, іх фармулёўку і разуменне, што знайшло адлюстраванне ў розных падручніках. Расійскі навуковец В. А. Барадзіна сістэматызавала іх у групы: дэмакратызацыі, мэтазгоднасці, камфортнасці, развіцця [6,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

с. 13]. Прынцып развіцця ўключае не толькі развіццё сродкаў і тэхналогій абслугоўвання, але і развіццё асобы карыстальніка бібліятэкі з прымяненнем педагагічных прынцыпаў сістэмнасці, комплекснасці, нагляднасці, цэласнасці, выбіральнасці, шматпрофільнасці.

Інакш зараз трактуецца і кіраўніцтва чытаннем, тэарэтычнай асновай якога з'яўляецца педагогіка. Кіраўніцтва чытаннем у пэўны перыяд было дыктатам над чытачом і ў прафесійнай супольнасці папулярнасцю не карысталася. Нападкі на кіраўніцтва чытаннем звязаны з крытыкай камуністычнай манаідэалогіі і арыентацыяй на ідэю суверэннага права чытача на выбар і выкарыстанне разнастайнай інфармацыі ва ўсіх сферах асабістай жыццядзейнасці ў адпаведнасці з прынцыпамі дэмакратызацыі.

На сучасны момант практыка кіраўніцтва чытаннем распаўсюджваецца ў першую чаргу на дзяцей, падлеткаў, моладзь; пры гэтым выкарыстоўваюцца тыя метадычныя палажэнні, на якія ў свой час засяроджвалі ўвагу асветнікі і бібліятэказнаўцы М. А. Рубакін, Л. Б. Хаўкіна, Я. М. Мядынскі і інш.

Тэорыя кіраўніцтва чытаннем утрымлівае розныя канцэптуальныя асновы, якія абапіраюцца на педагагічную навуку, менавіта:

– з'яўляецца галоўнай канцэпцыяй бібліятэказнаўства, маючай агульнае педагагічнае значэнне;

– інтэгруе бібліятэчную і педагагічную справу ў даследаваннях праблем чытання і чытачоў;

– ляжыць у аснове распрацоўкі канцэпцыі педагогікі чытання, вынікам якога з'яўляюцца выхаванне і адукацыя карыстальнікаў;

– абгрунтоўвае прыкладное прымяненне педагагічных прынцыпаў дыдактыкі;

– трактуе ідэю аб самакіраўніцтве ў чытанні як прынцып комплекснасці педагагічнага ўздзеяння і сістэмы кампанентаў кіраўніцтва чытаннем.

Бібліятэчная педагогіка як складнік бібліятэказнаўства мае на мэце тэарэтычнае абгрунтаванне ўсіх педагагічных аспектаў бібліятэчнай дзейнасці, якія не абмяжоўваюцца толькі кіраўніцтвам чытаннем, хоць менавіта ў ім найбольш яскрава праяўляецца педагагічная сутнасць бібліятэчнага працэсу. Даныя педагагічнай навукі выкарыстоўваюцца пры распрацоўцы праб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лем бібліятэчнага менеджменту, маркетынгу, фандрэйзінгу, бібліятэчнай рэкламы і паблік рылейшнз, падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

Інтэграцыя бібліятэказнаўства і педагогікі знаходзіць адлюстраванне і ў выхаванні інфармацыйнай культуры грамадзян, культуры чытання ў шырокім сэнсе і разуменні яе як адной з галоўных задач бібліятэчнай работы на сучасным этапе, а па сутнасці – педагагічнай праблемы.

Звернем увагу і на зваротную сувязь гэтых навук. Бібліятэказнаўства не толькі выкарыстоўвае дасягненні педагагічнай навукі, але і, у сваю чаргу, уплывае на яе развіццё. Напрыклад, метад літаратурна-педагагічнага аналізу чытання і ўспрымання кнігі дзецьмі сёння аднолькава выкарыстоўваецца для навуковых вывадаў не толькі ў бібліятэказнаўстве, але і ў педагогіцы і псіхалогіі, што знаходзіць адлюстраванне на старонках педагагічнага друку. Таму існуюць падставы разглядаць бібліятэказнаўства і педагогіку як роднасныя, узаемазвязаныя, хоць і самастойныя, навукі.

Тым часам неабходна адзначыць узрастаючы ўплыў бібліятэказнаўства на працэс фарміравання грамадства ведаў. Навука, у тым ліку і педагогіка, не можа развівацца без забеспячэння яе надзейнай інфармацыйна-бібліятэчнай базай, бібліяграфічнымі метадамі аналізу яе дасягненняў і стану.

Вынікі гэтага аналізу сведчаць аб наступным. Узаемасувязь бібліятэказнаўства з педагогікай актывізуецца і рэалізуецца ў розных формах і метадах як непасрэдна пры бібліятэчных стасунках, так і апасродкавана праз фарміраванне інфармацыйна-бібліятэчных рэсурсаў, даведачна-пошукавага апарату, бібліятэчна-інфармацыйнага асяроддзя з улікам іх уздзеяння на карыстальніка.

Бібліятэказнаўства і педагогіка цесна ўзаемадзейнічаюць і ў той ці іншай меры рэалізуюцца ў дзейнасці бібліятэк розных тыпаў і відаў, але асабліва актыўна бібліятэчная педагогіка выкарыстоўваецца ў дзіцячых, публічных бібліятэках, бібліятэках агульнаадукацыйных устаноў.

У Расіі існуюць педагагічныя бібліятэкі як спецыялізаваныя галіновыя, якія ажыццяўляюць бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне педагогаў і навучэнцаў педагагічных вучэбных устаноў (Дзяржаўная навуковая педагагічная бібліятэка імя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

К. Д. Ушынскага, бібліятэкі НДІ педагогікі, педагагічных ВНУ, каледжаў, вучылішчаў).

У Беларусі метадычную місію выконвае Навукова-педагагічная бібліятэка ўстановы «Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтр Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь».

З 30-х гг. XX ст. Вышэйшая атэстацыйная камісія (ВАК) СССР, а з 1990-х гг. ВАК Рэспублікі Беларусь уключылі бібліятэказнаўства ў сістэму педагагічных навук. Спецыялісты бібліятэчнай справы, абараніўшыя дысертацыі на суісканне вучоных ступеняў, становяцца кандыдатамі і дактарамі педагагічных навук па спецыяльнасці 15.25.03 – бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства.

Пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў існуе Савет па абароне дысертацый К 09.03.01, за тэрмін існавання якога прафесіяналы бібліятэчнай справы абаранілі 16 кандыдацкіх дысертацый, адну доктарскую. Гістарычны аспект праблемы і сучаснасць сведчаць аб значным станоўчым уплыве педагагічнай навукі на развіццё бібліятэказнаўства і бібліятэчнай справы. Мяркуецца, што ўзаемасувязь і інтэграцыя навук будуць спрыяць новым здабыткам і перспектывам з улікам развіцця і выкарыстання інавацыйных камп'ютарных і сацыяльных тэхналогій.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Балика, Д. А.* Библиотека в свете современной педагогики / Д. А. Балика // Библиотека : сб. ст. – М. ; Л., 1927. – С. 16–39.

2. *Бацяеў, В. Ф.* Узнікненне і развіццё беларускіх асветніцкіх грамадскіх аб'яднанняў у першыя дзесяцігоддзі XX стагоддзя / В. Ф. Бацяеў // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 4. – С. 45–50.

3. *Беляева, Л. И.* Проблемы интеграции библиотековедения и психологии (постановка вопроса) / Л. И. Беляева // Библиотеки СССР. – 1972. – Вып. 50. – С. 44–65.

4. *Библиотечная* энциклопедия. – М. : Пашков дом, 2007. – 1020 с.

5. *Библиотечное* обслуживание: теория и методика : учеб. / под ред. А. Я. Айзенберга. – М. : МГУКИ, 1996. – 200 с.

6. *Бородина, В. А.* Библиотечное обслуживание : учеб.-метод. пособие / В. А. Бородина. – М. : Либерея, 2004. – 166 с.

7. *Ванеев, А. Н.* Библиотечное дело. Теория. Методика. Практика / А. Н. Ванеев. – СПб. : Профессия, 2004. – С. 24–32.

8. *Дзямешка, Л. А.* Бібліятэчнае абслугоўванне карыстальнікаў у гістарычным аспекце / Л. А. Дзямешка // Весн. Беларус. дзярж. ін-та праблем культуры. – 2005. – № 1 (3-4). – С. 135–143.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Дзямешка, Л. А.* Культурна-асветніцкая і адукацыйная дзейнасць бібліятэк Беларусі / Л. А. Дзямешка // Науч. труды Респ. ин-та высш. школы. Исторические и психолого-педагогические науки: в 2 ч. – Минск, 2008. – Ч. I. – С. 85–95.

10. *Работа* с читателями: учебник. – 2-е изд., перераб. и доп. / под ред. В. Ф. Сахарова. – М. : Книга, 1970. – 352 с.

11. *Работа* с читателями : учебник. – 3-е изд., перераб. и доп. / под ред. В. Ф. Сахарова, И. М. Цареградского. – М. : Сов. Россия, 1981. – 296 с.

12. *Работа* с читателями: учебник / под ред. В. Ф. Сахарова, И. М. Цареградского. – М. : Сов. Россия, 1961. – 239 с.

13. *Рубакин, Н. А.* Практика самообразования / Н. А. Рубакин // Избранное : в 2 т. – М. : Книга, 1975. – Т. 2. – 278 с.

14. *Чубарьян, О. С.* Общее библиотековедение: итоги и проблемы развития / О. С. Чубарьян. – М. : Книга, 1973. – С. 41–59.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1.2. Канцэпцыі бібліятэчнай педагогікі, задачы, прынцыпы, катэгорыі: сутнасць і перспектывы развіцця

Інтэграцыі бібліятэказнаўства з іншымі, супольнымі, навукамі і фарміраванню на гэтай падставе самастойных, спецыяльных, галін ведаў, такіх як бібліятэчная педагогіка, надаецца вялікая ўвага ў сучасных публікацыях. Педагогіка як навука, што ахоплівае ўсе бакі чалавечай дзейнасці, з’яўляецца неад’емным кампанентам падрыхтоўкі спецыяліста інфармацыйна-дакументнай сферы. Яе пастулаты ляжаць у аснове навуковага абгрунтавання арганізацыі бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, узаемадзеяння бібліятэкі і карыстальніка, узаемаадносін у бібліятэчным калектыве.

Аднак тэарэтыка-метадычныя асновы бібліятэчнай педагогікі, яе структура, падыходы і канцэпцыі пакуль яшчэ далёкія ад шматаспектнага комплеснага абгрунтавання. Недастаткова дакладна выяўлены спецыфічныя асаблівасці педагагічнага працэсу ва ўмовах бібліятэкі. Застаюцца дыскусійнымі педагагічныя кампаненты бібліятэказнаўчых даследаванняў, асабліва тых, што не маюць непасрэдных адносін да абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Усё гэта падахвочвае да паглыбленага аналізу паняцця «бібліятэчная педагогіка», разгляду яго ключавых аспектаў і шляхоў узаемадзеяння з іншымі навукамі.

Бібліятэчная педагогіка можа разглядацца і як спецыяльная галіна педагогікі, сфарміраваная на базе інтэграцыі з бібліятэказнаўствам, і як міждысцыплінарны раздзел бібліятэказнаў-

ства, створаны на падставе яго сінтэзу з педагогікай. У любым выпадку яе прадметам з'яўляюцца педагагічныя аспекты бібліятэчнай справы, выяўленне дыдактычных прынцыпаў і метадаў арганізацыі ўзаемадзеяння ў сістэме «бібліятэка – карыстальнік».

Бібліятэчная педагогіка – гэта навука аб сутнасці фарміравання і развіцця чалавека, які імкнецца набываць веды, пазнаваць свет і самога сябе праз чытанне, ва ўсёй шматбаковасці ўзаемадзеяння са светам інфармацыі, бібліятэчным асяроддзем, інфармацыйнымі рэсурсамі, прадуктамі і паслугамі.

Бібліятэчная педагогіка імкнецца даць тэарэтычнае абгрунтаванне педагагічных працэсаў, якія ажыццяўляюцца ў бібліятэцы як у ходзе абслугоўвання карыстальнікаў, так і падчас станаўлення і развіцця бібліятэчнага калектыву. Бібліятэчная педагогіка вывучае заканамернасці і абгрунтоўвае тэарэтычныя палажэнні, распрацоўвае прынцыпы, метады, формы і тэхналогіі чытацкага развіцця, выхавання і навучання сродкамі чытання. Чытанне выступае і як сродак фарміравання асобы, і як інструмент вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

*Аб'ектам* бібліятэчнай педагогікі выступаюць чытацкае развіццё, фарміраванне чытацкай і інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк. *Прадметам* – педагагічны працэс, які ажыццяўляецца ў ходзе ўзаемадзеяння бібліятэкара з карыстальнікам і накіраваны на пераўтварэнне яго асобасных уласцівасцей і якасцей пад уплывам успрынятай і перапрацаванай інфармацыі.

Бібліятэчная педагогіка мае сваёй *мэтай* фарміраванне навукова абгрунтаваных уяўленняў аб заканамернасцях бібліятэчна-бібліяграфічнага ўплыву на чытацкую свядомасць, чытацкую дзейнасць і чытацкія зносіны, станаўленне і развіццё адукаванай, творчай асобы са шматбаковым мысленнем, высокай чытацкай і інфармацыйнай культурай. Не апошнюю ролю адыгрывае тэарэтычнае абгрунтаванне педагагічных працэсаў, якія ажыццяўляюцца ў бібліятэцы як у ходзе абслугоўвання карыстальнікаў, так і ў ходзе станаўлення і развіцця бібліятэчнага калектыву.

*Задачамі* бібліятэчнай педагогікі выступаюць: фарміраванне ў карыстальнікаў бібліятэк навыкаў прадуктыўнага чытання, пошуку і выбару неабходнай інфармацыі, сістэмы бібліятэчна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічных ведаў, а таксама выхаванне ўстойлівага інтарэсу да чытання і імкнення да саамаадукацыі.

Метадалагічную аснову бібліятэчнай педагогікі складае агульнапедагагічная тэорыя выхавання. Апроч яе бібліятэчная педагогіка абапіраецца на педагогіку дарослых, бібліятэказнаўства, чытачазнаўства, сацыялогію і псіхалогію чытання, сацыяльную псіхалогію і сацыяльную педагогіку, іншыя навукі.

Змест бібліятэчнай педагогікі складаюць такія раздзелы, як педагагічныя зносіны, тэорыя чытацкага развіцця, фарміраванне культуры чытання як педагагічны працэс, інфармацыйная дыдактыка, педагагічная і камунікатыўная культура бібліятэкара.

Тэрмін «бібліятэчная педагогіка» быў уведзены ў навуковы абыходак Б. П. Гушчыным [6]. Значны ўнёсак у распрацоўку тэарэтычных асноў бібліятэчнай педагогікі зрабілі тэарэтыкі пазашкольнай адукацыі У. М. Бехцераў, В. А. Зелянко, У. І. Чарналускі, а таксама бібліятэкары-практыкі М. А. Корф, Я. М. Мядынскі, М. Ф. Фёдараў.

У якасці цэнтральнай катэгорыі бібліятэчнай педагогікі ў 1920-я гг. Д. А. Баліка вызначыў і абгрунтаваў кіраўніцтва чытаннем [2]. Яно доўгія часы атаясамлівалася з педагагічнай функцыяй бібліятэкі і разумелася як мэтанакіраванае і планамернае ўздзеянне на змест і характар чытання з мэтай фарміравання камуністычнага светапогляду.

З пачатку 1970-х гг. праблемы бібліятэчнай педагогікі асвятляліся ў працах расійскіх бібліятэказнаўцаў А. Я. Айзенберга [1], Л. В. Белякова [гл.: 17], А. М. Ванеева [4], Ю. У. Грыгор’ева [гл.: 17], А. С. Чубар’яна [гл.: 17]. Беларускімі бібліятэказнаўцамі таксама распрацоўваліся педагагічныя аспекты адкрытага доступу да фондаў публічных бібліятэк (В. А. Дукель) [8], інтэрнацыянальнага выхавання моладзі (Л. А. Дзямешка) [7], кіраўніцтва самаадукацыйным чытаннем у ЦБС (Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэме) (Н. У. Клімянкова) [12].

З цягам часу ў межах бібліятэказнаўства намеціўся шэраг падыходаў да вызначэння зместу і сутнасці педагагічных працэсаў ва ўмовах бібліятэкі. Кожны з іх мае сваё разуменне ключавой праблемы бібліятэчнай педагогікі, базавай канцэпцыі ўзаемадзеяння бібліятэкі з карыстальнікам.

Так, у 1990-я гг. У. І. Цярошын [20] абгрунтоўвае, а потым і развівае думку, што ва ўсіх відах дзейнасці бібліятэкі пры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сутнічаюць элементы педагогікі і сама бібліятэка ўяўляе сабой педагагічную сістэму, арыентаваную на выхаванне і адукацыю карыстальнікаў. Прычым педагагічная функцыя бібліятэкі рэалізуецца як пры непасрэдным кантакце з карыстальнікамі, так і апасродкавана, праз фарміраванне бібліятэчных фондаў, ДПА (даведачна-пошукавы апарат), бібліятэчнага асяроддзя з улікам магчымасцей іх уздзеяння на чытачоў. Такі падыход можна назваць бібліяцэнтрысцкім альбо агульнапедагагічным.

Камунікатыўны падыход таксама акрэсліўся ў 1980–90-я гг. Яго прыхільнікамі ў краінах СНД можна назваць С. А. Езаву [10], І. А. Мейжыс [15], А. В. Смоліну [18], Э. Р. Сукіасяна [19] і інш. У беларускім бібліятэказнаўстве адзначаны падыход абгрунтаваны ў работах Л. А. Дзямешкі [9], Н. У. Клімянковай [13], С. А. Паўлавай [9]. Тут найважнейшым элементам педагагічнага працэсу ў бібліятэцы разглядаюцца зносіны бібліятэкара з карыстальнікам, як непасрэдныя, так і апасродкаваныя: праз спецыяльна падабраныя і сфарміраваныя інфармацыйныя рэсурсы, мэтанакіравана арганізаванае бібліятэчнае асяроддзе, сістэму інфармаццыйных прадуктаў і паслуг.

Заслугоўвае ўвагі і такая новая канцэпцыя, як «бібліятэчная кагніталогія», яна абгрунтавана ў манаграфіі А. І. Астапава [16] і атрымала далейшае развіццё ў рабоце В. А. Факеева [21]. Хоць у прыведзеных публікацыях бібліятэчная і бібліяграфічная кагніталогія разглядаецца па-за сувяззю з бібліятэчнай педагогікай, агульная кагніталогія як навука, што фарміруе сістэму распаўсюджвання і ўжывання ведаў у грамадстве, выступае ў якасці складніка педагогікі [5]. Такім чынам, кагнітыўная педагогіка з’яўляецца асновай дзейнасці любой бібліятэкі, а кагніталагічны падыход у бібліятэчнай педагогіцы мае рацыю, асабліва ва ўмовах, калі бібліятэчна-інфармацыйная сфера паступова пераходзіць ад прадастаўлення карыстальніку інфармацыі да мэтанакіраванай дапамогі яму ў набыцці ведаў.

В. А. Барадзіна [3] падчас распрацоўкі акмеалагічнай канцэпцыі чытання і чытацкага развіцця падкрэслівае, што бібліяпсіхалогія і бібліяпедагогіка выступаюць у якасці тэарэтычнай асновы дыдактыкі і тэорыі чытання, мяркуе, што яны арганічна ўвойдуць у адзіную навуковую дысцыпліну на падставе тэорыі чытацкага развіцця асобы – акмеалогію чытання.

Апошнім часам набывае асобую актуальнасць бібліятэрапеўтычны падыход, у межах якога падкрэсліваецца кампенсатор-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ная функцыя чытання, разглядаюцца асаблівасці ўзаемадзеяння з карыстальнікамі, якія маюць праблемы і асаблівасці псіхафізіялагічнага кшталту, патрэбу ў дапамозе і падтрымцы з боку бібліятэкі і бібліятэкара. У расійскім бібліятэказнаўстве заснавальнікам дадзенага падыходу з'яўляецца А. Я. Шапашнікаў. Сярод беларускіх навукоўцаў можна назваць У. А. Акуліча, С. А. Паўлаву, Н. Я. Пятушка, І. А. Сталярову і інш.

Такім чынам, у межах бібліятэчнай педагогікі можна вылучыць пяць напрамкаў: агульнабібліятэчны, камунікатыўны, кагнітывісцкі, акмеалагічны і бібліятэрапеўтычны.

Асноўныя тэорыі і падыходы бібліятэчнай педагогікі грунтуюцца на ідэях аб прыродзе чытання, яго ролі і значэнні ў інтэлектуальным і духоўным развіцці асобы [11; 17], а таксама аб прыродзе бібліятэчных зносін як інфармацыйным і прадметным узаемадзеянні, абумоўленым пошукам неабходных матэрыялаў для чытання, арганізацыяй чытацкай дзейнасці, абмеркаваннем прачытанага [10; 12; 15; 18]. Прычым на першае месца ставяцца пастулаты педагогікі супрацоўніцтва, якія дазваляюць уплываць на чытанне і чытацкія паводзіны, не ўжываючы ўціску на псіхіку карыстальніка.

Важнейшым элементам педагагічнага працэсу ў бібліятэцы з'яўляюцца зносіны бібліятэкара з карыстальнікам, як непасрэдныя, так і апасродкаваныя. Па сваёй прыродзе бібліятэка займае прамежкавае становішча паміж інстытутамі спантаннай сацыялізацыі: сямёй, сяброўскімі групамі, сродкамі масавай інфармацыі, асветнымі грамадскімі арганізацыямі і г. д. – і адукацыйнымі ўстановамі, прызванымі мэтанакіравана ажыццяўляць выхаванне, навучанне і адукацыю.

З першымі яе збліжае даверлівы характар зносін у ходзе педагагічнага ўзаемадзеяння, адсутнасць прамога прымусу, арыентацыя на індывідуальныя інтарэсы і патрэбы карыстальніка, спантаннасць узнікнення і заканчэння кантактаў, іх імправізацыйны характар.

Другія прыўносяць у бібліятэчныя зносіны і абслугоўванне элементы сістэматычнасці, паслядоўнасці, нагляднасці і іншыя дыдактычныя прынцыпы, калі бібліятэкару даводзіцца мець справу з групай, спецыяльна арганізаванай для праходжання навучання асновам інфармацыйнай культуры, альбо з чытацкім аб'яднаннем у рамках адукацыйнай, сацыяльна-педагагічнай праграмы, праекта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У любым выпадку бібліятэка шчыльна супрацоўнічае і ўзаемадзейнічае як з інстытутамі спантаннай сацыялізацыі, так і з установамі сістэмы адукацыі, інфармацыйна забяспечваючы іх дзейнасць, ажыццяўляючы метадычную дапамогу ў пошуку і засваеннні неабходнай інфармацыі, пераўтварэнні яе ў веды. Асобае месца ў педагагічнай дзейнасці бібліятэкі займае садзейнічанне самаадукацыі карыстальнікаў, што традыцыйна выступае ў якасці істотнай задачы любой бібліятэчна-інфармацыйнай установы.

Прынцыпы дыдактыкі – сістэматычнасці, паслядоўнасці, свядомасці і актыўнасці навучэнцаў, даступнасці, нагляднасці, трываласці засваення ведаў, індывідуальнага падыходу – альбо зусім «не працуюць» ва ўмовах бібліятэчнага абслугоўвання, альбо могуць быць рэалізаваны ў абмежаваным маштабе. Напрыклад, прынцыпы сістэматычнасці, паслядоўнасці, трываласці засваення ведаў у адносінах узаемадзеяння бібліятэкара з карыстальнікам абмежаваныя кароткачасовасцю, эпізадычнасцю кантактаў, немагчымасцю загадзя прадугледзець наведванне бібліятэкі карыстальнікам, які робіць гэта не адпаведна жаданням бібліятэкара для ажыццяўлення педагагічнага ўплыву, а ў зручны для сябе момант.

Прынцып даступнасці рэалізуецца не столькі праз падачу інфармацыі ў даступнай для карыстальніка форме, хоць і гэта вельмі важна, колькі шляхам забеспячэння беспершкоднага і поўнага доступу да інфармацыйных рэсурсаў. Дадзены прынцып таксама прадугледжвае дыферэнцаваны падыход да чытачоў з улікам іх узроставых, гендарных, сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцей і ўзроўню інфармацыйнай культуры.

Трываласць засваення ведаў не можа быць рэалізавана ва ўмовах бібліятэкі, таму што кантроль за набываемымі ведамі ажыццяўляецца па-за яе межамі і не ўваходзіць у функцыі бібліятэчна-інфармацыйнай установы.

Бібліятэчнае абслугоўванне наогул прынцыпова адрозніваецца ад працэсу арганізаванага выхавання і навучання перш за ўсё тым, што зносіны тут маюць спантанны характар. Бібліятэкар і чытач значна менш залежаць адзін ад аднаго. Яны не аб’яднаны ў педагагічным працэсе, як выкладчык і навучэнец. Адсутнічае элемент прымусу. Чытач вольны як аднавіць зносіны па сваім асабістым разуменні, так і перарваць іх па ўласным жаданні, чаго не можа сабе дазволіць навучэнец без рызыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апынуцца па-за межамі навучальнай установы за парушэнне вучэбнай дысцыпліны.

Змястоўны аспект узаемадзеяння таксама істотна адрозніваецца ў бок менш фармалізаваных і заарганізаваных зносін і, у рэшце рэшт, мае характар імправізацыі. Выкладчык павінен наперад ведаць, аб чым пойдзе гаворка на ўроку, каго трэба выклікаць, што задаць на дом. Бібліятэкар абсалютна свабодны ў выбары сродкаў зносін, але, у той жа час, ён не можа прадугледзець пытанняў, якія ўзнікнуць падчас размовы, загадзя падрыхтавацца да адказу на іх.

Узаемадзеянне бібліятэкара з карыстальнікам максімальна індывідуалізавана. Таму індывідуальны падыход – не столькі прынцып, колькі сутнасная характарыстыка ўзаемадзеяння бібліятэкара з карыстальнікам, аснова бібліятэчнага абслугоўвання.

Такім чынам, кіравацца дыдактычнымі прынцыпамі ў індывідуальным абслугоўванні карыстальнікаў альбо зусім немагчыма, альбо магчыма, але пры наяўнасці істотных абмежаванняў і пэўных умоў. Нават прынцып нагляднасці ў абслугоўванні праяўляецца вельмі своеасабліва і выконвае не столькі дапаможную, илюстрацыйную ролю, колькі адну з асноўных – раскрыцця фонду, прадастаўлення найбольш поўнай інфармацыі аб яго змесце, каштоўнасці і наяўнасці дакументаў.

Сутнасць педагагічнага мыслення бібліятэкара заключаецца ў тым, што теарэтычныя пастулаты і агульнапрызнаныя прынцыпы педагагічнай навукі мадыфікуюцца ў ходзе іх практычнага ўжывання ў бібліятэчным абслугоўванні з улікам спецыфікі педагагічнага працэсу ў бібліятэцы. Педагагічная практыка тут выліваецца ў формы гутаркі-рэкамендацыі, размовы аб прачытаным, кансультавання, інфармавання, масавага мерапрыемства, мэтавай комплекснай праграмы, арганізацыі чытацкіх аб’яднанняў і г. д. Педагагічны кампанент прысутнічае ў бібліятэчнай рэкламе, рабоце з сацыяльна неабароненымі групамі і індывідамі, псіхалагічным кансультаванні, кіраванні на ўсіх яго ўзроўнях.

Бібліятэчная педагогіка накіравана на развіццё прыродных здольнасцей карыстальніка, інфармацыйна забяспечваючы яго самаадукацыю і самавыхаванне. Чытанне спрыяе самарэалізацыі асобы, разуменню сябе і іншых, адэкватнай ацэнцы рэчаіснасці. Найважнейшай педагагічнай задачай з’яўляецца распра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цоўка прынцыпаў выбару крыніц інфармацыі для самаадукацыі, а таксама рацыянальных метадаў, прыёмаў самаадукацыйнага чытання, яго эфектыўнай арганізацыі.

Фарміраванне культуры чытання і інфармацыйнай культуры карыстальнікаў выступае ў якасці істотнай педагагічнай задачы сучаснай бібліятэкі, у ходзе вырашэння якой найбольш поўна рэалізуюцца прынцыпы дыдактыкі, што садзейнічае забеспячэнню інфармацыйнай бяспекі асобы.

Кожны з існуючых сацыяльна абгрунтаваных прыярытэтных кірункаў бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання: фарміраванне прававой культуры насельніцтва, дапамога ў бесперапыннай адукацыі карыстальнікаў, дапамога карыстальнікам з «асобымі патрэбнасцямі», фарміраванне культуры чытання і інфармацыйнай культуры карыстальнікаў – знаходзіць сваю апору ў адпаведнай педагагічнай тэорыі альбо галіне педагогікі.

Бібліятэчная педагогіка шчыльна звязана з педагогікай дарослых. Бібліятэка як установа, прызваная распаўсюджваць разнастайныя веды і забяспечваць змястоўнае баўленне вольнага часу, не толькі абапіраецца на распрацоўкі і методыкі, прызначаныя для адукацыі дарослых, але і выпрацоўвае свае ўласныя падыходы да фарміравання інфармацыйнай культуры карыстальнікаў, павышэння ўзроўню іх ведаў у той перыяд, калі яны не ахоплены арганізаванымі формамі навучання.

Дасягненні сацыяльнай педагогікі таксама з'яўляюцца асновай для работы бібліятэкі з сацыяльна неабароненымі групамі карыстальнікаў: дзецьмі, пазбаўленымі бацькоўскага апекавання, састарэлымі, інвалідамі, беспрацоўнымі і г. д. Ва ўзаемадзеянні з сацыяльнымі службамі, сям'ёй і школай, органамі правааховы, грамадскімі арганізацыямі бібліятэка сваімі спецыфічнымі сродкамі садзейнічае вырашэнню праблем сацыялізацыі, сацыяльнай адаптацыі і сацыяльнай рэабілітацыі адзначаных груп карыстальнікаў.

Карэкцыйная педагогіка выступае метадалагічнай базай у рэалізацыі кампенсаторнай функцыі чытання, ажыццяўленні бібліятэрапіі для карыстальнікаў, якія апынуліся ў складаных жыццёвых сітуацыях.

Палажэнні сучаснай дэфекталогіі выкарыстоўваюцца ў рабоце з наведвальнікамі, якія маюць псіхафізіялагічныя абмежа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванні, для стварэння безбар’ернага бібліятэчнага асяроддзя і забеспячэння свободнага доступу да інфармацыі.

Асноўнымі катэгорыямі бібліятэчнай педагогікі, на наш погляд, з’яўляюцца:

– кіраўніцтва чытаннем (мэтанакіраванае і планамернае ўздзеянне на змест і характар чытання);

– фарміраванне культуры чытання (уменне арыентавацца ў інфармацыйным асяроддзі, знаходзіць і адбіраць неабходныя матэрыялы для чытання, успрымаць і спажываць заключаную ў іх інфармацыю, пераўтвараючы яе ў веды);

– чытацкае развіццё асобы (пераход у новы якасны стан навыкаў чытання, здольнасцей да выбару, перапрацоўкі і засваення інфармацыі, асобасных якасцей, пазнавальных працэсаў);

– чытацкая свядомасць (сістэма поглядаў, ідэй, уяўленняў, ведаў, меркаванняў, эмоцый, інтарэсаў, установак, памылак, ілюзій і г. д., што ўзнікаюць на падставе чытацкага вопыту і ўзаемадзеяння з іншымі чытачамі);

– чытацкая дзейнасць (разнавіднасць педагагічнай сістэмы, якая падпарадкоўваецца прынцыпам самаарганізацыі, самарэгуляцыі і самакіравання і абумоўлена мэтамі, зместам чытання і сродкамі ажыццяўлення чытацкіх запытаў);

– чытацкія зносіны (спосаб існавання і пазнання ўласнага чытацкага Я і чытацкага асяроддзя ў міжчытацкіх зносінах на падставе абмену думкамі, меркаваннямі, ацэнкамі з нагоды прачытанага; узнікненне, устанаўленне, развіццё, а таксама разбурэнне і скасаванне кантактаў паміж чытачамі);

– інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе бібліятэкі (матэрыяльныя, духоўныя і інфармацыйныя ўмовы ажыццяўлення педагагічна-адукацыйнай дзейнасці).

Выкарыстоўваючы дасягненні педагагічнай навукі, бібліятэкарам-бібліёграфам неабходна больш дакладна абгрунтаваць прынцыпы бібліятэчнай педагогікі, паказаць яе месца і ролю ў шматбаковай бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, сканцэнтраваць увагу на педагагічным асэнсаванні праблем узаемадзеяння і ўзаемнага ўплыву бібліятэкі і карыстальніка, а таксама пытанняў падрыхтоўкі бібліятэчнага персаналу, яго інтэграцыі ў педагагічны працэс і прафесійнай адаптацыі да новых рэалій бібліятэчнай практыкі [14].

Сучасныя праблемы бібліятэчнай педагогікі традыцыйна выступаюць прадметам вывучэння на кафедры менеджменту

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйна-дакументнай сферы факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў. У межах даследчага праекта распрацоўваюцца праблемы тэорыі і методыкі бібліятэчнай педагогікі, псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння бібліятэкара з карыстальнікам, кіраўніцтва дзіцячым чытаннем і сацыялізацыі падрастаючага пакалення, бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў з абмежаванымі псіхафізіялагічнымі магчымасцямі, педагагічнага патэнцыялу праектнай дзейнасці бібліятэк, экалагічнага выхавання і адукацыі, фарміравання інфармацыйнай культуры карыстальнікаў, падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў і інш.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Айзенберг, А. Я.* О содержании курса «Библиотечная педагогика» / А. Я. Айзенберг // Советское библиотековедение. – 1985. – № 1. – С. 56–64.

2. *Балика, Д. А.* Библиотека в свете современной педагогики / Д. А. Балика // Библиотека : сб. ст. – М. ; Л., 1927. – С. 25–41.

3. *Бородина, В. А.* Теория и технология читательского развития в отечественном библиотековедении: в 2 ч. Ч. 1 : Научные и методологические основы / В. А. Бородина. – М. : Шк. б-ка, 2006. – 336 с.

4. *Ванеев, А. Н.* Структура библиотековедения / А. Н. Ванеев // Советское библиотековедение. – 1983. – № 3. – С. 44–56.

5. *Генецинский, В. И.* Знание как категория педагогики: опыт педагогической когнитологии / В. И. Генецинский. – Л. : ЛГУ, 1989. – 144 с.

6. *Гущин, Б. П.* Библиотечная педагогика / Б. П. Гущин // Библиотекарь. – 1915. – Вып. 3–4. – С. 408–414.

7. *Демешко, Л. А.* Интернациональное воспитание молодежи: из опыта работы массовых библиотек БССР / Л. А. Демешко. – Минск : Беларусь, 1984.–302 с.

8. *Дзямешка, Л. А.* Дзейнасць бібліятэкі як сацыяльнай установы / Л. А. Дзямешка, С. А. Паўлава // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2008. – № 8. – С. 20–24.

9. *Дукель, В. А.* Педагогические основы влияния открытого доступа к фондам библиотек на формирование читательских интересов (на материале библиотек Белоруссии) : автореф. дис. … канд. пед. наук. / В. А. Дукель ; МГПИ им. А. М. Горького. – Минск, 1979. – 22 с.

10. *Езова, С. А.* Библиотечное общение / С. А. Езова. – Улан-Удэ : Бурятское книж. изд-во, 1990. – 68 с.

11. *Збаровская, Н. В.* Библиотечная педагогика как научная дициплина / Н. В. Збаровская // Библиотековедение. – 2006. – № 2. – С. 118–125.

12. *Клименкова, Н. В.* Проблема общения в руководстве чтением (на примере Минской ЦБС) / Н. В. Клименкова // Советское библиотековедение. – 1983. – № 2. – С. 36–43.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*13. Клименкова, Н. В.* Роль библиотеки ПТУ в профессиональном и духовном становлении молодого рабочего / Н. В. Клименкова. – М. : Высш. шк., 1990. – 90 с.

*14. Клімянкова, Н. У.* Бібліятэчна-педагагічная дзейнасць: накірункі і перспектывы развіцця / Н. У. Клімянкова // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 12. – С. 44–49.

*15. Мейжис, И. А.* Социально-психологические основы библиотечного обслуживания : учеб. пособие / И. А. Мейжис. – Николаев : [Б.и.], 1994. – 197 с.

*16. Остапов, А. И.* Библиотечная когнитология: монография / А. И. Остапов. – Краснодар : КГАК, 1993. – 331 с.

*17. Развитие* педагогических функций советских библиотек : межвуз. сб. науч. тр. – М. : Моск. гос. ин-т культуры, 1991. – 326 с.

*18. Смолина, Е. В.* Теоретико-методические основы изучения общения в библиотеке : (аналитический обзор) / Е. В. Смолина. – Л. : БАН, 1989. – 59 с.

*19. Сукиасян, Э. Р.* Библиотечная профессия. Кадры. Непрерывное образование : сб. ст. и докл. / Э. Р. Сукиасян. – М. : Фаир-Пресс, 2004. – 448 с.

*20. Терёшин, В. И.* Библиотека – педагогическая система / В. И. Терёшин // Библиотековедение. – 1998. – № 5. – С. 33–46.

*21. Фокеев, В. А.* Природа библиографического знания : монография / В. А. Фокеев. – М. : РГБ, 1995. – 352 с.

## 1.3. Зносіны як неад'емны элемент педагагічнага працэсу ў бібліятэцы

Зносіны – адзін з найбольш істотных аспектаў прафесійнай дзейнасці бібліятэкара. Менавіта ў ходзе зносін бібліятэкара з чытачом рэалізуюцца асноўныя сацыяльныя функцыі бібліятэкі, складаецца сістэма ўяўленняў аб ёй, ажыццяўляецца зваротная сувязь з чытацкай аўдыторыяй.

Пераход ад імператыўнай педагогікі да педагогікі супрацоўніцтва патрабуе адпаведных псіхолага-педагагічных падыходаў да зносін, нацэленасці на зносіны раўнапраўныя, якія грунтуюцца на інтарэсе да развіцця асобы чытача, асобасна-арыентаваныя. Такія зносіны дазваляюць бібліятэкарам не толькі перабудаваць сістэму ўзаемаадносін з карыстальнікамі, але і больш прадуктыўна вырашаць прафесійна-педагагічныя задачы, больш поўна выкарыстоўваць багаты інфармацыйны і маральна-этычны патэнцыял твораў друку і іншых інфармацыйных матэрыялаў.

Супрацоўніцтва і актыўны дыялог з чытачом пабуджаюць бібліятэкараў асэнсаваць той факт, што бібліятэка, асабліва публічная, агульнадаступная, павінна быць не толькі месцам захавання і выкарыстання дакументаў, але і цэнтрам інтэлектуальных, духоўных зносін, арганізацыі і правядзення сустрэч чытачоў са стваральнікамі кніг, асяродкам культурнага змястоўнага дасугу.

Усё гэта патрабуе падрыхтоўкі спецыяліста на якасна новым узроўні – бібліятэкара, які спалучае высокі прафесіяналізм, шырокую эрудыцыю з камунікатыўнай кампетэнтнасцю.

Зносіны бібліятэкара з чытачом – гэта і праблема вырашэння актуальных сацыяльна-псіхалагічных задач, якія існуюць у сучасным бібліятэчна-інфармацыйным абслугоўванні, і магчымасці вырашэння перспектыўных пытанняў, звязаных з мадэляваннем новых адносін у межах бібліятэкі. Невыпадкова ў апошнія дзесяцігоддзі яна прыцягвае ўсё больш пільную ўвагу даследчыкаў-бібліятэказнаўцаў і бібліёграфаў.

Першыя спробы ўлічваць фактар псіхалагічнага ўзаемадзеяння бібліятэкара з чытачом у працэсе кнігавыдачы сустракаюцца ў работах расійскіх бібліятэказнаўцаў М. А. Рубакіна, А. А. Пакроўскага, Л. Б. Хаўкінай і інш.

У 20-я гг. мінулага стагоддзя ў сувязі з вывучэннем бібліятэчнай прафесіі і выяўленнем спецыфічных умоў працы бібліятэкараў абанемента асобая ўвага надавалася праблеме іх узаемаадносін з наведвальнікамі бібліятэкі. У гэтай сувязі нельга не адзначыць работу А. А. Гайвароўскага «Психотехника и бибдело», якая была надрукавана ў Мінску ў 1928 г. [3].

Надалей, амаль да 80-х гг. XX ст., у прафесійным друку можна было знайсці толькі асобныя згадкі і рэдкія публікацыі, у якіх праблема зносін бібліятэкара з чытачом закранналася мімаходзь, за адным разам з рашэннем іншых пытанняў.

Актывізацыя даследаванняў у галіне кіраўніцтва чытаннем прымусіла навукоўцаў звярнуць увагу на праблему псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння бібліятэкара з чытачом. Менавіта як фактар удасканалення кіраўніцтва самаадукацыйным чытаннем карыстальнікаў цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм (ЦБС) масавых бібліятэк зносіны разглядаліся ў дысертацыйным даследаванні Н. У. Клімянковай, якая адной з першых у бібліятэказнаўстве звярнулася да вывучэння дадзенай праблемы [10].

Потым С. А. Езава ўвяла ў навуковы абыходак сам тэрмін «бібліятэчныя зносіны» [4] і пачала плённа распрацоўваць дадзены кірунак, абапіраючыся на дасягненні агульнай і сацыяльнай псіхалогіі. У прыватнасці, ёю зроблена спроба адаптацыі тэхналогіі трансактнага аналізу амерыканскага псіхолага Э. Берна ў практыку індывідуальнага абслугоўвання карыстальнікаў [5]. Разглядаючы феномен бібліятэчных зносін як аб’ект даследавання і грунтоўнага аналізу, С. А. Езава ў сваіх шматлікіх публікацыях імкнецца прадставіць шырокі спектр праблем, звязаных з бібліятэчнымі зносінамі і камунікатыўнай падрыхтоўкай бібліятэкара [4–9].

Даволі прадуктыўным з’явіўся таксама і падыход, пры якім зносіны разглядаліся як фактар эфектыўнасці індывідуальнай работы з чытачамі, павышэння ўзроўню культуры бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, як неабходная ўмова задаволенасці чытачоў бібліятэчнымі паслугамі. Гэты падыход знайшоў адлюстраванне ў дысертацыі і публікацыях А. В. Смолінай [12].

Зараз праблема зносін актыўна распрацоўваецца, але ўжо з іншага пункту гледжання – як аснова бібліятэчна-інфармацыйнага ўзаемадзеяння з чытачамі, як фактар аптымізацыі працэсу абслугоўвання. У дадзеным напрамку актыўна і плённа працуюць бібліятэказнаўцы М. Я. Дворкіна, М. А. Джэраліеўская, І. К. Джэраліеўская, С. А. Езава, Б. Г. Зільберман, Н. У. Клімянкова, Л. Ф. Красінская, С. Г. Матліна, І. А. Мейжыс, А. В. Смоліна і інш.

Такім чынам агульнымі намаганнямі навукоўцаў і практыкаў былі выяўлены і абгрунтаваны тэарэтычныя і метадычныя палажэнні, якія маюць фундаментальнае значэнне для распрацоўкі праблемы зносін ва ўмовах бібліятэкі. Праведзеныя эмпірычныя даследаванні далі багаты фактычны матэрыял, дзякуючы якому можна меркаваць аб характары ўзаемаадносін бібліятэкара з карыстальнікам, аб спецыфічных рысах і асаблівасцях стасункаў у бібліятэцы.

Тым не менш аналіз навуковых работ, прысвечаных бібліятэчным зносінам, сведчыць аб недастатковай распрацаванасці некаторых важных тэарэтыка-метадалагічных пытанняў, без вырашэння якіх немагчыма грунтоўнае вывучэнне дадзенай праблемы. Феномен бібліятэчных зносін патрабуе больш цэласнага даследавання, якое неабходна ажыццяўляць з улікам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

усіх сацыяльных і сацыяльна-псіхалагічных фактараў, што ўздзейнічаюць на бібліятэку і на камунікатыўныя працэсы ў ёй.

Дзеля таго, каб выявіць спецыфіку прафесійных зносін у бібліятэках розных тыпаў, патрабуецца вырашыць пытанне аб іх прадмеце і функцыях, месцы ў структуры бібліятэчнай дзейнасці. Важна вывучыць унутраныя псіхалагічныя механізмы прафесійных зносін бібліятэкара: патрэбнасці, матывы, маральныя ўстаноўкі, каштоўнасныя арыентацыі.

Апроч навуковага асэнсавання гэтых і шэрагу іншых пытанняў, рашэння не толькі на тэарэтычным, але і на практычным узроўні патрабуе праблема ўдасканалення зносін у бібліятэцы, навучання бібліятэкараў сучасным прыёмам дзелавых зносін, развіцця іх камунікатыўнай кампетэнтнасці.

Складанасць і шматбаковасць праблемы бібліятэчных зносін абумоўліваюць выбар у якасці прадмета даследавання ўсяго комплексу псіхолага-педагагічных аспектаў узаемадзеяння бібліятэкара з чытачом. Паколькі асноўным пасрэднікам узаемадзеяння, яго рухаючай сілай, «душою справы» з'яўляецца бібліятэкар, асноўная ўвага надаецца заканамернасцям яго зносін з чытачом у ходзе бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання.

Асэнсаванне ўказанага феномена немагчыма без выкарыстання дасягненняў псіхалогіі і педагогікі ў галіне тэорыі і практыкі зносін, што з'яўляецца метадалагічнай асновай іх вывучэння. Не менш важна ўлічваць напрацоўкі, якія існуюць у бібліятэказнаўстве і маюць непасрэднае дачыненне да праблемы бібліятэчных зносін.

Зносіны – адна з асноў прафесійна-педагагічнай дзейнасці бібліятэкара ў абслугоўванні. У сацыяльнай псіхалогіі пад зносінамі разумеюць уласцівы ўсім людзям, ажыццяўляемы ў працэсе і з нагоды сумеснай дзейнасці спосаб узаемных стасункаў, спосаб існавання чалавека ў яго ўзаемасувязі з іншымі людзьмі.

Такім чынам, зносіны разглядаюцца намі як інструмент, сродак рэалізацыі прафесійнага і асобаснага патэнцыялу бібліятэкара аддзела абслугоўвання. Паколькі заканамернасці зносін маюць універсальны характар, веды, атрыманыя ў ходзе вывучэння практычнай дзейнасці, могуць быць выкарыстаны не толькі ў бібліятэчным абслугоўванні, але і іншых сферах, якія патрабуюць стасункаў паміж людзьмі.

Найбольш яскрава адметныя рысы зносін праяўляюцца ў працэсе абмену інфармацыяй, таму на ўзроўні звычайнай свя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

домасці яны часцей за ўсё разумеюцца даволі проста: адзін чалавек нешта гаворыць, а другі – яго слухае, разумее, потым адказвае, і наадварот. Інфармацыя, яе пошук і абмеркаванне часцей за ўсё з'яўляюцца прадметам зносін ў бібліятэцы. Таму вельмі зручна было б разглядаць бібліятэчныя зносіны як абмен інфармацыяй паміж бібліятэкарам і карыстальнікам у працэсе абслугоўвання. У такім выпадку чытач выступае ў якасці заказчыка і спажыўца інфармацыі, а бібліятэкар – выканаўцы функцыі абслугоўвання ў рэжыме «запыт – адказ».

На самай справе ўсё больш складана. Працэс і вынікі абслугоўвання звычайна ўзаемазвязаны. На іх актыўна ўплываюць разнастайныя аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары, якія маюць непасрэднае дачыненне да структуры зносін, іх спецыфікі і псіхалагічнай прыроды. Чым больш індывідуалізаваны працэс абслугоўвання, тым большую ролю ў ім адыгрываюць псіхалагічныя аспекты, тым больш ён падпарадкоўваецца заканамернасцям і правілам зносін. Таму бібліятэкар аддзела абслугоўвання павінен ведаць як мага больш аб зносінах, іх структуры і асаблівасцях.

Працэс зносін толькі вельмі ўмоўна і прыблізна можна было б апісаць як паслядоўнасць дзеянняў яго ўдзельнікаў, што ажыццяўляюцца па схеме «пытанне – адказ». У ходзе аналізу кожнага асобнага дзеяння выяўляецца непарыўная сувязь з дзеяннямі партнёра па зносінах. Вядомы псіхолаг Я. Л. Каламінскі характарызуе зносіны як «...інфармацыйнае і прадметнае ўзаемадзеянне, у працэсе якога рэалізуюцца, праяўляюцца і фарміруюцца ўзаемаадносіны» [11].

У сувязі з тым, што зносіны з'яўляюцца формай сумеснай дзейнасці бібліятэкара з карыстальнікам у працэсе абслугоўвання, трэба іх разглядаць не як уздзеянне аднаго на другога, а менавіта як узаемадзеянне раўнапраўных партнёраў. У сацыяльнай псіхалогіі вызначаюць тры базісныя аспекты зносін: перцэптыўны, камунікатыўны і інтэрактыўны.

*Перцэптыўны бок* зносін (зносіны як успрыманне) уключае працэс фарміравання вобраза іншага чалавека. Характэрнай рысай з'яўляецца ярка выражаная эмацыйна-ацэначная афарбоўка вобраза партнёра па зносінах, залежнасць уяўленняў аб гэтым чалавеку ад асобасных якасцей суразмоўцы і ад яго папярэдняга вопыту. Чалавек адлюстроўваецца ў свядомасці іншага чалавека толькі праз своеасаблівы ўнутраны свет партнё-

ра па зносінах. Удзельнікі зносін увесь час арыентуюцца на ўзнікаючыя вобразы, і ад таго, наколькі дакладна вобразы адлюстроўваюць рэчаіснасць, залежыць эфектыўнасць зносін.

Асабліва вялікую ролю ў працэсе ўспрымання адыгрывае першае ўражанне, калі на падставе першых, найбольш відавочных адчуванняў дабудоўваецца поўны вобраз асобы. Бібліятэкару трэба ўлічваць, што непазбежныя памылкі ўспрымання на першапачатковым этапе зносін потым нялёгка выправіць. Таму неабходна звяртаць увагу на тыя фактары, што спрыяюць узнікненню станоўчага ўражання ў чытача.

*Камунікатыўны бок* зносін (зносіны як абмен інфармацыяй) найбольш істотна даследаваны навукай. Асаблівасцю інфармацыйных працэсаў, якія адбываюцца паміж людзьмі, з'яўляецца тое, што інфармацыя не толькі перадаецца і прымаецца, але і фарміруецца, удакладняецца, узбагачаецца. У выніку камунікатыўнага працэсу ўяўленні абодвух суразмоўнікаў аб прадмеце зносін набываюць новыя рысы, узнікае агульнае сэнсавае поле, і, у рэшце рэшт, людзі з рознымі поглядамі здольныя прыйсці да агульнага меркавання.

*Інтэрактыўны бок* зносін – гэта зносіны як узаемадзеянне. У сучаснай псіхалагічнай навуцы ўзаемадзеянне вызначаецца як спосаб аб'яднання індывідуальных намаганняў у пэўных формах агульнай дзейнасці. Узаемадзеянне ў зносінах магчыма толькі пры наяўнасці ўзаемазалежнасці. Гэта адбываецца ў тым выпадку, калі паводзіны аднаго партнёра спрыяюць дасягненню мэты другога. Тады ёсць падстава для супрацоўніцтва.

Адзначаныя бакі зносін цесна звязаны паміж сабой і не існуюць паасобку. Характар успрымання партнёра, напрыклад, уздзейнічае на разуменне інфармацыі, якую ён паведамляе, і на ўзаемадзеянне з ім. У сваю чаргу, у выніку ўзаемадзеяння і ўзаемнага інфармавання ўдакладняюцца ўяўленні партнёраў адно аб адным, што спрыяе больш дакладнаму ўспрыманню і разуменню.

Зносіны – своеасаблівы інструмент, сродак, што дазваляе бібліятэкару ажыццяўляць свае прафесійныя функцыі, псіхалагічны механізм, з дапамогай якога ўзаемадзейнічаюць, супрацоўнічаюць бібліятэкар з карыстальнікам. Сэнсавай асновай зносін у бібліятэцы, іх вядучым прадметам з'яўляецца чытанне ва ўсёй яго складанасці і шматбаковасці. Таму ўсё, што тычыц-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ца чытання, павінна цікавіць бібліятэкара як пасрэдніка паміж кнігай і чытачом.

Веданне псіхалагічных аспектаў чытання не менш важна, чым грунтоўнае ўсведамленне структуры зносін. Уяўленне аб структуры зносін садзейнічае фарміраванню камунікатыўнай кампетэнтнасці, якая з'яўляецца неад'емнай часткай прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкара. Спасціжэнне ж прыроды чытання як псіхалагічнага працэсу дазваляе бібліятэкару мэтанакіравана і змястоўна ўзаемадзейнічаць з карыстальнікам.

В. А. Барадзіна дае наступнае азначэнне чытання: «Чытанне – гэта від пазнавальна-камунікатыўнай дзейнасці, сутнасць якой у актыўным мэтанакіраваным пераўтварэнні і падпарадкаванні зместу тэксту разнастайным патрэбам сацыяльнага суб'екта» [1]. Тое, што чытанне тут аднесена да камунікатыўна-пазнавальнай дзейнасці, дазваляе разглядаць яго як асобны выпадак апасродкаваных зносін.

Тэкст заўсёды адлюстроўвае суб'ектыўны свет аўтара, яго думкі і пачуцці. Чытач, які застаецца сам-на-сам з кнігай, вядзе маўклівы дыялог з яе стваральнікам, у думках пагаджаецца альбо спрачаецца з ім.

Аналізуючы сучасныя канцэпцыі псіхалагічнай структуры чытацкай дзейнасці, В. А. Барадзіна прапануе сваю мадэль чытання, якая складаецца з трох фаз:

– матывацыі і падахвочвання (патрэба ў чытанні, матывы выбару тэксту, мэты чытання);

– працэсуальна-выніковай (успрыманне, асэнсаванне, запамінанне, увага – умовы самога працэсу чытання);

– вынікова-ацэначнай (параметры і крытэрыі ацэнкі тэксту, вынікі чытання і высновы з прачытанага) [1].

Калі разглядаць чытанне як камунікатыўны працэс, можна дадзеныя фазы назваць: перадкамунікатыўная, камунікатыўная і посткамунікатыўная, – усе яны з'яўляюцца ўзаемапранікальнымі, шчыльна ўзаемазвязанымі і ўзаемаабумоўленымі.

Так, напрыклад, калі патрэбнасць у чытанні, матываваная пэўным чынам, не рэалізуецца, няма і чытацкай дзейнасці. Патрэбнасць існуе толькі на ўзроўні чытацкай свядомасці, інакш кажучы, яна ўсведамляецца, але не задавальняецца.

На ўспрыманне і асэнсаванне тэксту актыўна ўплываюць матывы і мэты чытання. Вынікі і ацэнкі, высновы з прачытанага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у сваю чаргу, залежаць ад якасці ўспрымання і ўзроўню матывацыі.

Зносіны ўплываюць на чытанне ў кожнай з адзначаных фаз. Але найбольш істотна і выражана гэты ўплыў адбываецца ў перадкамунікатыўнай і посткамунікатыўнай фазах. Па даных сацыялагічных даследаванняў, на выбар кніг найбольш эфектыўна ўздзейнічаюць рэкамендацыі і меркаванні асоб з бліжэйшага акружэння чытачоў: родных, знаёмых, сяброў, калег па рабоце. Не апошнюю ролю тут адыгрываюць і зносіны з бібліятэкарам, калі ён з'яўляецца аўтарытэтам у галіне чытання.

Сродкі масавай камунікацыі, сістэма прапаганды кнігі ў бібліятэцы даюць неабходную арыентацыю ў свеце друкаваных твораў, а ў сферы зносін атрыманая інфармацыя ўдакладняецца, прыстасоўваецца да індывідуальных патрэбнасцей асобы, актыўна ўплывае на матывацыю і вызначэнне мэт чытання. Звесткі, якія атрымлівае чытач аб творах да непасрэднага сутыкнення з імі, спрыяюць, альбо перашкаджаюць, паўнацэннаму ўспрыманню зместу тэкстаў.

Вызначэнне суб'ектыўнай каштоўнасці тэксту, асэнсаванне яго якасцей і значнасці таксама адбываюцца пад уплывам зносін. Прачытаўшы нешта цікавае, чалавек імкнецца абмеркаваць гэта з іншымі чытачамі, у выніку чаго чытацкія ацэнкі твору могуць грунтоўна змяніцца, альбо наадварот – умацавацца, набыць больш трывалую форму.

Бібліятэка па самой сваёй прыродзе павінна забяспечваць чытанне ва ўсёй яго складанасці і шматбаковасці. Усе формы масавай і індывідуальнай работы з чытачамі прызначаны дапамагаць наведвальнікам бібліятэкі ў выбары найбольш каштоўных і патрэбных выданняў (першая фаза чытання). Дзякуючы сістэме чытальных залаў бібліятэка імкнецца стварыць спрыяльныя ўмовы для непасрэднага ўспрымання і разумення тэкстаў (другая фаза чытання). Арганізацыя чытацкіх зносін, накіраваных на абмеркаванне прачытанага: чытацкіх клубаў і аб'яднанняў па інтарэсах, чытацкіх канферэнцый і дыскусій, – павінна спрыяць больш грунтоўнаму і змястоўнаму асэнсаванню вынікаў чытання (трэцяя фаза чытання). Як бачым, усе адзначаныя фазы чытання знаходзяцца пад большым ці меншым уплывам бібліятэкі. Уздзеянне бібліятэчных зносін значна павялічвае дадзены ўплыў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пад бібліятэчнымі зносінамі трэба разумець сістэму камунікатыўнага ўзаемадзеяння ў працэсе выбару кнігі, успрымання і асэнсавання інфармацыі ва ўмовах бібліятэкі. Узаемадзеянне можа адбывацца паміж бібліятэкарам і чытачом, бібліятэкарам і групай чытачоў, паміж чытачамі бібліятэкі і паміж бібліятэкарамі.

У лепшых сваіх варыянтах яно характарызуецца педагагічнай накіраванасцю. Але, у адрозненні ад зносін настаўніка з вучнямі, бібліятэчныя зносіны менш рэгламентаваныя, часцей за ўсё носяць фрагментарны характар, узнікаюць і завяршаюцца, як правіла, па жаданні чытача. Асноўныя дыдактычныя прынцыпы: нагляднасці, даступнасці, паслядоўнасці, сістэматычнасці, актыўнасці, трываласці засваення ведаў і г. д. – могуць быць выкарыстаны бібліятэкарам у вельмі абмежаваным маштабе і пры наяўнасці спецыяльна арганізаваных умоў. Прымус, як сродак педагагічнага ўздзеяння, абсалютна не прыгодны ва ўмовах бібліятэкі.

Бібліятэчныя зносіны – гэта інфармацыйныя зносіны, але, у адрозненні ад зносін сродкаў масавай інфармацыі з чытачамі, гледачамі, слухачамі, яны арыентаваны на канкрэтную асобу, ім уласціва актыўная зваротная сувязь, таму што карыстальнік бібліятэкі ўступае ў непасрэдны кантакт з бібліятэкарам-інфарматарам, а не з’яўляецца часткай шматлікай і аморфнай аўдыторыі.

Зносіны ў бібліятэцы могуць быць як непасрэднымі, так і апасродкаванымі. Непасрэдныя зносіны ствараюць сістэму ўзаемаадносін паміж чытачом і бібліятэкарам і маюць характар прамых кантактаў паміж пэўнымі асобамі.

Апасродкаваныя зносіны харакратызуюцца адсутнасцю прамога кантакту паміж тым, хто стварае інфармацыю, і тым, хто яе спажывае. Прыкладамі такіх зносін з’яўляюцца: расстаноўка фонду бібліятэкі, каталогі, картатэкі, бібліяграфічныя паказальнікі, кніжныя выставы. Ва ўмовах сучасных інфармацыйных тэхналогій гэта таксама – сайт бібліятэкі, базы даных і іншыя інфармацыйныя прадукты. Усё гэта вынікі дзейнасці бібліятэкара-бібліёграфа, сродкі камунікацыі паміж ім і чытачом, з дапамогай якіх перадаецца неабходная і карысная інфармацыя. Спалучэнне дадзеных сродкаў стварае спецыфічнае бібліятэчнае асяроддзе, якое альбо ўзмацняе эфект ад непасрэд-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных зносін, альбо, наадварот, перашкаджае стварэнню аптымальных узаемаадносін паміж бібліятэкарам і чытачом.

Па колькасці і складу ўдзельнікаў зносіны падзяляюцца на індывідуальныя, групавыя і масавыя. Па характары ўзаемаадносін паміж партнёрамі яны могуць быць паўнацэннымі, змястоўнымі, разгорнутымі ці згорнутымі, фрагментарнымі, фармальнымі. У першым выпадку партнёры актыўна ўспрымаюць адно аднаго, імкнуцца да ўзаемнага паразумення. Такія зносіны духоўна ўзбагачаюць кожнага з удзельнікаў, выклікаюць пачуццё задавальнення.

У выпадку, калі зносіны згортваюцца, збядняюцца, адбываецца кароткі абмен некалькімі стэрэатыпнымі фразамі альбо дзеяннямі, што глыбока не адбіваецца на свядомасці і паводзінах партнёраў. Прыкладам паўнацэнных, змястоўных зносін ва ўмовах бібліятэкі можна лічыць разнастайныя гутаркі бібліятэкара з чытачом, рэкамендацыі кніг, кансультацыі, удакладненні чытацкіх запытаў, высвятленне чытацкіх інтарэсаў, абмеркаванне ўражанняў аб прачытаным і г. д. Прыкладаў згорнутых зносін таксама дастаткова: механічная рэгістрацыя прынятых і выдадзеных кніг, кароткія, аднаскладовыя адказы на запыты чытачоў, дзяжурная фраза «звярніцеся да каталога» замест падрабязнага тлумачэння і г. д.

Зносіны могуць грунтавацца на прынцыпах суб’ект-аб’ектнай і суб’ект-суб’ектнай схем. У выпадках, калі зносіны маюць суб’ект-аб’ектны характар, мы можам казаць аб тым, што адбываецца маніпуліраванне аднаго партнёра другім.

У адпаведнасці са зместам і характарам узаемадзеяння зносіны можна падзяліць на рытуальныя, маніпулятыўныя і гуманістычныя [2].

*Рытуальныя зносіны* – гэта зносіны ў тыповых сітуацыях, калі партнёры выступаюць як бы неабходнымі атрыбутамі для выканання пэўнага рытуалу, дзе кожны ўдзельнік з’яўляецца своеасаблівай «маскай» з наперад зададзенымі ўласцівасцямі. Рытуалы патрабуюць ад удзельнікаў толькі аднаго – ведання правіл гульні. У падобным стылі ажыццяўляюцца многія кантакты ў бібліятэчным абслугоўванні: запіс чытача ў бібліятэку, размова з даўжнікам, гутарка-кансультацыя наконт каталога і г. д. У рытуальных зносінах неабходна прытрымлівацца пэўнай ролі: сацыяльнай, прафесійнай, міжасобаснай. Тут важна, з аднаго боку, правільна распазнаць сітуацыю зносін і ўявіць, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трэба ў ёй сябе паводзіць, – з другога. У шмат якіх выпадках і бібліятэкар, і карыстальнік з задавальненнем бяруць удзел у рытуальных зносінах, свядома, альбо аўтаматычна, выконваючы патрабаванні сітуацыі. Але рытуальныя зносіны займаюць у абслугоўванні далёка не асноўнае месца. Яны бываюць часам толькі перадумовай да іншых зносін – маніпулятыўных.

*Маніпулятыўныя зносіны* – гэта зносіны, пры якіх да партнёра ставяцца як да сродку дасягнення пэўнай мэты. Нават калі ў кожнага з партнёраў ёсць свае ўласныя мэты, перавага будзе за тым, хто з'яўляецца лепшым маніпулятарам, лепш ведае партнёра, лепш разумее яго мэты, лепш валодае тэхнікай зносін. Не варта лічыць, што маніпуляцыя – цалкам негатыўная з'ява. Вялікая колькасць прафесійных задач, у тым ліку і ў галіне абслугоўвання карыстальнікаў, прадугледжвае менавіта маніпулятыўныя зносіны. Скажам, як без маніпуляцыі пераканаць чытача вярнуць у бібліятэку кнігу, да якой ён даўно «прывык», як прывіць юным чытачам асновы інфармацыйнай культуры і культуры паводзін у бібліятэцы? Па сутнасці, любое навучанне, перакананне, кіраванне ўтрымліваюць у сабе маніпулятыўныя зносіны. Менавіта таму эфектыўнасць гэтых працэсаў шмат у чым залежыць ад ступені валодання законамі і тэхнікай маніпулятыўных зносін.

Маніпулятыўныя зносіны – надзвычай распаўсюджаны від узаемадзеяння, які сустракаецца ў асноўным там, дзе існуе сумесная дзейнасць. Важна памятаць, што адносіны чалавека да маніпулятыўнага ўплыву на яго звычайна адмоўныя. Акрамя таго, існуе зваротны ўплыў маніпулятыўных зносін на асобу, якая прымяняе іх паспяхова і пастаянна. Яна з цягам часу пачынае лічыць маніпулятыўныя зносіны натуральнымі, правільнымі і ўжываць іх нават там, дзе яны зусім не абавязковыя, не патрэбныя, што прыводзіць да канфліктаў і непаразуменняў.

*Гуманістычныя зносіны* – гэта ў найбольшай ступені асобасныя зносіны, якія дазваляюць задаволіць такую чалавечую патрэбнасць, як патрэбнасць у разуменні, спачуванні, суперажыванні. Ні рытуальныя, ні маніпулятыўныя зносіны не дазваляюць цалкам задаволіць гэту жыццёва важную патрэбнасць.

Мэты гуманістычных зносін жорстка не запланаваны і не замацаваны. Іх важнай асаблівасцю з'яўляецца тое, што чакаемым вынікам узаемадзеяння становіцца не падтрыманне сацыяльных сувязей, як у рытуальных зносінах, не змяненне пункту

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гледжання і паводзін партнёра, як у маніпулятыўных, а супольнае змяненне ўяўленняў абодвух партнёраў, знаходжанне шляхоў паводзін, выгадных кожнаму з іх.

Сітуацыі гуманістычных зносін усім добра знаёмы – гэта інтымныя, спавядальныя, псіхатэрапеўтычныя зносіны. Яны звязаны з накіраванасцю, настроем і мэтамі партнёраў. Але ёсць сітуацыі, калі такія зносіны недарэчы. Напрыклад, чытачоў раздражняе, калі бібліятэкар замест таго, каб выконваць свае абавязкі па абслугоўванні, захоплена размаўляе з адным з карыстальнікаў – сваім знаёмым, не звяртаючы ўвагі на чаргу.

Таксама бібліятэкару не заўсёды падабаецца, калі чытач замест таго, каб дакладна сфармуляваць запыт, імкнецца «заваяваць» сімпатыю бібліятэчнага работніка і з гэтай мэтай выказвае яму асобы давер – дзеліцца якой-небудзь сваёй праблемай, не зважаючы на тое, што паслуг чакаюць і іншыя карыстальнікі. Інакш кажучы, гуманістычныя зносіны ў абслугоўванні не павінны перашкаджаць бібліятэкару належным чынам выконваць свае абавязкі, а карыстальніку – своечасова і ў поўным аб'ёме задаволіць інфармацыйныя патрэбнасці.

Гуманістычныя зносіны звычайна абумоўлены не столькі звонку (мэтамі, умовамі, сітуацыяй, стэрэатыпамі), колькі знутры (індывідуальнасцю, настроем, адносінамі да партнёра). Гэта не азначае, што гуманістычныя зносіны не прадугледжваюць сацыяльнай дэтэрмінацыі. Відавочна, што чалавек, у якія б зносіны ён ні ўступаў, застаецца сацыяльнай істотай. Аднак у гэтых зносінах больш, чым у іншых, праяўляецца залежнасць ад індывідуальнасці. У гуманістычных зносінах партнёр успрымаецца цэласна, без дзялення на патрэбныя і непатрэбныя функцыі, на важныя і не важныя ў дадзены момант якасці.

Напрыклад, мы можам падчас даверлівай размовы з чытачом, якога бачым упершыню, добра яго зразумець, адчуць яго праблемы, выказаць спачуванне, даць і атрымаць параду. Пры гэтым мы можам дрэнна разумець, альбо зусім не разумець, свайго калегу альбо кіраўніка, з якімі працуем побач шмат гадоў запар, але ніколі не ўступалі ў даверлівы кантакт.

Асноўным механізмам уздзеяння ў гуманістычных зносінах з'яўляецца ўнушэнне, сугестыя, – найбольш эфектыўны з усіх існуючых механізмаў. Важна памятаць, што гэтае ўнушэнне ўзаемнае, калі абодва партнёры праяўляюць давер адно да аднаго, а таму вынікам з'яўляецца не змяненне ў пункце гле-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

джання аднаго з партнёраў, а ўзаемнае супольнае змяненне ўяўленняў абодвух партнёраў.

Як бачым, у бібліятэчным абслугоўванні ўжываюцца ў розных сітуацыях усе тры віды зносін.

Працэс бібліятэчнага абслугоўвання прадугледжвае інтэнсіўныя і амаль бесперапынныя зносіны бібліятэкара з карыстальнікамі. Гэта падабаецца таму, хто стаў бібліятэкарам па прызванні; не падабаецца таму, хто прыйшоў у прафесію з адной толькі любові да кнігі і чытання; раздражняе і траўміруе таго, хто стаў бібліятэкарам выпадкова, мяркуючы, што гэта спакойная работа, якая не патрабуе вялікіх інтэлектуальных і фізічных намаганняў.

У любым выпадку інтэнсіўныя зносіны стамляюць, асабліва псіхалагічна, а галоўнае – патрабуюць спецыяльных навыкаў, уменняў, ведаў, пэўнага вопыту, бадай, не меншай тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі, чым пры стварэнні і вядзенні каталогаў, картатэк, бібліяграфічных дапаможнікаў, фарміраванні фондаў і г. д.

У наш час культура зносін прадугледжвае перш за ўсё валоданне ведамі аб асноўных заканамернасцях працэсу зносін, уменне аналізаваць ход і вынікі зносін з пункту гледжання іх маральнага зместу і інфармацыйнай эфектыўнасці, разумець механізмы ўзаемадзеяння паміж людзьмі. Важным застаецца таксама веданне канкрэтных нормаў і правілаў, што рэгулююць зносіны. Практычнае валоданне навыкамі зносін патрабуе фарміравання пэўных якасцей асобы – камунікатыўнай кампетэнтнасці.

Але калі навучанне студэнтаў асновам бібліятэчнай тэхналогіі мае даўнюю традыцыю і добра распрацаваную методыку, калі кола агульнанавуковых дысцыплін акрэслена больш-менш рэл'ефна, бібліятэчныя зносіны як прадмет бібліятэказнаўчых даследаванняў і вучэбная дысцыпліна зараз толькі набываюць тое значэнне, якое ім належыць мець.

У засваенні тэорыі і практыкі зносін ёсць, на наш погляд, адна даволі спецыфічная асаблівасць. Чалавек не можа засвоіць зносіны толькі як вучэбны прадмет, як нейкую суму ведаў, таму што зносінам можна навучыцца толькі ў працэсе зносін. Нават самае лепшае засваенне тэарэтычных ведаў па плаванні яшчэ не сведчыць аб тым, што чалавек умее плаваць. Так і ўменне эфектыўна ажыццяўляць зносіны фарміруецца толькі ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсе непасрэдных зносін, разнастайнай камунікатыўнай дзейнасці.

Індывідуальны стыль зносін ствараецца на працягу ўсяго жыцця асобы. Ён здольны змяняцца ў залежнасці ад абставін, умоў жыццядзейнасці і характару сістэмы навучання. Вось чаму ўвядзенне спецыяльных курсаў і трэнінгаў можа дапамагчы станаўленню спецыяліста, які не толькі валодае камунікатыўнымі кампетэнцыямі, але і мае свой уласны стыль узаемадзеяння з карыстальнікам, цалкам адпавядаючы яго індывідуальным якасцям. Неабходна ўзброіць будучага бібліятэкара адпаведнымі ведамі і ўменнямі. Астатняе давяршыць праца над сабой, творчасць у зносінах.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Бородина, В. А.* Читательская деятельность: теоретический аспект психологии читателей / В. А. Бородина // Психология чтения и проблемы типологии читателей. – Л. : ЛГИК, 1984. – С. 6–15.

2. *Бороздина, Г. В.* Психология делового общения : учеб. пособие / Г. В. Бороздина. – М. : Инфра-М, 2000. – 224 с.

3. *Гайворовский, А. А.* Психотехника и бибдело / А. А. Гайворовский. – Минск, 1928. – 33 с.

4. *Езова, С. А.* Библиотечное общение / С. А. Езова. – Улан-Удэ : Бурят. кн. изд-во, 1990. – 86 с.

5. *Езова, С. А.* Грани библиотечного общения : учеб.-метод. пособие / С. А. Езова. – М. : Профиздат, 2002. – 160 с.

6. *Езова, С. А.* Феномен общения как объект исследования библиотековедением / С. А. Езова // Российское библиотековедение: XX век. Направления развития, проблемы и итоги : опыт монографического исследования. – М. : Фаир-Пресс : Пашков дом, 2003. – С. 178–193.

7. *Езова, С. А.* Библиотечное общение как феномен исследования : монография / С. А. Езова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2007. – 160 с. – (Библиотекарь и время. XXI век. Вып. 78).

8. *Езова, С. А.* Культура общения библиотекарей : учеб.-метод. пособие / С. А. Езова. – М. : Либерея, 2004. – С. 3–28.

9. *Езова, С. А.* Библиотекарь как слушатель / С. А. Езова // Научные и технические библиотекки. – 2001. – № 3. – С. 131–137.

10. *Клименкова, Н. В.* Проблема общения в руководстве чтением (на примере Минской ЦБС) / Н. В. Клименкова // Советское библиотековедение. – 1983. – № 2. – С. 36–43.

11. *Коломинский, Я. Л.* Психология взаимоотношений в малых группах: общие и возрастные особенности : учеб. пособие / Я. Л. Коломинский. – Минск : Изд-во БГУ, 1976. – С. 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. *Смолина, Е. В.* Теоретико-методические основы изучения общения в библиотеке : (аналитический обзор) / Е. В. Смолина. – Л. : БАН, 1989. – 58 с. – Препринт / Б-ка АН СССР. № 9).

## 1.4. Падыходы да вызначэння паняцця «культура чытання» як асноўнай катэгорыі бібліятэчнай педагогікі

Значэнне чытання як сродку адукацыі, выхавання і развіцця чалавека агульнавядома. Элементарнымі навыкамі чытання, безумоўна, валодае кожны пісьменны чалавек, аднак гэтыя навыкі з’яўляюцца толькі асновай для ажыццяўлення складанага творчага працэсу, які мы разумеем пад чытаннем. Каб спасцігнуць друкаваны твор, правільна яго выкарыстаць і атрымаць з гэтага максімальную карысць, недастаткова адных толькі тэхнічных навыкаў чытання, неабходна валодаць культурай чытання. Яна фарміруецца на працягу ўсяго жыцця чалавека ў адпаведнасці з сацыяльна-псіхалагічнай роляй чытання на розных этапах сацыялізацыі асобы: дзяцінства, юнацтва, сталасці.

Асаблівае значэнне чытацкая культура набывае сёння, калі сітуацыя ў галіне чытання даволі напружаная: час, які адводзіцца сучасным чалавекам на чытанне, паступова і няўхільна скарачаецца, межы чытання звужаюцца, а літаратурныя густы робяцца даволі неперабoрлівымі.

Станаўленне і развіццё паняцця «культура чытання» адбывалася ў цеснай узаемасувязі са зменамі ў сферы чытацкай дзейнасці чалавека. Умовы для фарміравання культуры чытання былі створаны ў перыяд друкаванай камунікацыі (так званы перыяд Гутэнберга), калі фарміравалася сістэма друкаваных выданняў – пачалі з’яўляцца газеты, часопісы і г. д. У гэты час культурай чытання лічылася здольнасць да авалодання зместам тэксту, так званыя ўменні і навыкі, якія звязаны з працэсамі раскадзіравання, засваення, інтэрпрэтацыі і спасціжэння сэнсу, з выяўленнем найбольш каштоўнай і неабходнай інфармацыі. У эпоху друку культура чытання дасягнула свайго росквіту, паколькі ў гэты час адбывалася павышэнне якасці тэхналогій паліграфічнай прамысловасці, удасканаленне мастацкага афармлення друкаваных выданняў, развіццё іх даведачна-інфармацыйнага апарату, а таксама павышэнне ўзроўню культуры эстэтычных адносін да кнігі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Далейшае развіццё грамадства, з'яўленне радыё-, тэле-, відэакамунікацыйных сродкаў трансляцыі аказала значны ўплыў на стан і развіццё культуры чытання. Удумлівае чытанне пачало замяняцца пасіўным успрыманнем інфармацыі, што садзейнічала зніжэнню актыўнай аналітычнай работы мыслення, падзенню чытацкай актыўнасці, памяншэнню колькасці людзей, якія выбіраюць чытанне для правядзення дасугу.

З развіццём электронных тэхналогій істотна змяніліся патрабаванні да культуры чытання. Павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці інфармацыі, абумоўленае высокімі тэмпамі развіцця электронных тэхналогій, выклікала патрэбу ў іх апрацоўцы, засваенні і аналізе. Актуалізавалася неабходнасць у павышэнні хуткасці ўспрымання і якасці разумення, пачалі з'яўляцца методыкі навучання хуткаму чытанню. Больш таго, хуткачытанне становіцца адной з якасных характарыстык і прыкмет культуры чытання сучаснага чалавека, нягледзячы на тое, што хуткае чытанне развівае толькі «тэхналагічнае» ўспрыманне (здольнасць да распрадмечвання значэння слоў і выразаў), не пакідаючы часу для аналітычнага асэнсавання і ўспрымання інфармацыі.

«Культура чытання» як шматмернае паняцце ў розныя часы трактавалася па-рознаму. Разгледзім некаторыя падыходы да вызначэння дадзенага тэрміна.

У савецкія часы, калі кніга з'яўлялася адным з найважнейшых сродкаў камуністычнага выхавання, культура чытання лічылася ўмовай прадуктыўнай і самастойнай працы з творамі друку, а таксама мэтанакіраванага самаадукацыйнага чытання.

У навуковых выданнях таго часу культура чытання найчасцей разглядалася як складаная з'ява, якая ўключае чытацкія веды, уменні і навыкі – ад элементарнага карыстання кніжнай закладкай да творчага чытання, калі чытач становіцца «сааўтарам» пісьменніка, пашыраюцца межы яго чытацкай дзейнасці [17, с. 4–6].

Некаторыя навукоўцы адносна паняцця «культура чытання» засяроджвалі ўвагу на асобных яго складніках. Так, напрыклад, А. П. Прымакоўскі вылучаў важнасць правільна разумець тэкст, умела выкарыстоўваючы для гэтага неабходную даведачную літаратуру (слоўнікі, энцыклапедыі, паказальнікі і г. д.). У яго разуменні культура чытання – гэта правільная арганізацыя чытання з улікам дасягненняў тэхнікі і гігіены разумовай працы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прымяненне розных спосабаў работы з кнігай у залежнасці ад яе зместу, ад мэты чытання і часу, які ёсць у чытача [14].

Аўтары вучэбнага дапаможніка «Библиотековедение» (1972), характарызуючы культуру чытання, на першы план выносяць сур’ёзныя адносіны да чытання, калі чытач выкарыстоўвае кнігу не для простага баўлення часу, а для самаадукацыі, развіцця, для арганізацыі і ўдасканалення сваёй прафесійнай дзейнасці. Аўтарамі былі акрэслены тры характэрныя рысы культуры чытання: мэтанакіраванасць, рознабаковасць і планавасць. Чытач з высокай культурай чытання выбірае кнігі ў адпаведнасці з мэтай чытання, не абмяжоўваецца мастацкай літаратурай, чытае папулярныя навуковыя выданні для пашырэння свайго кругагляду, сочыць за спецыяльнай літаратурай для павышэння сваёй прафесійнай кваліфікацыі. Пры гэтым чытанне прыносіць найлепшы плён, калі ажыццяўляецца ў пэўнай паслядоўнасці і сістэме, па плану [2].

У метадычных рэкамендацыях па выхаванні культуры чытання 1970-х гг. валоданне культурай чытання прадугледжвала разуменне ролі кнігі ў жыцці грамадства, уменне карыстацца ёю, выбіраць літаратуру, глыбока ўнікаць у задумку пісьменніка, тонка ацэньваць мастацкі твор, уменне працаваць з навуковай кнігай, а таксама карыстацца бібліятэкай [4].

Паступова патрабаванні да культуры чытання пачалі падзяляцца на тры блокі адпаведна этапам чытацкай дзейнасці: выбар літаратуры для чытання, сам працэс чытання, а таксама замацаванне і выкарыстанне атрыманай інфармацыі. У якасці навуковага азначэння паняцця «культура чытання» даследчыкамі стала выкарыстоўвацца наступнае: культура чытання – гэта комплекс навыкаў работы з кнігай, які ўключае ўсвядомлены выбар пэўнай кнігі і ўменне арыентавацца ў ёй, уменне прымяняць на практыцы атрыманую інфармацыю, а таксама веданне прыёмаў, якія забяспечваюць замацаванне і выкарыстанне прачытанага [5].

С. А. Трубнікаў, разглядаючы праблему тыпалогіі чытачоў, упершыню выдзеліў у структуры культуры чытання тры кампаненты: культуру выбару літаратуры, культуру ўспрымання інфармацыі і культуру засваення і выкарыстання інфармацыі [20].

На думку Т. С. Макаранкі, чытацкая культура як частка агульначалавечай культуры праяўляецца ў здольнасці чытача арыентавацца ў інфармацыйным патоку той ці іншай галіны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведаў, у дакладным усведамленні мэты чытання, успрыманні, разуменні, засваенні і практычным выкарыстанні зместу твора друку, а таксама ва ўзроўні тэхнікі чытання, дасягнутым пры ўмове прымянення найбольш мэтазгодных прыёмаў і правіл чытання [11].

У бібліятэказнаўстве 1990-х гг. адной з галоўных праблем было вызначэнне межаў паняцця «культура чытання». Напрыклад, Ю. М. Тугаў вызначальнымі складнікамі называў: накіраванасць чытання, уменні і навыкі інфармацыйна-пошукавай дзейнасці, механізм успрымання кнігі і ўключэнне атрыманых ведаў у сістэму духоўных каштоўнасцей асобы [21]. Адначасова асобныя даследчыкі разглядалі культуру чытання ў «агульным выглядзе» як меру і характар засваення матэрыялу, ступень засваення рэчаіснасці на аснове інфармацыі, атрыманай у працэсе чытання. Інакш кажучы, культура чытання імі разумелася як сукупнасць уменняў і навыкаў выдзялення і рашэння пэўных праблем у інфармацыйных плынях [15].

Такім чынам, аналіз бібліятэказнаўчай літаратуры 1960–90-х гг. дазваляе меркаваць, што паняцце «культура чытання» трактавалася як складнік культуры асобы і ўяўляла сабой комплекс навыкаў у рабоце з кнігай, які ўключае: усвядомлены выбар (матывацыю) чытання, яго сістэматычнасць і паслядоўнасць, арыентацыю ў першасных і другасных крыніцах інфармацыі, выкарыстанне рацыянальных прыёмаў і метадаў работы з кнігай, уменне выкарыстоўваць і прымяняць на практыцы атрыманую з літаратуры інфармацыю.

Трэба сказаць, што амаль усе гэтыя трактоўкі паняцця грунтаваліся на азначэнні, пададзеным у слоўніку бібліятэчных тэрмінаў 1976 г. [18].

Цікава адзначыць, што тэрмін «культура чытання» ў сваім поўным значэнні існуе толькі ў беларускай і рускай мовах. Напрыклад, у англійскай мове ёсць тэрміны reading habits (навыкі чытання), reading knowledge, reading skills (уменне чытаць), reading taste (густ да чытання, чытацкія густы), аднак яны толькі набліжаны да сутнасці аналізуемага паняцця.

Што да сучаснага азначэння «культуры чытаняння», то ў «Библиотечной энциклопедии» (2007) пададзена наступнае: культура чытання – гэта сукупнасць ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для аптымальнай арганізацыі працэсу чытання, дасягнення яго грамадска значнай накіраванасці, адна са складні-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каў інфармацыйнай культуры асобы. Пад культурай чытання мастацкіх твораў разумеецца развітасць псіха-эмацыйнай сферы; не мастацкіх – знаёмства са спецыфікай прадмета і бібліяграфічная пісьменнасць [3].

Да ліку асноўных паказчыкаў культуры чытання як паняцця комплекснага характару, адпаведна той жа энцыклапедыі, аднесены наступныя: усвядомлены выбар тэматыкі чытання, яго сістэматычнасць і паслядоўнасць; здольнасць да адэкватнага ўспрымання і засваення прачытанага; уменне арыентавацца ў бібліятэчным асяроддзі і эфектыўна працаваць з рознымі відамі дакументаў і матэрыялаў; валоданне тэхнікай чытання на ўзроўні, які забяспечвае аптымальную яго хуткасць, ступень засваення прачытанага; падтрымка ў працэсе чытання даўгачаснай працаздольнасці, а таксама ўменне знаходзіць патрэбную літаратуру з дапамогай бібліяграфічных дапаможнікаў, уменне карыстацца даведачна-бібліяграфічным апаратам, прымяняць рацыянальныя прыёмы пошуку. Да культуры чытання адносяць і ўменне беражліва абыходзіцца з кнігай і перыёдыкай, выконваць асноўныя гігіенічныя, фізіялагічныя і псіхалагічныя правілы датычна работы з кнігай, а таксама рацыянальную арганізацыю працэсу чытання, уменне чытаць, гнутка вар'іруючы працэс чытання, выбар прыёмаў работы з кнігай або артыкулам.

Побач з культурай працы, побыту і адпачынку, культура чытання характарызуе агульную культуру асобы, бо чытанне фарміруе маральнасць і эстэтычныя густы, садзейнічае развіццю інтэлекту, мовы, а значыць, і духоўнага патэнцыялу асобы ў цэлым.

У шырокім, філасофскім значэнні культура чытання сучаснымі навукоўцамі разумеецца як пэўная прастора, суцэльнае асяроддзе, народжанае феноменам чытання ў імя маральнай і інтэлектуальнай гармоніі асобы. У вузкім сэнсе культуру чытання разглядаюць як здольнасць успрымаць, прымаць і аналізаваць вербальную інфармацыю, прадстаўленую ў пісьмовым, друкаваным і электронным фарматах [6].

Нягледзячы на тое, што накоплены значны фактаграфічны і тэарэтычны матэрыял, які дае ўяўленне аб феномене культуры чытання, яна па-ранейшаму застаецца аб'ектам рознабаковых даследаванняў і нават дыскусій. Існуюць розныя падыходы да

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вызначэння сутнасці чытацкай культуры. Звернемся да некаторых з іх шэрагу.

У. М. Бяспалаў, вядомы даследчык у галіне псіхалогіі чытацкай дзейнасці, падзяляе культуру чытання на чатыры кірункі: навуковая арганізацыя працы чытача, развіццё чытацкага ўспрымання, методыка спецыялізаванага чытання (методыка хуткага чытання) і развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнай пісьменнасці чытача. На яго думку, культура чытання пачынаецца з навуковай арганізацыі працы [1], аўтар адзначае, што навуковая арганізацыя працэсу чытання ў наш час набывае найбольш актуальнае значэнне, бо для аптымізацыі працоўнага працэсу неабходна вывучаць шматлікія патокі прафесійнай інфармацыі, якія адлюстроўваюць сітуацыю ў галіне, сачыць за апошнімі распрацоўкамі.

Т. Д. Палозавай паняцце «культура чытання» разглядаецца з пазіцый трактоўкі асобы як суб'екта і мэты чалавечай цывілізацыі і падыходу да культуры чытання як крытэрыю не толькі літаратурна-эстэтычнай, але і сацыяльнай сталасці чытача. Аўтар адзначае, што працэс фарміравання культуры чытання – абавязковая ўмова цэласнага гарманічнага развіцця асобы і залежыць ад валодання ведамі, навыкамі і ўменнямі эстэтычна правільнага чытання. Паняцце «культура чытання», на думку Т. Д. Палозавай, можна суадносіць з такімі паняццямі, як «творчае чытанне», «таленавітае чытанне», «мастацтва чытання». З іншага боку, у якасці роднаснага паняцця ёю прыводзіцца тэрмін «сістэма чытання» як паказчык пэўнага ўзроўню якасці чытацкай дзейнасці [16].

Культуралагічны падыход разглядае чытанне ў якасці феномена культуры, найважнейшага сродку захавання інтэлектуальнай культуры грамадства, пераемнасці пакаленняў і істотнага фактару сацыякамунікатыўнага развіцця чалавека. Выкарыстоўваючы культуралагічны падыход для аналізу чытання школьнікаў і прытрымліваючыся меркавання Д. С. Ліхачова, што культура – гэта «некое целостное органическое явление, своего рода среда, в которой существуют свои общие для разных аспектов культуры тенденции, законы, взаимопритяжения и взаимоотталкивания…» [10, с. 10], Т. Г. Галакціёнава дае асабістую трактоўку паняцця «культура чытання». На яе думку, гэта пэўная прастора, цэласнае асяроддзе, народжанае феноменам чытання ў імя маральнай і інтэлектуальнай гармоніі асобы

[7]. Выходнай перадумовай яе ідэі стала перакананне, што ва ўмовах сучаснай школы можа быць створана адукацыйнае асяроддзе, у якім чытанне з’яўляецца базай, інструментам і стымулам агульнага культурнага развіцця дзіцяці.

У філасофскім кантэксце разглядае культуру чытання М. В. Карданава. Яна сцвярджае, што культура чытання, як і культура ў цэлым, існуе на стыку рацыянальнасці і ірацыянальнасці, логікі і ўяўлення, што ўскладняе яе фарміраванне і існаванне, але адначасова робіць выхаванне яе жывым і цікавым філасофска-педагагічным заняткам [9]. Аўтар падкрэслівае, што культура і кніга заўсёды разам, культура ўтварае неабходную жыццёвую прастору чытання, у якой увесь час ажыццяўляецца ўключэнне чалавека ў свет артэфактаў, матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей папярэдніх пакаленняў, засваенне ім новых форм асобасных і сацыяльных зносін.

Р. Ф. Пярцоўская, аналізуючы гісторыю інтэлектуальнага развіцця грамадства, называе культуру чытання сацыякультурнай з’явай, аснову якой складае дзейнасны пазнавальны працэс, які і вызначае ўзровень інтэлектуальнага і духоўнага развіцця [13].

Н. Я. Дабрыніна ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі прапануе разумець культуру чытання як від дзейнасці, якая ўключае тры асноўныя складнікі: «перадфаза», звязаная з матывацыйнай сферай звароту да друкаванай крыніцы і інфармацыі аб ёй; фаза, на якой адбываюцца непасрэдны кантакт з тэкстам, яго спасціжэнне (успрыманне і разуменне), і пастфаза, якая вызначаецца вынікамі чытання (далейшым асэнсаваннем тэмы, развіццём чытацкага інтарэсу, міжасобаснымі стасункамі наконт прачытанага, выкарыстаннем засвоенай інфармацыі ў розных сферах жыцця) [8].

У сучасным бібліятэказнаўстве прызнаецца той факт, што культура чытання – гэта істотны складнік інфармацыйнай культуры. Аднак многія вучоныя звяртаюць увагу на недапушчальнасць паглынання тэрміна «культура чытання» іншымі і, як вынік, паступовага выпадзення яго з навуковага абыходку. Таму суаднясенне паняццяў «інфармацыйная культура» і «культура чытання» з’яўляецца на сённяшні дзень прадметам навуковых дыскусій.

Яшчэ ў 1990-х гг. уздымалася праблема размежавання культуры чытання і інфармацыйнай культуры асобы. Так, у 1994 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у Расіі былі апублікаваны матэрыялы двух навукова-практычных канферэнцый па праблемах культуры чытання: «Праблемы інфармацыйнай культуры» (Масква) і «Праблемы фарміравання культуры чытання» (Тамбоў). Удзельнікамі канферэнцый была зроблена спроба замяніць вузкаспецыяльнае, на іх думку, паняцце «культура чытання» паняццем больш шырокім – «інфармацыйная культура асобы». Пры гэтым працэс чытання разглядаўся імі перш за ўсё як працэс інфармацыйны.

Большасць навукоўцаў XXI ст. засяроджваюць увагу на адрозненнях тэрмінаў тыпу «бібліятэчна-бібліяграфічная пісьменнасць», «інфармацыйная культура асобы» і «культура чытання». Так, напрыклад, І. І. Ціхамірава бачыць адрозненне інфармацыйнай культуры ад культуры чытання ў наступным: культура чытання выходзіць за межы ведаў, уменняў і навыкаў у сферу светапогляду і духоўнай культуры, яна адрозніваецца большай глыбінёй, шматаспектнасцю і псіхалагічнай складанасцю. Гэта працэс сумеснай творчасці з аўтарам, што патрабуе асаблівай актыўнасці з боку чытача. Інфармацыйная культура ж – больш паверхневая, прагматычная, дзелавая [19].

Ю. П. Мяленцьева лічыць, што тэрмін «культура чытання», у параўнанні з тэрмінам «інфармацыйная культура», выкарыстоўваецца даволі рэдка менавіта таму, што некаторыя вучоныя памылкова заключаюць гэты тэрмін у межы больш шырокіх паняццяў. Аўтар звяртае ўвагу спецыялістаў на ўнікальны складнік паняцця «культура чытання», які надае тэрміну значнасць і актуальнасць, а таксама дазваляе гаварыць аб яго незаменнасці іншымі паняццямі. Тэрмін, разам з уменнем арыентавацца ў свеце інфармацыі, уключае ў сябе такія паняцці, як «любоў да кнігі», «інтарэс да чытання», «успрыманне і разуменне прачытанага», «творчае чытанне» і інш. Тым самым аўтар прыходзіць да высновы, што «культура чытання» паняцце больш «унутранае», асобаснае, нават інтымнае [12, с. 133].

Акрамя таго, сёння, на этапе развіцця інфармацыйнага грамадства, калі ўзаемасувязі чытання, кнігі, інфармацыі, чытачоў і карыстальнікаў ужо трактуюцца з пазіцый тэорыі камунікацый, навукоўцы пачалі гаварыць аб працэсе зліцця інфармацыйнай культуры і культуры чытання ў адзіную камунікатыўную культуру. Аднак усё ж большасць сучасных навукоўцаў прытрымліваюцца таго меркавання, што культура чытання – гэта той падмурак, база, на якім толькі і можна будаваць іншыя

канструкцыі – «бібліятэчна-бібліяграфічную пісьменнасць», «інфармацыйную культуру асобы» і інш. Таму культура чытацкай дзейнасці такая важная як для асобы, так і для грамадства ў цэлым, і будзе няправільна, калі тэрмін «культура чытання» выпадзе з навуковага абыходку, патоне ў тэрмінах іншага парадку.

На жаль, у сучасным грамадстве разуменне каштоўнасці культуры чытання зніжана, пазіцыя чытача сацыяльна менш прэстыжная, чым пазіцыя карыстальніка электронных рэсурсаў або гледача. І нягледзячы на тое, што ў вызначэнні зместу паняцця «культура чытання» і яго месца ў структуры навукі дасягнута адноснае пагадненне, усё ж няма поўнага адзінства наконт яго актуальнасці, запатрабаванасці і жыццяздольнасці ў інфармацыйным грамадстве.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Беспалов, В. М.* Психология чтения : учеб. пособие для вузов культуры и искусств / В. М. Беспалов ; Федер. агентство по культуре и кинематографии ; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – М. : МГУКИ, 2007. – 198 с.: ил.

2. *Библиотековедение :* учеб. пособие / под ред. В. В. Серова, Е. В. Сеглина. – М. : Книга, 1972. – 384 с.

3. *Библиотечная* энциклопедия / Рос. гос. б-ка. – М. : Пашков дом, 2007. – 1300 с.: ил.

4. *Воспитание* культуры чтения : метод. рекомендации / Гос. б-ка СССР им. В. И. Ленина. – М., 1973. – 33 с.

5. *Воспитание* культуры чтения и библиотечно-библиографический всеобуч на селе : метод. рекомендации / Гос. публ. б-ка им. М. Е. Салтыкова-Щедрина ; сост. М. И. Губанова. – Л., 1982. – 31 с.

6. *Галактионова, Т. Г.* Чтение школьников как социально-педагогический феномен открытого образования: (теоретико-методологические основы образования) : монография / Т. Г. Галктионова. – СПб., 2007. – 164 с.

7. *Галактионова, Т. Г.* Культура чтения современных школьников как социально-педагагическая проблема открытого образования / Т. Г. Галактионова. – URL: www. e-culture.ru / Article/2006/Galaktionova.

8. *Добрынина, Н. Е.* По ступеням культуры чтения / Н. Е. Добрынина // Библиотековедение. – 2000. – № 3. – С. 53–57.

9. *Карданова, М. В.* Культура чтения в ритме пограничной рациональности / М. В. Карданова // Библиотековедение. – 2006. – № 4. – С. 60–68.

10. *Лихачев, Д. С.* Русская культура / Д. С. Лихачев. – М. : Искусство, 2000. – 190 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. *Макаренко, Т. С.* Формирование культуры чтения научной литературы в процессе библиотечного обслуживания специалистов : автореф. дис. … канд. пед. наук: 05.25.03 / Т. С. Макаренко. – М., 1984. – 16 с.

12. *Мелентьева, Ю. П.* Чтение, читатель, библиотека в изменяющемся мире = Reading, reader, library in the changing world / Ю. П. Мелентьева.– М. : Наука, 2007. – 355 с.

13. *Перцовская, Р. Ф.* Чем определяется интеллектуальное развитие общества / Р. Ф. Перцовская // Мир библиографии. – 2009. – № 5. – С. 22–28.

14. *Примаковский, А. П.* О культуре чтения: методы самостоятельной работы с книгой в свете научной организации умственного труда / А. П. Примаковский. – М. : Книга, 1969. – 158 с.

15. *Проблемы* формирования культуры чтения : материалы Всерос. науч. конф., 25–27 ноября 1994 г. / редкол.: А. А. Соболева (науч. ред.) [и др.]. – Тамбов : Изд-во МИНЦ, 1994. – 180 с.

16. *Руководство* чтением детей и юношества в библиотеке : учеб. для студ. библ. фак. ин-тов культуры, ун-тов и пед. ин-тов / Т. Д. Полозова [и др.]; под ред. Т. Д. Полозовой. – М. : МГИК, 1992. – 231 с.

17. *Смородинская, М. Д.* О культуре чтения: что нужно знать каждому / М. Д. Смородинская, Ю. П. Маркова. – М. : Книга, 1984. – 88 с.

18. *Суслова, И. М.* Словарь библиотечных терминов / Гос. б-ка СССР им. В. И. Ленина ; сост. И. М. Суслова, Л. Н. Уланова ; общ. ред. д-ра пед. наук проф. О. С. Чубарьяна. – М. : Книга, 1976. – 223 с.

19. *Тихомирова, И. И.* О драгоценном времени детства / И. И. Тихомирова // Библиотечное дело. – 2009. – № 17. – С. 37–41.

20. *Трубников, С. А.* Культура чтения как критерий общей типологии читателей / С. А. Трубников // Советское библиотековедение. – 1980. – № 1. – С. 28–38.

21. *Тугов, Ю. М.* Педагогика чтения: общая теория / Ю. М. Тугов // Библиография. – 1993. – № 5. – С. 124.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. КІРУНКІ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ

## 2.1. Педагагічныя аспекты бібліяграфічнай дзейнасці

Бібліяграфазнаўства на пачатку XXI ст. характарызуецца шматканцэптуальнасцю, суіснаваннем тэарэтычных канцэпцый, адрозных уяўленнямі аб сутнасці бібліяграфіі, яе непасрэдным аб'екце, метасістэме, функцыях і мэтах, якія рэалізуе бібліяграфічная дзейнасць у сучасным грамадстве. Характарыстыка развіцця тэорыі бібліяграфіі ў гісторыка-парадыгмальным асвятленні, раскрыццё сутнасці сучасных канцэпцый глыбока і ўсебакова прадстаўлены ў рабоце В. А. Факеева «Библиография: теоретико-методологические основания» [22].

Сярод выдзеленых канцэпцый прадстаўлена і інфармацыйна-педагагічная (псіхалагічная, чытачазнаўчая, бібліятэчна-псіхолага-педагагічная). Асноўны ўнёсак у распрацоўку азначанай канцэпцыі належыць спецыялістам у галіне рэкамендацыйнай бібліяграфіі – Ю. М. Тугаву, Н. Н. Салаўёвай, С. А. Трубнікаву, Ю. С. Зубаву, А. М. Фаміной. У гэтай канцэпцыі акумуляваліся і атрымалі творчае развіццё прагрэсіўныя сацыяльныя імкненні многіх пакаленняў «ідэйных» дзеячаў кнігі, асветнікаў XIX – пачатку XX ст., якія адстойвалі прыярытэтную ролю чалавечага фактару для ўсіх галін кніжнай справы.

Мэту бібліяграфіі яны бачылі ў аказанні дапамогі чытачу ў працэсе выбару кніг для чытання, уздзеянні на свядомасць чытача, асветніцтве і выхаванні чытача на псіхолага-педагагічных асновах, выхаванні чытацкіх якасцей асобы. Вылучэнне ў псіхолага-педагагічнай канцэпцыі чытацкай сутнасці бібліяграфіі, а галоўнае – непасрэднае ўключэнне бібліяграфіі ў працэс чытання на правах аднаго з яго кампанентаў, у сваю чаргу, пацягнула за сабой вельмі актыўнае ўключэнне ў тэорыю і методыку бібліяграфіі такіх сацыёлага-псіхалагічных катэгорый, як «механізмы чытацкай дзейнасці», «чытацкая свядомасць і чытацкая псіхалогія», «чытацкі свет і чытацкае асяроддзе», «дыферэнцыяцыя чытацкага кантынгенту і духоўнага свету чытацкай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

групы» [3, с. 93]. Актыўна развівалася асэнсаванне пытанняў бібліяграфічнай тыпалогіі чытачоў, падрыхтоўкі бібліяграфічных матэрыялаў у адпаведнасці з мэтавым і чытацкім прызначэннем, вывучаліся пытанні выкарыстання і ўспрымання бібліяграфічнай прадукцыі, бібліяграфічных апавяшчэнняў рознымі чытацкімі групамі і ў розных мэтах. Бібліяграфічная дзейнасць разглядалася як спецыфічны комплексны род творчай дзейнасці, у якой яна «чыста» бібліяграфічная («кампактнае згортванне»), неаддзельная ад публіцыстычнай, прапагандысцкай, педагагічнай, папулярызатарскай, журналісцкай, навукова-, вытворча-, кіраўніча-дапаможнай дзейнасці [3, с. 93].

Асноўныя распрацоўкі канцэпцыі адносяцца да 1960–80-х гг., у 1990–2000-х гг. псіхолага-педагагічная канцэпцыя бібліяграфіі, па вывадах В. А. Факеева, практычна не развівалася [22, с. 60]. Гэта звязана з агульнымі заканамернасцямі развіцця бібліяграфіі, змяненнем функцый бібліяграфіі прыватнага парадку і пераразмеркаваннем вагі і значэння асобных звёнаў і напрамкаў развіцця ў розныя гістарычныя перыяды [7, с. 26]. Асветніцкая функцыя ў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці саступае па сваім значэнні функцыі камунікатыўна-пошукавай, паколькі ў новых умовах прыярытэтнай задачай камунікацыі стала стварэнне максімальных умоў для забеспячэння доступу да банкаў даных і ведаў. З гэтым звязана і пераважнае развіццё ў тэорыі бібліяграфіі дакументна-інфармацыйнага кірунку бібліяграфазнаўчых пошукаў.

У сумежнай з бібліяграфазнаўствам навуцы – бібліятэказнаўстве – таксама вылучаюцца розныя парадыгмы функцыянавання бібліятэкі, да прыкладу інфармацыйная, прыхільнікі якой (В. В. Скварцоў, Я. Л. Шрайберг, К. Ю. Геніева і інш.) прапаноўваюць разглядаць у якасці місіі бібліятэкі забеспячэнне свабоднага доступу карыстальнікаў да ўсіх патокаў інфармацыі. Супрацьлеглых поглядаў на сацыяльнае прызначэнне бібліятэкі прытрымліваюцца А. М. Ванееў, М. Я. Дворкіна, С. Р. Матліна, М. С. Карташоў, А. С. Чачко, вызначаючы яго як садзейнічанне асвеце, фарміраванню каштоўнасных арыентацый чытача, духоўна-маральнаму развіццю.

Адной з заканамернасцей развіцця бібліяграфіі з’яўляецца тое, што яна не страчвае нічога каштоўнага, дасягнутага за гады свайго існавання. І сёння пастулаты псіхолага-педагагічнай канцэпцыі бібліяграфіі не толькі актуальныя для практычнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічнай дзейнасці, але і патрабуюць свайго далейшага развіцця. На наш погляд, яе ўзбагачэнне ў цяперашні час адбываецца за кошт развіцця тэорыі бібліяграфічнай каштоўнаснай арыентацыі [21], тэорыі бібліяграфічнай культуры і асаблівасцей яе фарміравання [10; 13; 26], тэорыі бібліяграфічных зносін, бібліяграфічнай камунікацыі [8], кагнітаграфічнай бібліяграфічнай канцэпцыі [23; 24].

У 1990-я гг. у міжвузаўскім зборніку навуковых прац «Развитие педагогических функций советских библиотек» былі апублікаваны артыкулы В. М. Какойкінай і В. М. Лук'янавай, аўтары якіх паспрабавалі раскрыць педагагічныя функцыі і магчымасці бібліяграфіі ў дзейнасці бібліёграфа і бібліяграфічных дапаможніках рознага віду і зместу, выкарыстоўваемых у бібліятэках [16; 19]. В. М. Какойкінай абгрунтоўвалася неабходнасць фарміравання новага напрамку, які ўмоўна можна назваць «бібліяграфічнай педагогікай»; сярод асноўных вектараў вывучэння гэтага напрамку яна выдзяляла: педагагічныя аспекты складальніцкай бібліяграфічнай дзейнасці; педагагічныя аспекты сістэмы сродкаў бібліяграфічнай прапаганды; педагагічныя аспекты бібліятэчнага абслугоўвання (з выкарыстаннем бібліяграфічных паказальнікаў); педагагічныя аспекты каталагізацыі і фарміравання бібліятэчнага фонду (з выкарыстаннем бібліяграфічных паказальнікаў) [16, с. 106]. Нягледзячы на агульнапрызнанасць педагагічных магчымасцей бібліяграфічнай дзейнасці, уласна бібліяграфічная педагогіка не склалася (ды і сам тэрмін у сучасных публікацыях практычна не сустракаецца) і вывучэнне педагагічнай функцыі бібліяграфічнай дзейнасці не атрымала належнага асэнсавання і развіцця.

Неабходна адзначыць, што педагагічны складнік бібліяграфічнай дзейнасці заключаецца ў імпліцытнай прысутнасці адукацыйнай функцыі ў бібліяграфічнай інфармацыі. Патрэбнасць у ведах, недахоп звестак аб чымсьці, імкненне чалавека атрымаць падобную інфармацыю з'яўляюцца прычынай развіцця сацыяльных, дакументных, бібліяграфічных камунікацый. Бібліяграфія сфарміравалася як структура, якая аказалася здольнай дапамагчы ў задавальненні гэтай патрэбнасці. Яна выпрацавала спецыфічныя сродкі, якія арганізуюць веды, назапашаныя чалавецтвам, дакументальна аформленыя, дазваляюць чалавеку арыентавацца ў іх. Э. К. Бяспалава, аналізуючы су-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часны этап метадалагічнага асэнсавання бібліяграфіі, лічыць, што «ёсць агульная катэгорыя і найбольш значная культурна-гістарычная рэалія, якая задае сэнс інфармацыйным працэсам. Гэта – веды. Бібліёграфы доўга аддавалі перавагу сістэме “дакумент”, “дакумент – спажывец”, вельмі нясмела ўваходзілі ў свет ведаў. Але яшчэ В. Р. Анастасевіч ў пачатку XIX ст. пісаў, што бібліяграфія – гэта навука ведаць кнігі па іх змесце. Адсюль бяруць пачатак некаторыя метады і методыкі бібліяграфіі» [5, с. 67].

У педагогіцы тэрмін «веды» характарызуе адну з важнейшых мэт навучання, указвае на сродак педагагічнага ўздзеяння, раскрывае змест педагагічнага працэсу, акрэслівае матэрыял, які ўвасабляе педагагічны намер. Пад ведамі разумеецца сукупнасць звестак, якія перадаюцца ў рамках вучэбных дысцыплін і ўспрымаюцца навучэнцамі. Веды і інфармацыя цесна ўзаемазвязаны. Інфармацыя ёсць перадаваемыя веды, яна выступае ў якасці сродку перадачы ведаў. У бібліяграфічнай дзейнасці веды перадаюцца, па словах В. П. Ляонава, «у інфармацыйнай упакоўцы» з выкарыстаннем бібліяграфічных метадаў, па правілах бібліяграфічнага згортвання і ў стандартным выглядзе з мэтай далейшага выкарыстання [17, с. 63]. Важным момантам у разважаннях аўтара з’яўляецца разглядаемая ім класіфікацыя ведаў на аб’ектыўныя, якія змяшчаюцца ў масіве дысцыплінарных публікацый, і суб’ектыўныя, асобасныя, у складзе якіх вылучаюцца нефармалізаваныя веды. Апошнія, па меркаванні В. П. Ляонава, справядліва было б назваць уменнямі і навыкамі, чалавечым вопытам, якія ў прафесійнай супольнасці перадаюцца ад настаўніка да вучня шляхам паказу, сумеснага пошуку і аналізу поспехаў і памылак [6, с. 64].

Функцыянаванне бібліяграфічнай інфармацыі ў сістэме «дакумент – карыстальнік», «тэкст – карыстальнік», «аб’ектыўныя веды – карыстальнік», дваістасць як спецыфічная яе якасць сведчаць, што арыентацыя ў сістэме інфармацыі, аб’ектыўных ведах ажыццяўляецца не проста на падставе якіх-небудзь абстрактных, ідэальных, прыдуманых чалавекам крытэрыяў, а ў суаднясенні з патрэбнасцямі грамадства, асобных груп і канкрэтных людзей у той ці іншай інфармацыі, ведах, іх магчымасцямі і здольнасцямі ўспрымаць і засвойваць прапанаваную інфармацыю: інфармацыя можа быць даступна ўсім, а «магчы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

масці пераўтварыць яе ў веды індывідуальны і звязаны з асабістым вопытам і здольнасцямі» [6, с. 63].

Пашыраюць пазнавальныя магчымасці бібліяграфічнай інфармацыі і такія яе якасці, як:

комплекснасць – праяўляецца ў здольнасці цэнтрыраваць вакол сябе інфармацыю іншага роду, якая раскрывае асноўны сэнс бібліяграфуемага дакумента (першасную інфармацыю з дакументаў у форме анатацый і рэфератаў, ацэнку інфармацыі, канцэптаграфічную інфармацыю, дадатковую інфармацыю аб аўтары і г. д.);

камунікатыўнасць – праяўляецца ва ўстанаўленні сувязі паміж бібліёграфам і карыстальнікам у мэтах абмену інфармацыяй, а таксама ўздзеяння на інфармацыйныя інтарэсы карыстальнікаў з дапамогай характарыстыкі, групоўкі дакументаў інфармацыі;

універсальнасць – праяўляецца ва ўзаемасувязі з усімі галінамі ведаў і чалавечай дзейнасці дзякуючы адлюстраванню дакументаў рознага зместу, на розных матэрыяльных носьбітах, засваенню ўсіх відаў сацыяльнай камунікацыі.

Садзейнічанне ў арыентацыі, задавальненні грамадскіх патрэбнасцей у дакументна фіксаваных ведах і непарсэдная рэалізацыя якасцей бібліяграфічнай інфармацыі ажыццяўляюцца з дапамогай спецыяльных метадаў бібліяграфічнай дзейнасці, сярод якіх выдзяляюцца метады бібліяграфічнага згортвання, рэкамендацыі, групоўкі, ідэнтыфікацыі, апавяшчэння.

Развіццё бібліяграфічных рэсурсаў з улікам сучасных дасягненняў распаўсюджвання сацыяльнай інфармацыі ў інфармацыйным грамадстве, прадастаўлення шырокага гарантаванага доступу да інфармацыі садзейнічае рэалізацыі прынцыпу роўных і гнуткіх адукацыйных магчымасцей для ўсіх катэгорый грамадства, рэалізацыі крытэрыяў інтэлектуальнай свабоды, авалоданню ведамі ў працэсе пошуку дакументаў, аналізу і сінтэзу, асэнсаванню атрыманай інфармацыі, развіццю як інфармацыйнай, так і агульнай культуры.

Гэта палажэнне набывае асаблівую актуальнасць у святле кардынальных перамен, якія адбываюцца ў цяперашні час у сусветнай сістэме адукацыі, змянення самой парадыгмы і мадэлі адукацыі. Інавацыйная парадыгма, якая прыйшла на змену парадыгме «падтрымліваючай», «асветніцкай» адукацыі, характарызуецца шэрагам якасна новых рыс. Галоўнымі з іх з’яўляюц-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ца: арыентацыя на прыярытэт асобы, якая пастаянна развіваецца; пераход ад рэпрадуктыўнай мадэлі адукацыі да прадуктыўнай, гуманістычнай, культурна-арыентаванай; шматукладнасць і варыятыўнасць; дзейнасны характар адукацыі. Важнейшым складнікам новай парадыгмы адукацыі стала ідэя «адукацыі на працягу ўсяго жыцця», або бесперапыннай адукацыі, якая ахоплівае ўсе формы, тыпы і ўсе ўзроўні адукацыі і выходзіць далёка за рамкі так званай фармальнай адукацыі.

Дамінаванне ідэі бесперапыннай адукацыі актуалізуе разуменне сутнасці самога чалавека, яго жыццёвых мэт, іерархіі каштоўнасцей, дазваляе разглядаць адукацыю не толькі як адзіную сістэму атрымання ведаў у навучальных установах, але і як спосаб культурна-творчай рэалізацыі асобы. Попыт на бесперапынную адукацыю адлюстроўвае розныя сацыяльныя, эканамічныя, грамадзянскія, маральныя, культурныя патрэбнасці, – і разнастайнасць такіх патрэбнасцей расце. Усё гэта істотна ўплывае на запатрабаванасць педагагічнага патэнцыялу бібліяграфіі, які нельга абмежаваць толькі інфармацыйным, камунікатыўна-пошукавым, «рэсурсным» падыходам, звязаным з прадастаўленнем доступу да інфармацыйных рэсурсаў адукацыі.

Сёння спецыялісты гавораць не толькі аб магчымасці рэалізацыі бібліёграфам ацэначнай функцыі ў працэсе бібліяграфічнай дзейнасці, але і аб развіцці экспертнага напрамку ў рабоце бібліёграфаў [4], «магчымасцях глыбокага аперыравання методыкамі пошуку блокаў ведаў і ўстанаўлення сэнсавых сувязей там, дзе іх мог не ўстанавіць карыстальнік» [6], бібліяграфічнай трансфармацыі ведаў, звязанай з уменнем распазнаваць і ствараць новыя, недысцыплінарныя веды [17, с. 77–102].

Усе віды крыніц бібліяграфічнай інфармацыі, не толькі спецыяльнай, валодаюць пазнавальным патэнцыялам, выступаюць у якасці крыніц пазнавальнай, адукацыйнай дзейнасці. Так, характарызуючы нацыянальную бібліяграфію, П. Н. Беркаў, бібліёграф і вучоны-філолаг, пісаў наступнае: «Нацыянальная бібліяграфія – гэта інвентар усяго шматвяковага культурнага жыцця народа, гэта своеасаблівая справаздача аб дасягненнях народа ва ўсіх галінах грамадскага жыцця, але выражаныя асаблівымі прыёмамі, характэрнымі толькі для бібліяграфіі, уласцівымі толькі ёй. Чым больш развітая, багатая і разнастайная нацыянальная бібліяграфія, тым дакладней, падрабязней і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ярчэй ствараемая ёю карціна ўкладу кожнага народа ў агульную скарбніцу сусветнай культуры. І, адначасова, чым багацей бібліяграфія, тым хутчэй пранікаюць культурныя каштоўнасці ў шырокія народныя масы» [4, с. 19–20], узбагачаецца рэсурс навукі, адукацыі, самаадукацыі.

Акрамя такога пашыранага падыходу да разгляду педагагічнага патэнцыялу бібліяграфічнай дзейнасці, можна выдзеліць таксама канкрэтныя праяўленні яго рэалізацыі: бібліяграфічнае забеспячэнне педагагічнай дзейнасці як асобай сферы грамадскай дзейнасці – знаходзіць адлюстраванне ў фарміраванні галіновай педагагічнай бібліяграфіі; бібліяграфічная падтрымка вучэбных праграм у сістэме асноўнай і дадатковай адукацыі – знаходзіць выражэнне ў развіцці вучэбна-дапаможнай бібліяграфіі; бібліяграфічная падтрымка самаадукацыі, выхавання – рэалізуецца ў рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці; бібліяграфічнае забеспячэнне бесперапыннай (дадатковай, нефармальнай) адукацыі; фарміраванне бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў інфармацыі – рэалізуецца ў форме непасрэднага педагагічнага працэсу (бібліяграфічнага навучання як кампанента фарміравання інфармацыйнай культуры спажыўцоў інфармацыі), а таксама як апасродкаваная функцыя бібліяграфавання (падрыхтоўка спецыяльных, разлічаных на карыстальнікаў інфармацыі, элементаў даведачна-метадычнага апарату дапаможніка), усіх відаў бібліяграфічнага абслугоўвання (пераважна даведачна-бібліяграфічнага), выкарыстання бібліяграфічных сродкаў у фарміраванні камфортнага інфармацыйнага асяроддзя для карыстальніка інфармацыі; бібліяграфічнае забеспячэнне, суправаджэнне і падтрымка дзейнасці культурна-асветных устаноў (бібліятэк, музеяў і інш.) – ажыццяўляюцца праз развіццё бібліятэчнай, музейнай і іншых відаў бібліяграфіі.

Перспектывы развіцця бібліяграфічнай дзейнасці як эфектыўнага педагагічнага інструмента, сродку папулярызацыі ведаў, садзейнічання засваенню рознымі катэгорыямі карыстальнікаў інфармацыі сацыякультурнага вопыту, адлюстраванага ў дакументных крыніцах, іх бесперапыннай самаадукацыйнай дзейнасці ў большай ступені звязана з развіццём рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці.

Сацыяльныя працэсы, якія адбываюцца сёння ў свеце, змянілі звыклыя парадыгмы, рэгулятыўныя прынцыпы, падыходы да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навуковых пошукаў, напрамкаў практычнай дзейнасці, у тым ліку і ў галіне рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці.

Рэкамендацыйная бібліяграфія ў розныя перыяды мела рознае сацыяльнае прызначэнне: садзейнічаць ліквідацыі непісьменнасці; далучаць шырокія масы да сусветнай культуры; спрыяць самаадукацыі; выступаць сродкам кіраўніцтва чытаннем; дапамагаць у працы педагогаў, бібліятэкараў; быць сродкам ідэалагічнага ўздзеяння на шырокія масы працоўных і г. д. Аб гэтым сведчыць аналіз азначэнняў рэкамендацыйнай бібліяграфіі, якія былі зафіксаваны ў тэрміналагічных стандартах, слоўніках.

З задачамі кіраўніцтва чытаннем звязваліся дэферэнцыяцыя карыстальнікаў рэкамендацыйнай бібліяграфіі, якая заснавана на іх сацыяльна-дэмаграфічных параметрах, неабходнасць пры стварэнні дапаможнікаў улічваць галоўны прынцып бібліяграфавання, які заключаецца ў захаванні адзінства мэтавага і чытацкага прызначэння, а таксама пераважнае выкарыстанне і падрыхтоўка крыніц рэкамендацыйнай бібліяграфіі ва ўмовах публічных бібліятэк і інш.

Змены ў сацыякультурнай сітуацыі садзейнічалі перагляду як тэарэтычных, так і метадалагічных падыходаў да функцыянавання рэкамендацыйнай бібліяграфіі [1; 2; 11; 12]: вызначаецца яе шматфункцыянальнасць, звязаная з рэалізацыяй інфармацыйнай, адукацыйнай, выхаваўчай, асветнай функцый; адмаўленне рэкамендацыйнай бібліяграфіі ад нарматыўнасці ў кіраўніцтве чытаннем прывяло да актыўна сцвярджаемай і рэалізуемай «свабоды выбару» кніг і інфармацыі; змены на ўзроўні падрыхтоўкі чытачоў, сацыяльных прыярытэтаў, адукацыйнага цэнзу, адносін да духоўнай культуры садзейнічалі ўсведамленню таго, што ў цэнтры ўвагі павінны быць пашыраны спектр інтарэсаў чытачоў да праблематыкі рэкамендацыйна-бібліяграфічных дапаможнікаў, арыентацыя на канкрэтныя інтарэсы карыстальнікаў інфармацыі, магчымасць спалучэння ў матэрыяле аднаго дапаможніка мноства адрасатаў і мэтаў чытання; выхад за межы «згорнутай інфармацыі» пра кнігі знайшоў адлюстраванне ва ўключэнні ў змест дапаможніка фактаграфічнай інфармацыі, ідэй, закладзеных у дакументах, пазнавальных, адукацыйных элементаў. Выключна важнае значэнне надаецца асобе бібліёграфа – папулярызатара, асветніка, які здольны сваімі прафесійнымі адносінамі схіляць патэнцыяль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага карыстальніка інфармацыі да актыўнага і ўсвядомленага яе набыцця.

З'явілася магчымасць рыхтаваць рэкамендацыйныя дапаможнікі, прынцыпова іншыя, чым ранейшыя, па тэматыцы, напаўненні і раскрыцці матэрыялу. Побач з традыцыйнымі жанрамі рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў (рэкамендацыйныя спісы, паказальнікі, гутаркі аб кнігах, кола чытання, планы чытання, лістоўкі, закладкі і інш.) узніклі новыя тыпы выданняў, якія абапіраюцца на сучасную метадалогію і метадычныя прынцыпы: бібліяграфічныя энцыклапедыі, анталогіі, нарысы, пуцевадзіцелі, хрэстаматыі і інш. Дапаможнікі малых форм пераважна звязваюцца з бібліяграфічнай складальніцкай практыкай публічных бібліятэк, накіраваныя на дасягненне асветных мэт, недаўгавечныя па часе існавання. Разам з тым яны мабільныя, здольныя аператыўна адклікацца на актуальныя падзеі, шырока выкарыстоўваць прыёмы камунікатыўнасці з мэтай дасягнення найбольшай эфектыўнасці ўздзеяння на карыстальніка бібліяграфічнай інфармацыі.

Перавага жанраў бібліяграфічных дапаможнікаў гістарычна абумоўлена, звязана з іх сацыяльнай запатрабаванасцю. Так, у 1920-я гг. шырокае распаўсюджанне атрымалі малыя формы (спіскі, планы чытання, гутаркі), накіраваныя на прыцягненне да чытання малападрыхтаваных чытачоў. У пасляваенны перыяд, калі востра паўстала пытанне аб камплектаванні фондаў разбураных вайной бібліятэк, выдаваліся дапаможнікі – «тыпавыя каталогі». У 1960–80-я гг., перыяд абавязковай усеагульнай сярэдняй адукацыі, шырокае распаўсюджанне атрымалі выданні ў дапамогу самаадукацыі, так званыя «колы чытання». У сучасны перыяд ва ўмовах масавай вышэйшай адукацыі ў краіне, рэалізацыі задач пераходу да бесперапыннай адукацыі, павышэння ролі самаадукацыі, адказнасці кожнага за свой лёс у сацыяльным, прафесійным і асобасным плане абазначылася тэндэнцыя да выдання фундаментальных дапаможнікаў разглядаемага віду.

Аўтары – складальнікі новых жанраў рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў – супрацоўнікі аддзела рэкамендацыйнай бібліяграфіі Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі ў сваіх навуковых публікацыях [1; 2; 11; 12], вызначаючы ўмовы запатрабаванасці крыніц гэтага віду бібліяграфіі, адзначаюць наступныя сучасныя падыходы да іх падрыхтоўкі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходнасць павелічэння пазнавальнай каштоўнасці рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў за кошт увагі да тэм, аспектаў, кірункаў, якія не вывучаюцца ў вучэбных курсах;

шматаспектнасць асвятлення тэмы, шырыня бібліяграфуемага матэрыялу і яго дыскусійнасць;

узмацненне арыентацыйнай ролі бібліяграфічнага дапаможніка за кошт увагі да дэталяў і падзей эпохі, увядзення элементаў займальнасці, фактаграфіі і іх інтэрпрэтацыі аўтарам бібліяграфічнага дапаможніка;

акцэнт на персаніфікацыю ўдзельнікаў падзей, аб якіх аповед у кнізе;

значна большая ўвага да выкарыстання метаду праблемнай сітуацыі ў аповедзе аб кнігах;

комплекснасць у падборы дакументаў і ілюстрацыйнага раду;

уключэнне ў тэкст бібліяграфічнага дапаможніка матэрыялаў, невядомых шырокай публіцы: новых публікацый, архіўных матэрыялаў, мемуараў, меркаванняў спецыялістаў, дыскусійных матэрыялаў і інш.;

дапамога ў арганізацыі першапачатковай сістэмы чытання, здольнай выклікаць далейшы інтарэс да тэмы, асабліва тады, калі літаратура фізічна недаступна чытачу (для гэтага трэба актыўна прасоўваць тэксты да чытачоў, каб яны маглі знаёміцца і з тымі матэрыяламі, якіх няма ў кніжным фондзе бібліятэкі);

імкненне даць чытачу сістэматычныя веды па праблеме, растлумачыўшы іх папулярна, даступна і цікава;

наяўнасць ацэнак бібліёграфа, якія дазваляюць чытачу скласці агульнае ўяўленне аб праблеме, тэме, падзеі;

актыўная асабістая пазіцыя бібліёграфа, яго ўвага да тэксту, выкарыстанне папулярызатарскіх прыёмаў у імя чытабельнасці тэксту бібліяграфічнага дапаможніка.

Прадстаўленыя бібліяграфічныя веды ў такіх дапаможніках адлюстроўваюць яго розныя пазнавальныя магчымасці: не толькі апісальны ўзровень, звязаны з падачай бібліяграфічнай інфармацыі аб дакументах, але і тлумачальны, звязаны з рэалізацыяй ацэначнай функцыі ў адносінах да ўключаных у спіс дакументаў; класіфікацыйны, які рэалізуецца ў логіцы раскрыцця паслядоўнасці знаёмства з матэрыялам; метадычны, звязаны з наяўнасцю ўказанняў, падказак, накіраваных на леп-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шае ўспрыманне, засваенне прапанаванага ў дапаможніку матэрыялу.

Новыя якасці рэкамендацыйнай бібліяграфіі дазваляюць ёй выйсці за парог масавай бібліятэкі, дзе яна на працягу доўгага часу дапамагала бібліятэкару ў раскрыцці кніжных фондаў, у працы з чытачамі. Захоўваючы за сабой гэтыя функцыі, яна, разам з тым, становіцца важнай падтрымкай у арганізацыі вучэбнага працэсу, выхаваўчай работы з рознымі катэгорыямі навучэнцаў – школьнікамі, студэнтамі, дапамагае кожнаму, хто жадае рэалізаваць свае пазнавальныя патрэбнасці, не толькі задаволіць існуючы інтарэс, але і абудзіць новы.

Безумоўна, сёння падрыхтоўка фундаментальных бібліяграфічных дапаможнікаў (бібліяграфічных манаграфій, анталогій, нарысаў і г. д.) не пад сілу многім бібліятэкам, для рэалізацыі такіх праектаў неабходны шэраг умоў: адпаведная рэсурсная база бібліятэкі, як дакументная, так і матэрыяльная, творчы калектыў супрацоўнікаў, прычым часцей за ўсё з профільнай галіновай адукацыяй (філалагічнай, мастацтвазнаўчай і г. д.), супрацоўніцтва са шматлікімі арганізацыямі, зацікаўленымі ў развіцці асветніцтва, разуменне значнасці гэтай працы. Разам з тым апрабаваныя, пацвердзіўшыя сваю жыццяздольнасць і прынцыпова новыя метадалагічныя, метадычныя рашэнні могуць сёння выступаць у якасці асновы для паспяховага пошуку і творчай рэалізацыі ў прадуктах рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці розных тыпаў бібліятэк.

Інавацыйным феноменам з’яўляецца рэкамендацыйна-бібліяграфічная дзейнасць у Інтэрнэце. Навуковыя даследаванні работы дзіцячых бібліятэк дазволі выдзеліць прыярытэтныя напрамкі стварэння рэкамендацыйна-бібліяграфічных матэрыялаў [9]. Сярод іх: абуджэнне пазнавальнай актыўнасці дзяцей, інтарэсу да кнігі, чытання, класічнай літаратуры як маральна-духоўнай і інтэлектуальнай апоры ў жыцці; прыцягненне ўвагі настаўнікаў, навучэнцаў, бацькоў, школьнікаў да адукацыйных рэсурсаў; арганізацыя сямейных чытанняў; падтрымка мастацка-творчай дзейнасці дзяцей; развіццё літаратурнага краязнаўства, далучэнне дзяцей да вывучэння літаратуры свайго краю і інш. [9, с. 47]. Аналіз выдзеленых напрамкаў сведчыць, што Інтэрнэт становіцца асяроддзем, у якім з дапамогай бібліяграфічных сродкаў рэалізуюцца ўмовы для ўсебаковага развіцця асобы дзіцяці. Эфектыўнасці дасягнення пастаўленых мэт са-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнічае таксама выкарыстанне тэхнічных магчымасцей: мультымедыйныя тэхналогіі, сумяшчэнне магчымасцей прадастаўлення розных відаў інфармацыі; дынамічная, зручная і зразумелая карыстальнікам сістэматызацыя матэрыялу; музычныя або міні-гукавыя застаўкі, графічна-каляровае афармленне сайтаў з рэкамендацыйна-бібліяграфічнай інфармацыяй; прысутнасць гульні і галоўная вартасць – гіперспасылкі, якія значна скарачаюць шлях ад бібліяграфічнай інфармацыі да поўных тэкстаў твораў, непасрэдна да саміх першасных дакументаў, што выхоўвае і інфармацыйную культуру, дапамагае карыстальніку інфармацыі лепш убачыць і зразумець існуючыя сувязі паміж першаснай і другасна-дакументнай інфармацыяй.

Ва ўмовах электроннага асяроддзя бібліёграфамі шырока выкарыстоўваюцца метады каштоўнаснай арыентацыі ў дакументным патоку карыстальнікаў інфармацыі; прапаноўваемыя ацэнкі, рэкамендацыі, парады разнастайныя па мэтах і змесце: рэкамендуецца чытаць лепшае з лепшага, паралельна звяртаецца ўвага на выпадкі несумленнасці некаторых аўтараў і выдаўцоў, нізкі мастацкі ўзровень асобных кніг, пры неабходнасці выказваюцца крытычныя заўвагі наконт інтэрнэт-рэсурсаў.

Электронны доступ сам па сабе не надзяляе ведамі, неабходнымі для іх разумення і выкарыстання. Ва ўмовах Інтэрнэта і ўключэння інтэрнэт-рэсурсаў у якасці аб’ектаў бібліяграфавання забеспячэнне якаснага адбору і ацэнкі рэсурсаў асабліва важна, таму што ў інфармацыі Інтэрнэта складана арыентавацца нават падрыхтаваным карыстальнікам з-за недастатковай выразнасці яе якасных крытэрыяў. Акрамя таго, празмерны рост інфармацыі і магчымасці ўспрымання яе чалавекам, якія мала змяніліся за тысячы год, могуць прывесці да «крызісу неадлюстравання» (І. Маргенштэрн), інфармацыяй можна перанасыціцца. Менавіта ў сувязі з гэтымі асаблівасцямі падрыхтаваныя бібліёграфамі крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі разглядаюцца сёння ў якасці значных сродкаў педагагічнага ўздзеяння на чытачоў, забеспячэння інфармацыйна-псіхалагічнай бяспекі карыстальнікаў [18; 25; 27].

Арыентацыі ў інтэрнэт-рэсурсах садзейнічаюць таксама арганізацыя форумаў, інтэрактыўны рэжым і прынцып добраахвотных і зацікаўленых зносін як чытачоў з бібліёграфамі, так і карыстальнікаў інфармацыі паміж сабой, іх ацэнка прачытанага. Віртуалізацыя бібліяграфічнай камунікацыі як адлюстра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванне і вынік інфарматызацыі грамадства дае магчымасць узнавіць пэўныя тыпы зносін, звязаныя з традыцыйнай кнігай, і ў той жа час прадаставіць больш свабоды, падстаў і форм, якія дазваляюць выказаць свае меркаванні аб пісьмовай спадчыне, аб інтэлектуальным, эстэтычным і іншых відах творчасці. Гэтыя магчымасці выкарыстоўваюцца і спрыяюць узбагачэнню рэкамендацыйна-бібліяграфічных матэрыялаў, адрасаваных не толькі дзіцячаму чытачу, але і іншым катэгорыям карыстальнікаў інфармацыі [14; 15].

Рэкамендацыйная бібліяграфія з’яўляецца самастойным культурным феноменам, сродкам педагагічнага ўздзеяння, у той жа час яна цесна звязана з бібліятэкай як культурна-асветным, адукацыйным, сацыяльным інстытутам. На сучасным этапе менавіта ў рэчышчы бібліятэчнай бібліяграфіі і развіваецца пераважна гэты від бібліяграфічнай дзейнасці. Як функцыя бібліятэкі рэкамендацыйна-бібліяграфічная дзейнасць мае некалькі асноўных напрамкаў: з аднаго боку, яна забяспечвае пазнавальныя, культурныя патрэбнасці чытача, з другога – прадстаўляе бібліятэку менавіта культурна-асветным інстытутам; патрэцяе, з’яўляецца актыўным рэкламным сродкам прапаганды кнігі і чытання, прыцягнення да чытання як значнага віду пазнавальнай дзейнасці. У межах кожнага з іх, у сваю чаргу, дзейнасць ажыццяўляецца ў розных формах і з рознай ступенню паўнаты ў залежнасці ад цэлага комплексу прычын (тыпу бібліятэкі, кадравага складу, а таксама прафесійнага асэнсавання значнасці гэтай работы і г. д.).

Праведзены аналіз дзейнасці бібліятэк Беларусі па падрыхтоўцы крыніц рэкамендацыйнай бібліяграфіі высветліў: значна скарачаецца колькасць выданняў крыніц рэкамендацыйнай бібліяграфіі (ад агульнай колькасці рыхтуемых да выдання крыніц на долю рэкамендыцыйных прыходзіцца толькі 15%); абмежаванасць жанравай структуры бібліяграфічных дапаможнікаў паказальнікамі, спісамі, аглядамі, календарамі знамянальных і памятных дат; адмова ад выдання запатрабаваных з боку і бібліятэк, і карыстальнікаў пэўных крыніц, такіх як, напрыклад, «Дзіцячая літаратура Беларусі»; не бяруць удзел у падрыхтоўцы гэтага віду выданняў некаторыя рэспубліканскія бібліятэкі, бібліятэкі ВНУ, якія асветніцкую дзейнасць спрабуюць абмежаваць культурна-масавымі мерапрыемствамі і больш арыентаваны на непасрэдныя зносіны з чытачамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У бібліятэказнаўстве склалася дакладная, якая часта фармальна разумеецца, дыферэнцыяцыя бібліятэк па асобных тыпах. Гэта ўскладняе карыстанне рэсурсамі навуковых бібліятэк для больш шырокіх колаў насельніцтва. Навуковыя бібліятэкі, не забываючы сваіх непасрэдных задач, павінны быць гатовы рэфармаваць свае сацыяльныя функцыі, пашыраць катэгорыі карыстальнікаў, якіх яны абслугоўваюць. У гэтым выпадку важнейшымі з’яўляюцца мэты больш высокага парадку, чым толькі прафесійныя, звязаныя з вельмі дыферэнцыраванымі функцыямі абслугоўвання. Гэта – сацыяльныя мэты, магчымасць намаганнямі навуковых бібліятэк духоўна «падпітваць» тыя пласты насельніцтва, якія традыцыйна далучаюць да карыстальнікаў масавых бібліятэк.

Бібліятэказнаўцы-даследчыкі ўпэўнены, што прафесійнае таварыства, незалежна ад прыналежнасці да таго ці іншага тыпу бібліятэк, павінна абапірацца на агульную для ўсіх устаноўку: развіццё хаця б часткі чытачоў у кірунку ад менш да больш сур’ёзнага чытання. Некаторым будзе здавацца, што гэта заклік вярнуцца да кіраўніцтва чытаннем. Разам з тым, спрабуючы ў канцы 1980-х гг. зняць ідэалагічны кампанент чытання, мы, па перакананні С. Р. Матлінай, фактычна адмовіліся ад ідэй асветніцтва, на якіх у большасці сваёй базіруецца дзейнасць бібліятэк у любой дэмакратычнай краіне [20]. І менавіта рэкамендацыйная бібліяграфія з’яўляецца сродкам, які накіраваны на рэалізацыю гэтай місіі бібліятэкі.

Удасканаленне рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці беларускіх бібліятэк нам бачыцца ў неабходнасці:

асэнсавання кожнай бібліятэкай сваёй ролі, функцый у рэалізацыі асветніцкай, культурнай місіі бібліятэкі і педагагічнага патэнцыялу сродкаў рэкамендацыйнай бібліяграфіі;

больш шырокага выкарыстання вынікаў навуковых даследаванняў у галіне сацыялогіі, псіхалогіі чытання, вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей розных катэгорый карыстальнікаў з боку саміх бібліятэк;

прыцягнення да адбору і ацэнкі кніг, іншых дакументаў літаратуразнаўцаў, мастацтвазнаўцаў, педагогаў, вучоных, псіхолагаў, саміх карыстальнікаў інфармацыі;

каардынацыі работы бібліятэк і магчымасцей узаемакарыстання вынікамі гэтай дзейнасці шляхам размяшчэння на сваіх сайтах спасылак як на друкаваныя рэкамендацыйныя крыніцы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іншых бібліятэк (пры ўмове іх даступнасці ў фондах бібліятэкі), так і на электронныя версіі бібліяграфічных дапаможнікаў, выстаўленных і даступных на сайтах іншых бібліятэк; ва ўмовах жанравай разнастайнасці кожнай бібліятэкай у адпаведнасці са сваімі магчымасцямі вызначыць найбольш рацыянальныя для задавальнення патрэбнасцей сваіх карыстальнікаў жанры рыхтуемых рэкамендацыйных дапаможнікаў.

Асобай увагі патрабуе ўдасканаленне прафесійнага майстэрства бібліёграфаў, якія сёння выступаюць не проста складальнікамі, а аўтарамі рэкамендацыйна-бібліяграфічных крыніц, папулярызатарамі, асветнікамі. Нельга ў сувязі з гэтым не адзначыць і такую важную праблему, як паслабленне функцый метадычнага цэнтра ў галіне рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў нашай краіне, адсутнасць тэарэтычнага асэнсавання гэтага віду дзейнасці ў новых сацыякультурных і інфармацыйна-тэхналагічных умовах. Актыўнае развіццё і выкананне Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі функцый сацыякультурнага цэнтра, далучэнне да гэтага напрамку абласных універсальных навуковых бібліятэк сведчаць аб актывізацыі адпаведнай працы ў далейшым.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Бавин, С. П.* Очерки новейшей истории рекомендательной библиографии ГБЛ (1985–2005) : монография / С. П. Бавин; РГБ, НИО библиографии. – М. : Пашков дом, 2006. – 279 с.

2. *Бавин, С. П.* Вымысел и реальность в популярной библиографии / С. П. Бавин // Вопросы библиографоведения. Вып. 11 : Современные проблемы рекомендательной библиографии : сб. науч. ст. / РГБ, НИО библиографии. – М. : Пашков дом, 2001. – С. 47–53.

3. *Барсук, А. И.* Психолого-педагогическая концепция библиографии / А. И. Барсук // Библиография. – 1998. – № 6. – С. 89–96.

4. *Берков, П. Н.* Избранное. Труды по книговедению и библиографоведению / П. Н. Берков. – М. : Книга, 1978. – С. 266.

5. *Беспалова, Э. К.* Библиография: новый этап осмысления / Э. К. Беспалова // Библиография. – 2005. – № 1. – С. 65–67.

6. *Беспалова, Э. К.* Предисловие к книге В. П. Леонова «Библиография как профессия» / Э. К. Беспалова // Научные и технические библиотеки. – 2005. – № 3.

7. *Вохрышева, М. Г.* Теория библиографии : учеб. пособие / М. Г. Вохрышева. – Самара : СГАКИ, 2004. – 367 с.

8. *Вохрышева, М. Г.* О библиографическом общении / М. Г. Вохрышева // Советская библиография. – 1983. – № 3. – С. 55–60.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Ганзикова, Г. С.* Рекомендательно-библиографическая деятельность детских библиотек в Интернете (направления и педагогические принципы) / Г. С. Ганзикова // Библиотековедение. – 2008. – № 3. – С. 46–50.

10. *Гендина, Н. И.* Формирование информационной культуры личности в библиотеках и образовательных учреждениях / Н. И. Гендина [и др.]. – М. : Шк. б-ка, 2003. – 285 с.

11. *Горбунов, А. М.* «Легенды прошлых дней» / А. М. Горбунов // Мир библиографии. – 1998. – № 1. – С. 23–30.

12. *Добрынина, Н. Е.* Рекомендовать – значит просвещать / Н. Е. Добрынина // Мир библиографии. – 1998. – № 1. – С. 19–22.

13. *Зиновьева, Н. Б.* Библиография в структуре информационной культуры: теоретико-метод. исследование : автореф. дис. … д-ра пед. наук / Н. Б. Зиновьева. – Краснодар, 1998. – 34 с.

14. *Зыгмантовіч, С. В.* Рэкамендацыйна-бібліяграфічная дзейнасць бібліятэк Рэспублікі Беларусь / С. В. Зыгмантовіч // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2010. – № 8. – С. 54–60.

15. *Зыгмантович, С. В.* Подготовка библиографической продукции : науч.-практ. пособие / С. В. Зыгмантович. – Минск : Новое знание, 2009. – 229 с. – (Профессионалам библиотечного дела).

16. *Кокойкина, О. Н.* Педагогические аспекты библиографической деятельности (постановка проблемы) / О. Н. Кокойкина // Развитие педагогических функций советских библиотек: межвуз. сб. науч. тр. – М., 1991. – С. 103–109.

17. *Леонов, В. П.* Библиография как профессия : монография / В. П. Леонов. – М. : Наука, 2005. – 128 с. – (Книжная культура в мировом социуме: теория, история, практика).

18. *Леончиков, В. Е.* Информационно-психологическая безопасность личности: библиотековедческий аспект / В. Е. Леончиков // Научные и технические библиотеки. – 2008. – № 12. – С. 60–69.

19. *Лукьянова, О. Н.* Педагогические возможности библиографии художественно-эстетического комплекса / О. Н. Лукьянова // Развитие педагогических функций советских библиотек : межвуз. сб. науч. тр. – М., 1991. – С. 109–114.

20. *Матлина, С. Г.* Библиотечная этика в аспекте национальных просветительских традиций: (постановка вопроса) / С. Г. Матлина // Библиотековедение. – 2000. – № 3. – С. 25–26.

21. *Сафиуллина, З. А.* Информация: ценность и оценка : научн.-практ. пособие / З. А. Сафиуллина. – М., 2006. – (Библиотекарь и время. XXI век).

22. *Фокеев, В. А.* Библиография: теоретико-методологические основания : учеб. пособие / В. А. Фокеев. – СПб. : Профессия, 2006. – 352 с.

23. *Фокеев, В. А.* Культурологическая концепция библиографии / В. А. Фокеев // Библиография. – 1994. – № 3. – С. 124–134.

24. *Фокеев, В. А.* Природа библиографического знания : монография / В. А. Фокеев. – М. : РГБ, 1995. – 350 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*25. Чурашева, О.* Информационно-психологическая безопасность читателей: создание модели деятельности публичной библиотеки / О. Чурашева // Библиотечное дело. – 2007. – № 2. – С. 21–23.

*26. Шадрина, В. Н.* Библиографическая культура исследователя и педагогические методы ее формирования : автореф. дис. … канд. пед. наук / В. Н. Шадрина. – Краснодар, 2003. – 18 с.

*27. Юшина, О. Л.* Информационно-психологическая безопасность: библиотековедческий аспект (по материалам зарубежной литературы) / О. Л. Юшина // Научные и технические библиотеки. – 2003. – № 11. – С. 32–45.

## 2.2. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял біябібліяграфічнай інфармацыі

Глабалізацыя, нароўні з відавочнымі дасягненнямі і пазітыўна асэнсаваным патэнцыялам, вылучае і шэраг праблем. Так, паступова губляецца нацыянальная самаідэнтыфікацыя, развіваюцца працэсы дэперсаналізацыі асобы, самакаштоўнасць асобы перастае быць прыярытэтам.

Можна сцвярджаць, што біябібліяграфічная інфармацыя як від бібліяграфічнай інфармацыі, які мае сваім аб'ектам інтэлектуальную і мастацка-творчую спадчыну персаналій і калектываў, садзейнічае чалавечай самарэалізацыі і ідэнтыфікацыі ў шырокім сэнсе і дазваляе нацыянальнай грамадзе адначасова як інтэгравацца ў сусветную навуковую і мастацка-творчую супольнасць, так і акрэсліць межы і значнасць свайго ўнёску.

Сістэмна вывучэннем і распрацоўкай функцый біябібліяграфічнай інфармацыі займаліся Т. В. Захарчук (у адносінах да функцый біябібліяграфіі прыродазнаўства і тэхнікі ў сістэме навуковых камунікацый) [2; 3; 4], Н. М. Козачак (у адносінах да функцый персанальнай краязнаўчай бібліяграфіі дзеячаў мастацтва) [5], А. С. Крымская (у адносінах да функцый біябібліяграфіі ў тэхналогіях менеджменту ведаў [8; 9].

Біябібліяграфічная інфармацыя дазваляе зарыентаваць карыстальніка ў гісторыі навук, культуры і даць асноўныя звесткі аб вядучых іх прадстаўніках. Жыццяпіс у выданнях біябібліяграфічнай інфармацыі будуецца на аснове сінтэзу прыёмаў вобразнага адлюстравання асобы і калектыву з элементамі бібліяграфічнай характарыстыкі іх творчасці. Абагульняючы вынікі дзейнасці асобных персаналій і калектываў, фарміруючы ня-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бачны калектыў вызначанага профілю, біябібліяграфічная інфармацыя прама або ўскосна, з аднаго боку, персаніфікуе дасягненні ў разнастайных напрамках грамадскага жыцця, навукі і культуры і, з другога – удзельнічае ў апісанні сукупнага працэсу культурна-гістарычнага развіцця дзяржавы і сусвету. Праз біяграфію і бібліяграфію біябібліяграфічная інфармацыя далучае карыстальніка да кола каштоўнасцей мінулага і сучаснага, фарміруе на гуманістычнай аснове культуру чалавека, выхоўвае самастойнае мысленне.

Рост разнастайнасці біябібліяграфічнай інфармацыі азначае пашырэнне магчымасцей індывідуальнага выбару, задавальненне інтэлектуальных і культурных запытаў розных груп насельніцтва, спрыяе пераадоленню культурнай нацыянальнай замкнёнасці.

Арыентацыя на пашырэнне інтэлектуальнага патэнцыялу чалавека, мабілізацыю яго мыслення, развіццё яго пазнавальных здольнасцей, творчага патэнцыялу, крэатыўнасці, разнастайных праяў духоўнасці, маральнага здароўя з'яўляецца агульнай мэтай арганізацыі функцыянавання ў прасторы біябібліяграфічнай інфармацыі. Разуменне гэтай мэты дае грунт дзейнасці супрацоўнікам бібліятэк па падрыхтоўцы бібліяграфічных рэсурсаў аб персаналіях і калектывах розных сфер дзейнасці.

У сацыяльна-педагагічным патэнцыяле біябібліяграфічнай інфармацыі значнай з'яўляецца не інтэгральная цэласнасць сістэмы функцый біябібліяграфічнай інфармацыі, а магчымасць іх выбарачнага ўжывання, якая дазваляе фарміраваць камбінацыі функцый, прыцягваць да функцый аб'екта функцыі яго асобных элементаў, родныcных аб'ектаў, што асабліва актуальна пры разглядзе магчымасцей выкарыстання аб'екта ў розных сферах дзейнасці. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял біябібліяграфічнай інфармацыі будзе выяўлены і рэалізаваны па-рознаму ў залежнасці, па-першае, ад запытаў карыстальніка і, па-другое, ад асаблівасцей карыстальніка (узроўню інфармацыйнай культуры і інш.) або тых, на каго накіравана дзеянне гэтых функцый.

Рэалізацыя сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу біябібліяграфічнай інфармацыі адбываецца, у першую чаргу, за кошт біяграфічнай інфармацыі і інфармацыі першасных дакументаў, якія адлюстраваны ў біябібліяграфічных рэсурсах. Біябібліяграфічная інфармацыя садзейнічае канцэнтрацыі функцый бія-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графіі і першасных дакументаў у адным рэсурсе, што дае магчымасць абгрунтавання іх функцый і функцый біябібліяграфічнай інфармацыі, якая іх адлюстроўвае.

У структуры сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу біябібліяграфічнай інфармацыі характэрна выдзяленне сацыяльна-мнеманічнай функцыі, якая выяўляецца ў фіксацыі і захаванні ў часе і прасторы дасягненняў грамадства. Менавіта ў біябібліяграфічнай інфармацыі кампактна і структурыравана збіраецца ўся магчымая біяграфічная і бібліяграфічная інфармацыя аб персаналіях, калектывах, іх інтэлектуальных, творчых і духоўных дасягненнях.

Сацыяльна-прасторавая функцыя прадугледжвае распаўсюджанне ў сацыяльнай прасторы актуальных сэнсаў (ведаў, эмоцый, стымулаў). Функцыя перадачы інфармацыі і ведаў у выніку выкарыстання біябібліяграфічнай інфармацыі спецыялістамі не адмаўляецца, але перадача сэнсаў, эмоцый, знакаў не разглядаецца. Тым не менш розныя формы бібліяграфічнай інфармацыі, якія складаліся падчас гістарычнай эвалюцыі, апасродкавана адлюстроўваюць духоўныя запыты грамадства, дамінанты розных культурных этапаў, іх псіхалагічную атмасферу, даюць багаты матэрыял для меркаванняў аб грамадскіх інтарэсах.

Садзейнічанне комплекснаму выкарыстанню духоўных багаццяў, дасягненняў навукі, тэхнікі, культуры, зафіксаваных у разнастайных дакументах, выяўляецца ў адукацыйнай і выхаваўчай функцыях біябібліяграфічнай інфармацыі.

Педагагічныя аспекты бібліяграфічнай дзейнасці і бібліяграфічнай інфармацыі ў даследаваннях вывучаны слаба. Адукацыйная і выхаваўчая функцыі ў бібліяграфазнаўстве разглядаюцца выключна як адны з функцый толькі рэкамендацыйнай бібліяграфіі. З усім тым пры дапамозе біяграфічных і бібліяграфічных звестак біябібліяграфічная інфармацыя далучае карыстальніка да культурных каштоўнасцей мінулага і сучаснага, фарміруе на гуманістычнай аснове самастойнае мысленне. Выхаваўчая функцыя біябібліяграфічнай інфармацыі ў тым, што яна прызначана садзейнічаць павышэнню ўзроўню культуры карыстальнікаў у шырокім сэнсе: культуры духоўнай, палітычнай, эканамічнай, мастацкай, культуры чытання. Біябібліяграфічная інфармацыя накіравана на распаўсюджанне ведаў, фарміраванне асобы сучаснага чалавека, здольнага на аснове ду-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хоўных багаццяў, назапашаных чалавецтвам, выпрацаваць сваю жыццёвую пазіцыю.

Дадзеныя функцыі павінны ўлічвацца пры распрацоўцы адукацыйных і выхаваўчых праграм сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школы, у дзейнасці масавых бібліятэк. Так, з улікам як інфармацыйнай (для адукацыі), так і выхаваўчай нагрузкі адукацыйных і выхаваўчых праграм вучэбных устаноў у аснову вывучэння той або іншай дысцыпліны павінна ўваходзіць таксама інфармацыя аб наяўных біябібліяграфічных выданнях, прысвечаных прадстаўнікам і калектывам вывучаемай дысцыпліны. Гэта тычыцца і асноўных мерапрыемстваў у бібліятэках, прысвечаных персаналіям і калектывам, у іх правядзенні пажадана ўлічваць адукацыйны і выхаваўчы патэнцыял біябібліяграфічнай інфармацыі.

Ідэалагічная функцыя, як сугестыўная папулярызацыя якіх-небудзь навуковых, культурных, палітычных, рэлігійных дактрын, з'яўляецца адной з найбольш характэрных для біябібліяграфічнай інфармацыі. Любому навукоўцу, творчаму дзеячу або калектыву характэрна належнасць да той або іншай навуковай або творчай школы, поглядаў, што адлюстравана як у створаных імі дакументах, творах, так і ў самім выданні біябібліяграфічнай інфармацыі.

Геданістычная функцыя біябібліяграфічнай інфармацыі ў якасці крыніцы эстэтычнага эмацыйнага элемента асабліва выразна адлюстроўваецца ў біябібліяграфічных выданнях, прысвечаных адной персаналіі. У гэтыя выданні, апроч непасрэдна біяграфічнай і бібліяграфічнай інфармацыі, прыцягваецца ўся магчымая інфармацыя аб асобе: поўныя тэксты найбольш значных прац, фотаздымкі, водгукі калег і вучняў, вынікі творчай дзейнасці. Дадзеная функцыя асабліва ўзмацняецца падчас рэалізацыі біябібліяграфічнай інфармацыі ў электроннай форме, калі ёсць магчымасць дадаваць інфармацыю тэкставую, аўдыявізуальную, магчымасць інтэрактыўных зносін.

Тая тэндэнцыя, што шматлікія з сучасных выданняў біябібліяграфічнай інфармацыі становяцца аўтарскімі, калі на тытульным лісце прыводзіцца пэўны аўтар-складальнік, дазваляе гаварыць аб такой функцыі біябібліяграфічнай інфармацыі, як функцыя аўтарскага самавыяўлення. Такім выданням біябібліяграфічнай інфармацыі характэрна адзінства задумы, працэсу яе рэалізацыі і вынікаў асабістага стаўлення бібліёграфа да аб'ек-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

та бібліяграфавання. Варта адзначыць, што даволі часта такая інфармацыя з'яўляецца прадуктам дзейнасці не бібліёграфаў-прафесіяналаў, а вучняў, калег (для біябібліяграфічнай інфармацыі аб адной персаналіі), кіраўніка або супрацоўніка калектыву (для біябібліяграфічнай інфармацыі аб калектывах), энтузіяста пэўнай сферы дзейнасці (для біябібліяграфічнай інфармацыі аб прадстаўніках той або іншай сферы дзейнасці, навуковай, творчай школы і г. д.), што таксама пацвярджае сацыяльна-педагагічную значнасць біябібліяграфічнай інфармацыі.

Сярод мноства функцый, характэрных для сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу біябібліяграфічнай інфармацыі, можна таксама вылучыць такія спецыфічныя функцыі, як актывізацыі пазнавальнай дзейнасці; фарміравання матываў навучання; дапамогі ў прафесійным самавызначэнні; фарміравання карпаратыўнай культуры ў маладых спецыялістаў; выхавання нацыянальнай самасвядомасці (у адпаведнасці з абраным падыходам да функцыянальнага патэнцыялу біябібліяграфічнай інфармацыі гэты спіс можа быць працягнуты).

Вылучэнне дадзеных функцый біябібліяграфічнай інфармацыі заснавана, у першую чаргу, на філасофскай тэорыі значнага іншага. Паводле гэтай тэорыі, узаемадзеянне людзей можа быць эфектыўным толькі ў тым выпадку, калі яго ўдзельнікі з'яўляюцца значнымі адзін для аднаго.

Як паказала праведзенае на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у 2006–2010 гг. педагагічнае даследаванне, біябібліяграфічная інфармацыя на сённяшні дзень не знаходзіць шматаспектнага ўжывання ў значнай ступені з-за недаацэнкі яе сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу. Тым не менш з выкарыстаннем біябібліяграфічнай інфармацыі выкладчыкі вышэйшай школы могуць вырашаць шэраг адукацыйных і выхаваўчых задач.

Так, вядома, што навуку як сістэму аб'ектыўных абгрунтаваных ведаў аб рэчаіснасці можна вывучаць, не закранаючы яе гісторыі. Але цяжка зразумець яе метад і немагчыма вызначыць месца навукі ў культуры, калі ігнараваць гісторыю. Гісторыя навукі або дысцыпліны – гэта не толькі гісторыя навуковых ідэй, гісторыя метадаў і адкрыццяў. Галоўнымі ў гісторыі з'яўляюцца людзі і калектывы, іх дзейнасць і ўмовы гэтай дзейнасці. Выкарыстанне біябібліяграфічнай інфармацыі аб значных прадстаўніках вывучаемай навукі, дысцыпліны ў ад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паведнасці з яе функцыянальным патэнцыялам дазваляе выкладчыку не толькі даць студэнтам інфармацыю аб людзях і калектывах, якія стваралі і развівалі навуку, дысцыпліну, але і сфарміраваць на яе аснове веданне законаў і логікі развіцця навукі, сфарміраваць навыкі самастойнай працы па пошуку інфармацыі аб персаналіях і калектывах, інфармацыі вузкай тэматычнай накіраванасці.

Апроч гэтага, курс лекцый і іншыя формы вучэбных заняткаў па дысцыпліне «Уводзіны ў спецыяльнасць» для студэнтаў першага курса абавязкова ўключаюць у свой змест агульную інфармацыю аб спецыяльнасці, яе гісторыі і сучасным стане, асноўных прадстаўніках, яе асноўных інфармацыйных рэсурсах. Інфармацыя аб вядучых прадстаўніках і калектывах абранай спецыяльнасці з указаннем існуючых біябібліяграфічных крыніц дазволіць прадставіць не толькі значнасць гэтых персаналій і калектываў для самой спецыяльнасці, але і для навукі і культуры ў цэлым.

Адной з найважнейшых прафесійных якасцей спецыяліста любой галіны з'яўляецца ўменне самастойна арганізаваць сваю дзейнасць. Гэтыя навыкі развіваюцца падчас навучання ў ВНУ. Варта ўлічваць, што аб'ём інфармацыі ўсё павялічваецца, а час, адведзены на яе засваенне, абмежаваны. Тут актуальнай становіцца прапанова студэнтам такіх інфармацыйных матэрыялаў для самастойнай падрыхтоўкі, у якіх інфармацыя пададзена ў комплексе, сістэматызавана і з'яўляецца зручнай для выкарыстання. Біябібліяграфічная інфармацыя суадносіцца з гэтымі патрабаваннямі. Таму, пры наяўнасці біябібліяграфічнай інфармацыі аб прадстаўніках і калектывах вывучаемых дысцыплін неабходна менавіта яе паказваць у якасці асноўнай крыніцы падчас самастойнай працы студэнтаў у метадычнай літаратуры, спісах літаратуры для падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў. Біябібліяграфічная інфармацыя можа быць прапанавана і як крыніца атрымання біяграфічнай і бібліяграфічнай інфармацыі аб персаналіях і калектывах, і як крыніца інфармацыі па якой-небудзь вузкай праблематыцы (калі вызначаныя персаналіі і калектывы дэталёва займаліся распрацоўкай дадзенай праблематыкі).

Функцыянаванне біябібліяграфічнай інфармацыі ў рамках курсавога і дыпломнага праектавання студэнтаў можна разглядаць у двух аспектах. Па-першае, даволі часта курсавыя і ды-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пломныя работы маюць сваім непасрэдным аб'ектам вывучэння вызначаную персаналію або калектыў. У гэтым выпадку біябібліяграфічная інфармацыя аб персаналіі або калектыве можа быць зыходным пунктам курсавога або дыпломнага даследавання. Па-другое, біябібліяграфічная інфармацыя з'яўляецца неацэннай крыніцай у пошуку інфармацыі вузкай тэматычнай накіраванасці для любой тэмы курсавой або дыпломнай работы.

Значным фактарам паспяховага фарміравання трывалых ведаў па прадмеце лічыцца інтэлектуальная і эмацыйная падрыхтоўка студэнтаў да ўспрымання новага вучэбнага матэрыялу.

Эмацыйна-пазнавальнае стаўленне, непасрэдна матываванае, мае тэндэнцыю пераходзіць у пазнавальную накіраванасць асобы. Самым значным матывам навучання псіхолагамі і педагогамі вылучаецца пазнавальная цікавасць. Выкарыстанне біябібліяграфічнай інфармацыі аб вядучых прадстаўніках дысцыпліны дазволіць як на аснове ведаў аб выніках дзейнасці гэтых прадстаўнікоў, так і на аснове пазнавальнай цікавасці да персаналій і калектываў уплываць на фарміраванне ў студэнтаў матываў навучання. (Да гэтага адзначым, што крыніцам біябібліяграфічнай інфармацыі характэрна гіпертэкставасць феномену Інтэрнэт: тэкст у крыніцах біябібліяграфічнай інфармацыі незавершаны, ён насычаны спасылкамі, што патрабуе ад карыстальніка далейшых пошукаў).

Сацыяльна-педагагічны патэнцыял біябібліяграфічнай інфармацыі цесна звязаны з працэсамі абуджэння нацыянальнай самасвядомасці, памкненнямі беларусаў да сваіх каранёў, назапашанага пласта культурных каштоўнасцей. Біябібліяграфічная інфармацыя праз неад'емнае адзінства біяграфічнага і бібліяграфічнага ў сваёй структуры дазваляе выяўляць і распаўсюджваць неацэнныя звесткі аб тых дзеячах і калектывах культуры, навукі, адукацыі, якія сваім жыццём і дзейнасцю, мастацкай і інтэлектуальнай творчасцю развіваюць і ўдасканальваюць культурнае, навуковае, эканамічнае жыццё краіны.

Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці з'яўляецца часткай грамадзянскага выхавання. Змест фарміравання і выхавання нацыянальнай самасвядомасці рэалізуецца з выкарыстаннем розных форм, метадаў і сродкаў. Сярод іх можна вылучыць арганізацыю працы па вывучэнні нацыянальных сімвалаў, прыроды роднага краю, яго гістарычнай мінуўшчыны. Прадугледжваецца інфармаванне аб дасягненнях краіны ў галі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не культуры, навукі, тэхнікі. Гэты кірунак выхаваўчай і адукацыйнай працы рэалізуецца падчас знаёмства з жыццём і дзейнасцю прадстаўнікоў розных галін навукі і культуры. Важным фактарам і сродкам развіцця гісторыка-культурнага асяроддзя дзяржавы з'яўляецца біябібліяграфічная інфармацыя, якая фіксуе вынікі дзейнасці чалавека і калектыву бібліяграфічнымі сродкамі і, тым самым, удзельнічае ў назапашванні, засваенні і трансляцыі культурных каштоўнасцей.

Сярод выхаваўчых задач, пры вырашэнні якіх яскрава выяўляецца сацыяльна-педагагічны патэнцыял біябібліяграфічнай інфармацыі, варта вылучыць задачу фарміравання гатоўнасці да прафесіі ў будучых спецыялістаў. Псіхолагамі-практыкамі разглядаецца такая псіхалагічная характарыстыка чалавека, як «гатоўнасць» або «прыдатнасць» да дзейнасці: разумеецца ўвесь комплекс псіхічных асаблівасцей, які забяспечвае паспяховае выкананне вызначанай дзейнасці. Адносіны да прафесіі, матывы яе выбару надзвычай важныя (а пры некаторых акалічнасцях і вызначальныя) фактары, якія абумоўліваюць паспяховасць прафесійнага навучання. Прынцыповы характар маюць словы У. Д. Шадрыкава аб тым, што прыняцце прафесіі спараджае жаданне выконваць яе належным чынам, служыць зыходным момантам фарміравання псіхалагічнай сістэмы дзейнасці [1, с. 8].

Значным фактарам у прыняцці прафесіі, фарміраванні гатоўнасці да яе з'яўляецца наяўнасць у будучых спецыялістаў паглыбленых ведаў аб вядучых яе прадстаўніках. У гэтым выпадку дзейнічае вядомая філасофская тэорыя «значнага іншага».

Гатоўнасць да прафесіі цесна звязана з прыняццем прафесіі, адчуваннем сябе часткай прафесійнай супольнасці. Тут пэўнае значэнне мае сацыяльна-педагагічны патэнцыял біябібліяграфічнай інфармацыі ў фарміраванні карпаратыўнай культуры будучых і маладых спецыялістаў. Карпаратыўная культура ўяўляе сабой комплекс выпрацаваных і прызнаных калектывам сацыяльных норм, установак, арыентацый, стэрэатыпаў паводзін, якія прымушаюць чалавека, групу паводзіць сябе ў тых або іншых сітуацыях пэўным чынам. Культура групы людзей прымае форму рытуалаў, міфаў, легенд, моўных сімвалаў і артэфактаў. У сённяшні час карпаратыўная культура разглядаецца ў якасці галоўнага механізму забеспячэння практычнага павышэння эфектыўнасці працы арганізацыі. Карпаратыўная куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тура важная для любой арганізацыі, паколькі ўплывае на матывацыю супрацоўнікаў, маральнасць кожнага супрацоўніка, прадуктыўнасць і эфектыўнасць працоўнай дзейнасці, характар асабістых і вытворчых адносін у арганізацыі, стаўленне супрацоўнікаў да працы, творчы патэнцыял супрацоўнікаў. Паняцце «карпаратыўная культура» традыцыйна выкарыстоўваюць у дачыненні асобных арганізацый і ўстаноў, аднак яно з'яўляецца і дастаткова значным для сферы дзейнасці ў цэлым.

Карпаратыўная культура ў арганізацыі, сферы дзейнасці будзе больш усвядомленая, успрынятая яе супрацоўнікамі, калі яны асабіста або завочна (праз часопісныя і газетныя артыкулы, іншыя інфармацыйныя матэрыялы) знаёмяцца з найбольш яркімі прадстаўнікамі арганізацыі, сферы дзейнасці. Давядзенне на лекцыйных занятках, куратарскіх гадзінах інфармацыі аб вядомых прадстаўніках абранай прафесіі (у прыватнасці, біябібліяграфічнай інфармацыі як аднаго з паказчыкаў прызнання аўтарытэту персаналіі, калектыву ў сваёй дзейнасці) дазволіць сфарміраваць у маладых спецыялістаў жаданне, па-першае, шанаваць абраную арганізацыю, сферу дзейнасці, яе прадстаўнікоў і, па-другое, самому дамагчыся такіх жа значных вынікаў у сваёй дзейнасці.

Адраджэнне і захаванне нацыянальнай памяці – найбольш важныя задачы, якія стаяць перад дзеячамі сучаснай айчыннай культуры [7]. Вучоныя, краязнаўцы, даследчыкі, бібліёграфы і ўсе тыя, хто ганарыцца гісторыка-культурнай і навуковай спадчынай сваёй краіны, паступова прыходзяць да асэнсавання неабходнасці вывучэння жыцця і дзейнасці персаналій і калектываў розных сфер дзейнасці; стварэння біябібліяграфічных манаграфій аб іх, а таксама шматперсанальных дапаможнікаў. Вядома, што кульмінацыяй прызнання значнасці дзейнасці чалавека перад нацыяй і сусветным згуртаваннем служыць з'яўленне асобнага напрамку навуковай дзейнасці, напрыклад Пушкініяны ў Расіі, Скарыніяны ў Беларусі. Без лоцыі, або без біябібліяграфічнага забеспячэння, паспяховае развіццё гэтых накірункаў марудзіцца. Наяўнасць біябібліяграфічнай інфармацыі, разуменне яе функцыянальнага патэнцыялу, эфектыўнае шматаспектнае яе выкарыстанне з мэтай генерацыі і распаўсюджання комплексных звестак аб персаналіі і калектыве як суб'екце і аб'екце культуры, як аднаго са складнікаў у сістэме

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхавання грамадзян сваёй краіны – выразны барометр адносін грамадства да дасягненняў чалавека і дзяржавы [6].

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Диагностические* методики выявления профессиональных склонностей учащихся / Респ. ин-т высш. шк. ; сост. В. Д. Скаковский, А. Н. Беленков. – Минск, 2007. – 97 с.

2. *Захарчук, Т. В.* Биобиблиографические указатели как информационная база исследования субъекта научного творчества / Т. В. Захарчук // Проблемы деятельности ученого и научных коллективов. – СПб., 1995. – Вып. 9, ч. 1. – С. 114–121.

3. *Захарчук, Т. В.* Биобиблиография в системе профессионального общения / Т. В. Захарчук // Мир библиографии. – 1998. – № 4. – С. 7–1.

4. *Захарчук, Т. В.* Биобиблиография естествознания и техники в системе научных коммуникаций: автореф. дис. … канд. пед. наук : 05.25.03 / Т. В. Захарчук ; С.-Петербург. гос. акад. культуры. – СПб., 1996. – 13 с.

5. *Козачек, Н. Н.* Персональная краеведческая библиография деятелей искусства: специфика, место в культурной жизни региона: дис. … канд. пед. наук: 05.25.03 / Н. Н. Козачек. – Краснодар, 2002. – 164 л.

6. *Козленко, Е. Ю.* Биобиблиографическая информация в учебном и воспитательном процессе высшей школы : метод. реком. / Е. Ю. Козленко. – Минск: Бел. гос. ун-т культуры и искусств, 2009. – 32 с.

7. *Концепция* непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь (2006 г.).

8. *Крымская, А. С.* Персональная библиография в технологиях менеджмента знаний: дис. … канд. пед. наук : 05.25.03 / А. С. Крымская. – СПб., 2005. – 389 л.

9. *Крымская, А. С.* Перспективы персональной библиографии в технологиях управления знаниями / А. С. Крымская // Российское библиографоведение: итоги и перспективы : сб. науч. ст. / сост., науч. ред. Т. Ф. Лиховид. – М. : Фаир-Пресс, 2006. – С. 440–453.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.3. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял бібліятэрапіі і яго рэалізацыя ў абслугоўванні асобных катэгорый карыстальнікаў бібліятэк

Кніга і чытанне традыцыйна з’яўляюцца не толькі сродкамі пазнання, але і крыніцамі эмоцый, спосабам гарманізацыі чалавечых адносін, стымулявання самасвядомасці, забеспячэння адэкватнай самаацэнкі, аказання дапамогі чытачу ў вызначэнні сваіх інтарэсаў, планаванні аптымальных дзеянняў для вырашэння жыццёва важных задач.

У самім працэсе чытання закладзена магчымасць рэверсіі – змены роляў, пры якой звычайна адбываецца пераключэнне ўвагі з эгаістычных перажыванняў на перажыванні іншага, станоўчага парадку. Даючы веданне чужога вопыту, навяваючы той ці іншы настрой, наводзячы на разважанні, кніга пашырае сферу свядомасці, падказвае шлях руху думкі ад безвыходнасці да творчай актыўнасці.

Сутнасць сацыяльна-педагагічнай дзейнасці бібліятэкі заключаецца ў арганізацыі праз кнігу і чытанне мэтанакіраванага працэсу фарміравання развітой асобы, узбагачэння яе ведамі, выхавання станоўчых асобасных якасцей, карэкцыі адхіленняў у паводзінах, інтэграцыі ў соцыум. Эфектыўнай рэалізацыі задач гэтай дзейнасці спрыяе *арганізацыя бібліятэрапеўтычнага працэсу* з улікам узроставых асаблівасцей карыстальнікаў.

Паняцце «бібліятэрапія» (гр. biblion – кніга і therapeia – лячыць) было ўведзена ў навуковы абыходак у ЗША напачатку XX ст. Сэмюэлем Крозэрсам, які ўпершыню ў гісторыі бібліятэрапеўтычнай думкі ажыццявіў тэарэтычную дыферэнцыяцыю бібліятэрапіі, вызначыўшы яе як прадпісанне кніг у медыцыне і псіхіятрыі дзеля тэрапеўтычнай дапамогі пацыентам [12].

З таго часу бібліятэрапіяй называецца міждысцыплінарная галіна ведаў аб лячэбным эфекце чытання літаратуры розных жанраў, тыпаў і разнавіднасцей. Асновы гэтых ведаў створаны аб'яднанымі даследчымі намаганнямі бібліятэказнаўцаў, педагогаў, сацыяльных работнікаў, медыкаў, кнігазнаўцаў, псіхолагаў, псіхіятраў.

Бібліятэрапія як навуковая дысцыпліна і спецыфічны метад кіраўніцтва чытаннем выступае адным з прыярытэтных напрамкаў бібліятэчнай педагогікі. Яна заклікана спрыяць вырашэнню праблем фарміравання ў чытача ўменняў і навыкаў супрацьстаяння экстрэмальным сітуацыям: хваробам, страхам, дэпрэсіям. Не менш важнай задачай з'яўляецца таксама ўмацаванне сілы волі, падвышэнне інтэлектуальнага і адукацыйнага ўзроўню асобы, што дасягаецца шляхам сінтэзавання сітуацый чытання падчас асэнсавання і абмеркавання прачытанага.

Даказана, што бібліятэрапія разам з арт-тэрапіяй, араматэрапіяй, музычнай тэрапіяй «запускае» псіхічны механізм выцяснення станоўчымі эмоцыямі эмоцый адмоўных, нейтралізуючы тым самым іх згубнае ўздзеянне як на біяхімічныя, фізіялагічныя працэсы, што адбываюцца ў чалавечым арганізме, так і на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльныя паводзіны людзей (Ф. Я. Васілюк, П. Глева, Л. Гозман, М. А. Уолш) [1].

Інфарматызацыя дазваляе бібліятэкарам паставіць на службу бібліятэрапіі сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі. Але значныя групы людзей не маюць магчымасці імі карыстацца. Публічныя бібліятэкі – як адзначаецца ў праекце PULMAN – надзвычай удала прыстасаваны да вырашэння праблемы лічбавай дыскрымінацыі шляхам развіцця новых паслуг. Таксама яны дапамогуць ліквідаваць прабелы ў адукацыі карыстальнікам, якія па тых ці іншых прычынах не маюць камп’ютара і адпаведна выхаду ў Інтэрнэт [9].

Вывучаючы заканамернасці сэнсавага і эмацыйнага ўспрымання друкаванага слова і на гэтай аснове распрацоўваючы метады псіхалагічнай карэкцыі асобы пры дапамозе лячэбнага чытання (або праслухоўвання) спецыяльна падабраных тэкстаў, бібліятэрапія спрыяе засваенню ідэй і прыкладаў, увасобленых у кнігах або іншых носьбітах інфармацыі. Пры гэтым яна ўлічвае асаблівасці паводзін людзей як чытачоў і ажыццяўляе свае мэты на аснове прынцыпаў, форм і метадаў педагагічнага ўплыву на карыстальнікаў бібліятэк. Перафразуючы вядомае азначэнне кіраўніцтва чытаннем, бібліятэрапію можна разглядаць як *мэтанакіраванае і планамернае ўздзеянне на змест і характар чытання з мэтай псіхалагічнай карэкцыі асобы, падвышэння яе адаптыўных магчымасцей, фарміравання навыкаў здаровага ладу жыцця.*

Бібліятэрапія – параўнальна маладая навука, і яе гісторыя яшчэ чакае свайго даследчыка. Аднак сёння можна з поўнай упэўненасцю сказаць, што вялікі ўплыў на развіццё бібліятэрапіі як навукі аказалі працы З. Фрэйда (1856–1939), І. П. Паўлава (1849–1936), У. М. Бехцерава (1857–1927), псіхатэрапеўта К. І. Платонава (1877–1969), у прыватнасці даследаванні апошняга аб слове як фізіялагічным і лячэбным фактары. Значны ўклад у развіццё бібліятэрапіі ўносяць навукоўцы розных краін.

Вывучэнне педагагічнага патэнцыялу бібліятэрапіі стала адным з прыярытэтных кірункаў навуковых даследаванняў кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У артыкулах У. А. Акуліча, Л. А. Дзямешкі, С. А. Паўлавай раскрываюцца асаблівасці выкарыстання бібліятэрапіі ў Беларусі. У 1990-я гг. бібліятэрапія пачынае разглядацца і як сродак рэ-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адаптацыі насельніцтва да посткатастрофных умоў жыцця (А. І. Смолік, У. А. Акуліч). Н. Я. Петушка [7] абараніла кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную тэарэтыка-метадычным аспектам бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку, у якой абгрунтоўваецца выкарыстанне твораў беларускіх аўтараў у бібліятэрапіі і прыводзіцца спіс пэўных твораў. Выконваюцца і абараняюцца дыпломныя працы, магістарскія і кандыдацкія дысертацыі па пытаннях бібліятэрапіі. Таксама ажыццяўляецца даследаванне магчымасцей бібліятэрапіі ў карэкцыі дэвіянтных паводзін малодшых школьнікаў [11].

Цікавыя вынікі пададзены ў працы ўкраінскага бібліятэрапеўта А. М. Мілер, якая ў пачатку 1970-х гг. правяла ўнікальнае даследаванне ў санаторыі «Беразоўскія мінеральныя воды» (Харкаў) [6].

У гэты перыяд асноўная ўвага бібліятэрапеўтаў засяроджваецца на тэрапеўтычным патэнцыяле тэкстаў, іх класіфікацыі і выяўленні тэрапеўтычных характарыстык (А. М. Мілер, І. З. Вяльвоўскі, В. І. Малініна, А. Я. Аляксейчык, А. Я. Шапашнікаў, К. І. Вараб'ёва).

Плённыя ідэі і практычныя рэкамендацыі па бібліятэрапіі утрымліваюцца, напрыклад, у кнігах і артыкулах такіх расійскіх аўтараў, як Ю. М. Дрэшэр [7], А. Л. Кабачэк [8], Ж. У. Марусіч [5] і інш.

У ЗША рэгулярна праводзяцца «круглыя сталы», на якіх абмяркоўваюцца праблемы бібліятэрапіі. У Псіхіятрычным слоўніку П. З. Кэмпбэла [13] бібліятэрапія вызначаецца як «ужыванне чытання ў дапамогу псіхатэрапіі». Тут прыводзіцца даволі поўны пералік магчымага выкарыстання кнігі ў тэрапеўтычных мэтах. Яна, па меркаванні аўтара, заклікана дапамагчы чытачу лепш зразумець свае псіхалагічныя і фізіялагічныя рэакцыі, папоўніць або ўдакладніць веды.

Магчымасці выкарыстання псіхатэрапеўтычных ведаў і метадаў уяўляюць несумненную каштоўнасць для аптымізацыі працэсу зносін чалавека з кнігай на ўсіх этапах чытання і бібліятэчнага абслугоўвання. Амерыканскі псіхолаг Карл Роджэрс (1902–1987) падкрэсліваў, што пры выкарыстанні тэрапіі, «цэнтраванай на кліенце», чалавек пачынае па-іншаму глядзець на сябе. Ён больш поўна прымае сябе і свае пачуцці, больш давярае сабе, можа лепш кіраваць сабой, становіцца больш падобным на таго чалавека, якім бы сам жадаў стаць, робіцца больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гнуткім, меней застылым у сваім успрыманні, ставіць для сябе больш рэальныя мэты. Акрамя таго, яго паводзіны становяцца добра абдуманымі, ён пачынае больш добразычліва ўспрымаць іншых, яму становяцца больш даступныя прычыны таго, што адбываецца з ім самім і з яго асяроддзем, ён мяняе асноўныя якасці сваёй асобы ў лепшы бок [10]. Характэрна, што, ужываючы метады бібліятэрапіі, бібліятэкары імкнуцца менавіта да такіх змен у свядомасці і паводзінах кожнага карыстальніка, таму вывучэнне і адаптацыя дасягненняў псіхатэрапеўтаў для бібліятэчных мэт не менш важная задача, чым ужыванне прынцыпаў педагогікі і псіхалогіі.

Гісторыя вывучэння магчымасцей ужывання бібліятэрапіі ў сацыяльна-педагагічнай рабоце з дзецьмі пачынаецца з 1946 г., калі амерыканская сястра міласэрнасці М. Агнес эксперыментальна прымяніла бібліятэрапію ў практыцы работы з «цяжкімі» дзецьмі. З гэтага моманту бібліятэрапія пачынае мэтанакіравана ўжывацца для развіцця, выхавання дзіцяці, дапамогі ў пераадоленні яго праблем [14].

Такі параўнальна позні зварот да бібліятэрапіі як крыніцы паўнавартаснага фарміравання асобы дзіцяці і карэкцыі дэвіянтных паводзін тлумачыцца фактычна адсутнасцю дзіцячай літаратуры, якая адпавядала б мэтам бібліятэрапіі. Л. Мірэйкл адзначае, што да канца XIX ст. большасць дзіцячых кніг былі напісаны дыдактычнай, маралізатарскай мовай, дзеля таго каб праінструктаваць дзяцей, як трэба сябе паводзіць. Толькі напачатку XX ст. раманы і прыгодніцкія аповесці сталі пісаць для задавальнення інтарэсаў дзяцей [15].

У сярэдзіне 1970-х гг. ужыванне бібліятэрапеўтычных метадаў пры рабоце з дзіцячай аўдыторыяй пачынае разглядацца як найбольш эфектыўны кірунак бібліятэрапіі. Дзіця лепш за дарослага можа ідэнтыфікаваць сябе з героем кнігі, спалучаць свае праблемы з праблемамі персанажа, асэнсоўваць сваю жыццёвую сітуацыю і магчымыя шляхі выйсця з яе (даследаванні Olson, Pardek).

Далейшае развіццё дзіцячай бібліятэрапіі звязана з выкарыстаннем бібліятэрапеўтычнага патэнцыялу чытання кніг для ўздзеяння на дзяцей, якія зведалі глыбокія душэўныя перажыванні, падвергліся гвалтаванню, нарадзіліся з living рознымі псіхафізіялагічнымі абмежаваннямі (Р. Лянкоўскі, Д. Шэрыдан) [16].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэрапеўтычная практыка таксама набывае ўсё большае распаўсюджанне ў нашых бібліятэках. Асабліва актыўна яна ўжываецца ў дачыненні да дзяцей з дэвіянтнымі паводзінамі і асаблівасцямі развіцця. Прыкладам можа служыць клас-майстэрня «Чарадзейны ліхтарык» дзіцячай бібліятэкі № 2 г. Магілёва [8].

Работа клас-майстэрні накіравана на пабудову цэласнай сістэмы выхавання дзяцей малодшага школьнага ўзросту, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным асяроддзі. Яна прызвана забяспечыць актывізацыю іх развіцця, аказанне сацыялізуючага і адаптуючага ўздзеяння, фарміраванне эмацыйных і псіхічных асноў асобы, карэкцыю этычных і маральных норм чытача-дзіцяці, адцягненне ўвагі ад адчуваемага дыскамфорту, пераадоленне стрэсаў, дэпрэсій.

Псіхалагічная карэкцыя метадамі бібліятэрапіі і сацыяльнай педагогікі праводзілася з дзецьмі, у якіх узровень сфарміраванасці маральных якасцей нізкі і сярэдні. Праграма бібліятэрапеўтычнай дапамогі дзецям, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, разлічана на два гады: на першым этапе праводзіцца мэтанакіраваная карэкцыйная работа, другі этап мае карэкцыйна-развіваючы характар. Заняткі ўключаюць тры блокі:

– *бібліятэрапеўтычны* – гутаркі па прачытаных творах, чытанне ўголас, чытанне па ролях, аналіз характараў герояў, рэфлексія;

– *псіхалагічны* – дыягностыка, псіхалагічны трэнінг, развіваючыя гульні;

– *блок творчага самавыражэння* – маляванне, лепка.

Эксперыментальнае даследаванне ўплыву бібліятэрапеўтычных методык ва ўмовах дзіцячай бібліятэкі ажыццяўлялася ў некалькі этапаў.

На першым, пастановачным, этапе былі праведзены: адбор і аналіз культуралагічнай, бібліятэрапеўтычнай, псіхолага-педагагічнай, сацыяльна-педагагічнай, бібліятэказнаўчай літаратуры; вывучэнне сучасных бібліятэрапеўтычных і сацыяльна-педагагічных падыходаў; вызначэнне кола выкарыстоўваемай мастацкай літаратуры; распрацоўка праграмы заняткаў.

На другім, фарміруючым, этапе ажыццяўляліся: арганізацыя бібліятэрапеўтычнага працэсу ў дзіцячай бібліятэцы; эмпірыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нае вывучэнне яго эфектыўнасці; аналіз уплыву бібліятэрапеўтычных методык на дзяцей; вопытна-эксперыментальная работа.

Трэці, абагульняючы, этап прадугледжваў: абагульненне і апісанне вынікіў вопытна-эксперыментальнай работы – фармулёўку высноў; распрацоўку практычных рэкамендацый; афармленне рекамендацыйнага бібліяграфічнага паказальніка для дзяцей «Дзіўныя магчымасці кнігі».

На працягу двух гадоў сістэматычных заняткаў з псіхолагам і бібліятэкарам, дзякуючы псіхалагічнай карэкцыі сродкамі чытання і зносін, дзеці з небяспечных і апякунскіх сем'яў значна змянілі стаўленне да сябе, сяброў і блізкіх. Развіццё інтэлектуальных здольнасцей стала грунтам павышэння паспяховасці, адмаўлення ад дэвіянтных паводзін.

Падчас даследавання былі атрыманы станоўчыя вынікі ў галіне павышэння ўзроўню сфарміраванасці маральных якасцей дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Адбыліся станоўчыя змяненні ў дамінаванні духоўных каштоўнасцей над матэрыяльнымі. Зафіксаваны павышэнне самаацэнкі, зніжэнне агрэсіўнасці, трывожнасці, стабілізацыя эмацыйнага стану. Пры паўторнай дыягностыцы ў адказах дзяцей назіралася адэкватная ацэнка паводзін чалавека, учынкаў герояў, якасцей характару. Прыкметна палепшыліся паводзіны і зносіны: дзеці сталі больш добразычлівымі, адкрытымі, імкнуліся паводзіць сябе культурна, ужываць ветлівыя словы, разважаць, рабіць вывады. Адзначана і паляпшэнне паспяховасці ў школе, павелічэнне кантактнасці ў калектыве, а таксама актыўнасці ва ўзаемаадносінах.

Даследаванне пацвердзіла адзначаныя Ю. М. Дрэшэр уласцівасці бібліятэрапеўтычнага працэсу, у якім яскрава праяўляецца «*дзеянне закона пераходу колькасных змяненняў у якасныя*» [3, с. 254]. Усе інтэгратыўныя асобасныя характарыстыкі ўяўляюць сабой вынік паступовага назапашвання, нарошчвання колькасных змяненняў, а мэтанакіраваныя, паслядоўныя і планамерныя бібліятэрапеўтычныя ўздзеянні не адразу прыносяць станоўчыя вынікі, толькі з цягам пэўнага часу ў ходзе шматлікіх паўторных дзеянняў, практыкаванняў пэўная якасць праяўляецца як устойлівае асобаснае ўтварэнне.

Вынікі двух этапаў нашага даследавання (першы – у 2004 г.) супадаюць і дазваляюць канстатаваць, што станоўчы ўплыў бібліятэрапеўтычных методык на развіццё і карэкцыю мараль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най сферы асобы дзіцяці з'яўляецца не выпадковым, а заканамерным (эфектыўнасць бібліятэрапеўтычных методык разглядалася праз параўнанне эксперыментальных і кантрольных груп дзяцей).

Падводзячы вынікі эксперыментальнага вывучэння эфектыўнасці ўкаранення нашай мадэлі бібліятэрапіі ў практыку работы дзіцячай бібліятэкі № 2 г. Магілёва, адзначым яе дзейнасць пры рабоце з «цяжкімі» дзецьмі. Сістэматычныя сустрэчы і заняткі спрыяюць фарміраванню маральных асноў асобы чытача-дзіцяці, павышэнню яго самаацэнкі, карэкцыі паводзін і зносін, а таксама служаць спосабам прыцягнення дзяцей да сістэматычнага чытання.

Стварэнне цэласнай сістэмы выхавання дзяцей малодшага школьнага ўзросту, якія патрабуюць асобага педагагічнага падыходу, актывізавала развіццё новых кірункаў у дзейнасці бібліятэкі, узмацніла супрацоўніцтва з установамі адукацыі і выхавання, сацыяльнымі службамі. Бібліятэкары імкнуцца праз кнігу, чытанне, заняткі мастацкай творчасцю адцягнуць увагу маленькіх карыстальнікаў ад шкодных прывычак, далучыць іх да сістэматычнага пазнання, прывіць пачуццё самапавагі, сфарміраваць эмацыйныя і маральныя асновы асобы, спрыяць сацыялізацыі і адаптацыі.

Не менш важнай, чым бібліятэрапія, у дачыненні да дзяцей і асоб з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, якія апынуліся ў цяжкіх жыццёвых абставінах, з'яўляецца праца з іх непасрэдным асяроддзем: роднымі, блізкімі, сябрамі, суседзямі. І гэта не менш удзячная справа, чым дапамога самім інвалідам.

Аднак для далейшага развіцця бібліятэрапеўтычнай тэорыі і практыкі неабходны новыя падыходы да сістэмы падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў, увядзенне новых, здвоеных кваліфікацый: бібліятэкар-псіхолаг, бібліятэкар-сацыёлаг, бібліятэкар-сацыяльны работнік, бібліятэкар-бібліятэрапеўт. Але можна пазбегнуць штучнага пашырэння пераліку спецыяльнасцей, так ці іначай звязаных з сацыяльнай працай, за кошт увядзення комплекснай здвоенай кваліфікацыі бібліятэкар-сацыяльны работнік, бо сацыяльная праца ўключае і сацыяльную педагогіку, і бібліятэрапію, і псіхалогію як сродак дасягнення адпаведнай сацыяльна значнай мэты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Борецка, И.* Библиотерапия : лекции / И. Борецка ; пер. с пол. И. Ф. Притульчик. – Гродно : ГрГУ, 2007. – 99 с.

2. *Дрешер, Ю. Н.* Современная концепция подготовки специалиста-библиотерапевта : науч.-метод. пособие / Ю. Н. Дрешер. – М. : Либерея, 2003. – 247 с.

3. *Дрешер, Ю. Н.* Библиотерапия: полный курс / Ю. Н. Дрешер. – М. : ФАИР, 2007. – 559 с.

4. *Кабачек, О. Л.* Сказка в век компьютера : метод. пособие в помощь библиотекарям и педагогам, работающим с детьми мл. и средн. школьн. возраста / О. Л. Кабачек. – М. : Либерея, 2001. – 205 с.

5. *Марусич, Ж. В.* Библиотечное обслуживание инвалидов по зрению средствами новых информационных технологий / Ж. В. Марусич. – М. : Либерея, 2004. – 95 с.

6. *Миллер, А. М.* Особенности руководства чтением больных в библиотеках лечебно-профилактических учреждений : автореф. дис. … канд. пед. наук / А. М. Миллер. – Л., 1975. – 22 с.

7. *Петушко, Н. Е.* Библиотерапия: компенсаторное чтение художественной литературы / Н. Е. Петушко // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2003. – № 5. – С. 29–41.

8. *Программа* класс-мастерской «Волшебный фонарик» / сост. Г. И. Кравченко, И. А. Рыбакова. – Могилев, 2007. – 32 с.

9. *Публичные* библиотеки в век цифровой информации. Рекомендация проекта PULMAN Европейской комиссии. – М. : Гранд-Фаир, 2004. – 410 с.

10. *Роджерс, К. Г.* Взгляд на психотерапию: становление человека : пер англ. / К. Г. Роджерс. – М. : Прогресс, 1994. – 480 с.

11. *Рыбакова, И. А.* Зарубежный и отечественный опыт использования библиотерапии в работе с детьми и подростками / И. А. Рыбакова // Бібліятэчны свет. – 2007. – № 4. – С. 20–22.

12. *Tews, R. M.* Bibliotherapy / R. M. Tews // Encyclopedia of library and information science. – New York ; London, 1969. – Vol. 2. – P. 448–457.

13. *Campbell, P. S.* Psychiatry dictionary / P. S. Campbell. – 3 ed. – New York : Oxford University Press, 1981. – P. 80.

14. *Agnes, S. M.* Bibliotherapy for Socially Maladjusted Children / S. M. Agnes // Catholic Educational Review. – 1946. – 44. – P. 8–16.

15. *Pardeck, J. T.* Using Bibliotherapy in Clinical Practice with Children / J. T. Pardeck // Psychological Reports. – 1990. – 67. – P. 1043–1049.

16. *Tews, R. M.* Progress in bibliotherapy / R. M. Tews // Advances in librarianship. – New York, 1970. – Vol. 1. – P. 171–188.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.4. Праектная дзейнасць бібліятэк: сацыяльна-педагагічны патэнцыял

Праектная дзейнасць з'яўляецца неад'емнай часткай сучаснай стратэгіі кіравання бібліятэкай. Яна ўяўляе сабой спалучэнне паслядоўных дзеянняў прафесійна-грамадскага характару, якія дазваляюць дасягаць пэўных вынікаў, звязаных з якаснымі і змястоўнымі зменамі ў бібліятэчным абслугоўванні, пераўтварэннем бібліятэчнага асяроддзя.

Да асноўных складнікаў праектнай дзейнасці адносяцца бібліятэчныя праекты і мэтавыя бібліятэчныя праграмы. Бібліятэчны праект – гэта сістэма мерапрыемстваў сацыяльнага, адукацыйнага, выхаваўчага характару, прызначаных ўдасканаліць дзейнасць бібліятэк у сферах абслугоўвання карыстальнікаў, павышэння прафесійнага ўзроўню бібліятэкараў, прымянення бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій і рэсурсаў. Мэтавая бібліятэчная праграма ўяўляе сукупнасць паслядоўных праектаў, якія аб'яднаны агульнай мэтай і маюць сістэмную, комплексную накіраванасць.

Метадалагічнай асновай праектнай дзейнасці бібліятэк з'яўляецца педагагічны метад праектаў, заснаваны на тэарэтычных канцэпцыях прагматычнай педагогікі другой паловы XIX ст. Распрацоўшчыкам гэтага метаду лічыцца філосаф-ідэаліст Джон Дзьюі, які падкрэсліваў: «…сапраўдным і каштоўным з'яўляецца тое, што карысна людзям, што дае практычны вынік і накіравана ў выгоду ўсяго грамадства» [цыт.: 9, с. 13].

Асноўным прынцыпам рэалізацыі метаду праектаў стала «навучанне праз дзеянне», што забяспечвае развіццё творчай ініцыятывы і самастойнасці ўдзельнікаў праектных распрацовак [6, с. 79].

З цягам часу праектныя методыкі пачалі развівацца сугучна з дзейнасна-асобасным падыходам у навучанні і выхаванні. Сёння, у гэтым кантэксце, існуе некалькі аўтарскіх поглядаў. Так, праект асацыіруецца са «спосабам дасягнення дыдактычнай мэты праз дэталёвую распрацоўку праблемы (тэхналогію), якая павінна завяршыцца рэальным, прыкметным практычным вынікам, аформленым тым ці іншым чынам» [13, с. 41]. Ёсць меркаванне, што праект – дыдактычны сродак, які дазваляе вучыць, як адзначае Г. А. Лякіна, удзельнікаў праектавання праблематызацыі, планаванню дзейнасці, пошуку патрэбнай ін-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фармацыі, правядзенню даследавання (аналізу, сінтэзу, вылучэнню гіпотэз, дэталізацыі, абагульненню), самааналізу і рэфлексіі, выбару, асваенню і выкарыстанню адэкватнай тэхналогіі стварэння прадукту праектавання, прэзентацыі этапаў праектнай дзейнасці і яе вынікаў [9, с. 14]. Відавочна, што праектныя методыкі дапамагаюць абагульняць і структурыраваць вопыт сацыяльных ўзаемаадносін, укараняць інавацыі.

Асобныя аспекты тэарэтычнага абгрунтавання праектнай дзейнасці знаходзяць адлюстраванне ў шэрагу разнастайных па змесце работ спецыялістаў у галіне інфармацыйных тэхналогій. Сутнасныя рысы бібліятэчнага праектавання разглядаюцца з сістэмнага (У. І. Варапаеў, З. І. Злотнікава, І. М. Суслава) і кіраўніцкага (Н. В. Жадзько, С. А. Паўлава, А. А. Пурнік) пунктаў гледжання.

Абапіраючыся на вучэнне Ю. М. Сталярова аб чатырохэлементнай сістэме «бібліятэка», І. М. Суслава і З. І. Злотнікава прапанавалі наступную іерархію кампанентаў ці падсістэм праектавання: канцэпцыя – праграма – праект [16, с. 76]; класіфікацыю тыпаў праектаў ў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, дзе сярод прыкмет вылучаны ўзровень праекта, яго памер і характар, тэрміны рэалізацыі, характар мэтавай задачы (змест) [16, с. 88].

У той жа час у праектнай дзейнасці значная роля належыць ступені развіцця, руху аб’екта праектавання, што ўплывае на яго якасныя і колькасныя характарыстыкі, такія, напрыклад, як павелічэнне фонду бібліятэкі, паказчыкаў чытальнасці, кнігавыдачы і інш.

У бібліятэчным праектаванні важнай з’яўляецца яго накіраванасць. Яна вызначае ўзровень удасканалення бібліятэчнай работы сродкамі праектных тэхналогій, дзе асобая роля належыць патрэбнасцям, запытам, інтарэсам, імкненням, перакананням, як групавым і асобасным, так і прафесійным.

Дадзеная накіраванасць павінна ўлічвацца пры структурыраванні бібліятэчнага праекта ці мэтавай праграмы. Тым больш што на практыцы ў змесце бібліятэчных праектаў і мэтавых праграм значная ўвага надаецца арганізацыі масавых і індывідуальных форм работы з карыстальнікамі, арыентацыі на іх чытацкія патрэбнасці, выкарыстанне прыватных методык абслугоўвання. Гэты прынцып праектавання ўжо выкарыстоўваецца ў публічных бібліятэках Беларусі і распаўсюджваецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на бібліятэчныя праекты і мэтавыя праграмы рознай тэматыкі: «Зямля, дзе пачаўся наш край» (краязнаўства, Пухавіцкая РЦБС); «Развіццё традыцыйнай культуры» (маральна-патрыятычнае выхаванне, Лельчыцкая РЦБС); «Здаровы лад жыцця – аснова моцнай сям'і» (прапаганда здаровага ладу жыцця, Валожынская РЦБС).

Кіраўніцкі аспект бібліятэчнага праектавання заснаваны на распрацоўцы тэарэтыка-метадычных палажэнняў прыцягнення рэсурсаў праектавання, іх выкарыстання і ўздзеяння на сацыяльна-эканамічны стан бібліятэчнай установы, эфектыўнасць іх рэалізацыі і мэтавую арыентацыю [14; 15]. Як адзначае С. А. Паўлава, «кіраванне праектамі – асобны тып кіравання, які патрабуе адпаведнай камбінацыі ўсіх яго параметраў: структуры сістэмы кіравання, размеркавання функцый, пабудовы і выкарыстання спецыялізаванай тэхналогіі і арганізацыі кіравання» [11, с. 45]. Пры гэтым эфектыўнасць праектнай дзейнасці вызначаецца паслядоўнасцю ўзаемадзеяння яе суб'ектаў. Такое ўзаемадзеянне адбываецца на суб'ект – суб'ектным узроўні паміж кіраўнікамі бібліятэк, кіраўнікамі праектаў, функцыянальнымі менеджарамі праектаў, бібліятэчнымі спецыялістамі – выканаўцамі пэўных тэхналагічных аперацый у межах праекта, спонсарамі, дабрачынцамі, некамерцыйнымі арганізацыямі. Разам з тым у тэорыі праектнай дзейнасці недастаткова даследуюцца пытанні ўзаемаўплыву праектных тэхналогій і адпаведных задач праектавання і развіцця агульных і спецыяльных здольнасцей суб'ектаў гэтай дзейнасці, шырыні і рознабаковасці іх запытаў, рысаў характару.

Тэарэтычнае асэнсаванне праектнай дзейнасці сведчыць аб тым, што незалежна ад кантэксту выкарыстання праектныя методыкі характарызуюцца такімі катэгорыямі, як мэтанакіраванасць, прыярытэтнасць, сістэмнасць, абмежаванасць і інш. [3; 4; 8; 17].

Аналіз сістэмных і інтэгральных асаблівасцей праектавання дазваляе разглядаць праграміраванне як форму праектнай дзейнасці бібліятэк, якая спрыяе выкананню скаардынаваных дзеянняў, аб'яднаных маштабнасцю і складанасцю праектных рашэнняў, а таксама ўліку спецыялізацыі і ўзроўню кваліфікацыі выканаўцаў.

Пры даследаванні праблемы праектнай дзейнасці ў бібліятэказнаўчай літаратуры практычна адсутнічаюць яе сацыяльна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагагічнае асэнсаванне, перспектыўнасць з пункту гледжання прафесіяналізму бібліятэчных кадраў [5; 7; 18]. Пры гэтым менавіта сацыяльны і прафесійны аспекты бібліятэчнага праектавання і праграміравання могуць стаць вызначальнымі ў працэсе ініцыіравання і прыцягнення пазабюджэтных сродкаў; яны маюць двухбаковы характар. Па-першае, гэта ўплыў арганізаванымі сродкамі бібліятэчнай работы на павышэнне адукацыйнага, прафесійнага, культурнага ўзроўняў карыстальнікаў, па-другое, дасягненне прафесійнай паспяховасці ў пытаннях акумулявання пазабюджэтных сродкаў на грамадска важныя пачынанні.

У сувязі з гэтым праектную дзейнасць бібліятэк можна разглядаць як працэс, які дазваляе больш дынамічна развіваць прыярытэтныя кірункі бібліятэчнай работы і, як вынік, спрыяе аб'яднанню прафесійнага патэнцыялу супрацоўнікаў, інфармацыйна-спажывецкіх запытаў карыстальнікаў у мэтах пераўтварэння бібліятэчнага асяроддзя з улікам магчымага ў будучым якаснага стану аб'екта праектавання. Вопыт праектнай дзейнасці айчынных бібліятэк і яе пазіцыяванне ў грамадстве дазваляюць дыферэнцаваць бібліятэчныя праекты і мэтавыя праграмы па наступных крытэрыях:

– у залежнасці ад маштабу фарміравання і выкарыстання (мега-, мона-, мульціпраекты);

– па прызначэнні (для ўнутранага выкарыстання, для знешняга выкарыстання);

– па статусе (міжнародныя, нацыянальныя, рэгіянальныя, галіновыя, лакальныя);

– па форме ўдзелу бібліятэкі ў рэалізацыі праекта (інфраструктурныя, прафесійна-інтэлектуальныя);

– па дамінуючай дзейнасці выканаўцаў (творчыя, ролевыя);

– па накіраванасці (прафілактычныя, тлумачальныя, навукова-даследчыя, практыка-арыентаваныя);

– па ўздзеянні на ўдзельнікаў (сацыялізуючыя, адаптацыйныя, выхаваўчыя, адукацыйныя);

– па форме арганізацыі і распрацоўкі (аўтарскія, сааўтарскія, калектыўныя);

– па працягласці (доўгатэрміновыя, сярэднетэрміновыя, кароткія);

– па тэматыка-змястоўнай прыкмеце (інфармацыйныя, рэкрэацыйныя, культурныя).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такая дыферэнцыяцыя абумоўлена некалькімі абставінамі. Сярод іх тыпалагічныя адрозненні бібліятэк, іх адукацыйна-выхаваўчы і развіваючы патэнцыял, уплыў асобасна-прафесійных якасцей распрацоўшчыкаў і ўдзельнікаў, свядомае ўзаемадзеянне розных суб’ектаў грамадскасці, сумесная дзейнасць членаў соцыуму. Сацыяльнае ўзаемадзеянне абумоўлівае вырашэнне сацыяльнай праблемы пры праяўленні і фарміраванні асобы чытача і бібліятэкара праз дзейнасць. І як вынік – наяўнасць сацыялагічных, псіхолага-педагагічных і арганізацыйна-дзейнасных умоў, якія вызначаюць праектную дзейнасць як устойлівы сфарміраваны элемент бібліятэчнай работы.

Сацыялагічны складнік бібліятэчнага праектавання патрэбны для выяўлення ўспрымання праграмна-мэтавай дзейнасці карыстальнікамі і ўласнікамі бібліятэк і сацыяльнай патрэбнасці ў ёй. Даследчы працэс разглядаецца праз прызму ведаў бібліятэчных спецыялістаў і грамадскасці аб мэтавым фінансаванні, відах камунікацыі, даступнасці праектавання; эфектыўнасці і якасці мэтавага абслугоўвання абанентаў; неабходнасці спецыяльнай падрыхтоўкі бібліятэчнага персаналу.

Вынікі спецыяльных даследаванняў садзейнічаюць абгрунтаванню праблемных кірункаў праектавання і іх актуалізацыі, уключэнню праектнай дзейнасці ў планы работы бібліятэк, правядзенню аналізу меркаванняў экспертаў і карыстальнікаў наконт развіцця праектавання ў той ці іншай бібліятэцы, бібліятэчнай сістэме. Сацыяльна-арыентаванае праектаванне дазваляе раскрыць педагагічную камунікацыю, звязаную з вучэбнай, навуковай, самаадукацыйнай дзейнасцю ўдзельнікаў працэсу падрыхтоўкі і рэалізацыі пэўнага бібліятэчнага праекта, мэтавай праграмы.

Педагагічны аспект праектнай дзейнасці разглядаецца ў святле педагагічных ведаў, якія дапамагаюць раскрыць асаблівасці асобы чытача, вызначыць заканамернасці працэсу выхавання, неабходнасць педагагічнага ўздзеяння і на гэтай аснове мадэліраваць змест і структуру праграм пазабюджэтнага фінансавання. Педагагічныя навыкі бібліятэчных спецыялістаў дазваляюць выявіць пазнавальныя патрэбнасці чытачоў, метады, сродкі і формы задавальнення запытаў рознага віду; распрацоўваць праграмы дадатковай адукацыі, аказваць дапамогу педагогам у выбары спосабаў дзеяння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разгледжаныя ўмовы, як і праблема атрымання прафесійных кампетэнцый у сферы праектнага развіцця бібліятэк, маюць дэскрыптыўны характар [1; 2; 10]. Тым не менш праектная дзейнасць з'яўляецца сродкам эфектыўнага развіцця бібліятэкі, кожнага яе супрацоўніка і карыстальнікаў. Аднак дасягненне прафесійна важных якасцей бібліятэчных спецыялістаў, павышэнне калектыўнай кампетэнцыі і развіццё бібліятэкі знаходзяцца ва ўзаемнай залежнасці, бо ў рамках работы над бібліятэчным праектам раскрываюцца і дапаўняюцца прафесійныя веды і ўменні, а таксама праяўляюцца асобасныя якасці, здольнасць працаваць у калектыве, матывацыя. Апошняя мае значэнне пры ўстанаўленні прафесійных і асобасных зносін удзельнікаў праектавання. Зацікаўленасць супрацоўнікаў бібліятэкі ў паспяховай рэалізацыі праекта абумоўліваецца магчымасцю пашырэння сферы зносін, выкарыстання вопыту калег, развіцця прафесійных якасцей, творчай ініцыятывы і актыўнасці. Дадзены аспект праблемы яскрава праяўляецца ў дзейнасці бібліятэк па сацыялізацыі карыстальнікаў. Гэта тлумачыцца жаданнем бібліятэчных установаў цэласна і шматаспектна развіваць існуючую сістэму бібліятэчнага абслугоўвання.

Так, пры распрацоўцы праграм і праектаў падтрымкі дзіцячага чытання вядучая роля належыць гульнёвым і ролевым элементам праектавання. Асноўнай мэтай бібліятэчнага праекта і мерапрыемстваў, што ўваходзяць ў яго склад, можа стаць арыентацыя на развіваючы патэнцыял гульні, а таксама віктарын, конкурсаў і інш. Гэтыя формы работы з чытачамі пашыраюць іх светапогляд, стымулююць пазнавальную актыўнасць, садзейнічаюць засваенню і разуменню розных з'яў, іх інтэрпрэтацыі, самавыяўленню, рэкрэацыі, самарэалізацыі. У сваю чаргу, бібліятэчныя спецыялісты павінны валодаць кампетэнцыямі, якія садзейнічаюць фарміраванню і развіццю асобы з улікам яе ўзроставых асаблівасцей. Праектная дзейнасць павінна спрыяць эмацыянальнаму развіццю асобы, станаўленню сферы паводзін, праяўленню маральных якасцей, самавызначэнню, патрэбнасці ў творчасці.

Чытачы школьнага і студэнцкага ўзросту сацыялізуюцца ў працэсе вучэбнай дзейнасці. Задача бібліятэчнага праектавання – дапамагчы ў выбары прафесіі, садзейнічаць адукацыі, фарміраванню грамадзянскай пазіцыі. Праектная дзейнасць можа будавацца на аснове такіх форм бібліятэчнага абслугоўвання,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як чытацкія канферэнцыі, гутаркі аб прачытаным, вусныя часопісы, якія актывізуюць мысленне, памяць, супастаўленне, аналіз, абагульненне і іншыя працэсы.

Прафесійная дзейнасць, сталасць асобы чытача, асаблівасці старэйшага ўзросту вызначаюць далейшыя стадыі сацыялізацыі. Бібліятэчныя праекты і праграмы павінны дапамагаць карыстальніку ў яго кар'ерным росце, павышэнні кваліфікацыі, арганізацыі вольнага часу. У іх рамках магчыма стварэнне і прадастаўленне бібліятэчна-інфармацыйнай прадукцыі грамадска-палітычнага, прававога, аздараўленчага і іншага зместу; арганізацыя дзён інфармацыі, дзён спецыяліста, комплексных форм абслугоўвання.

У працэсе праектавання яго ўдзельнікі атрымоўваюць не толькі магчымасць дэманстрацыі індывідуальных поглядаў на праект, але і калектыўнага прыняцця рашэнняў, што служыць падставай узнікнення арыгінальных ідэй мадэліравання бібліятэчнага асяроддзя, вызначэння ступені ўздзеяння вынікаў гэтай дзейнасці на эфектыўнасць абслугоўвання.

Змест бібліятэчнага праектавання павінен адлюстроўваць такія формы работы з чытачамі, якія б садзейнічалі развіццю чытацкай актыўнасці і самастойнасці. Прызначэнне праектнай дзейнасці бачыцца ў распрацоўцы мадэляў чытацкай дзейнасці, вывучэнні матывацыі, даследаванні ролі бібліятэкі ў задавальненні інфармацыйных патрэбнасцей, запытаў і інтарэсаў, стварэнні комплексных праграм камплектавання бібліятэчнага фонду, укараненні сучасных сродкаў аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў і аперацый.

Фарміраванне і развіццё праектнай дзейнасці прадугледжваюць наяўнасць камунікацыі, якая ажыццяўляецца на вербальным узроўні. У працэсе зносін удзельнікаў праектавання ствараецца непасрэдны вынік усёй дзейнасці. Бібліятэкар як суб'ект праектнай дзейнасці фарміруе праблемнае поле праекта на аснове вывучэння сацыякультурнай сітуацыі ў зоне абслугоўвання, структурыруе яе элементы, арганізуе бібліятэчнае асяроддзе, рыхтуе праектную дакументацыю, вядзе перамовы з патэнцыяльнымі спонсарамі, кансультантамі.

Бібліятэчны праект (мэтавая праграма) можа разглядацца як своеасаблівая мадэль, якая ўключае ў сябе моўна-графічнае абгрунтаванне будучых змяненняў; лічбавую, фактаграфічную інфармацыю, якая сведчыць аб станоўчых выніках праектаван-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня; матывацыйна-камунікатыўнае ўзаемадзеянне суб'ектаў праектавання.

Праектная дзейнасць можа разглядацца як:

– самастойная бібліятэчная работа па вывучэнні сацыяльных груп абанентаў і прадастаўленні адпаведнай інфармацыі, аказанні паслуг па выхаванні, навучанні і развіцці;

– суправаджэнне сацыяльна-педагагічнай дзейнасці спецыялізаваных устаноў і асобных спецыялістаў па стварэнні адукацыйна-выхаваўчай прасторы і аказанні сацыяльна-педагагічнай дапамогі розным катэгорыям насельніцтва;

– інтэграцыйная дзейнасць розных інстытутаў грамадства, накіраваная на рэалізацыю праектаў і праграм сацыяльнай абароны і адаптацыі, матэрыяльнай падтрымкі, арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці [12, с. 277].

Вылучаюцца наступныя арганізацыйна-метадычныя формы работы з карыстальнікамі ў межах праектнай дзейнасці:

– непасрэднае супрацоўніцтва, якому ўласціва камунікацыя бібліятэкара з чытачом (правядзенне гутарак, сустрэч, урокаў інфармацыйнай культуры, дзён інфармацыі і інш.);

– апасродкаванае ўзаемадзеянне, якое ажыццяўляецца без непасрэднага кантакту паміж бібліятэкарам і карыстальнікам. Яно рэалізуецца шляхам выканання бібліятэчным супрацоўнікам прафесійных абавязкаў, звязаных з камплектаваннем фонда, даведачна-бібліяграфічнай дзейнасцю, стварэннем інфармацыйных прадуктаў і паслуг, зводных электронных каталогаў, карпаратыўных бібліятэчных сетак, алічбоўкай рэдкіх выданняў і г. д. Гэта прафесійная дзейнасць бібліятэкараў садзейнічае атрыманню карыстальнікамі неабходнай інфармацыі, назапашванню ведаў, рэалізацыі адукацыйных задач.

Праектная дзейнасць забяспечвае пастаянства і дынамізм сацыяльна значных кірункаў бібліятэчнай работы. Удзел у праектнай дзейнасці з'яўляецца фактарам, які садзейнічае развіццю матывацыі ўдзельнікаў праектавання і разглядаецца як стымул у вырашэнні існуючых праблем бібліятэчнай рэчаіснасці ў сацыяльна-педагагічным аспекце.

### Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Библиотечные* программы и проекты // Библиотечное дело – XXI век : науч.-практ. сб.: прил. к журн. «Библиотековедение» / Рос. гос. б-ка ; редкол.: М. И. Акилина [и др.] ; сост. и науч. ред. И. П. Осипова. – М., 2004. – Вып. 2. – С. 164–166.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Библиотечные* программы и проекты // Библиотечное дело – XXI век : науч.-практ. сб.: прил. к журн. «Библиотековедение» / Рос. гос. б-ка ; редкол.: М. И. Акилина [и др.] ; сост. и науч. ред. И. П. Осипова. – М., 2005. – Вып. 2. – С. 168–173.

3. *Воропаев, В. И.* Системный подход к управлению проектами и программами / В. И. Воропаев, Г. И. Секлетова // Управление проектами. – 2005. – № 3. – С. 20–29.

4. *Воропаев, В. И.* Управление проектами в России. Основные понятия. История. Достижения. Перспективы / В. И. Воропаев. – М. : Аланс, 1995. – 225 с. – (Библиотека управления проектами).

5. *Дзямешка, Л. А.* Сацыяльная накіраванасць праектнай дзейнасці службы Public Relations / Л. А. Дзямешка, С. А. Паўлава // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. ст. / под. ред. В. Ф. Беркова. – Минск, 2007. – Вып. 4. – С. 271–276.

6. *Збаровская, Н. В.* Проектная деятельность библиотек / Н. В. Збаровская // Библиотека. – 2005. – № 4. – С. 79–82.

7. *Злотникова, З. И.* Библиотека в системе социально-культурного программирования / З. И. Злотникова // Библиотековедение. – 2002. – № 2. – С. 32–34.

8. *Иванов, В. В.* Основы управления проектами : учеб. пособие / В. В. Иванов, А. В. Бельц. – М. : МИЭТ, 2000. – 72 с.

9. *Лякина, Г. А.* Главный результат – ход работы. Ещё раз о проектах в школе и в библиотеке / Г. А. Лякина // Библиотека в школе. – 2010. – № 11. – С. 13–16.

10. *Осипова, И. П.* Проектная деятельность библиотек: общие проблемы, региональный опыт / И. П. Осипова // Библиотечное дело – XXI век : науч.-практ. сб. : прил. к журн. «Библиотековедение» / Рос. гос. б-ка. – М., 2003. – Вып. 2. – С. 243–271.

11. *Паўлава, С. А.* Тэарэтычныя асновы кіравання некамерцыйнымі бібліятэчнымі праектамі / С. А. Паўлава // Бібліятэкі і музеі ў сістэме інавацыйнай дзейнасці: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 21–22 кастр. 2009 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: С. В. Зыгмантовіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 44–50.

12. *Пераверзева, Ю. А.* Праектная дзейнасць публічных бібліятэк: сацыяльна-педагагічны аспект / Ю. А. Пераверзева // Культура Беларусі і сусвет: агульнае і асаблівае : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 13–14 ліст. 2008 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэдкал.: Н. А. Ляйко (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 274 – 279.

13. *Полат, Е. С.* Метод проектов / Е. С. Полат // Метод проектов : науч.-метод. сб. / Белорус. гос. ун-т, Центр проблем развития образования; общ. ред. М. А. Гусаковский. – Минск, 2003. – С. 41. – (Современные технологии университетского образования; вып. 2).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Пурник, А. А.* Проектное управление в библиотечной сфере: авторский семинар / А. А. Пурник // Молодые в библиотечном деле. – 2006. – № 4. – С. 4–27.

15. *Пурник, А. А.* Проектное управление в библиотечной сфере: авторский семинар / А. А. Пурник // Молодые в библиотечном деле. – 2006. – № 8. – С. 3–19.

16. *Суслова, И. М.* Проектная деятельность библиотек : науч.-практ. пособие / И. М. Суслова, З. И. Злотникова. – М. : Гранд : Фаир-Пресс, 2005. – 176 с. – (Специальный издательский проект для библиотек).

17. *Управление* проектами = Project management : справ. для профессионалов / И. И. Мазур [и др.] ; под общ. ред. И. И. Мазура. – М. : Высш. шк., 2001. – 875 с.

18. *Чернякова, Ю. Ф.* От удачного выбора проекта зависит успех / Ю. Ф. Чернякова // Библиотека. – 1998. – № 5. – С. 29–31.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.5. Арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць бібліятэк: сацыяльна-псіхалагічныя і сацыяльна-педагагічныя аспекты

Увага да якасці ўсіх працэсаў і пастаяннае ўдасканаленне – неад'емныя атрыбуты сучаснай бібліятэкі, якая імкнецца да бесперапыннага набыцця новых ведаў, што патрабуе адэкватнай сённяшнім рэаліям гнуткай і эфектыўнай сістэмы кіравання.

Змяненне арганізацыйных працэсаў кіравання бібліятэкай адбываецца па двух шляхах:

– па шляху татальнага кіравання якасцю (бесперапыннае ўдасканаленне);

– па шляху радыкальнага пераасэнсавання (рэінжынерынг).

Пры татальным кіраванні якасцю адбываецца ўдасканаленне бібліятэкі ў цэлым, якое паступлова нарастае, а пры радыкальным пераасэнсаванні – уплыў паляпшэнняў носіць скачкападобны характар. Праваднікамі перамен выступаюць створаныя ў бібліятэцы праектныя групы – венчурныя каманды, якія здзяйсняюць карэнную перабудову бібліятэкі.

Далейшае ўдасканаленне розных бакоў кіравання бібліятэкай набывае асаблівае значэнне ў сувязі з Законам «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» [1], дзе юрыдычна замацаваны канцэптуальны падыход да перспектыў развіцця бібліятэкі, які асноўваецца на ўсведамленні яе сацыяльнай функцыі. Такім чынам, у Беларусі статус бібліятэкі як сацыяльнага ін-

ститута замацаваны заканадаўча. Гэта дае падставу класіфікаваць бібліятэку як сацыяльна-культурны і інфармацыйны інстытут грамадства.

У сувязі з узрастаннем ролі сацыяльных зносін, неабходнасцю ўмацавання і аптымальнага развіцця бібліятэчнага калектыву асабліва важнымі фактарамі эфектыўнага кіравання становяцца сацыяльна-псіхалагічныя і сацыяльна-педагагічныя. На ступень уключанасці чалавека ў сістэму сацыяльнага ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі ўплываюць сацыяльныя ўзаемаадносіны, жыццёвы вопыт чалавека, яго ўзровень развіцця і самарэгуляцыі. Пры гэтым бібліятэчныя зносіны з'яўляюцца працэсам сацыяльна-псіхалагічнага ўзаемадзеяння людзей.

Сацыяльныя зносіны ў бібліятэцы маюць на мэце пашырэнне і ўмацаванне міжасобасных кантактаў, устанаўленне і развіццё міжперсанальных адносін, асобасны рост. Адрозніваюць тры ўзроўні сацыяльных зносін у бібліятэцы:

– макраўзровень – масавыя кантакты чытачоў у дастаткова вялікіх групах;

– мезаўзровень – зносіны ў працоўным калектыве і падраздзяленнях бібліятэкі;

– мікраўзровень – міжасобасныя зносіны, якія грунтуюцца на псіхалагічнай блізкасці карыстальнікаў і супрацоўнікаў бібліятэкі.

Пры сацыяльных зносінах узнікаюць сацыяльна-культурныя бар'еры паміж людзьмі розных культур і сацыяльнага становішча. Таму кіраўнікі любога ўзроўню для паспяховай рэалізацыі сацыяльнай функцыі бібліятэкі павінны дасканала арганізаваць працэс сацыяльна-псіхалагічнага ўзаемадзеяння як у калектыве, так і з карыстальнікамі.

Кіраванне бібліятэкай выводзіцца на ўзровень арганізацыйнай культуры, якая абапіраецца на складанае аб'яднанне базавых каштоўнасцей, перакананняў, эканамічных, сацыяльных, псіхалагічных і педагагічных прыярытэтаў у арганізацыі дзейнасці ўстановы.

Арганізацыйная культура класіфікуецца па відах: культура ўлады, культура ролі, культура задачы, культура асобы.

*Культура ўлады* абапіраецца на асобу кіраўніка і яго акружэнне, у руках якіх сканцэнтраваны ўсе важнейшыя рэсурсы бібліятэкі. Рашэнні ў такой бібліятэцы прымаюцца на аснове балансу сіл, без прымянення іншых метадаў менеджменту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ступень уплыву асобнага супрацоўніка на дзейнасць бібліятэкі залежыць ад яго набліжанасці да кіраўніцтва. Арганізацыя работы пабудавана на канкурэнцыі і жорсткай сістэме кантролю з боку адміністрацыі. Эфектыўна працаваць у такой бібліятэцы зможа толькі чалавек, зарыентаваны на сілу, упэўнены ў сабе, хто не баіцца рызыкі, які не лічыцца са слабасцямі іншых. Выніковасць работы такой бібліятэкі цалкам залежыць ад кампетэнтнасці кіраўніка. Асноўныя праблемы такой бібліятэкі:

– складанасць захавання кантролю над падначаленымі;

– вялікая цякучасць кадраў, паколькі не кожны чалавек можа камфортна адчуваць сябе ў такіх умовах.

*Культура ролі* (бюракратычная культура) заснавана на дакладнай спецыялізацыі падраздзяленняў бібліятэкі, чыю дзейнасць каардынуе невялікае верхняе звяно кіраўнікоў. У такой бібліятэцы высокая ступень фармалізацыі і стандартызацыі дзейнасці і адносін. Кантроль здзяйсняецца на аснове правіл і інструкцый. Крыніца ўлады – пасада, якую займае супрацоўнік, а не яго асабістыя якасці. На кожны ўчастак прызначаецца работнік, чыя кваліфікацыя ацэньваецца адпаведна прызначанай ролі. Таму эфектыўнасць такой бібліятэкі вызначаецца рацыянальнасцю размеркавання роляў, а не патэнцыялам персаналу. У такой арганізацыйнай культуры добра адчуваюць сябе людзі, якія цэняць стабільнасць і лічаць, што іх кваліфікацыя расце прапарцыянальна стажу работы. Калі ўмовы функцыянавання бібліятэкі стабільныя, то выніковасць яе дзейнасці высокая; але калі павышаецца дынаміка асяроддзя, то прапарцыянальна росту дынамікі падае эфектыўнасць дзейнасці бібліятэкі.

*Культура задачы* арыентуе персанал на выкананне работы шляхам аб’яднання мэт супрацоўнікаў і адміністрацыі бібліятэкі. Кантроль сканцэнтраваны ў дырэкцыі і тычыцца размеркавання работ, рэсурсаў і супрацоўнікаў на ўчастках, якім перадаюцца ўсе паўнамоцтвы для вырашэння пастаўленых задач. Наяўнасць такіх паўнамоцтваў культывуе калектывізм і патрабуе ўзаемнай падтрымкі. Выніковасць работы каманды ў арганізацыйнай культуры цэніцца вышэй за асабістыя вынікі, а прафесіяналізм – вышэй за пасаду, займаемую супрацоўнікам. Уплыў спецыяліста на дзейнасць бібліятэкі тут значна вышэй, чым у іншых культурах. Таму чым больш дынамічным з’яўляецца асяроддзе, тым эфектыўней такая бібліятэка. Асноўнымі недахопамі дадзенай арганізацыйнай культуры з’яўляюцца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ускладненне кіравання пры росце бібліятэкі, таму пры дасягненні значных памераў ствараюцца дадатковыя падраздзяленні і філіялы;

– пагаршэнне выніковасці работы асобных падраздзяленняў пры ўзнікненні дэфіцыту неабходных рэсурсаў; пачынаецца барацьба паміж структурамі бібліятэкі, і культура задачы пераходзіць у культуру ролі.

*Культура асобы* трактуе, што арганізацыя існуе толькі для таго, каб садзейнічаць дасягненню асабістых мэт супрацоўнікаў. Сіла ўлады ў такой культуры – гэта сіла спецыяліста, які прафесійна выконвае сваю работу, што вымушае арганізацыю прыслухоўвацца да яго меркаванняў. У рэальным жыцці арганізацый з такой культурай не існуе, за выключэннем кансалтынгавых фірм. Разам з тым многія высокакваліфікаваныя спецыялісты разглядаюць арганізацыю (у тым ліку і бібліятэку) як месца для дасягнення сваіх асабістых мэтаў з некаторай выгадай для гэтай арганізацыі. Такімі людзьмі складана кіраваць, сіла фармальнага кіраўніка на іх не дзейнічае. Таму адзіны спосаб кіраўніцтва імі – прадастаўленне рэсурсаў, якія ім патрэбны.

Такім чынам, адзначым: арганізацыйная культура і персанал установы аказваюць узаемны ўплыў. Супрацоўнік вымушаны прытрымлівацца культурных традыцый установы, якія рэалізуюцца сродкамі дзейнасці персаналу. Розныя людзі ў рознай ступені бываюць задаволены работай і кантактамі паміж супрацоўнікамі. Людзям, якія дрэнна пераносяць няпэўнасць і любяць стабільнасць, больш падыходзіць культура ролі. Калі для чалавека важнай з'яўляецца самарэалізацыя як кіраўніка, то яму больш падыходзіць культура ўлады, а калі прафесійная самарэалізацыя – то культура задачы. Таленты супрацоўніка будуць хутчэй заўважаны ў культурах улады і задачы. Людзі з сярэднімі здольнасцямі зацікаўленыя ў культуры ролі.

Кіраўнік, які імкнецца захаваць ролевую культуру, не будзе набіраць у штат бібліятэкі таленавітых людзей, чыя дзейнасць разваліць бюракратычную арганізацыю дзейнасці бібліятэкі знутры. У той жа час няяркія супрацоўнікі здольны звесці да нуля ўсю дзейнасць кіраўніка – прыхільніка культуры ўлады і задачы.

Трэба адзначыць, што нават пры дасканалай арганізацыйнай культуры і структуры бібліятэкі рашаючай умовай яе эфектыў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най дзейнасці з’яўляюцца кадры. Рэалізацыя кадравай палітыкі павінна зыходзіць з агульнай тэорыі кіравання бібліятэкай, якая характарызуецца сістэмным і мэтавым падыходам і ўвагай да псіхалагічнага фактару. Вопыт кіравання бібліятэчнымі кадрамі паказвае, што эфектыўнасць выкарыстання патэнцыялу супрацоўнікаў залежыць ад трох умоў:

– ступені адпаведнасці выконваемай работы прафесійнай падрыхтоўцы і псіхалагічным асаблівасцям супрацоўніка (некамунікабельныя людзі не могуць працаваць з чытачамі, схільныя да арганізацыйнай работы лепш за ўсё праявяць сябе ў масавай рабоце і г. д.);

– прысутнасці ў выконваемай рабоце элементаў разнастайнасці і магчымасці праявіць ініцыятыву;

– адчування супрацоўнікам перспектывы прафесійнага росту і прасоўвання па службовай лесвіцы.

Стварэнне такіх умоў патрабуе ад кіраўніцтва бібліятэкі разлічанай на перспектыву праграмы дзейнасці. Адказнасць кіраўніка за павышэнне ўзроўню работы з кадрамі, прафесійнай актыўнасці работнікаў абумоўлівае неабходнасць валодаць рэкамендацыямі псіхолагаў і сацыёлагаў па стварэнні добрага маральнага клімату ў калектыве.

Спецыфіка сацыяльна-псіхалагічных метадаў заключаецца ў выкарыстанні ў працэсе кіравання нефармальных фактараў, улік інтарэсаў асобы, групы і калектыву ў цэлым. Работа бібліятэкі павінна быць пастаўлена так, каб людзі атрымлівалі ад яе максімум задавальнення і мелі максімум адказнасці. Развіццё творчых асноў працы патрабуе стварэння ўмоў, пры якіх праца лічыцца не толькі абавязкам, але і сферай самавыяўлення асобы.

Псіхолага-педагагічнаму боку бібліятэчнай дзейнасці ўдзяляецца ў апошні час многа ўвагі. У бібліятэку запрашаюцца псіхолагі, развіваюцца формы работы з кадрамі, метады павышэння іх кваліфікацыі. Новыя падыходы да арганізацыі работы бібліятэк, пашырэнне сферы інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці патрабуюць актуалізацыі бібліятэчнай адукацыі. Найбольшай каштоўнасцю прагрэсіўнай педагагічнай тэхналогіі з’яўляецца дэмакратычны характар камунікацыі. У якасці яе канцэптуальнай асновы выступае мадэліраванне прадметнага і сацыяльнага зместу актуальнай прафесійнай дзейнасці з усімі яе праблемамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сістэме бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі важнае месца займаюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка бібліятэчных кадраў. Гэта складаная комплексная сістэма, накіраваная на актуалізацыю, удасканаленне, пашырэнне і паглыбленне прафесійных ведаў бібліятэчных кадраў у адпаведнасці з дасягненнямі навукі, набыццё сучасных тэарэтычных і практычных навыкаў для адаптацыі персаналу бібліятэкі да зменлівых сацыяльных і вытворчых умоў.

У Беларусі склалася і стабільна функцыянуе сістэма павышэння кваліфікацыі, пабудаваная на прынцыпах абавязковасці, планавасці і бесперапыннасці, якая мае свае задачы, мэты і формы. Яе галоўнае прызначэнне – на аснове базавай падрыхтоўкі, атрыманай у навучальных установах, падымаць на больш высокі ўзровень кваліфікацыю работнікаў, стымуляваць іх прафесійную творчасць. Традыцыйна яе аснову складаюць курсы, навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, практыкумы, стажыроўкі.

Арыентацыя на атрыманне новых ведаў, асабліва ў галіне асваення інфармацыйных тэхналогій і іншых сучасных напрамкаў, – адзін з перспектыўных шляхоў развіцця не толькі сістэмы павышэння кваліфікацыі, але і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

Пэўным станоўчым зрухам у бок актуалізацыі навучання бібліятэчных кадраў ва ўмовах сучасных інфармацыйных тэхналогій стала распрацаваная ў Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры (згодна з рашэннем калегіі Міністэрства культуры ад 29.10.1998 г. № 9, п. 1) Мадэль перападрыхтоўкі спецыялістаў публічных бібліятэк па авалоданні камп’ютарнай тэхнікай і новымі тэхналогіямі. Мадэль прадугледжвае навучанне чатырох катэгорый бібліятэчных работнікаў:

– кіраўнікі ЦБС (дырэктар, намеснік дырэктара);

– бібліятэчныя спецыялісты;

– тэхнолагі і адміністратары БД;

– групы суправаджэння АБІС (інжынер, інжынер-праграміст, электроншчык).

Мадэль выканана такім чынам, што ўключала профільныя курсы для адпаведных катэгорый спецыялістаў і скарочаныя курсы на базе сумежных праграм.

Інфармацыйныя тэхналогіі і магчымасць выкарыстання камп’ютарных сетак сувязі паўплывалі і на сістэму павышэння

кваліфікацыі бібліятэкараў. З’явіліся новыя формы яе арганізацыі, у ліку якіх перш за ўсё неабходна назваць тэлеканферэнцыі – адзін з сэрвісаў Інтэрнэта, які складаецца з арганізацыйнага тэматычнага абмену інфармацыяй паміж карыстальнікамі, гэта значыць правядзенне групавых дыскусій. У залежнасці ад рэжыму, у якім адбываецца канферэнцыя, адрозніваюць тэлеканферэнцыі, што праходзяць у інтэрактыўным рэжыме (on-line) і ў рэжыме абмену тэкстамі або файламі, пераведзенымі ў лічбавую форму на аснове электроннай пошты (off-line). Першай у Беларусі тэлеканферэнцыю правяла Беларуская бібліятэчная асацыяцыя (ББА).

Як удалы прыклад інавацыйнага падыходу можна назваць новы напрамак у павышэнні кваліфікацыі кадраў – распрацоўка і правядзенне курсаў дыстанцыйнага навучання карыстальнікаў сеткі Інтэрнэт. Такую форму павышэння кваліфікацыі выкарыстоўвае Магілёўская абласная бібліятэка [2].

Далейшае ўдасканаленне сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў грунтуецца на аснове навукова аргументаванага фарміравання зместу, формы, метадаў навучання і іх дыферэнцыяцыі ў залежнасці ад ступені адукацыі, катэгорыі бібліятэчных работнікаў.

У апошнія гады сістэма павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў узбагацілася такімі формамі, як «круглыя сталы», дзелавыя сустрэчы, дзелавыя гульні, школы дырэктараў, школы прафесійнага майстэрства, удзел спецыялістаў у міжнародных, рэспубліканскіх канферэнцыях і семінарах, а таксама супрацоўніцтва з бібліятэкамі іншых рэгіёнаў краіны. Да новых форм навучання адносяцца:

– трэнінгі («Рэкламная работа ў бібліятэцы», «Павышэнне прэстыжу абласной бібліятэкі», «Арыентацыя ў культурнай сферы рэгіёна»);

– бібліятэчныя дайджэсты і анонсы («Інтэлектуальныя гульні», «Час нестандартных ідэй» і інш.).

Сучасны стан грамадства фарміруе патрэбу ў павышэнні кваліфікацыі, узроўню кампетэнтнасці спецыяліста бібліятэкі. Таму адукацыйны працэс павінен быць скіраваны на ўнутраную матывацыю навучэнцаў, іх асобасны рост, самапазнанне, самаразвіццё і самарэгуляцыю, а таксама, немалаважна, на абуджэнне патрэбы ў самаадукацыі. Менавіта самаадукацыя дазваляе бібліятэчным работнікам паглыбляць і папаўняць раней

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

атрыманыя веды ў адпаведнасці са зменамі, што адбываюцца ў тэорыі і практыцы бібліятэчнага будаўніцтва, а таксама з улікам патрабаванняў канкрэтных абставін. Кіраўнікі бібліятэк павінны садзейнічаць прафесійнай самаадукацыі.

Адзначым такую форму навучання, як майстар-класы. У дадзеным выпадку ствараецца спецыяльная сітуацыя навучання (прыбліжаная да кантэксту рэальнай прафесійнай дзейнасці спецыяліста-майстра), у ходзе якой узнаўляюцца асноўныя асаблівасці выканання вучэбнай задачы. Мэтай тут ставіцца індывідуальная работа з навучэнцам, пры гэтым забяспечваецца актыўны ўдзел аўдыторыі ў вучэбным працэсе. Прыкладам такой формы навучання можа служыць Дрыбінская ЦБС, дзе распрацавалі «Майстар-клас для сельскіх калег», і Ваўкавыская ЦБС, якая праводзіла майстар-клас «Навігацыя ў Інтэрнэт».

Цікавай формай навучання кадраў з'яўляюцца прафесійныя клубы і літаратурныя гасцёўні, у рамках якіх могуць праходзіць самыя розныя мерапрыемствы: дыскусіі, прэзентацыі кніг, сустрэчы з цікавымі людзьмі і інш., якія патрабуюць пэўнага прафесійнага і інтэлектуальнага ўзроўню бібліятэкараў і, з усім тым, спрыяюць яго павышэнню.

Перспектыўнай формай павышэння прафесійнага ўзроўню кадраў, мяркуем, можна лічыць так званы бібліятэчны «бартэр». Навучанне праходзіць на факультэтах самаадукацыі ЦБС, дзе вопытныя бібліятэкары дзеляцца між калег і абменьваюцца сваімі напрацоўкамі ў прафесіі.

Сучасныя тэмп і рытм жыцця ўплываюць на ўсе сферы дзейнасці, змяненні ў якой звязаны ў першую чаргу з інавацыйнасцю. У працэсах бесперапыннай адукацыі нараджаецца і прынцыпова новы прафесійны вопыт. Сёння патрэбны новы прафесіянал – які працуе творча, нестандартна, што патрабуе высокай культуры, інавацыйнага мыслення, здольнасці пастаянна і крытычна аналізаваць эфектыўнасць сваёй працы. Адпаведна асноўная задача павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў сёння скіравана на развіццё творчых якасцей асобы, а не проста трансляцыю новай інфармацыі.

У цяперашні час павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў ідзе па шляху адкрытага працэсу, які працякае не толькі ў сценах спецыялізаваных навучальных ус-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таноў і не толькі пад кіраўніцтвам прафесійных выкладчыкаў, але і пад уплывам асоб, якія валодаюць значным вопытам, ведамі, уменнямі і навыкамі. Спецыялісты мяркуюць, што аб'яднанне класічнай бібліятэчнай адукацыі з інавацыйнымі формамі павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў дасць найлепшыя вынікі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Аб бібліятэчнай* справе ў Рэспубліцы Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь, 22 сак. 1995 г. – URL: http://arc.pravoby.info.

2. *Андронава, А. У.* Сістэма павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў: традыцыі і інавацыі / А. У. Андронава // Бібліятэка прапануе. – 2006. – № 5. – С. 22–24.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ РАБОТЫ БІБЛІЯТЭК ПА РАЗВІЦЦІ АСОБЫ КАРЫСТАЛЬНІКА (ЧЫТАЧА)

## 3.1. Бібліятэчнае абслугоўванне сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў (на прыкладзе інвалідаў па зроку)

У сучасных умовах рэфармавання грамадства змяняецца сацыяльная палітыка дзяржавы ў адносінах да асоб з фізічнымі і (ці) псіхічнымі адхіленнямі. Пытаннямі іх сацыяльнай рэабілітацыі займаюцца розныя грамадскія інстытуты. Сярод іх важная роля належыць спецыяльным бібліятэкам як інфармацыйным цэнтрам па сацыяльна-педагагічнай праблематыцы. Практычная дзейнасць бібліятэк для асоб з поўнай або частковай слепатой, дэфектамі слыху, маўлення і інш. выклікала інтарэс у вучоных да такой галіны бібліятэказнаўства, як дэфекталагічнае бібліятэказнаўства (тыфлабібліятэказнаўства, сурдабібліятэказнаўства, алігафрэнабібліятэказнаўства), якое вывучае праблемы бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў.

Асноўнымі задачамі дэфекталагічнага бібліятэказнаўства з'яўляюцца перш за ўсё: распрацоўка навукова абгрунтаваных канцэпцый і комплексных праграм развіцця бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў; вызначэнне кола асоб, якім патрэбна спецыяльнае бібліятэчнае абслугоўванне, іх тыпалогія як чытачоў; стварэнне сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў, у якую павінны ўваходзіць спецыяльныя і публічныя бібліятэкі; абгрунтаванне сацыяльна-рэабілітацыйнай функцыі бібліятэк, якія абслугоўваюць інвалідаў; распрацоўка праблем, звязаных з кампенсаторнай накіраванасцю дзейнасці бібліятэк, бібліятэрапіяй.

Да ліку найбольш распрацаваных галін дэфекталагічнага бібліятэказнаўства адносіцца тыфлабібліятэказнаўства. Гэта абумоўлена шэрагам гістарычных фактаў: адкрыццём вучэбных устаноў, развіццём кнігадрукавання для сляпых, стварэннем бібліятэк для сляпых і слабавідушчых.

Узнікненне і станаўленне тыфлабібліятэказнаўства цесна звязаны з развіццём бібліятэчнай практыкі і абумоўлены ёю. Тыфлабібліятэказнаўства, якое ўзнікла ў XIX ст. як элементар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя веды аб бібліятэках для сляпых і прайшло складаны, супярэчлівы шлях развіцця, сёння выступае як вучэбная дысцыпліна і як пэўная тэорыя [4].

На гэтым фоне важна, улічваючы рэаліі сённяшняга дня (інфарматызацыю, камп'ютарызацыю бібліятэк, дэмакратызацыю, інтэлектуальную свабоду, гуманізацыю), даць яго азначэнне, раскрыць функцыі і прынцыпы, вызначыць структуру і міждысцыплінарныя сувязі.

Прапануем тэрмінам «тыфлабібліятэказнаўства» азначыць галіну бібліятэказнаўства, якая даследуе спецыфічныя законы, заканамернасці, прынцыпы функцыянавання бібліятэк па абслугоўванні інвалідаў па зроку. Як навуковая дысцыпліна дакументна-камунікацыйнага цыкла, яна, з прычыны асаблівасцей вывучаемага аб'екта, арыентавана на вырашэнне праблем сляпых і слабавідушчых у працэсе бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання.

Тыфлабібліятэказнаўства шырока выкарыстоўвае дасягненні бібліятэказнаўчых дысцыплін і абапіраецца на дасягненні тэорыі і практыкі дэфекталогіі, карэкцыйнай педагогікі, тыфлапедагогікі, тыфлапсіхалогіі, рэабіліталогіі і інш.

Для яго характэрны два тыпы функцый: навуковыя і сацыяльныя. Першыя наўпрост не ўплываюць на соцыум (тэарэтыка-пазнавальная, прыкладная, прагнастычная функцыі), другая, гуманістычная, дасканала адлюстроўвае ўздеянне тыфлабібліятэказнаўства на грамадства [4].

Характэрнымі прыкметамі тыфлабібліятэказнаўства як навуковай дысцыпліны з'яўляюцца навуковыя прынцыпы – агульныя і ўласныя. Агульныя адлюстроўваюць асноўныя патрабаванні да бібліятэчнага абслугоўвання ў цэлым, яны не маюць значнага праламлення ў абслугоўванні інвалідаў па зроку: агульнадаступнасць, кангруэнтнасць абслугоўвання, дыферэнцаваны падыход да чытачоў, паўната і аператыўнасць прадастаўлення паслуг.

Другую групу складаюць асноватворныя прынцыпы, якія акумулююць спецыфічныя аспекты, звязаныя з бібліятэчным абслугоўваннем сляпых і слабавідушчых. Гэта, перш за ўсё, прынцып роўных магчымасцей доступу да інфармацыі ўсіх карыстальнікаў, прыведзены Г. П. Дзіянскай, і прапанаваныя намі прынцыпы: сацыяльна адаптаванай накіраванасці бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку, стварэння безбар'ер-

нага бібліятэчнага асяроддзя, дыялектычнага адзінства інтэрнацыянальнага і нацыянальна-этнічнага падыходаў у сферы бібліятэчнага абслугоўвання [5].

Тыфлабібліятэказнаўства як навуковая дысцыпліна мае сваю структуру, пры вызначэнні якой мы прытрымліваемся погляду Ю. М. Сталярова на структурыраванне бібліятэказнаўства (агульнае і спецыяльнае бібліятэказнаўства) [6, с. 143]. Пры такім падыходзе зместам агульнага тыфлабібліятэказнаўства з'яўляюцца тэарэтычныя, метадалагічныя і гістарычныя праблемы тыфлабібліятэказнаўчых ведаў, гэта значыць яго сутнасць, прадмет і структура, тэрміналогія, устанаўленне суадносін з бібліятэказнаўствам і іншымі навукамі. Асноўны змест спецыяльнага тыфлабібліятэказнаўства павінны складаць дысцыпліны, якія маюць у якасці свайго прадмета тую ці іншую частку бібліятэкі як сістэмы: бібліятэчнае фондазнаўства; чытачазнаўства; бібліятэчны персанал; вучэнне аб матэрыяльна-тэхнічнай базе бібліятэкі.

Безумоўна, пад уздзеяннем далейшых працэсаў інтэграцыі і дыферэнцыяцыі тыфлабібліятэказнаўчых ведаў як на ўнутрыдысцыплінарным, так і міждысцыплінарным узроўнях гэта структура будзе паступова мяняцца, дапаўняцца і ўдасканальвацца. Функцыю ўнутрыдысцыплінарнага сінтэзу тыфлабібліятэказнаўчых ведаў можа выконваць дысцыпліна «Агульнае тыфлабібліятэказнаўства». Што ж датычыцца дыферэнцыяцыі, то яна выражаецца ва ўзнікненні новых падраздзелаў тыфлабібліятэказнаўства, напрыклад, як унутры базавых вучэбных дысцыплін («Безбар'ернае бібліятэчнае асяроддзе»), так і на стыку з іншымі навукамі («Бібліятэчная тыфлапедагогіка»). Апошняя прызначана вывучаць педагагічныя асновы бібліятэчна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай работы з чытачамі – інвалідамі па зроку. Прыкладам можа з'яўляцца галіна ведаў і практыкі, якая паспяхова развіваецца, – бібліятэрапія.

Інтэрпрэтацыя розных падыходаў да разумення псіхатэрапеўтычнага патэнцыялу кнігі, чытання дазваляе ў адносінах да сляпых і слабавідушчых з упэўненасцю вызначыць педагагічную сутнасць бібліятэрапіі. У яе аснове знаходзяцца тэарэтычныя палажэнні аб першасных дэфектах і другасных адхіленнях у развіцці, кампенсацыі і карэкцыі парушаных функцый. Зыходзячы з гэтага, у дачыненні да сляпых і асоб са слабым зрокам мы схільны разглядаць бібліятэрапію як адзін з напрамкаў пе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дагогікі чытання, які садзейнічае вывучэнню асаблівасцей іх чытацкага ўспрымання і прадугледжвае распрацоўку метадаў псіхалагічнай карэкцыі з дапамогай спецыяльна падабранай літаратуры.

Больш таго, працэс чытання разглядаецца намі з пазіцый псіхалагічнай кампенсацыі і мае характар як папаўнення, так і выраўноўвання. Да прыкладу, калі мы маем справу з кампенсацыяй псіхічнага стану індывіда, то, хутчэй за ўсё, ён носіць характар папаўнення. Калі сутыкаемся з кампенсацыяй знешніх жыццёвых сітуацый, то з'яўляецца працэсам выраўноўвання арганізма з сацыяльным асяроддзем, гэта значыць садзейнічае самаактуалізацыі асобы. Кампенсуючым, у дадзеным выпадку, з'яўляецца чытанне, якое абуджае асабісты патэнцыял сляпых і асоб са слабым зрокам, садзейнічае замяшчэнню ўнутранага псіхічнага стану і знешніх жыццёвых сітуацый, развіццю чытацкай культуры.

Такім чынам, міждысцыплінарныя сувязі з усімі галінамі бібліятэчна-бібліяграфічных і інфармацыйных ведаў, а таксама з навукамі грамадскага, прыродазнаўчага і тэхнічнага цыклаў з'яўляюцца характэрнай прыкметай у развіцці тыфлабібліятэказнаўства, яго паняційнага апарату, тэрмінасістэмы.

Як навуковая дысцыпліна тыфлабібліятэказнаўства карыстаецца развітой методыкай, якая ўключае мноства прыёмаў пазнання і пераўтварэння бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку. У адпаведнасці з галіной прымянення навуковыя метады тыфлабібліятэказнаўства падзяляюцца на агульнанавуковыя і прыватныя. Да першых адносяцца метады аналізу, сінтэзу, параўнання, абстрагіравання, назірання, эксперыменту, мадэліравання, прагназавання і інш. Да другіх – апытанне, кансультацыі спецыялістаў рэабілітацыйнай сферы, экспертныя ацэнкі, аналіз бібліятэчнай статыстыкі, бібліяметрычны аналіз складу дакументнага фонду, аналіз чытацкіх і кніжных фармуляраў і інш.

У залежнасці ад мэты даследавання, яго задач пералічаныя метады могуць ствараць featureзнага роду сувязі, якія дазваляюць глыбей пранікнуць у сутнасць вывучаемых з'яў, звесці ў адзіную сістэму інфармацыю аб дакументным фондзе, карыстальніках – інвалідах па зроку, іх інфармацыйных патрэбах і спосабах задавальнення. Вядучае месца ў рэалізацыі гэтых метадаў сёння належыць спецыялізаваным бібліятэкам для сляпых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З сакавіка 1988 г. і да канца 2002 г. бібліятэкі для сляпых ў Беларусі ўяўлялі сабой цэнтралізаваную бібліятэчную сістэму (ЦБС), функцыянаванне якой здзяйснялася ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, пры складанні якіх улічваліся палажэнні шэрагу міжнародных дакументаў ААН, ІФЛА і Секцыі бібліятэк для сляпых.

ЦБС для сляпых уяўляла сабой цэласную структуру, якая вырашала праблемы каардынацыі і кааперацыі для найбольш поўнага задавальнення інфармацыйных паслуг і эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў. Узаемадзеянне ўключала ўсе асноўныя кірункі дзейнасці бібліятэк: фарміраванне аптымальных фондаў рэпрадуктаваных і плоскадрукавальных выданняў; абслугоўванне чытачоў, даведачна-бібліяграфічная і метадычная работа, павышэнне кваліфікацыі кадраў.

У склад ЦБС уваходзіла 17 бібліятэк-філіялаў пры вучэбна-вытворчых і культурна-рэабілітацыйных цэнтрах. Узначальвала бібліятэкі-філіялы Цэнтральная бібліятэка (ЦБ) культурна-асветнага цэнтра Беларускае таварыства інвалідаў па зроку (БелТІЗ) (Мінск).

У цэлым бібліятэчным абслугоўваннем было ахоплена звыш 5000 чытачоў – інвалідаў па зроку (57,6% ад агульнай колькасці чытачоў).

ЦБ з'яўлялася самай буйной бібліятэкай для сляпых у Беларусі, яна доўгі час выконвала функцыі нацыянальнай бібліятэкі (па віду захоўваемых дакументаў – «брайлеўскіх» і агучаных) і метадычнага цэнтра бібліятэк, якія абслугоўвалі інвалідаў па зроку. Яна праводзіла даследаванні ў галіне бібліятэчнага забеспячэння інвалідаў па зроку, папаўняла фонды дакументамі на спецыяльных носьбітах, займалася ўкараненнем аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў, прымяненнем новых тэхналогій у рабоце з чытачамі, вывучала тэндэнцыі і вызначала перспектывы развіцця сеткі бібліятэк для сляпых.

Значную ролю адыгрывала ЦБ для сляпых у каардынацыі дзейнасці бібліятэк-філіялаў, якая заключалася ва ўзаемавыкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў, камп'ютарызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў, выяўленні, абагульненні і распаўсюджанні вопыту, інавацый.

Дзейнасць ЦБ і бібліятэк-філіялаў для сляпых ажыццяўлялася ў цеснай каардынацыі з БелТІЗ і яго мясцовымі арганізацыямі, адукацыйнымі школьнымі ўстановамі для дзяцей з пару-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэннямі зроку, органамі грамадскай абароны насельніцтва, рэабілітацыйнымі службамі, установамі культуры і г. д.

У канцы 2002 г. адбылося змяненне статусу і ведамаснай прыналежнасці бібліятэк для сляпых. Яны сталі часткай ЦБС публічных бібліятэк Міністэрства культуры на правах спецыяльных бібліятэк-філіялаў. Можна сказаць, што рэарганізацыя з'явілася важнай умовай стварэння і эфектыўнага функцыянавання сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку, якая забяспечвае роўныя магчымасці доступу да інфармацыі. Перспектывы яе ўдасканалення звязаны з рэалізацыяй наступных агульных палажэнняў:

– *удзел бібліятэк усіх тыпаў і відаў, незалежна ад ведамаснай прыналежнасці, у бібліятэчным абслугоўванні карыстальнікаў з парушэннямі зроку*. Гэтаму садзейнічае стварэнне на базе Нацыянальная бібліятэкі Беларусі (НББ) цэнтра карпаратыўнай даведачнай службы, які аб'ядноўвае бібліятэкі іншых узроўняў, ведамаснай прыналежнасці, дзейнічае на аснове цэнтралізаванага прыёму запытаў карыстальнікаў, іх размяркоўвання па тыпалагічных і праблемна-тэматычных прыкметах паміж бібліятэкамі-ўдзельнікамі;

– *стварэнне адзінай нарматыўна-прававой асновы дзейнасці розных бібліятэк, якія абслугоўваюць інвалідаў па зроку*. Тут важную ролю адыграла прыняцце змяненняў і дапаўненняў у Закон «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» (арт. 29);

– *каардынацыя дзейнасці ведамасных бібліятэк, якія абслугоўваюць інвалідаў,* можа здзяйсняцца ў межах інфрамацыйнага і сацыякультурнага цэнтра пры НББ, які прадастаўляе сваім карыстальнікам шырокі спектр паслуг;

– *сацыяльна-рэабілітацыйная накіраванасць дзейнасці бібліятэк, якія абслугоўваюць інвалідаў па зроку,* можа быць значна актывізавана за кошт выкарыстання магчымасцей сацыякультурных цэнтраў пры публічных бібліятэках, у задачы якіх, разам з арганізацыяй культурна-асветніцкай дзейнасці, уваходзіць рэкрэацыйная работа, зняцце псіхафізіялагічнага і эмацыянальнага напружання, стварэнне умоў для паўнацэннага адпачынку і зносін;

– *прадастаўленне інвалідам па зроку інфармацыі ў даступнай для іх форме*. Гэта праблема таксама вырашаецца сумеснымі намаганнямі спецыяльных бібліятэк-філіялаў для сляпых і адпаведных структур НББ. З пераездам у новы будынак гэтыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

структуры атрымалі ў сваё распараджэнне тэхнічныя сродкі, якія садзейнічаюць пераадоленню інфармацыйных бар'ераў і забяспечваюць роўны доступ інвалідаў па зроку да ўсіх без выключэння крыніц інфармацыі;

– *выкарыстанне арганізацыйных форм абслугоўвання, якія ў найбольшай ступені ўлічваюць псіхафізіялагічныя і індывідуальныя асаблівасці інвалідаў па зроку*, таксама звязана з далейшым развіццём сістэмы бібліятэк Міністэрства культуры на чале з НББ;

– *аснашчэнне бібліятэк адпаведнымі тэхнічнымі сродкамі* забяспечыць інвалідам па зроку магчымасць працаваць без староннняй дапамогі з выданнямі не толькі спецыяльных фарматаў, але і на традыцыйных носьбітах;

– *падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў для работы з інвалідамі па зроку* і іншымі катэгорыямі асоб з фізічнымі і разумовымі парушэннямі можа быць на базе факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БГУ культуры і мастацтваў шляхам стварэння спецыялізацыі: бібліятэкар – сацыяльны работнік, рэабілітолаг;

– *навукова-метадычнае забеспячэнне праблем бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку* можа здзяйсняцца шляхам стварэння адпаведных служб пры публічных бібліятэках – метадычных цэнтрах.

Такім чынам, можна канстатаваць не толькі наяўнасць умоў для стварэння і эфектыўнага фукцыянавання адзінай сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку, якая садзейнічае забеспячэнню ім роўнага доступу да інфармацыі, але і існаванне ўсіх неабходных элементаў дадзенай сістэмы. Для яе паспяховага функцыянавання неабходна дакладна размежаваць правы і абавязкі ўсіх звёнаў і суб'ектаў абслугоўвання.

Для ўдасканалення сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку неабходна вызначыць ступень удзелу ў іх сацыяльнай рэабілітацыі бібліятэк розных тыпаў і відаў. У якасці структурных кампанентаў мадэлі сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў па зроку можна вылучыць: выяўленне асоб, якія маюць патрэбу ў сацыяльнай рэабілітацыі; кампенсацыя парушаных функцый; элементарная сацыяльна-псіхалагічная і сацыяльна-працоўная рэабілітацыя. Дзякуючы сацыяльнай рэабілітацыі адбываецца інтэграцыя інвалідаў у грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сістэме сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў па зроку бібліятэка ажыццяўляе наступныя віды дзейнасці: выяўленне асоб з парушэннем зроку; набліжэнне кнігі да інвалідаў па зроку – выкарыстанне розных форм бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання; прадастаўленне інвалідам па зроку неабходнай інфармацыі, у тым ліку на спецыяльных носьбітах, у дапамогу вучэбнай, прафесійнай, дасугавай дзейнасці; індывідуалізацыя працэсу работы з чытачамі-інвалідамі, прымяненне пры неабходнасці метадаў бібліятэрапіі; устанаўленне цесных кантактаў з грамадствам, прадпрыемствамі, рэабілітацыйнымі ўстановамі, школамі для сляпых і слабавідушчых і інш.

Арганізацыйныя формы бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку павінны ўяўляць сабой адзіную сістэму, прызначаную забяспечыць рэальны доступ да грамадскіх кніжных фондаў і living рознабаковых крыніц інфармацыі, якія захоўваюцца ў бібліятэках усіх тыпаў і відаў. Прычым НББ у арганізацыйнай структуры сістэмы абслугоўвання інвалідаў па зроку належыць ключавая роля. Гэта знаходзіць пацвярджэнне ў канцэптуальных асновах развіцця НББ як рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра, дзе дапускаецца наяўнасць дакументаў, прызначаных для інвалідаў па зроку, і спецыяльнай апаратуры для работы з імі.

Мы прапануем выдзеліць у структуры метадычных служб адпаведны сектар, што будзе садзейнічаць удасканаленню метадычнага забеспячэння бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку ў маштабах краіны.

Рэкрэацыйная і сацыяльна-адаптыўная дзейнасць найлепш ажыццяўляецца ў межах сацыякультурнага цэнтра, дзе мэтазгодна вылучэнне і афармленне адпаведнага бібліятэчнага асяроддзя, а таксама наяўнасць спецыялістаў, якія падрыхтаваны да работы з дадзенай групай карыстальнікаў.

Адзначым, што менавіта бібліятэка здольна згладзіць дыскрымінацыйныя аспекты ў сістэме вышэйшай адукацыі, звязаныя з абмежаваннямі доступу да адукацыйных рэсурсаў інвалідаў па зроку, якія пазбаўлены магчымасці зрокава ўспрымаць інфармацыю, неабходную для атрымання паўнацэннай вышэйшай адукацыі. Дыспрапорцыя ў доступе да адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў паміж відушчымі студэнтамі і сляпымі студэнтамі можа быць ліквідавана менавіта бібліятэкамі шляхам прадастаўлення апошнім магчымасці пры дапамозе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльнага абсталявання чытаць навуковую і вучэбную літаратуру з агульнага фонду.

Канцэптуальныя метадычныя праблемы ўключэння бібліятэк для сляпых у рэгіянальную сістэму дыстанцыйнага навучання з'яўляюцца не толькі перспектывай навуковых даследаванняў, але і надзённай практычнай задачай. Гэта сістэма прадугледжвае наяўнасць развітой структуры цэнтраў аддаленага доступу дыстанцыйнага навучання. Магчыма, буйная навуковая бібліятэка і бібліятэка для сляпых могуць утварыць такі цэнтр па каардынацыі дыстанцыйных тэхналогій і паслуг аддаленых вядучых навучальных устаноў і адаптацыі прадастаўляемай інфармацыі для інвалідаў па зроку.

Як вызначае Г. Б. Паршукова: «Працэс фарміравання інфармацыйнай культуры як жыццёва неабходнага складніка ведаў і ўменняў сучаснага чалавека вызначаецца як працэс выпрацоўкі дыхатаміі патрабаванняў да асобы і да інфармацыйных устаноў, прызначаных і навучыць карыстальнікаў, і прадаставіць ім інфармацыйныя паслугі» [3, с. 42]. У адносінах да інвалідаў па зроку гэты працэс мае свае асаблівасці і прад'яўляе спецыфічныя патрабаванні да бібліятэк, паколькі менавіта яны з'яўляюцца асноўнымі крыніцамі інфармацыі для сляпых і ў перыяд актыўнай сацыялізацыі і адаптацыі, калі яны выступаюць актыўнымі суб'ектамі навучальнай прасторы, і ў вольны ад навучання час.

Бібліятэчнае асяроддзе як неад'емная частка інфармацыйнай прасторы індывіда павінна быць арганізавана з улікам спецыфічных асаблівасцей карыстальнікаў, у прыватнасці якія маюць абмежаванні па зроку рознай ступені. Бібліятэчнае асяроддзе ўяўляе сабой сукупнасць сродкаў і ўмоў, якія павінны забяспечваць інваліду па зроку паўнацэннае задавальненне яго інфармацыйных патрэбнасцей і запытаў. Структурна змястоўныя характарыстыкі рэсурсаў бібліятэчнага асяроддзя можна вобразна падзяліць на тры групы: прадметна-прасторавыя рэсурсы (памяшканне, мэбля, прадметы інтэр'ера, абсталяванне, сродкі індывідуальнай карэкцыі, рабочае месца, маршруты перамяшчэнняў у прасторы бібліятэкі), інфармацыйныя рэсурсы (дакументны фонд, даведачна-пошукавы апарат, электронныя базы даных, сродкі аддаленага доступу да інфармацыйных рэсурсаў) і сацыяльна-псіхолага-педагагічныя рэсурсы (бібліятэкары, сацыяльныя работнікі, бібліятэрапеўты, дапамога ў за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сваенні сацыяльных роляў і сацыяльных зносін, засваенне сацыяльных норм і правіл, фарміраванне пачуцця сацыяльнай абароненасці, эмацыянальна станоўчага настрою).

Падобная характарыстыка рэсурсаў бібліятэчнага асяроддзя дапамагае аддзяліць іх ад канкрэтнага бібліятэчнага выпадку і разглядаць у якасці з'яў, якія маюць уласную каштоўнасць. Гэта дазваляе раскрыць іх функцыянальныя магчымасці ў працэсе перадачы сацыяльнага вопыту, інтэнсіфікацыі дзейнасці, накіраванай на яго асваенне, змякчэнне абмежаванняў, якія абумоўлены парушэннямі зроку.

Агульныя падыходы да праектавання і мадэліравання бібліятэчнага асяроддзя інвалідаў па зроку дапускаюць наяўнасць некалькіх *этапаў*.

– Пастаноўка сацыяльна значных мэт бібліятэчнага абслугоўвання: вызначэнне таго, які канкрэтны вынік мяркуецца атрымаць. У залежнасці ад ступені маштабнасці пастаўленай мэты ствараюцца пастаянныя і дынамічныя бібліятэчныя асяроддзі. Доўгатэрміновыя, стратэгічныя мэты бібліятэчнага абслугоўвання маюць на ўвазе стварэнне стабільнага асяроддзя. Кароткатэрміновыя мэты (правядзенне аднаразовага мерапрыемства) суадносныя з дынамічнымі асяроддзямі, якія ствараюцца на пэўны прамежак часу.

– Адбор рэсурсаў бібліятэчнага асяроддзя. У гэтым працэсе ўлічваюцца інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў, іх сацыяльна-дэмаграфічныя і псіхафізічныя характарыстыкі. Адпаведна кожная катэгорыя чытачоў – інвалідаў па зроку будзе прад'яўляць да бібліятэчнага асяроддзя свой набор спецыфічных патрабаванняў.

– Мадэліраванне лакальнага бібліятэчнага асяроддзя – адабраных бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў з улікам патрабаванняў, якія прад'яўляюцца сучаснаму бібліятэчнаму абслугоўванню інвалідаў па зроку: бяспекі, насычанасці культурна значнымі аб'ектамі, даступнасці для ўспрымання і разумення, адлюстравання сістэмы сацыяльных зносін.

Такім чынам, працэс мадэліравання бібліятэчнага асяроддзя дапускае суадносіны чатырох груп даных: мэт бібліятэчнага абслугоўвання, сацыяльна-дэмаграфічных асаблівасцей, абмежаванняў жыццядзейнасці, якія характэрны для інвалідаў па зроку, а таксама патрабаванняў да мадэліравання бібліятэчнага асяроддзя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз мэт і задач, якія стаяць перад бібліятэкарамі ў працэсе абслугоўвання інвалідаў па зроку, веданне асноўных абмежаванняў жыццядзейнасці сляпых і слабавідушчых, іх сацыяльна-дэмаграфічных асаблівасцей (пол, узрост, адукацыя, сацыяльнае становішча), патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да мадэліравання бібліятэчнага асяроддзя, – дазваляе выкарыстаць набор найбольш эфектыўных прадметна-прасторавых, інфармацыйных і сацыяпсіхолага-педагагічных рэсурсаў і спраектаваць варыянты бібліятэчнага асяроддзя, якое максімальна камфортнае для інвалідаў па зроку, дазваляе ў поўным аб'ёме рэалізаваць прынцып роўных магчымасцей.

У працэсе стварэння бібліятэчнага асяроддзя неабходна ўлічваць сацыялізуючы ўплыў новых інфармацыйных тэхналогій. Даследчыкі адзначаюць узрастанне сацыялізуючай ролі сродкаў масавай інфармацыі і разглядаюць праблемы сацыялізацыі ў непарыўнай сувязі са стварэннем і функцыянаваннем новага інфармацыйнага асяроддзя [1, с. 260–274]. Вядучай асаблівасцю сучасных інфармацыйных тэхналогій з'яўляецца іх інтэрактыўны характар. Магчымасць для карыстальнікаў інфармацыі актыўна ўдзельнічаць у інфармацыйных патоках абумовіла павелічэнне ўздзеяння інфармацыі на працэсы сацыялізацыі. У сувязі з гэтым каштоўнасць інфармацыі вызначаецца не столькі яе масавасцю і агульнадаступнасцю, колькі магчымасцю персаналізацыі. Найбольш поўна гэта магчымасць рэалізуецца ў камунікацыі з дапамогай сеткі Інтэрнэт.

Праблема сацыялізацыі асобы інваліда па зроку ва ўмовах новага інфармацыйнага асяроддзя ўтрымлівае два асноўныя аспекты:

– вывучэнне віртуальнага асяроддзя як новага рэсурсу сацыяльнага развіцця асобы, гэта значыць уплыву новых інфармацыйных тэхналогій на працэсы сацыялізацыі ў цэлым;

– вывучэнне змяненняў асноўных напрамкаў сацыяльнага развіцця канкрэтнай асобы пад уздзеяннем віртуальнага асяроддзя.

Такім чынам, новае інфармацыйнае асяроддзе служыць адначасова і сродкам сацыялізуючага ўздзеяння, і сродкам сацыяльнага развіцця асобы. У дадзеным выпадку роля бібліятэкі ў адаптацыі інвалідаў па зроку ў камп'ютарным асяроддзі відавочна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфарматызацыя, укараненне сучасных тэхналогій ва ўсе бібліятэчна-інфармацыйныя працэсы дазваляе любой бібліятэцы не толькі значна палепшыць якасць і пашырыць асартымент прадастаўляемых інфармацыйных прадуктаў і паслуг, але і стварыць максімальна камфортнае асяроддзе для адукацыі, павышэння кваліфікацыі, рэабілітацыі і дасугу інвалідаў па зроку.

Пабудова інтэграванай сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання сляпых адбываецца ў працэсе непасрэднага наладжвання сувязей паміж бібліятэкамі розных тыпаў і відаў для дасягнення адзінай мэты: забеспячэння роўнага доступу да інфармацыі. Не менш значнымі ўмовамі існавання такой сістэмы з'яўляецца цеснае ўзаемадзеянне бібліятэк з іншымі сацыяльнымі інстытутамі, якія забяспечваюць сацыялізацыю і адаптацыю інвалідаў па зроку, каардынацыю дзейнасці бібліятэк розных ведамстваў у абслугоўванні інвалідаў па зроку.

Сістэма міжведамаснай каардынацыі дзейнасці бібліятэк па абслугоўванні інвалідаў можа выглядаць наступным чынам:




Рыс. Схема сістэмы міжгаліновай каардынацыі дзейнасці бібліятэк у абслугоўванні інвалідаў па зроку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прапанаваная сістэма бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку, мяркуем, скіравана, каб паспрыяць поўнаму і аператыўнаму задавальненню інфармацыйных патрэбнасцей, духоўнаму ўзбагачэнню, развіццю, сацыяльнай адаптацыі дадзенай катэгорыі карыстальнікаў.

Стварэнне і функцыянаванне дадзенай сістэмы ў большасці залежыць ад таго, наколькі арганічна яна сама і ўсе яе элементы будуць уключацца ў сацыяльныя праграмы падтрымкі інвалідаў, якія распрацоўваюцца і ажыццяўляюцца на агульнадзяржаўным і рэгіянальным узроўнях. Неабходна, каб пры распрацоўцы гэтых праграм улічваліся інфармацыйныя патрэбнасці інвалідаў, іх зацікаўленасць у бібліятэчным абслугоўванні.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Белинская, Е. П.* Социальная психология личности : учеб. пособие / Е. П. Белинская, О. А. Тихомандрицкая. – М. : Аспект Пресс, 2001. – 301 с.

2. *Диянская, Г. П.* Принцип равных возможностей в тифлобиблиотековедении и библиотечном обслуживании инвалидов по зрению / Г. П. Диянская ; Рос. гос. б-ка для слепых. – М., 1998. – 344 с.

3. *Паршукова, Г. П.* Информационно-библиотечная среда образовательного пространства региона (на примере Новосибирской области) : монография / Г. П. Паршукова ; ГПНТБ СО РАН. – Новосибирск, 2004. – 224 с.

4. *Петушка, Н. Я.* Тыфлабібліятэказнаўства як аснова тэорыі і практыкі бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку / Н. Я. Петушка // Весці БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2008. – № 2. – С. 33–38.

5. *Петушко, Н. Е.* Социокультурные основания библиотечного обслуживания инвалидов по зрению / Н. Е. Петушко // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2008. – № 1. – С. 18–23.

6. *Столяров, Ю. Н.* Структурирование библиотековедения как научной дисциплины и предмета преподавания / Ю. Н. Столяров // Книга: исследования и материалы. – М., 1994. – Вып. 68. – С. 135–159.

7. *Шапошников, А. Е.* Библиотечное обслуживание инвалидов: история, современность, тенденции / А. Е. Шапошников. – М., 1992. – 210 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.2. Псіхолага-педагагічныя прынцыпы гуманізацыі бібліятэчнай работы з малодшымі школьнікамі

Дзіцячая бібліятэка – гэта не толькі цэнтр інфармацыі, але і цэнтр стасункаў, развіцця. Работа дзіцячых бібліятэк сведчыць аб тым, што ў краіне назапашаны багаты вопыт менавіта педагагічнай работы з чытачамі. У асобных бібліятэках працуюць аматарскія аб’яднанні, змястоўна арганізуецца дасуг дзяцей. У сваёй рабоце з дзецьмі бібліятэкі выкарыстоўваюць самыя розныя віды дзейнасці: чытанне, маляванне, драматызацыю, літаратурную творчасць і г. д. Спецыфіка іх работы заключаецца ў тым, што любая дзейнасць ідзе праз кнігу, крочыць ад кнігі і чытання і скіравана на развіццё чытача-дзіцяці. Вядзецца гэта работа сёння галоўным чынам, на жаль, у большасці інтуітыўна, метадам спроб і памылак, перавага аддаецца практыцы «латаць дзіркі»: грамадства займаецца то маральным выхаваннем, то эканамічным, то ў якасці прыярытэтнага прапануюцца патрыятычнае выхаванне або прафілактыка наркаманіі і г. д. Прычым актывізуецца гэта дзейнасць звычайна тады, калі праблемы дзяцінства становяцца крайне вострымі.

Сацыёлагі, псіхолагі папярэджваюць, што ў дзяцей, падлеткаў, юнакоў узмацняецца пачуццё «адзіноты». У гэтай сітуацыі вельмі значная работа бібліятэкі як цэнтра культуры, як цэнтра гуманізацыі юнага чытача. Дадзеная ўстаноўка была заўсёды ўласціва дзейнасці дзіцячых бібліятэк. Цяпер надышоў час актуалізаваць яе як зыходную, якая вызначае антрапацэнтрызм бібліятэчнай работы, як сучасную канцэпцыю. «Ачалавечаная школа» павінна стаць антрапацэнтрычнай, гэта значыць змясціць у цэнтр самога вучня: не прыстасоўваць яго да вучэбнага матэрыялу, а ўвесь змест адукацыі падпарадкаваць яго развіццю як вышэйшай мэце, сцвярджае А. А. Мелік-Пашаеў, які абгрунтаваў платформу гуманізацыі адукацыі [6, с. 12]. Гэта зыходная пазіцыя ў значнай ступені важная для гуманізацыі ўсёй бібліятэчнай работы з дзецьмі. Такі падыход дыктуе перагляд тэарэтычных і метадычных пазіцый, зместу, форм работы з чытачамі, структурыраванне фондаў. Адпаведна канцэпцыі антрапацэнтрызму, на наш погляд, уяўляюць цікавасць псіхолага-педагагічныя прынцыпы гуманізацыі бібліятэчнай работы з дзецьмі і юнацтвам, якія закладзены ў агульнай тэорыі выхавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблемам уплыву чытання на развіццё дзіцяці надавалі вялікую ўвагу многія філосафы, педагогі, псіхолагі, бібліятэказнаўцы, тэарэтыкі мастацтва: В. Р. Бялінскі, М. Р. Чарнышэўскі, М. А. Дабралюбаў, К. Д. Ушынскі, Л. М. Талстой, М. А. Рубакін, В. В. Разанаў, Л. С. Выгоцкі [1], А. М. Ляонцьеў [5], В. Д. Асмус, А. М. Лявідаў [4]. У беларускім бібліятэказнаўстве педагагічныя аспекты бібліятэчнага абслугоўвання распрацоўвалі Л. А. Дзямешка [2], Н. У. Клімянкова [3] і інш. Гэты багаты тэарэтычны і практычны вопыт ляжыць у аснове сучаснай бібліятэказнаўчай тэорыі і методыкі работы з малодшымі школьнікамі – чытачамі бібліятэкі.

Аднак недастаткова пераканацца ў выхаваўчых магчымасцях чытання. Важна даць адказ на пытанне, як выхаваць чытача, для якога чытанне з'яўляецца патрэбнасцю і сродкам асабаснага развіцця.

Значны ўплыў на актуалізацыю праблем дзіцячага чытання і выхавання аказала дзейнасць М. А. Рубакіна. Створаная ім навука – бібліяпсіхалогія (навука аб чытанні, чытачы, аўтары і кнізе) – з'явілася вынікам эксперыментальных назіранняў і апрацоўкі фактычнага матэрыялу. На аснове свайго вопыту і даследаванняў М. А. Рубакін сцвярджаў, што кніга і чытанне з'яўляюцца важным сродкам развіцця грамадства. У артыкуле «Этюды о русской читающей публике» вучоны адзначыў, што «нішто так не характарызуе ступень грамадскага развіцця, ступень грамадскай культуры, як узровень чытаючай публікі ў дадзены момант» [8, с. 136].

Галоўныя якасці, якія, па меркаванні М. А. Рубакіна, можа развіць чытанне, – веды, разуменне, спагадлівасць, дзейнасць [8, с. 186]. Такім чынам, «усялякая кніга ўздзейнічае або можа ўздзейнічаць і на інтэлектуальны, і на эмацыянальны, і на валявы бок чытача, і на яго дзейнасць» [8, с. 202].

Але для таго, каб стаць чытачом (або вырасціць чытача), лічыў вучоны, трэба даць адказы на чатыры пытанні:

1. Як вычарпаць з кнігі магчыма больш каштоўных ведаў?
2. Як праз кнігу развіваць у сабе ўменне думаць?
3. Як выпрацаваць у сваёй душы спагадлівасць?
4. Як праявіць сябе ў жыцці? [8, с. 201].

Як бачым, перавага не аддаецца ні аднаму з палажэнняў, яны разглядаюцца ў комплексе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Напачатку XX ст. у работах, спецыяльна прысвечаных дзіцячай псіхалогіі, у цэнтр даследаванняў ставіцца пытанне аб спасылках, сродках і ўмовах развіцця асобы. У працах Л. С. Выгоцкага [1, с. 271], С. Л. Рубінштэйна [9, с. 482], А. М. Ляонцьева [5] і інш. распрацавана тэорыя здольнасцей як комплекс індывідуальна-псіхалагічных прыкмет і якасцей асобы, а таксама ўзнята праблема ролі культуры і мастацкай творчасці ў развіцці і станаўленні асобы. Навукоўцы прыйшлі да высновы, што літаратура займае асобнае месца ў фарміраванні духоўнага свету дзіцяці, яго маралі, мыслення, эмоцый, мовы, творчых пачаткаў. Але ўсё гэта мае месца толькі пры ўмове эстэтычнага ўспрымання мастацкага твора.

Думкамі аб тым, што чытанне з'яўляецца творчым працэсам, а прырода творчасці пісьменніка і прырода творчасці чытача маюць многа агульнага, прасякнута работа А. М. Лявідава [4], па перакананні якога, адной з умоў па-сапраўднаму вялікага мастацтва з'яўляецца і вялікі давер да чытача, да яго творчых магчымасцей. Сапраўднае мастацтва «падымае» чытача. Ён сцвярджае, што чытач, як і пісьменнік, павінен быць творцам – шляхі творчасці пісьменніка і чытача розныя, але прырода іх творчасці мае многа агульнага, таму ўсё, чым павінен валодаць пісьменнік, абавязкова і для чытача. А. М. Лявідаў разумее чытанне мастацкай літаратуры менавіта як творчы працэс [4, с. 289].

Клопатам аб выхаванні таленавітага чытача, здольнага ўспрыняць і засвоіць багацце мастацкай літаратуры, прасякнута канцэпцыя творчага чытання бібліятэказнаўцы, педагога Т. Д. Полазавай, якая абапіраецца, у першую чаргу, на эстэтычныя і педагагічныя погляды Л. М. Талстога, К. Д. Ушынскага і лічыць, што педагогіка сутворчасці (супрацоўніцтва) можа служыць арыенцірам для бібліятэкараў і педагагоў у выхаванні творчага чытача і творчай асобы, і ў асноўных сваіх палажэннях сцвярджае наступнае. Па-першае, неабходна разглядаць выхаванне не як набор або нават сістэму заняткаў, масавых мерапрыемстваў, індывідуальных гутарак у дадатак да вучэбнай дзейнасці, а як гуманістычны кірунак стасункаў бібліятэкара і настаўніка з дзецьмі-чытачамі, калі ўсе задачы адукацыі вырашаюцца пры ўзаемнай зацікаўленасці педагога і дзіцяці, калі не падзяляецца чытацкая дзейнасць для адукацыі і чытацкая дзейнасць для асалоды і развіцця. Па-другое, разумець выхаваўчую работу з дзецьмі не як перадачу свайго вопыту старэй-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шым пакаленнем малодшаму, а як узаемадзеянне і сутворчасць дарослых і дзяцей, сутворчасць, якая забяспечвае развіццё і станаўленне цэласнай гарманічнай асобы дзіцяці [7, с. 85].

Абодва гэтыя падыходы закладзены ў прынцыпах педагогікі супрацоўніцтва, якія з'яўляюцца канцэптуальнай асновай у рабоце бібліятэк з малодшымі школьнікамі. Разгледзім некаторыя з іх. Асобасны падыход выступае як вядучы прынцып педагогікі супрацоўніцтва. У традыцыйнай тэорыі бібліятэчнай работы з дзецьмі вядучым прынцыпам з'яўляецца індывідуальны падыход. Індывідуальны падыход у абслугоўванні ў асноўным зводзіцца да яго індывідуалізацыі і дыферэнцыяцыі; уліку чытацкіх інтарэсаў, пазнавальных здольнасцей маленькіх чытачоў. Асобасны падыход – паняцце шырокае, яно прадугледжвае мэтанакіраваную актывізацыю разнастайных сфер праяўлення індывідуальнасці чытача.

Маюцца розныя азначэнні паняцця асобы. Нягледзячы на розніцу прапануемых фармулёвак, іх аб'ядноўвае прызнанне асобы як інтэгратыўнага ўтварэння, якое фарміруецца ў прадметнай дзейнасці і стасунках.

Асоба з'яўляецца адкрытай сістэмай, якая аб'ядноўвае ў непаўторнае цэлае сацыяльныя і біялагічныя кампаненты. Яна, як і любая жывая істота, валодае здольнасцямі самарэгуляцыі. Рэгулюючым пачаткам актыўнасці асобы, яе ўчынкаў і паводзін з'яўляецца самаасэнсаванне, патрэбнасна-матывацыйная сфера.

Асобасны падыход арыентуе на ўнікальнасць кожнага дзіцяці, самаактуалізацыю яго здольнасцей і талентаў, шматбаковае развіццё духоўных сіл – інтэлектуальных, эмацыянальных, валявых.

Безумоўная павага да чытача – адносіны, арыентаваныя на патэнцыяльнае Я асобы чытача. Гэта павага, заснаваная на асобасна-значнай веры бібліятэкара, педагога ў творчы гуманістычны патэнцыял чытача. Павага да яго як уладальніка ўнікальнага, непаўторнага духоўнага свету, яго асобаснага прамога і ўскоснага вопыту. Галоўнае – павага, сімпатыя да чалавека, натуральная вера ў яго творчы патэнцыял. Інакш кажучы, павага авансам. Для дзіцяці гэта вельмі важна, таму што вызваляе яго ад няўпэўненасці ў сваіх сілах.

Дамінантай гэтага прынцыпу з'яўляюцца адносіны да асобы чытача як да суб'екта дзейнасці і стасункаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наступны прынцып – апераджальнае чаканне – як бы канкрэтызуе першы. Не толькі прызнанне таго, што чытач здольны, мае магчымасць творча прачытаць, зразумець, па-свойму ацаніць дадзеную кнігу і інш., але і чаканне далейшага развіцця юнага чытача як асобы, здольнай да творчай дзейнасці. Такія адносіны даюць перспектыву развіцця асобы, надаюць стасункам бібліятэкара і чытача сэнс двухбаковага самааднаўлення. Сярод гуманістычных прынцыпаў узаемадзеяння бібліятэкара і чытача важнае месца займае прынцып стасункаў і ўзаемнага дачынення. Ён таксама закладзены ў педагогіку супрацоўніцтва: настаўнік і вучань маюць стасункі не толькі ў межах функцыянальных, сацыяльна-ролевых. Гэтыя стасункі значна шырэй, яны заснаваны на даверы. Асабліва для чытача вельмі юнага неабходны чалавек у бібліятэцы, якому можна даверыць свае сумненні, распавесці аб сваіх праблемах. Такія адносіны лепш за ўсё складаюцца ў індывідуальных стасунках, менавіта яны і значныя ў першую чаргу пры арыентацыі на асобу.

У абслугоўвані малодшых школьнікаў важнае значэнне мае прынцып падабенства ў педагогіцы супрацоўніцтва – згодна антычнаму меркаванню, «падобнае параджаецца падобным», гэта значыць развіццё стымулюецца развіццём, творчасць нараджаецца толькі ў атмасферы творчасці, духоўнасць – у атмасферы духоўнасці, здольнасці фарміруюцца і праяўляюцца ў актыўнай дзейнасці.

Кожнае дзіця ад нараджэння мае свае магчымасці да развіцця; мэта выхавання – стварыць умовы для раскрыцця, развіцця і рэалізацыі здольнасцей дзіцяці. Не рэалізаваныя своечасова задаткі знікаюць. Асоба дзіцяці ўяўляе сабой інтэгратыўнае цэлае і павінна развівацца цэласна, а не па частках, гэта значыць інтэлектуальна, эстэтычна, духоўна.

Чытанне мастацкай літаратуры валодае вялікім патэнцыялам у цэласным развіцці дзіцяці. Але толькі чытанне, якое працякае як творчы працэс, садзейнічае цэласнаму выхаванню дзіцяці. Фарміраванне творчага чытача магчыма пры ўмове ведання і ўліку індывідуальных і ўзроставых псіхалагічных асаблівасцей дзіцяці, яго жыццёвага і чытацкага вопыту.

Практыка выхавання малодшых школьнікаў немагчыма без навукова абаснаванай сістэмы работы з малодшымі школьнікамі. Ніякія разавыя мерапрыемствы, нават самыя цікавыя, сучасныя, не прывядуць да пастаўленай мэты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перш за ўсё падкрэслім цэласнасць гэтай сістэмы, якая дасягаецца тым, што на развіццё дзіцяці скіраваны ўсе складнікі навуковай тэорыі выхавання: прынцыпы, змест, метады і арганізацыйныя формы. У аснове сістэмы – прынцыпы, якія ўяўляюць сабой мадыфікацыю прынцыпаў педагогікі супрацоўніцтва ў дачыненні да задач выхавання творчага чытача і асаблівасцей малодшага школьнага ўзросту.

У першую чаргу гэта апора на характэрныя для малодшых школьнікаў: дамінантную эмацыянальную актыўнасць; патрэбу ў гульні; багацце вольнага ўяўлення; нечаканасць асацыятыўных рэакцый.

Эмацыянальная актыўнасць – каштоўнейшая якасць псіхікі малодшага школьніка. Яна – аснова для фарміравання эмпатыі, гэта значыць эмацыянальнага водгуку на перажыванні, пачуцці, эмоцыі іншых людзей, водгуку на перажыванні, эмоцыі, пачуцці, замыслы, ідэі персанажаў літаратурнага твора. Важна стварыць умовы для праяўлення і развіцця пачуццяў дзяцей; менавіта яны будзяць патрэбнасць у стасунках з кнігай. Толькі тое, што ўспрынята эмацыянальна, становіцца асобасным здабыткам юнага чытача.

Важнай умовай паспяховай рэалізацыі прынцыпаў педагогікі супрацоўніцтва з'яўляецца ўключэнне гульні ў сістэму работы з малодшымі школьнікамі. Па-першае, гульня – адзін з найбольш натуральных, блізкіх для дадзенага ўзросту відаў дзейнасці, у якой дзіця адчувае сябе натуральна. Па-другое, гульня – гэта форма вольнага самавыяўлення дзіцяці, менавіта ў гульнёвых паводзінах дзіця паводзіць сябе свабодна, раскавана. Па-трэцяе, гульня будзіць цікавасць, вучыць зносінам, дапамагае пазнаваць сябе і іншых. Гульня – універсум дзяцінства. Яна садзейнічае стварэнню такіх умоў, без якіх немагчыма развіццё творчых патэнцый дзіцяці.

Гульня з'яўляецца тым «чароўным ключыкам», які адмыкае сэрца кожнага дзіцяці, стварае ўмовы для вольных, натуральных стасункаў чытачоў і бібліятэкараў, з'яўляецца своеасаблівай «творчай лабараторыяй» для бібліятэкара, дапамагае будзіць у дзяцей інтарэс, стымуляваць іх актыўнасць. Сутнасць гэтага прынцыпу можа быць адлюстравана лаканічнай формулай К. Чукоўскага «гульня – творчасць – развіццё».

Уключэнне гульні ў жыццядзейнасць дзяцей-чытачоў – важная ўмова паспяховай рэалізацыі прынцыпаў педагогікі супра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цоўніцтва. Псіхолагі лічаць, што любыя псіхалагічныя структуры фарміруюцца ў актыўнай дзейнасці дзяцей. Значыць, задача бібліятэкара заключаецца ў тым, каб уключыць дзіця ў актыўную і самастойную дзейнасць.

Галоўная скіраванасць работы бібліятэкара – арыентацыя на дзіцячую радасць, на дзіцячую захопленасць, стварэнне атмасферы гульні, вольнай фантазіі, непасрэднасці.

Функцыя ўяўлення мае вялікае значэнне ў рабоце з малодшымі школьнікамі. Для малодшага школьнага ўзросту характэрна ўяўленне, не абмежаванае ўмоўнасцямі і жорсткімі рамкамі. Багатае вольнае ўяўленне, скіраванае ў творчае русла, забяспечвае інтэнсіўнае развіццё дзіцяці. Асабліва ярка гэта якасць можа праяўляцца ў літаратурнай творчасці дзяцей.

Багацце пачуццяў, эмоцый, думак, якія спадарожнічаюць творчым стасункам, разнастайнасці відаў дзейнасці, стварае базу для ўзнікнення нечаканага мноства асацыятыўных сувязей, што з’яўляецца неабходнай умовай асобаснага ўспрыняцця прачытанага.

Такім чынам, для сістэмы работы з малодшымі школьнікамі характэрна наступнае: суб’ект-суб’ектныя адносіны паміж бібліятэкарам і дзецьмі-чытачамі; стварэнне ўмоў для вольнага самавыяўлення кожнага чытача; забеспячэнне багатай, духоўна-эмацыянальнай, разумовай жыццядзейнасці малодшага школьніка; выкарыстанне разнастайных прыёмаў, форм і метадаў бібліятэчнай работы, якія абапіраюцца на гульнёвую дзейнасць.

Бібліятэчная работа з дзецьмі (індывідуальная, масавая), якая вядзецца на аснове прынцыпаў педагогікі супрацоўніцтва, уяўляе сабой бібліятэчнае ўзаемадзеянне як узаемаўзбагачэнне, пастаяннае развіццё і самаразвіццё суб’ектаў: бібліятэкара і чытача.

Бібліятэкар – кіраўнік чытання павінен творча выконваць сваю справу. Тыя задачы, якія ў сучаснай сітуацыі выконвае бібліятэка, – частка, звяно шматаспектнай сістэмы гуманістычнага выхавання, адукацыі, арганізацыі дасугу дзяцей, якая ўключае многія альтэрнатыўныя падыходы і формы. Дзіцячая бібліятэка мае пэўнае прызначэнне – быць цэнтрам культурных духоўных стасункаў, творчай інтэлектуальнай дзейнасці і дасугу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Выготский, Л. С.* Педагогическая психология / Л. С. Выготский ; под. ред. В. В. Давыдова. – М. : Педагогика, 1991. – 375 с.

2. *Дзямешка, Л. А.* Педагагічная навука і бібліятэказнаўства: праблемы ўзаемасувязі / Л. А. Дзямешка // Адукацыя і выхаванне. – 2010. – № 7. – С. 43–48.

3. *Клімянкова, Н. У.* Бібліятэчна-педагагічная дзейнасць: накірункі і перспектывы развіцця / Н. У. Клімянкова // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 12. – С. 44–49.

4. *Левидов, А. М.* Автор – образ – читатель / А. М. Левидов. – Л. : ЛГУ, 1983. – 350 с.

5. *Леонтьев, А. А.* Педагогическое общение / А. А. Леонтьев. – М. : Знание, 1979. – 150 с.

6. *Мелик-Пашаев, А. А.* Гуманизация образования: проблемы и возможности / А. А. Мелик-Пашаев // Вопросы психологии. – 1989. – № 5. – С. 12.

7. *Полозова, Т. Д.* Педагогика сотворчества / Т. Д. Полозова // Библиотека. – 1993. – № 10. – С. 15–19.

8. *Рубакин, Н. А.* Избранное: в 2 т. / Н. А. Рубакин. – М. : Книга, 1975.

9. *Рубинштейн, С. А.* Проблемы общей психологии / С. А. Рубинштейн. – М. : Педагогика, 1989. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.3. Педагагічныя ўмовы развіцця чытацкай дзейнасці падлеткаў у бібліятэцы

Сярод разнастайных сацыяльных інстытутаў, якія садзейнічаюць развіццю асобы дзіцяці, бібліятэка выступае ў якасці важнай, але спецыфічнай структуры. Бібліятэка сёння не толькі месца акумуляцыі і распаўсюджвання літаратурных крыніц. Чытачы прыходзяць у бібліятэку, каб выбраць найбольш цікавыя для іх кнігі, наведаць тое ці іншае мерапрыемства. Менавіта ў мікраасяроддзі бібліятэкі ажыццяўляецца працэс вольнага міжасобаснага ўзаемадзеяння, якое незаарганізавана, нерэгламентавана вучэбнай дзейнасцю, пазбаўлена строгага кантролю, як, напрыклад, у школе.

Адной з галоўных задач абслугоўвання дзяцей і падлеткаў у дзіцячых бібліятэках з’яўляецца задача па прыцягненні падрастаючага пакалення да чытання лепшых твораў друку. Ю. П. Мяленцьева лічыць, што ў сваім рэальным праяўленні бібліятэчны ўплыў на чытанне не нясе педагагічнай нагрузкі, таму што наведванне бібліятэкі носіць эпізадычны характар, кантакты біб-

ліятэкара і чытача даволі рэдкія, бібліятэкары ў працэсе прафесійнай падрыхтоўкі не атрымліваюць дастаткова ведаў, каб весці педагагічную дзейнасць. Узаемадзеянне паміж бібліятэкарам і чытачом носіць суб'ект-суб'ектны характар. У бібліятэцы створаны інфармацыйны асяродак, а не педагагічны, як у школе, мяркуе даследчыца [12, с. 83–85].

Магчыма, гэта сцвярджэнне ў некаторай ступені можна лічыць правамоцным у адносінах да юнацкіх бібліятэк, але не для дзіцячых, педагагічная сутнасць якіх падкрэсліваецца шматлікімі даследчыкамі: Л. У. Сцяпанавай [19], А. А. Дубовік [7], Н. Л. Голубевай [5].

Педагогікай пранізана ўся дзейнасць бібліятэкі. Дзіцячую бібліятэку наведваюць пастаянныя чытачы, якія ўдзельнічаюць у пасяджэннях клубаў, створаных пры бібліятэках, у падрыхтоўцы масавых мерапрыемстваў. У вучэбныя праграмы вышэйшых навучальных устаноў, якія рыхтуюць бібліятэчныя кадры, уключаны курс «Асновы педагогікі», педагагічныя веды ў далейшым папаўняюцца праз сістэму павышэння кваліфікацыі, самаадукацыі. Узаемадзеянне, тым больш суб'ект-суб'ектнае, заўсёды носіць педагагічны характар.

У дзіцячых бібліятэках супрацоўнікі рэальна абапіраюцца на педагагічныя прынцыпы. Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і падлеткаў павінна развівацца ў рэчышчы гуманістычных ідэй у галіне адукацыі і выхавання. Канцэпцыя выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь (1999 г.) распрацавана на аснове новай гуманістычнай парадыгмы, якая прадугледжвае захаванне натуральнага характару і парадку сацыялізацыі індывіда. Стрыжнёвай ідэяй новай педагагічнай тэхналогіі выступае кіраванне ініцыятывай самога выхаванца ў працэсе педагагічнага ўзаемадзеяння. Такі падыход прадугледжвае падтрымку і стварэнне ўмоў для самарэалізацыі асобы, садзейнічае самавызначэнню асобы, стымуляванню здольнасці да паспяховай адаптацыі ў соцыуме.

Уся праблема разглядаецца ў кантэксце гуманістычнай педагогікі, якая абумоўлівае гуманістычную накіраванасць бібліятэчнага абслугоўвання.

Гуманістычная накіраванасць у выхаванні падрастаючага пакалення – з'ява не новая ў педагогіцы. Квінтэсэнцыяй назапашаных ведаў можна лічыць аўтарскую канцэпцыю гуманістычнага выхавання У. Т. Кабуша [8]. Працы беларускіх аўтараў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. У. Мартынавай [11], А. В. Петушковай [16] прысвечаны пытанням гуманістычнага напрамку ў педагогіцы.

У гуманістычным выхаванні дзіцяці ставіцца пытанне аб развіцці гуманнай асобы – зместу гуманістычнага выхавання. Чытанне літаратурных твораў найлепшым чынам адпавядае гэтай задачы. Бібліятэкар пры рэкамендацыі твораў друку ў індывідуальнай рабоце, пры падрыхтоўцы мерапрыемстваў на аснове літаратурных крыніц з найбольшым поспехам можа садзейнічаць развіццю асобы дзіцяці ў трох кірунках: асэнсаванне дзіцяцем самога сябе як маральнай асобы, фарміраванне ў дзіцяці маральных адносін да людзей, фарміраванне гармоніі ў адносінах дзіцяці і навакольнага свету.

Пры гуманістычным падыходзе пытанні аб разглядзе асобы дзіцяці як аб'екта бібліятэчнага абслугоўвання, аб кіраўніцтве чытаннем, аб суб'ект-аб'ектных адносінах падчас зносінаў з'яўляюцца не адпавядаючымі сучасным умовам.

Бібліятэкар, калі ён абслугоўвае дзяцей, выступае як спецыяліст, для якога на першы план паўстае вырашэнне педагагічных задач па выхаванні падрастаючага пакалення. Рэалізацыя гэтай задачы магчыма пры наяўнасці ў свядомасці бібліятэкара псіхолага-педагагічных ведаў, якія складаюць важны кампанент прафесіянальнай кампетэнцыі бібліятэкара, а таксама наяўнасці ўяўлення цэласнага вобраза дзяцінства.

Даследчыкі адзначаюць, што ў наш час мэты і каштоўнасці гуманістычнай педагогікі з пласта педагагічнай тэорыі пераходзяць у пласт педагагічнай свядомасці і ўвасабляюцца на практыцы. Супрацоўнікам бібліятэк, якія абслугоўваюць чытачоў-дзяцей, важна імкнуцца да рэалізацыі асноўных палажэнняў гуманістычнага выхавання ў прадастаўленні бібліятэчных паслуг. Таксама надаваць асаблівую ўвагу праблеме выхавання гуманнасці ў сваіх чытачоў, дапамагаць ім спасцігаць сябе, іншых людзей, свет праз веды і каштоўнасці, закладзеныя ў дзіцячай літаратуры.

Аўтар канцэпцыі гуманістычнага выхавання У. Т. Кабуш называе такія яго сродкі, як дзейнасць, стасункі і адносіны [8]. У бібліятэчным асяродку сродкамі выхавання з'яўляюцца чытацкая дзейнасць, бібліятэчныя зносіны і адносіны паміж чытачамі і бібліятэкарам.

Значная частка сацыяльнага вопыту чалавека фарміруецца праз чытанне. Ю. П. Мяленцьева справядліва сцвярджае, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чытанне з'яўляецца адзінай інтэлектуальнай тэхналогіяй засваення накопленых чалавецтвам ведаў у самым шырокім сэнсе гэтага паняцця [12, с. 10].

Трэба адразу адзначыць, што тэрміны «чытанне» і «чытацкая дзейнасць» у большасці выпадкаў выкарыстоўваюцца як сінонімы і з'яўляюцца ўзаемазамяняльнымі.

І. А. Нуньес Паула вызначыла чытанне як дзейнасць людзей, у ходзе якой у асноўным адбываецца засваенне імі грамадска-гістарычнага вопыту, замацаванага ў друкаваных тэкстах [15, с. 9].

Адпаведна «Новейшему философскому словарю» чытанне – спецыфічная форма моўных зносін людзей праз друкаваныя і рукапісныя тэксты, адна з форм апасродкаванай камунікацыі [9, с. 807]. Такой жа пазіцыі ў азначэнні чытання як камунікацыі прытрымліваецца даследчык М. Г. Ханін [20, с. 9].

У аснове азначэнняў В. А. Барадзіной і Ю. М. Дрэшэр – разуменне дзейнасці як спецыфічнага для чалавека спосабу адносінаў да знешняга свету, якое заключаецца ў пераўтварэнні і падпарадкаванні яго мэтам чалавека. Першапрычынай дзейнасці як віду чалавечай актыўнасці з'яўляецца патрэбнасць [2, с. 8]. Ю. М. Дрэшэр выкарыстоўвае непасрэдна тэрмін «чытацкая дзейнасць» і дае яму азначэнне – гэта мэтазгодны і актыўны спосаб адносін да знешняга свету, спосаб быцця асобы, які заключаецца ў засваенні, пераўтварэнні, выкарыстанні матэрыяльнага і духоўнага вопыту чалавецтва, зафіксаванага ў знакавай форме [6, с. 12].

В. А. Барадзіна разглядае чытанне як від камунікатыўна-пазнавальнай дзейнасці, сутнасць якой выражаецца ў актыўным, мэтанакіраваным пераўтварэнні і падпарадкаванні зместу тэксту розным патрэбнасцям сацыяльнага суб'екта [2, с. 8].

Такім чынам, агульнае ў гэтых азначэннях тое, што:

– чытанне разглядаецца як камунікатыўны акт;

– праз чытанне перадаецца матэрыяльны і культурны (сацыяльны) вопыт;

– сацыяльны вопыт зафіксаваны ў знакавай форме і перадаецца праз тэксты.

Можна падвесці вынік, што праз чытанне як камунікатыўны акт сацыяльны вопыт трансліруецца ў часе (з пакалення ў пакаленне) і ў прасторы (сацыяльны вопыт людзей, якія належаць да іншых культур).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У чытачазнаўстве выкарыстоўваецца падыход разгляду чытацкай дзейнасці па фазах ці этапах. У асноўным выдзяляюць тры фазы:

– матывацыйна-патрэбнасная фаза (тое, што папярэднічае чытанню і пабуджае да яго);

– працэсуальна-вынікова фаза (сам працэс чытання, звязаны з успрыманнем, разуменнем і засваеннем прачытанага);

– вынікова-ацэначная (тое, што ідзе за чытаннем: вынік і яго ацэнка).

Гэтыя ж фазы можна разглядаць праз паняцці «гатоўнасць – актыўнасць – выніковасць» у псіхалагічным кантэксце [6; 3].

Чытанне вывучаецца вучонымі розных навук: сацыялогіі, псіхалогіі, філалогіі, літаратуразнаўства, педагогікі, бібліятэказнаўства і інш.

Ю. М. Дрэшэр лічыць, што ў структуру тэорыі чытання ўваходзяць:

– агульная тэорыя чытання, якая сінтэзуе дасягненні ў вывучэнні чытання іншых навук;

– сацыялогія чытання, якая вывучае распаўсюджванне кніг і чытання, іх месца ў сістэме сучасных камунікатыўных сродкаў і г. д.;

– псіхалогія чытання;

– педагогіка чытання, задачай якой з'яўляецца выяўленне і абгрунтаванне прынцыпаў і крытэрыяў фарміравання кола чытання розных сацыяльна-дэмаграфічных груп, эфектыўнай сістэмы метадаў прапаганды кніг і кіраўніцтва чытаннем [6, с. 20–21].

Сацыялагічнымі праблемамі чытання займаліся Н. Я. Дабрыніна, І. М. Красаўцава і інш.

В. А. Барадзіна даследуе пытанні псіхалогіі чытання. Яна лічыць, што чытацкі лёс – лёс развіцця асобы ў пэўным соцыуме; разглядае эвалюцыю поглядаў на чытанне, чытацкую дзейнасць, прадстаўляе акмеалагічную канцэпцыю чытання, важнае месца ў якой займае ідэя чытацкай сацыялізацыі.

Праблемы педагогікі чытання распрацоўвалі І. І. Ціхамірава, В. А. Лявідаў і інш. У прыватнасці, В. А. Лявідаў прапанаваў методыку выкарыстання мастацкай літаратуры як спосабу маральнага выхавання падрастаючага пакалення. Ён падкрэсліваў, што бібліятэкі павінны стаць храмамі духоўнага адраджэння, якія ўносяць вялікі ўклад у падтрымку статусу чытання, якасці чытання і ўспрыняцця літаратуры [10, с. 111].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Педагагічны працэс ажыццяўляецца па абагульненай логіцы, якая адаптуецца да канкрэтных умоў. Вось асноўныя палажэнні:

– трэба ўлічваць патрэбнасныя інтарэсы дзяцей, іх полаўзроставыя і індывідуальна-псіхічныя асаблівасці, у адпаведнасці з якімі фармулюецца тэма;

– у адпаведнасці з тэмай з выдатных, перш за ўсё класічных твораў выбіраюцца некалькі сітуацый (сюжэтаў), якія маюць агульначалавечую мастацка-эстэтычную і маральную каштоўнасць;

– з адабраных сюжэтаў на пэўную тэму ствараецца цэласная мастацкая кампазіцыя, якая эмацыянальна закранае дзяцей, абуджае іх патрэбнасці, прымушае суперажываць, дзякуючы якой дзеці могуць зведаць, напрыклад, моц любві, трагічнасць смерці, адзіноты і інш.;

– кампазіцыя прадугледжвае выкарыстанне пры неабходнасці тэхнічных сродкаў – аудыя, відэа і інш.;

– дзецям прапаноўваецца выразіць адносіны да ўбачанага, пачутага, а таксама прывесці свае прыклады з мастацтва і жыцця;

– дзеці супастаўляюць адабраныя сітуацыі (сюжэты) і адказваюць на пытанні;

– дзецям прапаноўваецца ў думках здзейсніць які-небудзь свой учынак у некалькіх аналагічных жыццёва-рэальных сітуацыях і патлумачыць матывы сваіх дзеянняў [10, с. 110–111].

Такім чынам, па гэтай схеме можна распрацоўваць комплекс мерапрыемстваў, мэта якіх – прыцягненне падлеткаў да чытання твораў друку, якія дапамогуць ім ісці па ступенях сацыялізацыі.

Даследчыкі гавораць аб вялікай ролі бібліятэкі ў чытацкім развіцці асобы, якая абумоўлена наяўнасцю фондаў і спецыялістаў для кіраўніцтва чытаннем. Задачай бібліятэкі найперш з’яўляецца прасоўванне саміх кніг (аўтараў, тэм і г. д.). Зараз адбываецца асэнсаванне другой задачы – прасоўванне самога працэсу чытання, фарміраванне ў чытача пазітыўных адносін да гэтага віду дзейнасці.

Галоўным кірункам у рабоце бібліятэкі па выхаванні і развіцці падлеткаў з’яўляецца чытацкая сацыялізацыя. Яна разглядаецца намі ў русле канцэпцыі акмеалогіі чытання, паводле якой вызначаецца як працэс і вынік засваення, узнаўлення і ак-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туалізацыі чытацкага вопыту, назапашанага чалавецтвам [3]. Таксама ўжываецца паняцце «літаратурная сацыялізацыя» – разумеецца развіццё навыкаў чытання, выхаванне чытацкага густу, папулярызацыя мастацкай літаратуры [18, с. 52]. Гэта крыху спрошчаны падыход, В. А. Барадзіна разглядае праблему значна шырэй.

Блізкім па сэнсе тэрміну «чытацкая сацыялізацыя» В. А. Барадзіна называе паняцце «чытацкае развіццё», якое характарызуецца колькасна-якаснымі змяненнямі ў асобе чытача, што адбываюцца ў яго свядомасці, дзейнасці, зносінах [3]. Калі разглядаць чытацкае развіццё асобы ў антагенезе, то падлеткі знаходзяцца на фарміруючым этапе. На гэтым этапе чытацкай сацыялізацыі прадугледжваецца фарміраванне культуры чытання, развіццё творчага чытання.

Найважнейшым сродкам выхавання і сацыялізацыі падлеткаў у бібліятэцы выступаюць зносіны, падчас якіх усталёўваюцца эмацыянальна-асобасныя адносіны паміж удзельнікамі.

Шэраг бібліятэказнаўцаў (А. Ю. Рабушава і інш.) акцэнтуюць увагу на значэнні бібліятэкі як камунікатыўнага цэнтра. А. Ю. Рабушава лічыць, што асноўнай, сувязной, сярод іншых функцый (сацыялізуючай, адукацыйнай і функцыі самавыхавання) з'яўляецца функцыя камунікатыўных зносін [17, с. 28].

Міжасобасныя зносіны ва ўмовах бібліятэкі ўзнікаюць паміж падлеткамі і бібліятэкарам, а таксама паміж падлеткамі і іншымі чытачамі – дарослымі і равеснікамі. Сацыялізацыя падлеткаў адбываецца ў працэсе іх зносін з бібліятэкарам, для якога важна прытрымлівацца педагагічнай устаноўкі на ўзаемадзеянне з падлеткамі.

Міжасобасныя зносіны адбываюцца ў дзвюх формах: дыялагічнай і маналагічнай. Дыялагічная форма павінна пераважаць у зносінах паміж бібліятэкарам і падлеткамі ў індывідуальных формах бібліятэчнага абслугоўвання, і перш за ўсё ў гутарках, рэкамендацыйных, установачных, і гутарках аб прачытаным. Дыялагічная форма незаменная ў зносінах падлеткаў з іншымі чытачамі падчас правядзення бібліятэчных мерапрыемстваў: абмеркаванняў кніг, чытацкіх канферэнцый, дыскусій і інш. Гэты тып зносін аптымальны з пункту гледжання арганізацыі камунікацыі і валодання максімальна развіваючым, выхаваў-

чым, творчым патэнцыялам. У аснове дыялогавых форм зносін ляжаць такія псіхолага-педагагічныя прынцыпы, як:

– фарміраванне і развіццё інтарэсаў падлетка, якія не супрацьпастаўлены агульначалавечым гуманістычным каштоўнасцям;

– стварэнне атмасферы, якая б у найбольшай ступені спрыяла таму, каб юны чытач мог максімальна праявіць сваю індывідуальнасць;

– павага да асобы дзіцяці, прызнанне яго чалавечых правоў, свабоды выбару чытання [1].

Імкненне бібліятэкара да дыялогавага тыпу зносін з'яўляецца адным са шляхоў павышэння эфектыўнасці бібліятэчных стасункаў і бібліятэчнай дзейнасці ўвогуле.

Разам з тым некаторыя даследчыкі падкрэсліваюць сацыялізуючую ролю маналагічнай формы міжасобасных зносін, мэта і вынік якіх – самавыражэнне асобы. Гэта важны аспект сацыялізацыі, які абумоўлівае ўмацаванне навыкаў выражаць свае думкі, асэнсоўваць асобасныя праблемы і адносіны да іх самога індывіда [14, с. 9–10]. Гэта вельмі важна ў падлеткавым узросце, калі найбольш інтэнсіўна адбываецца фарміраванне асобы чалавека.

Педагагічная і сацыялізуючая сутнасць бібліятэчнага абслугоўвання праяўляецца ў зносінах бібліятэкара з чытачамі-падлеткамі падчас іх запісу ў бібліятэку, пры кансультацыях па розных пытаннях, а таксама у трох фазах чытання: матывацыйна-патрэбнаснай, працэсуальна-выніковай, вынікова-ацэначнай. Міжасобасныя зносіны ў кожнай фазе чытання маюць свае асаблівасці і тую ці іншую меру інтэнсіўнасці, а таксама абумоўліваюць выбар форм і метадаў бібліятэчнага абслугоўвання, у межах якіх ажыццяўляюцца зносіны з чытачамі.

Уяўленне аб чытацкіх інтарэсах падлеткаў з'яўляецца самай першай умовай для эфектыўнай работы бібліятэкара. Бібліятэкар павінен ведаць агульныя заканамернасці чытацкіх пераваг падлеткаў і імкнуцца вывучыць чытацкія інтарэсы кожнага падлетка паасобку, наколькі гэта магчыма.

У першай, матывацыйна-патрэбнаснай, фазе чытання бібліятэкар аказвае ўплыў на выбар падлеткамі той ці іншай кнігі. Зносіны з бібліятэкарам дазваляюць выявіць сфарміраванасць чытацкага інтарэсу, аблегчыць самастойны выбар кнігі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўнай формай індывідуальнай бібліятэчнай работы, у якой у поўнай меры рэалізуецца сацыялізуючы патэнцыял міжасобасных зносін, з’яўляецца рэкамендацыйная гутарка. Яна прадугледжвае шмат метадаў, якія дапамагаюць звярнуць увагу чытача на твор, зацікавіць ім.

Валоданне бібліятэкарам метадам «пераключэння», ці «тэорыяй мастоў», сведчыць аб яго высокім прафесіяналізме. Гэты метад прадугледжвае актыўны ўплыў на выбар літаратуры, замену кнігі пэўнага аўтара, жанру і віду на іншую, з пункту гледжання бібліятэкара, больш карысную. Але «пераключэнне» мае права на існаванне не як замена аднаго жанру ці тэмы іншым, а толькі як пашырэнне тэматыкі чытання і ўяўлення чытача аб розных відах і жанрах літаратуры. Эфектыўным гэты метад можа стаць у тым выпадку, калі бібліятэкар улічвае спецыфіку ўспрымання тэксту канкрэтным чытачом. Карыстацца ім трэба вельмі асцярожна, бо актыўнае ўмяшальніцтва выклікае непрыязь чытача.

Распаўсюджаным з’яўляецца метад ідэнтыфікацыі, гэта значыць рэкамендацыі, праз атаясамліванне чытача з героямі літаратурных твораў па ўзросце, інтарэсах і г. д. Метад персаніфікацыі прадугледжвае спасылку на аўтарытэт пэўнай асобы і яе чытацкі вопыт. Для рэкамендацыйных гутарак выкарыстоўваюцца водгукі сучаснікаў, рэцэнзіі, уступныя артыкулы.

Існуе шмат іншых прыёмаў рэкамендацыі кніг, так званы «эффект звароту бібліятэкара за дапамогай да чытача», «эффект спрэчнай кнігі», «эффект забароны» і шмат іншых. Бібліятэкар мае магчымасць уплываць на працэсуальна-выніковую фазу чытання падлетка праз установачную гутарку. У ходзе гэтай гутаркі бібліятэкар прапаноўвае чытачу аднесці кнігу да пэўнага жанру, звярнуць увагу на тое, наколькі поўна ці выбарачна раскрыта тая ці іншая тэма ў творы і г. д. Установачная гутарка патрэбна, калі неабходна змяніць матыў чытання, папярэдзіць, што кніга не пра тое, аб чым дзіця жадае прачытаць. Устаноўка павінна быць абавязкова спрыяльнай для кнігі.

У выніковa-ацэначнай фазе чытання падлеткі маюць патрэбнасць у абмеркаванні прачытанага, ім цікава ведаць уражанне аб кнізе іншых чытачоў, бібліятэкара. Гутарка аб прачытаным як метад бібліятэчнага абслугоўвання разглядаецца як адзіны дынамічны бібліятэчна-педагагічны працэс. Яе нельга праводзіць паспехам. У ходзе такой гутаркі бібліятэкар атрымлівае

звесткі, на аснове якіх будуецца далейшая работа па задавальненні існуючых патрэбнасцей і фарміраванні новых запытаў чытачоў.

Міжасобасныя зносіны бібліятэкара з падлеткамі могуць актывізаваць творчасць дзяцей, садзейнічаць развіццю ўспрымання тэксту праз прапанову напісаць водгук на твор ці праілюстраваць яго. Такая прапанова можа вывесці гутарку аб творы на новы ўзровень.

Сацыялізуючы ўплыў бібліятэчнага абслугоўвання праяўляецца таксама пры франтальных (масавых і групавых) формах абслугоўвання. Мерапрыемствы, у якіх падлетак – пасіўны аб’ект уздзеяння бібліятэкара, малаэфектыўныя. Больш плённым можа быць непасрэдны ўдзел чытачоў у распрацоўцы і правядзенні мерапрыемстваў. Арганізацыя ў бібліятэцы мерапрыемстваў, якія разлічаны на творчасць саміх дзяцей, спрыяе іх эмацыянальнаму развіццю, абуджае вобразнае мысленне. Формы такіх мерапрыемстваў могуць быць самымі разнастайнымі. Асабліва паспяховымі аказваюцца групавыя формы бібліятэчнай работы з невялікай колькасцю ўдзельнікаў: дыялогі-дыспуты, вечары-дыялогі, вечары пытанняў і адказаў, чытацкія канферэнцыі, абмеркаванні кніг, дыскусіі і г. д.

Гуманістычнай педагогікай рэкамендуецца прымяняць такія формы і метады, як дыскусія, драматызацыя, з дапамогай якіх можна ліквідаваць недахоп інфармацыі падлетка аб самім сабе, неразуменне асобасных праблем, недаацэнку ўласных магчымасцей, інтэлектуальнага, эмацыянальнага, валявога патэнцыялу. У ходзе дыскусіі адбываецца выпрацоўка ўласнага меркавання падлеткаў па пастаўленых пытаннях, таксама падлеткі вучацца чуць і разумець выказванні людзей, якія наконт дадзеных сітуацый маюць іншыя думкі [16].

Уключэнне падлеткаў у соцыум, выкананне пэўных сацыяльных роляў адбываецца пры падрыхтоўцы масавых мерапрыемстваў, сярод якіх на сённяшні дзень з’явіўся шэраг інавацыйных форм: трыбуны грамадскай думкі, канферэнцыі чытачоў і гледачоў, вечарыны і інш.

У педагогіцы ёсць вопыт арганізацыі «дыдактычнага тэатра», які добра ўспрымаецца дзецьмі. Творчая група працуе з творамі серыі «Жизнь замечательных людей», адбірае факты да драматызацыі, распрацоўвае сцэнарый. Падрыхтоўка і пастаноўка, у якой падлеткі выступаюць у якасці акцёраў, дэка-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ратараў, касцюмераў, рэалізуе патрэбнасці дзяцей у творчым самавыяўленні, самасцвярджэнні – асноўныя задачы сацыялізацыі [4].

Сацыялізуючае значэнне клубаў і аматарскіх аб'яднанняў пры дзіцячых бібліятэках цяжка пераацаніць. Па характары дзейнасці клубы ўмоўна можна падзяліць на творчыя, пазнавальна-пошукавыя, інфармацыйныя. Клубы найбольш эфектыўна працуюць там, дзе пасяджэнні, сустрэчы рыхтуюць самі чытачы. Такая работа спрыяе фарміраванню пастаянна дзеючага актыву. Арыентацыя на актыўную даўгачасную работу, якая аб'ядноўвае групу чытачоў з аднолькавымі інтарэсамі, уключае лепш разавыя, хоць і высокапрафесійныя, мерапрыемствы.

Апасродкаваныя формы бібліятэчнага абслугоўвання таксама ўтрымліваюць у сабе сацыялізуючы патэнцыял.

Такім чынам, бібліятэка з'яўляецца сацыяльным інстытутам, у якім важным сродкам развіцця асобы выступае чытацкая дзейнасць, каторую бібліятэкары намагаюцца актывізаваць і развіваць і гэтым самым спрыяюць чытацкай сацыялізацыі моладзі. Другім важным сродкам з'яўляюцца эмацыянальна-асобасныя, даверлівыя адносіны, што ўсталёўваюцца падчас бібліятэчных зносін паміж чытачамі і бібліятэкарам, чытачоў паміж сабой. Менавіта стасункі маюць першаступеннае значэнне як сродак выхавання і сацыялізацыі падлеткаў.

Праз зносіны засвойваюцца маральныя і сацыяльныя нормы паводзін, агульначалавечыя духоўныя каштоўнасці, адбываецца прывядзенне ведаў у пэўную сістэму, самасцвярджэнне і самарэалізацыя асобы.

У бібліятэчным асяроддзі зносінам надаецца надзвычайнае значэнне, бо бібліятэчнае абслугоўванне цалкам прасякнута зносінамі паміж чытачамі і бібліятэкарам. Гэтыя зносіны будуюцца на ідэях гуманістычнага выхавання, на прынцыпах дыялагічных, раўнапраўных суб'ект-суб'ектных адносін, ажыццяўляюцца ў індывідуальных формах абслугоўвання, пры правядзенні масавых мерапрыемстваў. У бібліятэчных зносінах дзіця пазнае назапашаны людзьмі вопыт, вучыцца яму і гэткім чынам фарміруецца як асоба, а бібліятэка рэалізуе сваю педагагічную і сацыялізуючую сутнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Беларуская* літаратура і падлетак: тэарэтыка-метадычны аспект / Нац. б-ка Беларусі ; склад. В. А. Рыхлова ; рэд. Н. М. Касілава. – Мінск, 2002. – 44, [1] с.

2. *Бородина, В. А.* Читательская деятельность: теоретический аспект / В. А. Бородина // Психология чтения и проблемы типологии читателей : сб. науч. тр. – Л., 1989. – Сб. 90. – С. 6–27.

3. *Бородина, В. А.* Теория и технология читательского развития в отечественном библиотековедении: в 2 ч. Ч. 1. Научные и методологические основы / В. А. Бородина. – М. : Шк. библиотека, 2006. – 336 с. – (Профессиональная б-ка шк. библиотекаря. Сер. 1 ; вып. 10–11).

4. *Гавриловец, К. В.* Оценка и взаимооценивание как метод воспитания гуманности / К. В. Гавриловец // Праблемы выхавання. – 1997. – Вып. 6. – С. 54–60.

5. *Голубева, Н. Л.* Детская библиотека: современные проблемы развития / Н. Л. Голубева. – М. : Литера, 2009. – 143, [1] с. – (Современная библиотека ; вып. 42).

6. *Дрешер, Ю. Н.* Библиотерапия: учеб. пособие / Ю. Н. Дрешер ; науч. ред. Т. И. Ключенко. – М. : Шк. библиотека, 2003. – 224 с.

7. *Дубовик, А. А.* Влияние библиотеки на развитие личности ребенка / А. А. Дубовик // Современная библиотека: концепция развития : тезисы докл. междунар. науч.-практ. конф. (11–14 мая 1999 г.) / Гос. ком. по науке и технологиям Респ. Беларусь ; Белорус. библиотеч. ассоц. – Минск, 1999. – С. 113–114.

8. *Кабуш, В. Т.* Гуманистическое воспитание: концепция / В. Т. Кабуш ; Минобразования Респ. Беларусь ; Акад. последиплом. образования. – М., 1998. – 97 с.

9. *Красавцева, И. Н.* Чтение / И. Н. Красавцева, В. Л. Абушенко // Новейший философский словарь / сост. А. А. Грицанов. – Минск, 1999. – С. 807–809.

10. *Левидов, В. А.* Художественная классика как средство духовного возрождения / В. А. Левидов. – СПб. : Петрополис, 1996. – 184 с.

11. *Мартынова, В. В.* Гармония любви – к себе, другим людям и миру / В. В. Мартынова // Праблемы выхавання. – 1997. – Вып. 6. – С. 43–49.

12. *Мелентьева, Ю. П.* Библиотека и юношество: поиски взаимопонимания: библиотечное обслуживание как процесс социализации личности / Ю. П. Мелентьева. – М. : Ин-т психологии РАН, 1999. – 160 с.

13. *Мелентьева, Ю. П.* Феномен чтения: поиски сущности / Ю. П. Мелентьева // Чтение как стратегия жизни : материалы междунар. науч.-практ. конф., Москва, 14 декабря 2006 г. / ред. Б. В. Ленский. – М. : Наука, 2006. – С. 7–13.

14. *Михайлова, Л. Н.* Социализация как социокультурная проблема / Л. Н. Михайлова // Обсерватория культуры. – 2006. – № 2. – С. 4–11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15. *Нуньес Паула, И. А.* О некоторых организационных и технических аспектах развития чтения / И. А. Нуньес Паула // Библиотековедение и библиография за рубежом : сб. – М. : Книга, 1985. – Вып. 104. – С. 9–14.

16. *Петушкова, Е. В.* Целевая направленность и ценностные ориентиры гуманистического воспитания / Е. В. Петушкова // Праблемы выхавання. – 1997. – Вып. 6. – С. 10–18.

17. *Рябушева, Е. Ю.* Коммуникативное общение как одна из ведущих функций в деятельности юношеских библиотек в процессе социализации личности / Е. Ю. Рябушева // Молодежь и книга : тезисы докл. и сообщ. науч.-практ. конф. (30 окт. 1996 г.). – Улан-Удэ, 1996. – С. 25–27.

18. *Сергеева, Е. М.* Литературная социализация молодежи в деятельности юношеской библиотеки / Е. М. Сергеева // Юношеские библиотеки России. – 2004. – Вып.1 (28). – С. 49–54.

19. *Степанова, Л. В.* Чтение детей как ценность современной культуры / Л. В. Степанова // Детское чтение. Феномен и традиции в конце 20 века: материалы междунар. конф., Санкт-Петербург, 12–14 мая 1999 г. Ч. 1. [Доклады, сообщения] / сост. В. В. Головин, Л. В. Степанова. – СПб. : [Б.и.], 1999. – С. 137–145.

20. *Ханин, М. Г.* Социальные функции печати и личностные функции чтения / М. Г. Ханин // Социология и психология чтения. – М., 1979. – Т. 15. – С. 58–73.

## 3.4. Экалагічнае выхаванне падлеткаў-чытачоў як педагагічная праблема

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрмін «экалагічнае выхаванне» з’явіўся ў педагагічнай навуцы адносна нядаўна, але праблема ўзаемадзеяння чалавека і навакольнага асяроддзя, прыроды з розных пунктаў гледжання разглядалася на працягу ўсёй гісторыі педагагічнай думкі.

Ідэі сцвярджэння непарыўнай сувязі духоўнага жыцця чалавека з прыродай прысвечаны працы вядомых вучоных Я. А. Каменскага, А. Гумбальдта, Ж.-Ж. Русо, І. Г. Песталоцці. Супраць бяздумных адносін да прыроды, яе фармальнага вывучэння, вузкага практыцызму выступалі рускія асветнікі В. Р. Бялінскі, А. І. Герцан, М. А. Дабралюбаў, Д. І. Пісараў.

Найбольш значныя тэарэтыка-метадычныя распрацоўкі ў галіне экалагічнага выхавання і адукацыі з ухілам на псіхолага-педагагічны аспект належаць расійскім вучоным; у прыватнасці, заслугоўваюць увагі тэарэтычныя канцэпцыі Л. С. Глушковай, А. Н. Захлебнага, І. Д. Зверава, Д. М. Каўтарадзэ, І. А. Ка-

леснікавай, І. Т. Суравегінай, І. У. Цвятковай і іншых навукоўцаў.

Працы беларускіх вучоных-педагогаў М. І. Аксюціка, В. М. Дарошка, Т. Р. Каленнікавай, Г. М. Каропы, Н. К. Катовіч, С. С. Кашлева, Г. Ю. Нікіценкі, Н. У. Самерсавай, С. В. Чубара звязаны з краязнаўчым матэрыялам, неабходнасцю пераадолення наступстваў Чарнобыльскай катастрофы і прысвечаны аптымізацыі экалагічнага выхавання і адукацыі, сістэмнаму падыходу да гэтых працэсаў і іх мадэліраванню, дыягностыцы экалагічнай культуры.

У спецыяльнай бібліятэказнаўчай літаратуры ў апошні час з'явілася шмат матэрыялаў аб дзейнасці бібліятэк па экалагічным выхаванні насельніцтва. Пытанням удасканалення работы бібліятэк з экалагічнай інфармацыяй, прававым аспектам доступу да экалагічнай інфармацыі прысвечаны работы А. Ф. Бычковай. В. У. Пакроўская, І. Ю. Паўлаў, К. В. Ніканорава, В. У. Ляшчынская, Н. Ф. Цэрцэк, А. А. Сухоціна, А. Я. Яршоў у сваіх працах спыняюцца на праблемах фарміравання і распаўсюджвання экалагічных ведаў. Даследаваннем і распрацоўкай сучаснай інфармацыйнай базы для навуковых даследаванняў у галіне экалогіі займаецца Л. Б. Шаўчэнка. Аб павышэнні кваліфікацыі і прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне фарміравання экалагічнай культуры паведамляюць работы Т. В. Кузняцовай, В. А. Барысавай.

Аднак у межах бібліятэказнаўства праблемы экалагічнага выхавання менавіта падлеткаў не падымаліся. Тым часам іх значнасць прадэманстравана на дзяржаўным узроўні шляхам падключэння бібліятэк да распрацоўкі і рэалізацыі шэрагу праграм і праектаў, якія з'яўляюцца працягам мер па фарміраванні эфектыўнай дзяржаўнай палітыкі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў.

Экалагічнае выхаванне ва ўмовах дзіцячай бібліятэкі ўяўляе сабой гарманічнае спалучэнне грамадскіх і асабістых інтарэсаў падлеткаў у фарміраванні гуманных, адказных адносін да прыроды, аховы і ўзнаўлення прыроднага асяроддзя. Канчатковая мэта экалагічнага выхавання – выпрацоўка ў падлетка высокай экалагічнай культуры, разумення і ўсведамлення таго, што паважлівыя адносіны да прыроды з'яўляюцца абавязкам, паказчыкам сацыяльнай і духоўнай сталасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уяўленне аб сутнасці, змесце экалагічнага выхавання дзяцей падлеткавага ўзросту ва ўмовах дзіцячай бібліятэкі, яго спецыфіцы, узроўнях экалагічнай культуры падлеткаў як выніку экалагічнага выхавання абумоўлена тэарэтыка-метадалагічным кантэкстам яго асэнсавання.

Базісам эфектыўнага эколага-выхаваўчага працэсу падлеткаў выступаюць навукова-даследчыя педагагічныя падыходы, сярод якіх у межах нашай праблемы мы вылучаем: *асобасна-арыентаваны, дзейнасны, сістэмны*, што дазваляе разглядаць эколага-выхаваўчы працэс як цэласную сістэму [2]. Разгледзім іх больш падрабязна.

Асобасна-арыентаваны падыход прадугледжвае ўлік прыродаадпаведных асаблівасцей асобы падлетка ў кантэксце адносін да экалагічных праблем. Адметнымі рысамі экалагічнага выхавання падлеткаў-чытачоў на аснове асобасна-арыентаванага падыходу з'яўляюцца: арыентацыя бібліятэкарам падлеткаў на самастойную чытацкую дзейнасць, выяўленне чытацкіх пераваг і здольнасцей падлеткаў-чытачоў, падбор інфармацыйных рэсурсаў з улікам патрэбнасцей кожнага падлетка, прадастаўленне яму магчымасці ўдзелу ў комплексе масавых мерапрыемстваў. Рэалізацыя асобасна-арыентаванага падыходу ў дзіцячай бібліятэцы забяспечвае гатоўнасць падлетка да адаптацыі, самаактуалізацыі і самавыяўлення ў грамадстве, спрыяе фарміраванню ўстаноўкі на сцвярджэнне і рэалізацыю пазітыўнай Я-канцэпцыі.

Аднак экалагічнае выхаванне падлеткаў аказваецца малаэфектыўным, калі базіруецца толькі на набыцці ведаў, атрыманні парад, рэкамендацый і г. д. У значнай ступені яно залежыць ад дзейнаснага падыходу ў экалагічным выхаванні.

Дзейнасны падыход звязаны з асобасна-арыентаваным падыходам і ўлічвае ўзровень сацыялізацыі асобы падлетка, мэтавыя ўстаноўкі, каштоўнасныя арыентацыі. Сутнасць дзейнаснага падыходу заключаецца ў набыцці падлеткамі-чытачамі практычнага вопыту па ахове прыроды на падставе выкарыстання інфармацыйна-бібліятэчных рэсурсаў. Дзейнасны падыход неабходна прымяняць і ў павышэнні кваліфікацыі бібліятэчных спецыялістаў – эфектыўнасць экалагічнага выхавання забяспечваецца не толькі ведамі, але і спосабамі дзейнасці.

Інструментам, які дазваляе аб'яднаць выхаваўчыя працэсы ў адзінае цэлае, з'яўляецца сістэмны падыход. Ён характары-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зуецца выкарыстаннем сукупнасці ўзаемадзейных кампанентаў у інфармацыйна-бібліятэчным абслугоўванні дзяцей падлеткавага ўзросту: інфармацыйныя рэсурсы па экалогіі; сродкі, формы і метады задавальнення інфармацыйных патрэб карыстальнікаў; комплекс матэрыяльных і тэхнічных сродкаў бібліятэкі.

Паміж азначанымі падыходамі існуюць глыбокая ўзаемасувязь і ўнутранае адзінства, што тлумачыцца ўзаемасувяззю тых катэгорый, якія ляжаць у аснове кожнага з іх; адначасова кожны з гэтых падыходаў уяўляе сабой якасна новую ступень экалагічнага выхавання з канкрэтызаванымі метадамі рэалізацыі ідэй.

Спецыфіка гэтых падыходаў праяўляецца ва ўзгодненым спалучэнні з прынцыпамі дзейнасці дзіцячых бібліятэк па экалагічным выхаванні падлеткаў, што з'яўляецца неад'емнай часткай сістэмнай работы ў гэтым кірунку.

Сярод агульнапедагагічных прынцыпаў выхавання і адукацыі, на якіх грунтуюцца прынцыпы эколага-выхаваўчай дзейнасці бібліятэк, намі вызначаны: *прынцып прыродаадпаведнасці* (экалагічнае выхаванне падлеткаў у адзінстве з навакольнай прыродай і апора на фактары прыроднага развіцця дзіцяці); *прынцып культураадпаведнасці* (выхаванне падлеткаў з улікам экалагічнага менталітэту беларусаў).

Менавіта прынцып прыродаадпаведнасці з'яўляецца адным з галоўных у дзейнасці бібліятэк па экалагічным выхаванні чытача падлеткавага ўзросту. Асноўваецца на навуковым разуменні ўзаемасувязі прыродных і сацыяльных працэсаў; узгодненасці законаў развіцця прыроды і чалавека; такіх складніках экалагічнай культуры, як асабістая адказнасць за стан і далейшую эвалюцыю біясферы. Інфармацыйна-бібліятэчныя рэсурсы пры пэўных умовах аб'ектыўна даюць магчымасць культываваць у падлеткаў пэўныя этычныя ўстаноўкі адносна прыроды, прыродаахоўнае і рэсурсазберагальнае мысленне і паводзіны, пачуццё адказнасці за развіццё прыроды і грамадства, а таксама фарміраваць імкненне ў падрастаючага пакалення да здаровага ладу жыцця, усведамлення глабальных праблем чалавецтва.

Прынцып культураадпаведнасці прадугледжвае экалагічнае выхаванне падлеткаў на агульначалавечых каштоўнасцях культуры і ў адпаведнасці з грамадскімі каштоўнасцямі і нормамі нацыянальных культур і асаблівасцей, характэрных для насель-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ніцтва тых ці іншых рэгіёнаў. Бібліятэка ўлічвае гістарычныя традыцыі ў пэўным соцыуме, каштоўнасці нацыянальнай культуры, якія з’яўляюцца своеасаблівай інфармацыйнай сістэмай і асновай прыродакарыстання. Таму прынцып экалагічнай культураадпаведнасці ў выхаванні падлеткаў увасабляе адраджэнне народных традыцый, нацыянальнай спадчыны ў адносінах да прыроды, дазваляе закрануць глыбінныя пласты народнай мудрасці, спрыяе выхаванню падлеткаў з улікам экалагічнага менталітэту беларусаў.

Асноўнымі прынцыпамі бібліятэчнага абслугоўвання, якія забяспечваюць эфектыўнасць экалагічнага выхавання падлеткаў, з’яўляюцца: *прынцып інтэграцыі працэсаў экалагічнага выхавання, экалагічнай адукацыі, экалагічнай асветы* (унясенне раўнацэннага ўкладу ў фарміраванне экалагічнай культуры падлеткаў-чытачоў); *прынцып даступнасці экаінфармацыі ў кантэксце жыццядзейнасці асобы падлетка* (распаўсюджванне, прадастаўленне, набліжэнне бібліятэкай інфармацыйных рэсурсаў па экалогіі да падлеткаў).

Напрамкі дзейнасці бібліятэк – экалагічнае выхаванне, экалагічная адукацыя, экалагічная асвета па сваёй сутнасці і змесце роднасныя і знаходзяцца ў пастаянным узаемаўплыве. Прынцып іх інтэграцыі патрабуе ад бібліятэкі вырашэння пэўных задач, рэалізацыя якіх залежыць ад узаемадзеяння бібліятэкі з дзяржаўнымі органамі ўсіх узроўняў, педагагічнымі, навучальнымі, культурна-асветнымі, медыцынскімі ўстановамі, рознымі грамадскімі рухамі, аб’яднаннямі, таварыствамі.

Даступнасць экалагічнай інфармацыі прызнана адной з важнейшых каштоўнасцей сучаснага грамадства. Адным з асноўных палажэнняў Закона «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» з’яўляецца забеспячэнне свабоды доступу да інфармацыі, якая ва ўсім свеце прызнаецца адкрытай і якая не ўяўляе дзяржаўнай або камерцыйнай тайны. Становіцца даступнай інфармацыя аб заканадаўчых і іншых нарматыўных актах, надзвычайных сітуацыях, аб дзейнасці органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, у тым ліку экалагічная, якую ўладныя структуры абавязаны прадастаўляць бясплатна.

Праблема экалагічнага выхавання падлеткаў-чытачоў разглядаецца намі не выпадкова. Падлеткавы ўзрост як пераходны ад дзяцінства да юнацтва з’яўляецца найбольш складаным у развіцці асобы і ў чытацкім развіцці: адбываецца анатама-фі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зіялагічнае станаўленне падлетка, яго інтэлектуальнае і духоўнае развіццё. Супярэчлівасці характару падлеткаў звязаны з нераўнамернасцю іх псіхічнага і фізічнага выспявання, і як вынік гэтага – негатыўныя адносіны да навакольнага асяроддзя. Аднак праблемы, цяжкасці і супярэчлівасці характару падлеткаў маюць і свае пэўныя перавагі, сярод якіх важнейшымі з'яўляюцца: сензітыўнасць (павышаная ўспрымальнасць) да тых ці іншых бакоў выхавання; гатоўнасць да ўсіх форм і метадаў выхаваўчага працэсу. Адзначаныя асаблівасці робяць гэты ўзрост найболей спрыяльным для засваення падлеткамі сістэматызаваных ведаў аб узаемадзеянні грамадства і прыроды, фарміравання практычных уменняў і навыкаў рацыянальнага выкарыстання і аховы прыроды [1].

Па ўзроўнях экалагічнай культуры можна меркаваць аб эфектыўнасці экалагічнага выхавання падлеткаў. У працэсе даследавання, праведзенага на базе дзіцячых бібліятэк г. Мінска («Экалагічнае выхаванне падлеткаў ва ўмовах публічнай бібліятэкі», 2007 г.), намі былі вылучаны ўзроўні сфарміраванасці экалагічнай культуры дзяцей падлеткавага ўзросту. Ахарактарызуем кожны з узроўняў: высокі, сярэдні і нізкі. Перадусім вылучым паказчыкі ўзроўняў экалагічнай культуры і звяжам іх з асноўнымі сферамі індывідуальнасці: *інтэлектуальнай* (якасці розуму, пазнавальныя працэсы, разумовыя аперацыі, вучэбныя ўменні), *матывацыйнай* (сукупнасць патрэбнасцей, матываў і жаданняў падлетка), *прадметна-практычнай* (здольнасці, учынкі, уменні падлеткаў у розных сферах дзейнасці і зносінах), *экзістэнцыяльнай* (пазіцыі і арыентацыі, шляхам якіх падлетак уступае ў зносіны з сацыяльным і прыродным асяроддзем).

Падлеткаў з высокім узроўнем экалагічнай культуры адрозніваюць правільнае разуменне і глыбокія веды кампанентаў, законаў, працэсаў і з'яў сацыяэкасістэм; добрае валоданне ўменнямі пераўтвараць экалагічную інфармацыю; сфарміраванасць разнастайных спосабаў і прыёмаў рацыянальнай экалагічнай дзейнасці, навыкаў сацыяльнага ўзаемадзеяння; развітая здольнасць самапавагі і павагі да людзей. Сфарміравана цэласная сістэма экалагічна значных рыс асобы, паводзіны характарызуюцца функцыянальнай аптымальнасцю ва ўзаемадзеянні з сацыяпрыродным асяроддзем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярэдні ўзровень характарызуецца правільным разуменнем норм, паняццяў, законаў; уменнем тлумачыць экалагічныя з'явы, але дрэнным валоданнем ўменнямі пераўтвараць экалагічную інфармацыю; развіццём асобных спосабаў і прыёмаў рацыянальнай экалагічнай дзейнасці; змешаным характарам экалагічных каштоўнасных арыентацый; недастатковым развіццём здольнасці сацыяльнага ўзаемадзеяння. Сфарміраваная сістэма экалагічных якасцей асобы і яе паводзін не ў поўнай меры адпавядае прынцыпам экалагічных каштоўнасцей.

Падлеткі з нізкім узроўнем сфарміраванасці экалагічнай культуры характарызуюцца павярхоўным веданнем экалагічных норм, паняццяў, законаў; няўменнем пераўтвараць экалагічную інфармацыю; адсутнасцю або слабым усведамленнем матываў і мэт, накіраваных на выкананне экалагічных норм; валоданнем асобнымі прыёмамі рацыянальнай экалагічнай дзейнасці і нежаданнем прытрымлівацца іх, адсутнасцю экалагічных каштоўнасных арыентацый; неразвітасцю здольнасцей сацыяльнага ўзаемадзеяння. У цэлым асобныя экалагічныя рысы асобы і яе паводзін характарызуюцца дэструктыўнымі паказчыкамі.

Вылучэнне ўзроўняў развіцця экалагічнай культуры дзяцей падлеткавага ўзросту дае магчымасць прагназаваць патэнцыяльныя вынікі экалагічнага выхавання, будаваць яго аперацыйна-працэсуальны і арганізацыйны аспекты, стымуляваць яго асноўныя сферы і фарміраванне асобасных якасцей падлеткаў.

Дыягностыка экалагічнай культуры дзяцей падлеткавага ўзросту паказала, што ў большасці падлеткаў экалагічная культура сфарміравана на нізкім і сярэднім узроўнях і толькі пэўная частка чытачоў характарызуецца высокім узроўнем. З прычыны гэтага намі разглядаецца трохузроўневая іерархічная мадэль экалагічнага выхавання падлеткаў ва ўмовах дзіцячай бібліятэкі.

Інтэграваная мадэль экалагічнага выхавання падлеткаў, спраектаваная на метадалагічных, тэарэтычных і дыдактычных асновах, уяўляе сабой трохузроўневую сістэму: *узровень макраасяроддзя*, *узровень мікраасяроддзя*, *узровень публічнай бібліятэкі*.

Першы ўзровень мадэлі – макраасяроддзе (знешняе асяроддзе бібліятэкі), прадстаўленае агульнымі знешнімі фактарамі, якія ўплываюць на мікраасяроддзе бібліятэкі ў цэлым: дэмагра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фічнымі, эканамічнымі, прыроднымі (экалагічнымі), навукова-тэхнічнымі, палітыка-прававымі і сацыяльна-культурнымі. Макраасяроддзе ў пэўнай ступені знаходзіцца па-за сферай уплыву дзіцячай бібліятэкі, якая вымушана адаптавацца да яго. Гнуткасць знешняга асяроддзя абумоўлена змяненнямі патрэбнасцей і попыту падрастаючага пакалення, тэхналагічнай мадэрнізацыяй, ускладненнем сродкаў сувязі – камунікацый, сацыяльных зносін і г. д. У дадзеным выпадку мяняецца і бібліятэчная дзейнасць. З гэтай мэтай дзіцячая бібліятэка распрацоўвае стратэгію дзеянняў, накіраваную на ўзаемадзеянне са знешнім асяроддзем. У той жа час сама бібліятэка аказвае ўплыў на макраасяроддзе, пашырае кола сацыяльнага партнёрства, паколькі валодае значным рэсурсным патэнцыялам (інфармацыйным, кадравым, матэрыяльным).

Другі ўзровень мадэлі ўтварае мікраасяроддзе – фактары, якія цесна звязаны з бібліятэкай і непасрэдна ўздзейнічаюць на яе: насельніцтва, дзяржаўныя органы ўлады і кіравання, навукова-даследчыя, грамадскія, адукацыйныя і культурна-асветныя ўстановы і арганізацыі, сродкі масавай інфармацыі. Мікраасяроддзе дзіцячай бібліятэкі прадстаўляе адносна ўстойлівае цэлае за кошт паступлення, узаемадзеяння, размеркавання, стварэння і перадачы інфармацыі.

Трэці ўзровень мадэлі – гэта ўзровень дзіцячай бібліятэкі, месца і роля якой абумоўлены яе сацыяльнымі функцыямі і адметнымі рысамі ўзаемадзеяння з карыстальнікамі. З аднаго боку, бібліятэка як інфармацыйны цэнтр па экалогіі стварае і акумулюе экалагічную інфармацыю, з другога – яна забяспечвае дзейнасць усіх элементаў мікраасяроддзя і задавальняе патрэбнасці падлеткаў-чытачоў.

У аснову распрацоўкі нашай мадэлі пакладзена шматузроўневая мадэль бібліятэкі, абгрунтаваная Ю. М. Сталяровым [3]. Яна ахоплівае ўсе магчымыя кірункі дзейнасці і адпаведна асноўныя элементы экалагічнага выхавання падлеткаў, характэрныя для дзіцячых бібліятэк: інфармацыйныя патрэбы падлеткаў у галіне экалогіі; інфармацыйныя рэсурсы па экалогіі; бібліятэкар як элемент сістэмы экалагічнага выхавання (спецыфіка бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання падлеткаў у галіне экалогіі); матэрыяльна-тэхнічная база (комплекс матэрыяльных і тэхнічных сродкаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абставіны ўзаемазалежнасці і ўзаемаўплыву элементаў сістэмы не дазваляюць ні аднаму з іх быць у ёй цэнтральным, асноватворным. Таму ні інфармацыйныя патрэбы падлеткаў у галіне экалогіі, ні інфармацыйныя рэсурсы па экалогіі, ні бібліятэкар як элемент сістэмы экалагічнага выхавання, ні матэрыяльна-тэхнічная база бібліятэкі самі па сабе і іх адносіны яшчэ не ўтвараюць экалагічнае выхаванне падлеткаў як цэласную сістэму. Арганічнае цэлае ўтвараецца толькі тады, калі паміж гэтымі падсістэмамі ёсць устойлівыя ўнутраныя сувязі, у выніку чаго сістэма набывае інтэгратыўныя якасці. Кожны элемент сістэмы раўнапраўны з іншымі і выконвае ў сістэме сваю асабістую, якасна адасобленую ўнутры- і знешнесістэмную функцыю, без якой сістэма недзеяздольна.

Для пабудовы і абгрунтавання мадэлі экалагічнага выхавання падлеткаў ва ўмовах дзіцячай бібліятэкі намі былі выбраны асобасна-арыентаваны, дзейнасны і сістэмны падыходы, што дазваляе выявіць педагагічныя і арганізацыйныя ўмовы яе эфектыўнага функцыянавання. Спецыфіка гэтых падыходаў праяўляецца ва ўзгодненым спалучэнні з бібліятэказнаўчымі законамі, прынцыпамі, метадамі і формамі інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання.

Актыўнае выкарыстанне інфармацыйна-дакументных рэсурсаў і наватарскіх тэхналогій, інавацыйных форм і метадаў экалага-выхаваўчай дзейнасці вызначаецца прафесійнай падрыхтаванасцю бібліятэкараў да рэалізацыі гэтых ідэй у практычнай рабоце.

Тэарэтыка-метадычнымі ўмовамі падрыхтаванасці бібліятэкараў да экалагічнага выхавання чытачоў-падлеткаў выступаюць: існуючы ўзровень спецыяльных ведаў, уменняў, навыкаў, вопыту, асабістых і дзелавых якасцей; наяўнасць унутрана і знешне абумоўленых абставін бібліятэчнай працы (рэсурсная база бібліятэкі ў галіне экалогіі, традыцыйныя і інавацыйныя формы і метады работы з падлеткамі, узровень развіцця і ўкаранення інфармацыйных тэхналогій, аптымізацыі тэхналагічных працэсаў бібліятэк, арганізацыя зносін з чытачамі-падлеткамі, ступень камфортнасці ўмоў работы ў бібліятэцы) [4].

Мяркуем, што ў адаптацыі бібліятэкараў да экалагічнага выхавання падлеткаў значная роля належыць сістэме дадатковай прафесійнай бібліятэчнай адукацыі. Менавіта гэтае звяно адукацыйнай сістэмы арыентавана на прадастаўленне бібліятэка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рам усяго комплексу ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для авалодання метадалогіяй і тэхналогіяй эколага-бібліятэчнай і інфармацыйнай дзейнасці з улікам апошніх дасягненняў у дадзенай галіне. З гэтай мэтай намі распрацаваны спецкурс «Экалагічнае выхаванне падлеткаў ва ўмовах публічнай бібліятэкі», які быў укаранёны ў вучэбны працэс УА «Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры». Праграма аўтарскага курса ўтрымлівае два раздзелы: «Асновы экалагічных ведаў» (серыя заняткаў, якія раскрываюць сутнасць, асноўныя прынцыпы, паняційна-тэрміналагічны апарат, гісторыю развіцця, асноўныя канцэпцыі экалогіі) і «Асаблівасці экалагічнага выхавання ў бібліятэцы» (фарміраванне ўменняў і навыкаў вядзення экалагічнага выхавання падлеткаў).

Такім чынам, дзейсным механізмам, які забяспечвае эфектыўнасць экалагічнага выхавання падлеткаў ва ўмовах дзіцячай бібліятэкі, з'яўляюцца: апора на навукова-даследчыя педагагічныя падыходы (асобасна-арыентаваны, дзейнасны, сістэмны), прынцыпы дзейнасці бібліятэкі (прыродаадпаведнасці; культурааадпаведнасці; інтэграцыі працэсаў экалагічнага выхавання, экалагічнай адукацыі, экалагічнай асветы; даступнасці экаінфармацыі), узроўні сфарміраванасці экалагічнай культуры падлеткаў, адаптаванне мадэлі экалагічнага выхавання падлеткаў да дзейнасці дзіцячай бібліятэкі, прафесійная падрыхтаванасць бібліятэкараў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Дзямешка, Л. А.* Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк : вучэб. дапам. / Л. А. Дзямешка, С. А. Паўлава. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – 114 с.

2. *Какшынская, В. А.* Педагагічныя падыходы да экалагічнага выхавання падлеткаў-чытачоў / В. А. Какшынская // Бібліятэкі і музеі ў сістэме інавацыйнай дзейнасці : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (21–22 кастр. 2009 г.) / рэдкал.: С. В. Зыгмантовіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2010. – С. 27–32.

3. *Столяров, Ю. Н.* Библиотека – двухконтурная система / Ю. Н. Столяров // Научные и технические библиотеки. – 2002. – № 11. – С. 5–24.

4. *Сухотина, Е. А.* Библиотеки и экологическое просвещение в интересах устойчивого развития : учеб.-практ. пособие / Е. А. Сухотина. – М. : Литера, 2010. – 240 с.

5. *Шумейко, А. А.* Становление экологического менталитета современных школьников: теория и практика : монография / А. А. Шумейко. – Брянск : Белый ветер, 2000. – 336 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.5. Сацыяльна-педагагічныя аспекты фарміравання прававой культуры падлеткаў у бібліятэцы

Комплексная і міждысцыплінарная праблема прававой культуры падрастаючага пакалення не атрымала належнага раскрыцця ў бібліятэказнаўчых даследаваннях. Нягледзячы на высокую запатрабаванасць сацыяльнай практыкай, распрацоўка навуковых падыходаў да яе рэалізацыі ўскладняецца тым, што прадметная вобласць ведаў аб прававой культуры не лакалізавана і не замацавана ў пэўнай сферы гуманітарных ведаў. У полі навуковага інтарэсу філасофіі, сацыялогіі, культуралогіі, юрыдычнай навукі, псіхалогіі і педагогікі адлюстравана шматпланавасць паняцця прававой культуры, абумоўленая пэўнымі аспектамі яе вывучэння. Як навуковая катэгорыя прававая культура разглядаецца на грамадскім і індывідуальным узроўнях, у сувязі з чым вылучаюцца прававая культура грамадства і прававая культура асобы, якая ў кантэксце сучаснай сацыякультурнай парадыгмы характарызуецца *ступенню засваення і выкарыстання асобай сістэмы прававых ведаў, каштоўнасцей, набыцця вопыту правамернай дзейнасці* [8].

Аналіз сацыялагічнай, юрыдычнай і педагагічнай літаратуры паказаў, што бібліятэка як сацыяльны інстытут пакуль што застаецца па-за полем зроку даследчыкаў праблем прававой культуры, нягледзячы на даволі актыўнае выкарыстанне яе дыдактычных і выхаваўчых сродкаў. У асобных крыніцах ускосна закранаюцца магчымасці бібліятэкі ў фарміраванні прававой культуры, што сведчыць пра асэнсаванне яе патэнцыялу і выкарыстанне апошняга ў вырашэнні практычных пытанняў прававога выхавання (В. С. Арлоў, М. П. Вярбіцкі, М. А. Грыгаровіч, А. А. Прымачонак, І. Ф. Рабко, М. Я. Сакалоў, І. П. Сідзельнікаў, А. Я. Тарас).

Між тым праблема прававой культуры моладзі паўстае як найбольш значная ва ўмовах тэндэнцый дэзаксіялагізацыі культуры і крыміналізацыі падрастаючага пакалення: дэфармаваная правасвядомасць, схільнасць да дэвіянтных паводзінаў, амаральныя ўстаноўкі, павышаная канфліктнасць, прававы нігілізм, інфантылізм і цынізм, на што ўказваюць Т. С. Будніцкая, Г. А. Зублеўская, Р. А. Васілевіч, Р. С. Іманкуілаў, В. П. Шыянок, Н. М. Юрашэвіч і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змена прыярытэтаў у грамадстве – прызнанне чалавека найвышэйшай каштоўнасцю, агульначалавечыя і дзяржаўныя арыенціры – патрабуе актывізацыі інстытутаў сацыялізацыі, у тым ліку бібліятэк, у кірунку фарміравання індывідуальнай сістэмы каштоўнасцей асобы, якія адпавядаюць сучасным сацыякультурным, эканамічным, інфармацыйным умовам і забяспечваюць сацыяльна прымальныя паводзіны. Павышэнне ролі грамадства ў выхаванні асобы з высокім узроўнем самасвядомасці, арыентаванай на свабоду меркаванняў і дзеянняў, пры адначасовым асэнсаванні грамадскай неабходнасці прытрымлівацца нормаў маралі і права актуалізуе праблему фарміравання прававой культуры падрастаючага пакалення і вызначае яе ў якасці адной з прыярытэтных на сучасным этапе.

Сацыяльны заказ грамадства на фарміраванне базавых каштоўнасцей, сярод якіх важнейшае месца належыць прававым, вызначае арыенціры дзейнасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута, інстытута сацыялізацыі асобы праз развіццё дэмакратычнага і грамадзянскага стылю жыцця (Маніфест аб публічных бібліятэках, ІФЛА – ЮНЕСКА, 1994). З улікам тэндэнцый сацыякультурнай рэальнасці дзейнасць бібліятэк павінна адпавядаць сацыяльным чаканням і аб'ектыўным патрэбнасцям грамадства адносна фарміравання культурнай асобы з высокім узроўнем сацыяльнай кампетэнтнасці, важным складнікам якой прадстае прававая культура.

Прававая культура з'яўляецца мэтай і вынікам прававога выхавання, якое вылучаецца ў асобны кірунак бібліятэчнага абслугоўвання ў 80-я гг. XX ст. і ў сувязі з ідэалагічнымі прыярытэтамі грамадства акцэнтуе ўвагу на праблеме ліквідацыі юрыдычнай малапісьменнасці насельніцтва, прафілактыкі правапарушэнняў, асабліва ў моладзевым асяроддзі. Пытанні павышэння прававой культуры, прапаганды прававых ведаў сярод самых шырокіх пластоў насельніцтва выступаюць важнай агульнадзяржаўнай задачай, у вырашэнні якой публічным бібліятэкам адводзілася даволі значная роля як найбольш набліжаным да насельніцтва.

Аналіз навуковых публікацый і метадычнай літаратуры гэтага перыяду дазваляе нам канстатаваць рэалізацыю фармальна-інфармацыйнай мадэлі прававога выхавання ў бібліятэчным абслугоўванні, накіраванай на ўдасканаленне выхаваўчых сродкаў, адпаведна арганізуючых паводзінную падструктуру асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сутнасць гэтай мадэлі заключаецца ў фарміраванні прававой культуры асобы на аснове ідэалагізаваных ведаў аб нарматыўным характары права, фарміраванні адпаведных ідэалагічным прыярытэтам якасцей асобы, што выяўна адлюстравана ў бібліятэказнаўчай літаратуры. Так, мэта прававога выхавання вызначана ў папярэджанні правапарушэнняў, выхаванні ў грамадзян асэнсаванай дысцыпліны, строгага выканання заканадаўства [17; 18; 19; 22]. Нягледзячы на дастаткова шматаспектнае раскрыццё ў прафесійнай літаратуры арганізацыйна-метадычных пытанняў прававыхаваўчай дзейнасці бібліятэкі, накіраванай на ліквідацыю «юрыдычнай малапісьменнасці» [19] і «ўмацаванне законнасці» [22], тэарэтычныя пытанні прававой культуры як мэты прававога выхавання засталіся нераскрытымі. Такім чынам, нягледзячы на добрую распрацаванасць методыкі прававыхаваўчай работы бібліятэкі і шырокае выкарыстанне яе дыдактычных магчымасцей у гэтым кірунку, у бібліятэказнаўстве не адбылося асэнсавання праблемы фарміравання прававой культуры асобы на абстрактна-тэарэтычным узроўні.

Адпаведна зафіксаванай мэтавай устаноўцы бібліятэчнага абслугоўвання [20, с. 202] прававое выхаванне як яго кірунак амаль да 90-х гг. XX ст. падпарадкоўваецца агульнаму ідэалагічнаму кантэксту, згодна з якім уздзеянне на асобу было накіравана на забеспячэнне дыктуемых паводзінаў, а не на развіццё прававой і грамадзянскай самасвядомасці асобы. Выпрацаваныя і зафіксаваныя бібліятэчнай практыкай падыходы, формы і сродкі прававога выхавання ў пачатку XXI ст. заканамерна трансфармуюцца ў сувязі з пераасэнсаваннем агульных тэарэтычных пытанняў бібліятэчнага абслугоўвання на аснове сучасных сацыялагічных і культуралагічных ідэй, з улікам пэўных сацыяльных адносінаў паміж асобай і грамадствам, рэакцыі працэсу абслугоўвання на новыя ўмовы функцыянавання бібліятэкі ў грамадстве.

Гістарычнай перадумовай, якая паспрыяла пераасэнсаванню і актывізацыі дзейнасці бібліятэкі ў кірунку фарміравання прававой культуры, сталі працэсы інфарматызацыі і дэмакратызацыі ўсіх сфер грамадскага жыцця ў 90-я гг. XX ст. Тэхналагічныя і сацыякультурныя змены ў грамадстве вызначылі новую філасофію інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання – забеспячэнне свабоднага доступу да інфармацыі [3, с. 200; 4] на аснове такіх фундаментальных каштоўнасцей сучаснага грамад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ства, як свабода слова і інфармацыі. Ва ўмовах фарміравання прававога грамадства і грамадзянскага супольніцтва бібліятэка становіцца адным з важнейшых каналаў, якія забяспечваюць свабодны доступ карыстальнікаў да інфармацыі, у тым ліку прававой, а прыярытэтам бібліятэчнай дзейнасці становіцца сацыялізацыя асобы, стварэнне ўмоў для яе свабоднага развіцця і самарэалізацыі праз прадастаўленне шырокай і поўнай інфармацыі [13, с. 32]. С. Матліна прасочвае тэндэнцыі дэмакратызацыі ва ўкараненні новай канцэпцыі бібліятэчнага абслугоўвання, накіраванай на задавальненне не толькі інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў, але і на задавальненне ўсёй сістэмы іх культурных чаканняў [12, с. 171] праз «адкрытасць» бібліятэкі для ўсіх груп карыстальнікаў, усіх сацыяльных інстытутаў.

Роля публічнай бібліятэкі ў вырашэнні праблем сацыяльнай няроўнасці праз доступ да прававой інфармацыі, садзейнічанне тым самым прававой абароне асобы падкрэсліваецца Т. Ф. Бераставай [2, с. 119]. Ю. П. Мяленцьева разглядае фарміраванне прававой культуры насельніцтва як сацыяльна абгрунтаваны прыярытэтны кірунак бібліятэчнага абслугоўвання ў сувязі з праблемай інфармацыйна-прававой неабароненасці асобы ў сучасным грамадстве [13, с. 122]. У кантэксце бібліятэчнай інаватыкі С. Матліна вылучае асобую ролю публічнай бібліятэкі ў фарміраванні грамадзянскага супольніцтва [12], неад’емным атрыбутам якога з’яўляецца належны ўзровень прававой культуры грамадства. Р. С. Матульскі падкрэслівае ролю бібліятэкі ў атрыманні незалежнай палітычнай і прававой інфармацыі [15, с. 56] як асновы фарміравання дэмакратычных каштоўнасцей у кантэксце аксіялагічных дэтэрмінантаў прынцыпаў дзейнасці бібліятэкі.

У канцэнтраваным выглядзе праблематыка прававой культуры ў бібліятэказнаўстве афармляецца ў сувязі з дзейнасцю публічных цэнтраў прававой інфармацыі (ПЦПІ) (на базе агульнадаступных бібліятэк), якія пачалі ствараццa ў 90-я гг. XX ст. Сярод вялікай колькасці публікацый апошняга дзесяцігоддзя, прысвечаных арганізацыйна-метадычным асновам дзейнасці ПЦПІ, адзначым выданні Ю. П. Мяленцьевай і Н. З. Старадубавай як комплексныя практыка-арыентаваныя дапаможнікі па стварэнні і аптымізацыі функцыянавання ПЦПІ на базе публічных бібліятэк [14; 6]. Ю. П. Мяленцьева разглядае дзейнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПЦПІ з пазіцыі сацыялізуючага падыходу, згодна з якім ПЦПІ дапамагаюць чалавеку, перш за ўсё маладому, адаптавацца ў грамадстве, вырашаць свае жыццёвыя праблемы, а таксама ажыццяўляць інфармацыйна-прававую абарону асобы [14].

Нягледзячы на тое, што фарміраванне прававой культуры і развіццё правасвядомасці насельніцтва вызначаюцца як адзін з кірункаў дзейнасці ПЦПІ [14, с. 14], пытанні прававой асветы і выхавання прававой культуры грамадзян як адна з мэт іх функцыянавання [6, с. 196], тэарэтычныя пытанні фарміравання прававой культуры асобы ў прыведзеных працах не атрымалі раскрыцця.

Магчымасці ПЦПІ ў прававой сацыялізацыі асобы абгрунтоўвае С. В. Мартынюк, раскрываючы іх праз патэнцыял інфармацыйных рэсурсаў цэнтра прававой інфармацыі, узровень прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкара, забеспячэнне доступу да крыніц прававой інфармацыі і ўключанасць бібліятэкі ў рэалізацыю разнастайных форм сацыяльнай камунікацыі [10, с. 234].

Неабходнасць павышэння прававой культуры і развіцця правасвядомасці насельніцтва падкрэсліваецца ў дысертацыйным даследаванні Ж. У. Аляксеевай, у сувязі з чым аўтар выяўляе і даследуе асноўныя кірункі бібліяграфічнай дзейнасці ПЦПІ ў якасці сродку прававой інфармаванасці і выхавання прававой культуры насельніцтва [1, с. 6]. Сістэмна і глыбока разглядаючы бібліяграфічную дзейнасць ПЦПІ як сродак аптымізацыі доступу да прававой інфармацыі ў мэтах прававога інфармавання і прававой асветы насельніцтва, аўтар не ставіць задачу раскрыць сутнасць і змест прававой культуры як мэты бібліяграфічнага інфармавання і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў ПЦПІ, таму на гэтым аспекце не засяроджвае ўвагу.

Вопыт стварэння і функцыянавання, асноўныя кірункі і перспектывы развіцця ПЦПІ на базе публічных бібліятэк Беларусі і краін блізкага замежжа знайшлі адлюстраванне ў шматлікіх зборніках матэрыялаў, прысвечаных дадзенай праблематыцы. Арганізацыйным пытанням прадастаўлення доступу да прававой інфармацыі ў ПЦПІ, метадычным аспектам адпаведнага бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў прысвечаны работы В. А. Бялюкіна, Э. А. Васканян, Т. Ю. Верхаланцавай, А. А. Даўгаполавай, А. А. Дзямідава, Т. У. Драбы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэўскай, Я. І. Кузьміна, Н. З. Старадубавай, М. Н. Усачова, У. М. Хургіна, Т. П. Ярцанкінай і інш.

Прававую культуру бібліятэкары разглядаюць як неад'емную частку светапогляду чалавека, заснаваную на павазе да закону, разуменні праблемы правоў чалавека і здольнасці знайсці магчымыя шляхі яе вырашэння, што з'яўляецца фактарам гарманічнага ўваходжання ў прававое дэмакратычнае грамадства. Менавіта гэтыя пазіцыі і прыярытэты, як сведчаць публікацыі вышэйназваных аўтараў, вызначаюць асноўныя кірункі дзейнасці бібліятэкі па выхаванні прававой культуры падлеткаў і моладзі.

Азнаямленне з бібліятэказнаўчай літаратурай, у пераважнай большасці прадстаўленай работамі па раскрыцці вопыту дзейнасці ПЦПІ, сведчыць пра асэнсаванне бібліятэчным супольніцтвам праблемы фарміравання прававой культуры праз арганізацыю і рэалізацыю доступу да прававой інфармацыі ў публічных бібліятэках. У гэтым кантэксце шэраг аўтараў аперыруюць паняццямі *павышэнне, выхаванне, фарміраванне прававой культуры насельніцтва* як мэты бібіятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў прававой інфармацыі, аднак сутнасць і змест апошніх не раскрываюць.

З улікам сучасных падыходаў да вызначэння прававой культуры на ўзроўні асобы як яе інтэгратыўнай якасці, а таксама на аснове інтэграцыі гэтых падыходаў існуе аб'ектыўная патрэбнасць выяўлення і раскрыцця сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу бібліятэкі па стварэнні адпаведных умоў для прававога развіцця асобы. Вырашэнне гэтай праблемы звязана з абнаўленнем тэарэтыка-метадалагічных, арганізацыйна-тэхналагічных, змястоўна-прадметных параметраў дзейнасці бібліятэкі па фарміраванні прававой культуры асобы з улікам сучасных гуманістычных тэндэнцый (Я. В. Бандарэўская, Д. А. Бялухін, У. У. Серыкаў, А. В. Хутарскі), у русле якіх асобасна-арыентаваная педагогіка накіравана не на фарміраванне і нават не на выхаванне, а на выяўленне, падтрымку, стварэнне ўмоў і садзейнічанне развіццю чалавечага ў чалавеку [20, с. 226].

У сістэме паняццяў гуманістычнага падыходу бібліятэчнае абслугоўванне спрыяе развіццю чалавека як асобы, здольнай да асэнсаванага светаўспрымання і пазітыўнай сацыяльнай адаптацыі ў грамадстве. Такім чынам, у новым, парадыгмальным кантэксце фармальна-інфармацыйная мадэль фарміравання



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прававаой культуры асобы саступае месца асобасна-арыентаванай з яе гуманістычнай чалавекаразмернасцю і культуратворчай скіраванасцю. Адпаведна пераасэнсаванаму разуменню бібліятэчнага абслугоўвання, якое трактуецца як сродак станаўлення асобы, яе самаразвіцця і самаўдасканалення, садзейнічання працэсу раскрыцця яе патэнцыялу, дзейнасць бібліятэкі па стварэнні ўмоў для развіцця правакультурнай асобы набывае высокую сацыяльную значнасць і характарызуе заканамерную эвалюцыю бібліятэкі як самаарганізавальнай сістэмы ў новых сацыяполікультурных умовах.

Прававая культура асобы прадстаўляе сабой частку агульнай культуры чалавека ў галіне права і з'яўляецца важным механізмам забеспячэння самарэгуляцыі стасункаў асобы і грамадства. Засваенне прававой культуры як складніка базавай культуры асобы, які дазваляе эфектыўна самасцвярджацца і рэалізоўвацца ў соцыуме, з'яўляецца неад'емнай часткай і ўмовай сацыялізацыі асобы, таму стварэнне спрыяльных умоў для засваення прававой культуры ў бібліятэчным асяроддзі набывае вялікую сацыяльную значнасць. Выбраўшы менавіта сацыяльна-педагагічны аспект дзейнасці бібліятэкі па фарміраванні прававой культуры, мы лічым метадалагічна правільным і карэктным у большай ступені скарыстаць катэгарыяльны апарат псіхолага-педагагічнай навукі, не адмаўляючыся ад дасягненняў, прадстаўленых іншымі галінамі ведаў па праблеме.

Абапіраючыся на педагагічныя даследаванні прававой культуры падлеткаў, прадстаўленыя працамі айчынных і расійскіх навукоўцаў А. Т. Зямновай, Л. М. Мацвіенкі, С. В. Міронавай, Т. А. Парафіяновіч, І. А. Царык, Н. І. Эліасберг і інш., мы прапануем разумець прававую культуру як *актуальную інтэгратыўную асобасную якасць, якая характарызуецца наяўнасцю і ступенню засваення прававых ведаў, маральна-прававых каштоўнасцей, установак і перакананняў як асновы правамерных паводзін, а таксама сацыяльна-прававой актыўнасцю.*

Кампанентны склад прававой культуры як інтэгратыўнай якасці асобы прадстаўлены прававымі ведамі, пачуццямі, каштоўнасцямі, матывамі, правамернымі паводзінамі і актыўнасцю асобы ў сферы права, што сведчыць пра наяўнасць інтэлектуальнай асновы, эмацыйнага і паводзіннага складнікаў у яе структуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І. А. Царык разглядае апошнія як кагнітыўны, эмацыйна-ацэначны і паводзінны кампаненты [21, с. 6], Н. І. Эліасберг прадстаўляе структуру прававой культуры кагнітыўным, эмацыйна-валявым і паводзінным кампанентамі [23, с. 25], Л. М. Мацвіенка вылучае кагнітыўны, матывацыйна-ацэначны і дзейнасны кампаненты [11, с. 8] у структуры прававой культуры падлетка. Абапіраючыся на юрыдычныя (А. А. Бачкоў, М. М. Бабаеў, А. А. Зорчанка, Р. У. Краўцоў, І. В. Ляскова, В. П. Сальнікаў, Т. В. Сінюкова, А. А. Лукашава, М. М. Марчанка) і сацыялагічныя даследаванні прававой культуры асобы (Т. В. Муслумава, С. А. Бандарэнка, М. Ю. Гур'янаў, В. С. Дзямко, Ю. А. Зубок, У. І. Чупроў), мы разглядаем кантэнт-структуру прававой культуры падлеткаў як *адзінства кагнітыўнага, каштоўнасна-матывацыйнага і дзейнаснага кампанентаў*.

*Кагнітыўны* кампанент прававой культуры падлетка характарызуе змены ў інтэлектуальнай сферы асобы, што знаходзіць адлюстраванне ў ступені прававой дасведчанасці і інфармаванасці асобы, ступені асэнсавання і разумення сутнасці прававых нормаў, іх важнасці як рэгулятара сацыяльных стасункаў. Актуалізаваныя прававыя веды з'яўляюцца інфармацыйнай перадумовай праваммерных паводзін, таму названы кампанент рэалізуе інфармацыйную функцыю.

*Каштоўнасна-матывацыйны* кампанент прававой культуры падлетка дае характарыстыку якасным змяненням у эмацыйнай сферы асобы. Яго сфарміраванасць і рэалізацыя скіраваны на развіццё каштоўнасных арыентацый, адпаведных перакананняў, станоўчай матывацыі законапаслухмянай дзейнасці і сацыяльна-прававой актыўнасці падлетка. Гэты кампанент забяспечвае асэнсаваны маральны выбар прававога ўчынка на аснове прававых ведаў, таму выконвае арыентацыйную функцыю.

Вылучэнне *дзейнаснага* кампаненту абумоўлена тым, што прававая культура выпрацоўваецца ў сацыяльнай практыцы, шляхам дзеянняў у рэальных абставінах або смадэляваных сітуацыях. Дзейнасны кампанент з'яўляецца важным вымярэннем прававой культуры падлетка. Менавіта ў дзейнасці і толькі праз дзейнасць кагнітыўны і каштоўнасна-матывацыйны кампаненты знаходзяць сваё выражэнне і праяўляюць якасць сфарміраванасці кожнага. У гэтым аспекце дзейнасны кампанент адлюстроўвае якасны стан прававой культуры асобы, нават саму прававую культуру, таму выконвае рэгулятыўную функцыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выяўленыя намі кагнітыўны, каштоўнасна-матывацыйны і дзейнасны кампаненты выступаюць як узаемазалежныя і ўзаемадзейныя ў недзялімай цэласнасці складнікі прававой культуры падлетка і прадстаўляюць сабой унікальны і рухомы комплекс сутнасных прыкмет, якія абумоўліваюць сацыяльную каштоўнасць асобы. На аснове гэтага мы разглядаем развіццё прававой культуры падлетка як *нелінейны* працэс, які характарызуецца заканамернай дынамікай усіх кампанентаў.

Фарміраванне прававой культуры як інтэгратыўнай якасці асобы адбываецца з улікам узроставых асаблівасцей псіхафізічнага развіцця, якія вызначаюць гатоўнасць і здольнасць асобы ўключыцца ў сацыяльны працэс, набыць агульначалавечыя і сацыяльныя якасці.

Сацыялагічныя даследаванні выявілі цесную ўзаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць развіцця прававой культуры і працэсу прававой сацыялізацыі асобы (М. Ю. Аруцюнян, А. В. Боршчава, В. М. Здравамыслава, Ш. Курыльскі-Ажвэн, З. Н. Каландрышвілі, Г. А. Каліноўскі, А. В. Мудрык). Псіхолага-педагагічныя даследаванні абаснавалі падлеткавы ўзрост (11–15 гадоў) найбольш прыдатным для прававой сацыялізацыі асобы як спецыфічнага спосабу засваення індывідам прававых нормаў і каштоўнасцей, прававой культуры грамадства, уваходжання ў гэта асяроддзе. Прававая сацыялізацыя як працэс прызнання, інтэрыярызацыі, асіміляцыі прававых каштоўнасцей і іншых уяўленняў і ведаў аб праве з мэтай іх прадуктыўнага ўзнаўлення суб'ектам права [9, с. 15] выступае ўводзінамі ў прававую культуру грамадства, «стрыжнем фарміравання прававой культуры падрастаючага пакалення» [16, с. 14]. Сацыёлагі лічаць, што першасная прававая сацыялізацыя адбываецца ва ўзросце да 14 гадоў, у выніку чаго фарміруецца ўменне аперыраваць і назапашваць неабходны для ўзаемадзеяння з сацыяльным асяроддзем элементарны прававы вопыт. Р. І. Іманкуілаў звужае рамкі ўзроставага перыяду, найбольш чуллівага і прыдатнага для засваення агульных асноў прававых нормаў, на аснове эмпірычных вынікаў даказвае псіхалагічную гатоўнасць асобы да эфектыўнай прававой сацыялізацыі ва ўзросце 11–12 гадоў як этапа, свабоднага ад станаўлення індывідуалістычнай пазіцыі [7, с. 16].

У бібліятэказнаўстве вызначана ўзроставая дыферэнцыяцыя чытацкіх груп, адпаведна якой існуюць пераходная ад дзіцячай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да падлеткавай (10–11 гадоў), падлеткавая (12–13 гадоў), пераходная ад падлеткавай да юнацкай (14 гадоў) групы [5, с. 21]. На падставе адзначанага малодшы падлеткавы ўзрост (11–12 гадоў), які з'яўляецца найбольш прыдатным для прававой сацыялізацыі асобы, мы вызначаем як спрыяльны і для развіцця прававой культуры падлеткаў у адзінстве кагнітыўнага, каштоўнасна-матывацыйнага і дзейнаснага кампанентаў.

У сучаснай навуцы склалася мноства падыходаў да фарміравання прававой культуры асобы, якія выступаюць як альтэрнатыўныя нарматыўныя асновы працэсу развіцця прававой культуры падлеткаў і вызначаюць канцэптуальныя пазіцыі яго праектавання і рэалізацыі ў бібліятэчным асяроддзі. Сярод найбольш запатрабаваных і прыярытэтных падыходаў мы адзначаем *аксіялагічны, дзейнасны, асобасна-арыентаваны і кампетэнтнасны*. Аналіз названых падыходаў дазволіў нам вылучыць крытэрый, пакладзены ў аснову прыведзеных канцэптуальных пазіцый, выявіць і скарыстаць патэнцыял кожнага як метадалагічную аснову дзейнасці бібліятэкі – суб'екта фарміравання культуры асобы ў прававым аспекце.

З пазіцый **аксіялагічнага падыходу** бібліятэка выступае як каштоўнасна арыентуючая сістэма, якая становіцца жыццядзейнай праз рэалізацыю патэнцыялу ў дадзеным кірунку, стварэнне ўмоў для прававой сацыялізацыі асобы як працэсу прызнання, інтэрыярызацыі, асіміляцыі прававых каштоўнасцей, выпрацаваных і захаваных чалавецтвам.

Аксіялагічны аспект дзейнасці бібліятэкі як суб'екта фарміравання прававой культуры асобы заключаецца ў канцэнтрацыі намаганняў на працэсе стымулявання ўнутранай патрэбнасці чалавека ў праваперных паводзінах, заснаванай на каштоўнасным успрыняцці права. Такім чынам, прымяненне адзначанага падыходу ў дзейнасці бібліятэкі ў абазначаным кантэксце базіруецца як на вызначэнні месца прававых каштоўнасцей у іерархічнай структуры каштоўнасцей асобы, у яе свядомасці і светапоглядзе, так і на фарміраванні гэтых каштоўнасцей як сацыяльна значных.

Выкарыстанне **дзейнаснага падыходу** як метадалагічнай асновы фарміравання прававой культуры падлетка заснавана на разуменні, што ўсякае асобаснае новаўтварэнне, у тым ліку прававая культура як актуальная інтэгратыўная якасць асобы, праяўляецца і фарміруецца ў працэсе дзейнасці. Сутнасць гэта-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га падыходу заключаецца ў тым, што засваенне каштоўнасна-матывацыйнага, кагнітыўнага і дзейнаснага кампанентаў прававой культуры асобы адбываецца не шляхам перадачы інфармацыі, а ў выніку ўласнай актыўнасці суб'екта, накіраванай на спасціжэнне сутнасці і з'яў прававой культуры як часткі навакольнага асяроддзя, створанага ў працэсе культурнага развіцця чалавецтва. Фарміраванне прававой культуры падлеткаў у аспекце дзейнаснага падыходу абапіраецца на неабходнасць праектавання, канструявання, стварэння і рэалізацыі сітуацый, стымулюючых сумесную дзейнасць бібліятэкара і падлетка па ўсведамленні, засваенні і выкарыстанні асобай прававых паняццяў і ведаў, прававых каштоўнасцей, выпрацоўцы стратэгіі паводзінаў у адпаведнасці з прававымі нормамі, выражэнні суб'ектыўных адносінаў да грамадства і самога сябе. З гэтай мэтай бібліятэкар павінен арыентавацца не на падачу гатовых узораў паводзінаў падлеткаў у прававой сферы, а на стварэнне іх разам з чытачамі з выкарыстаннем элементаў навізны, незвычайнасці, праблемнасці.

**Асобасна-арыентаваны падыход** у якасці канцэптуальнай пазіцыі працэсу выхавання прававой культуры робіць акцэнт на развіцці каштоўнасна-сэнсавай сферы падлетка, адыходзіць ад канцэпцыі фарміравання асобы і зацвярджае канцэпцыю садзейнічання яе развіццю, разглядае індывідуалізацыю выхавання як асноўны шлях рэалізацыі асобасных запытаў і стварэння ўмоў для самаактуалізацыі асобы. Дадзены падыход базіруецца на тэзісе аб унікальнасці і непаўторнасці кожнага чалавека, аб яго патэнцыяльнай таленавітасці, якую неабходна праяўляць і развіваць, ствараць умовы для развіцця яго творчага патэнцыялу (Я. В. Бандарэўская, Д. А. Бялухін, В. В. Серыкаў, А. В. Хутарскі, І. С. Якіманская).

Асобасна-арыентаваны падыход як практычная тактыка развіцця прававой культуры ў бібліятэцы эксплікуецца праз распрацоўку і рэалізацыю механізма арганізацыі педагагічнай дзейнасці, якая забяспечвае стварэнне развіваючага асяроддзя як прасторы для фарміравання прававой культуры падлетка. Немалаважным фактарам у названай дзейнасці выступае арганізацыя дыялогу паміж усімі суб'ектамі прававыхаваўчай дзейнасці як асобага дыдактыка-камунікатыўнага асяроддзя, які забяспечвае суб'ектна-сэнсавыя зносіны з мэтай фарміравання прававой культуры падлетка.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Кампетэнтнасны падыход** у дачыненні да фарміравання прававой культуры асобы мае на мэце станаўленне чалавека як культурна-гістарычнага суб'екта, здольнага да прадуктыўнай перапрацоўкі і ператварэння патэнцыялу прававой культуры ў канкрэтную сацыяльна значную якасць асобы – прававую кампетэнцыю ў сукупнасці яе матывацыйна-каштоўнаснага і кагнітыўнага кампанентаў. Супастаўленне зместу паняццяў «прававая культура асобы» і «прававая кампетэнтнасць асобы», а таксама параўнанне іх структуры сведчаць пра супадзенне іх кампанетаў, аднак менавіта праз паняцце кампетэнтнасці як «здольнасці, гатоўнасці» (Джон Равен), а таксама «ўпэўненасці» відавочнымі становяцца «мера» і «якасць» прававой культуры асобы як суб'екта жыццядзейнасці, дзяржавы, маралі і права. Гэта дае нам падставу разглядаць прававую кампетэнтнасць як паказчык і вынік фарміравання прававой культуры падлеткаў у бібліятэцы.

Відавочная наяўнасць розных метадалагічных пазіцый да фарміравання прававой культуры падлеткаў ні ў якай меры не сведчыць пра лішак або супярэчлівасць канцэптуальных падыходаў да адзначанага працэсу. Кожны з прадстаўленых намі падыходаў ахоплівае толькі частку або пэўны аспект працэсу фарміравання прававой культуры падлетка, што сведчыць аб іх пэўнай абмежаванасці. Паколькі частка не можа замяніць цэлага, у аснове метадалогіі фарміравання прававой культуры нам бачыцца гарманізацыя адзначаных падыходаў шляхам іх інтэграцыі.

У сучасных умовах публічныя бібліятэкі бяруць актыўны ўдзел у працэсе вырашэння сістэмных задач фарміравання прававой культуры падрастаючага пакалення. Як суб'ект фарміравання прававой культуры падлеткаў бібліятэка выконвае сацыяльны заказ грамадства на развіццё асобы з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, сфарміраванай інфармацыйнай і прававой культурай, развітымі якасцямі ў сферы грамадзянскай пазіцыі і сацыяльнага партнёрства, з навыкамі сацыяльна-арыентаванага ўчынка. Рэалізацыя бібліятэкай яе сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу ў гэтым кірунку садзейнічае фарміраванню базавых асноў, якія забяспечваюць далейшае сацыяльна-пазітыўнае развіццё асобы на аснове агульнапрынятых каштоўнасцей і прававых нормаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Алексеева, Ж. В.* Основные направления библиографической деятельности публичных центров правовой информации в России : автореф. дис. … канд. пед. наук: 05.25.03 / Ж. В. Алексеева. – М., 2005. – 24 с.

2. *Берестова, Т. Ф.* Общедоступная муниципальная библиотека в едином информационном пространстве : науч.-метод. пособие / Т. Ф. Берестова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2005. – 288 с.

3. *Библиотечная* энциклопедия / Рос. гос. б-ка. – М. : Пашков дом, 2007. – 1300 с.

4. *Дворкина, М. Я.* Библиотечное обслуживание: новая реальность : лекции / М. Я. Дворкина. – М. : МГУКИ, 1999. – 46 с.

5. *Дзямешка, Л. А.* Дзейнасць бібліятэкі як сацыяльнай установы / Л. А. Дзямешка, С. А. Паўлава // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2008. – № 8. – С. 20–24.

6. *Доступ* к правовой информации : метод. материалы по организации работ публ. центров правовой информации / сост. Н. З. Стародубова. – М. : Фаир-Пресс, 2005. – 288 с.

7. *Иманкуилов, Р. И.* Психолого-педагогические аспекты правового сознания (школьный возраст) : автореф. дис. … канд. психол. наук: 19.00.07 / Р.И. Иманкуилов; Кубанск. гос. ун-т. – Краснодар, 1998. – 17 с.

8. *Концепция* непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь : утв. постановлением Мин-ва образования Респ. Беларусь, 14 дек. 2006 г., № 125. – URL: http://www.pravoby.info/

9. *Кравцов, Р. В.* Правовое воспитание личности в контексте аксиологии права : автореф. дис. … канд. юрид. наук: 12.00.01 / Р. В. Кравцов. – Челябинск, 2006. – 25 с.

10. *Мартынюк, С. В.* Возможности библиотечных центров правовой информации в правовой социализации личности / С. В. Мартынюк // Румянцевские чтения : материалы междунар. конф. (10–12 апр. 2007 г.). – М. : Пашков дом, 2007. – С. 229–235.

11. *Матвиенко, Л. М.* Правовое воспитание старшеклассников в процессе изучения дисциплин гуманитарного цикла : автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / Л. М. Матвиенко. – Волгоград, 2004. – 28 с.

12. *Матлина, С. Г.* Публичная библиотека: пути инновационного развития : избранное / С.Г. Матлина. – СПб. : Профессия, 2009. – 376 с.

13. *Мелентьева, Ю. П.* Библиотечное обслуживание : учебник / Ю. П. Мелентьева. – М. : Фаир, 2006. – 256 с.

14. *Мелентьева, Ю. П.* Публичные центры правовой информации: новые возможности библиотечного обслуживания / Ю. П. Мелентьева. – М. : Фаир-Пресс, 2004. – 87 с.

15. *Мотульский, Р. С.* Общее библиотековедение : учеб. пособ. для вузов / Р. С. Мотульский. – М. : Либерея, 2004. – 224 с.

16. *Муслумова, Т. В.* Правовая культура подрастающего поколения: социально-философский анализ : автореф. дис. … д-ра филос. наук: 09.00.01 / Т. В. Муслумова. – Уфа, 2004. – 47 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. *Правовое* воспитание в работе библиотек : метод. реком. / Гос. библиотека им. В. И. Ленина, науч.-метод. отдел ; Гос. публ. ист. библиотека РСФСР. – М., 1984. – 39 с.

18. *Пропаганда* правовых знаний в школьной библиотеке : метод. реком. / отв. ред. Р. А. Марачева, Н. В. Ковалева ; РНПБ Мин-ва просвещения БССР. – Минск, 1975. – 26 с.

19. *Работа* библиотек в помощь пропаганде правовых знаний / Гомельская обл. б-ка им. В. И. Ленина, метод. отдел. – Гомель, 1971. – 8 с.

20. *Российское* библиотековедение XX век. Направление развития, проблемы и итоги: опыт монограф. исслед. / Б. Н. Бачалдин [и др.] ; сост. Ю. П. Мелентьева. – М. : Пашков дом, 2003. – 432 с.

21. *Царик, И. А.* Воспитание правовой культуры школьников / И. А. Царик // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2008. – № 5. – С. 3–9.

22. *Человек* и закон : метод. реком. массовым библиотекам в помощь правовому воспитанию молодежи / Минская обл. библиотека им. А. С. Пушкина, науч.-метод. отдел. – Минск, 1972. – 12 с.

23. *Элиасберг, Н. И.* Система этико-правового образования школьников: петербургская модель / Н. И. Элиасберг // Рос. конф. информ.-правовых центров для детей и подростков «Петербургская модель этико-правового образования школьников» (25–27 ноября 2002 г., г. Санкт-Петербург) / сост. В. К. Кузнецова, Ю. В. Ершова. – СПб. : ЦДГБ, 2003. – С. 24–29.

## 3.6. Педагагічныя асновы фарміравання інфармацыйнай культуры ва ўмовах бібліятэкі

Неабходнасць фарміравання інфармацыйнай культуры і павышэння інфармацыйнай пісьменнасці заключаецца ў тым, што ва ўмовах імклівага павелічэння інфармацыйных рэсурсаў грамадства чалавек сутыкаецца з вялікай колькасцю разнастайнай інфармацыі. На яго накіравана магутная інфармацыйная плынь. Акрамя таго, у перыяд навучання альбо працы ідзе яшчэ дадатковая колькасць дзелавой інфармацыі. Таксама назіраецца значны рост навучальнай інфармацыі, колькасць вучэбнай літаратуры на сёння павялічылася ў 3–4 разы [1].

Разам з тым з розных крыніц часта мы атрымліваем недакладную, неабгрунтаваную і ненадзейную інфармацыю. Менавіта таму ўзнікае пільная ўвага да ацэнкі, разумення і выкарыстання інфармацыі. Аднак узрастаючая колькасць інфармацыі і тэхналогій сама па сабе не ўтварае больш інфармаваных людзей. Іх яшчэ трэба навучыць валодаць інфармацыйнай культу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рай. Для гэтага неабходна абапірацца на сучасныя дасягненні педагогікі, якая, на думку вядомых навукоўцаў У. Бардоўскай, А. А. Рэан і інш., з'яўляецца навукай аб мэтанакіраваным працэсе перадачы чалавечага вопыту і падрыхтоўкі падрастаючага пакалення да жыцця і дзейнасці [3]. Л. В. Мардахаеў, у сваю чаргу, лічыць, што гэта навука аб сутнасці, заканамернасцях, прынцыпах, метадах і формах навучання і выхавання чалавека [5, с. 84]. С. І. Розум вызначае яе як навуку аб педагагічным працэсе, арганізаваным ва ўмовах педагагічнай сістэмы, забяспечваючым развіццё яго суб'ектаў [5, с. 86]. Г. М. Рапацэвіч лічыць, што гэта галіна гуманітарнай навукі аб спосабах і шляхах перадачы-атрымання чалавекам інфармацыі і далучэння да агульнакультурных каштоўнасцей з улікам яго індывідуальна-ўзроставых асаблівясцей развіцця ў кантэксце пэўнай педагагічнай сістэмы [4]. Такім чынам, у азначэннях прасочваецца думка, што педагогіка – гэта працэс перадачы чалавечага вопыту, які спрыяе развіццю чалавека ў пэўным кірунку шляхам перадачы і засваення інфармацыі з улікам індывідуальна-ўзроставых асаблівасцей і творчага самаразвіцця чалавека.

Калі спыніцца на педагагічных праблемах фарміравання інфармацыйнай культуры, яе задачай таксама з'яўляецца ўзбраенне навучэнца ведамі, уменнямі і навыкамі інфармацыйнага самазабеспячэння яго дзейнасці, якая поўнасцю ўкладаецца ў працэс, накіраваны на развіццё чалавека ў вызначаным кірунку з дапамогай перадачы і засваення інфармацыі для яго самаразвіцця.

Невыпадкова ЮНЕСКА апублікавала праграму «Інфармацыя для ўсіх» [7], якая вызначае сусветныя патрабаванні да інфармацыйнай культуры і ўключае наступныя асноўныя раздзелы: развіццё інфармацыйнай палітыкі на нацыянальным, рэгіянальным і міжнародным узроўнях; развіццё патэнцыялу чалавека, навыкаў і ўменняў, неабходных у эпоху інфармацыі; узмацненне ролі арганізацый і ўстаноў у забеспячэнні доступу да інфармацыі; развіццё спосабаў, сродкаў і сістэм інфармацыйнага менеджменту; інфармацыйныя тэхналогіі для адукацыі, навукі, культуры і камунікацый.

Амерыканская бібліятэчная асацыяцыя трактуе паняцце «інфармацыйная пісьменнасць» як уменне чалавека любога ўзросту выявіць, ацаніць і найбольш эфектыўна выкарыстаць інфармацыю. Пры гэтым кожнае з гэтых уменняў прадугледжвае вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карыстанне шэрагу дзеянняў, якія патрабуюць спецыяльнай падрыхтоўкі.

Варта падкрэсліць, што менавіта амерыканскія бібліятэкары ўзмацнілі інфармацыйны складнік паняцця «інфармацыйная пісьменнасць» у адрозненне ад папярэдніх трактовак, у якіх дамінавалі ўменні і навыкі работы з камп'ютарам. Немалаважна, што менавіта ў такой рэдакцыі паняцце «інфармацыйная пісьменнасць» паслужыла асновай для распрацоўкі стандартаў інфармацыйнай пісьменнасці для школьнікаў. Усяго распрацавана дзевяць стандартаў, якія падзяляюцца на тры катэгорыі, кожны стандарт суправаджаецца пералікам індыкатараў (паказчыкаў), характарызуючых патрабаванні да навучэнцаў [4].

Да першай катэгорыі – «Стандарты інфармацыйнай пісьменнасці» – адносяцца тры стандарты. Веды і ўменні, рэгламентуемыя гэтай катэгорыяй стандартаў, звязаны з пошукам і выкарыстаннем інфармацыі. Яны адлюстроўваюцца з дапамогай адпаведных індыкатараў.

Да другой катэгорыі – «Стандарты для самастойнай работы» – адносяцца стандарты і індыкатары, якія характарызуюць самастойнае дасягненне інфармацыйнай пісьменнасці.

Да трэцяй катэгорыі – «Стандарты сацыяльнай адказнасці» – адносяцца стандарты і індыкатары, якія сведчаць пра вялікі ўклад школьных бібліятэк у фарміраванне сацыяльнай адказнасці навучэнцаў у працэсе авалодання інфармацыйнай граматай.

Найважнейшымі пастулатамі гэтых стандартаў, якія адлюстроўваюць сутнасць паняцця «інфармацыйная пісьменнасць», з'яўляюцца наступныя.

**Стандарты і індыкатары інфармацыйнай пісьменнасці**

Па-першае – навучэнец, які валодае інфармацыйнай граматай, распрацоўвае эфектыўную стратэгію пошуку інфармацыі. Ён павінен ідэнтыфікаваць патрэбнасць у дакладнай інфармацыі, умець сфармуляваць пытанні, вызначыць крыніцы інфармацыі і выкарыстаць паспяховыя стратэгіі пошуку, ведаць, як арганізаваць пошук розных крыніц і фарматаў, адпавядаючых яго патрэбнасцям. Індыкатарамі выступаюць наступныя прыкметы: асэнсаванне патрэбнасці ў інфармацыі; разуменне, што дакладнасць і верагоднасць інфармацыі ёсць аснова для прыняцця рашэнняў; фармуляванне запытаў, якія грунтуюцца на інфармацыйных патрэбнасцях; ідэнтыфікаванне магчыма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцей розных крыніц інфармацыі; развіццё і выкарыстанне эфектыўных стратэгій пошуку інфармацыі.

Па другое – навучэнец, які валодае інфармацыйнай граматай, ацэньвае інфармацыю крытычна і кампетэнтна. Знайшоўшы неабходную інфармацыю, ён павінен ацаніць яе дакладнасць, аддзяліць факты ад меркаванняў і выключыць нерэлевантную інфармацыю. Індыкатарамі выступаюць наступныя прыкметы: вызначэнне дакладнасці, рэлевантнасці і верагоднасці інфармацыі; уменне адрозніваць факты, пункты гледжання і меркаванні; вызначэнне недакладнай і памылковай інфармацыі; адбор адпаведнай інфармацыі па праблеме альбо пытанню.

Па трэцяе – навучэнец, які валодае інфармацыйнай пісьменнасцю, выкарыстоўвае інфармацыю акуратна і творча. Для абмену інфармацыяй навучэнцы павінны арганізаваць яе і інтэграваць са сваімі ведамі. Яны таксама павінны мець навыкі крытычнага мыслення і вырашэння праблем. Індыкатарамі выступаюць наступныя прыкметы: арганізацыя інфармацыі для практычнага ўжывання; інтэграцыя новай інфармацыі з набытымі раней ведамі; выкарыстанне інфармацыі ў крытычным асэнсаванні і пошуку вырашэння праблем; стварэнне і перадача інфармацыі і ідэі ў належнай форме.

**Стандарты і індыкатары для самастойнай работы**

Па першае, навучэнец самастойна займаецца, валодае інфармацыйнай граматай і падбірае інфармацыю, звязаную з асабістымі інтарэсамі. Навучэнцам неабходна ацэньваць і выкарыстоўваць інфармацыю, якая мае дачыненне да сферы кар’еры, грамадскай работы, здароўя і адпачынку. Пасля таго як навучэнцы набылі інфармацыйную грамату, ім патрэбна пачаць ужываць тое, чаму яны навучыліся, для сваіх асабістых інтарэсаў, працягваючы самастойна вучыцца. Індыкатарамі выступаюць: пошук інфармацыі, якая мае дачыненне да розных каардынат асабістага поспеху, кар’еры, грамадскай работы, здароўя і адпачынку; стварэнне, развіццё і ацэньванне інфармацыйных прадуктаў і рашэнні, звязаныя з асабістымі інтарэсамі.

Па-другое, навучэнец самастойна займаецца, валодае інфармацыйнай граматай і ацэньвае літаратуру і іншыя творчыя спосабы выражэння інфармацыі. Ён павінен не толькі стаць упэўненым і зацікаўленым чытачом, але таксама ўмець творча ацаніць інфармацыю і прадставіць яе з дапамогай як традыцыйных сродкаў, так і электронных. Індыкатарамі выступаюць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уменне быць кампетэнтным і ўнутрана матываваным чытачом; здольнасць творча выдзяляць сэнс інфармацыі, прадстаўленай у рознай форме; імкненне прадстаўляць творчыя прадукты ў розных формах.

Па-трэцяе, навучэнец самастойна займаецца, валодае інфармацыйнай граматай і імкнецца да выдатных вынікаў у пошуку інфармацыі і генерыраванні ведаў. Ён павінен умець ацаніць працэс выкарыстання інфармацыі, дасягнутыя вынікі, знайсці шляхі перагляду, паляпшэння альбо аднаўлення сваёй работы. Індыкатарамі выступаюць: вызначэнне якасці працэсу і вынікаў пошуку інфармацыі для асабістых патрэб; вызначэнне інфармацыйных стратэгій для перагляду, паляпшэння і дапаўнення сваіх ведаў.

**Стандарты і індыкатары сацыяльнай адказнасці**

Па-першае, навучэнец валодае інфармацыйнай пісьменнасцю, усведамляе значнасць інфармацыі ў дэмакратычным грамадстве і павінен ведаць, як уносіць пазітыўны ўклад у яго развіццё. Сацыяльна адказны навучэнец разумее, што доступ да інфармацыі – ёсць аснова дзеяння дэмакратыі, ён павінен шукаць інфармацыю з разнастайных крыніц і паважаць прынцып раўнапраўнага доступу да інфармацыі. Індыкатары: шукае інфармацыю ў розных крыніцах, кантэкстах, дысцыплінах і культурах; паважае прынцыпы раўнапраўнага доступу да інфармацыі.

Па-другое, навучэнец уносіць пазітыўны ўклад у жыццё калектыву і грамадства, з'ўляецца інфармацыйна пісьменным і трымаецца этычных нормаў у галіне інфармацыі і інфармацыйных тэхналогій. Ён павінен быць адказным карыстальнікам інфармацыі, паважаць прынцыпы інтэлектуальнай свабоды і праводу на інтэлектуальную ўласнасць, даючы дакладныя спасылкі на ідэі іншых, разумець, што дэмакратычнае грамадства грунтуецца на павазе да ідэй і меркаванняў іншых людзей. Навучэнец ужывае гэтыя прынцыпы да ўсяго спектра інфармацыйных крыніц: апублікаваных, неапублікаваных і электронных. Індыкатары: паважае прынцыпы інтэлектуальнай свабоды; паважае інтэлектуальную ўласнасць; адказна выкарыстоўвае інфармацыйныя тэхналогіі.

Па-трэцяе, навучэнец уносіць пазітыўны ўклад у жыццё калектыву і грамадства, з'яўляецца інфармацыйна пісьменным і эфектыўна ўдзельнічае ў калектыўнай рабоце па пошуку і ства-

рэнню інфармацыі. Ён павінен умець супрацоўнічаць з іншымі ў пошуку і выкарыстанні інфармацыі, а затым умець падзяліцца вынікамі сваёй дзейнасці. Той, хто дасягне гэтых стандартаў, будзе гатовы да жыцця ў радыкальна зменлівым свеце. Індыкатары: дзяліцца ведамі і інфармацыяй з іншымі; паважае ідэі іншых і прызнае іх значэнне; супрацоўнічае з іншымі як асабіста, так і праз тэхналогіі, каб адрозніваць інфармацыйныя праблемы і знаходзіць іх рашэнні; супрацоўнічае з іншымі як асабіста, так і праз тэхналогіі, каб ствараць, развіваць і ацэньваць інфармацыйныя прадукты і рашэнні.

Як бачым «інфармацыйная пісьменнасць» трактуецца амерыканскімі бібліятэкарамі дастаткова шырока і ўключае практычна ўсе асноўныя аспекты ўзаемадзеяння чалавека і інфармацыі: ад разумення неабходнасці яе атрымання, авалодання стратэгіямі пошуку і апрацоўкі, крытычнай ацэнкі і творчага выкарыстання да асэнсавання прававых, этычных і іншых сацыяльных нормаў дэмакратычнага грамадства, якія дзейнічаюць у сферы інфармацыі.

Не менш дасканала вызначаецца і абгрунтоўваецца паняцце «інфармацыйная культура» расійскімі бібліятэказнаўцамі. У калектыўным даследаванні [8] прапануецца комплекс вучэбных праграм, разлічаны на паслядоўнае вывучэнне курса «Асновы інфармацыйнай культуры асобы» з 1-га па 11-ы клас. У межах курса пад інфармацыйнай культурай разумеецца адзін са складнікаў агульнай культуры чалавека – сукупнасць інфармацыйнага светапогляду і сістэмы ведаў і ўменняў, якія забяспечваюць мэтанакіраваную самастойную дзейнасць па аптымальным задавальненні індывідуальных інфармацыйных патрэбнасцей з выкарыстаннем як традыцыйных, так і новых інфармацыйных тэхналогій, што з'яўляецца найважнейшым фактарам паспяховай прафесійнай і непрафесійнай дзейнасці, а таксама сацыяльнай абароненасці асобы ў інфармацыйным грамадстве.

Асноўная мэта курса – даць навучэнцам веды, уменні і навыкі інфармацыйнага самазабеспячэння вучэбнай дзейнасці. Дасягненне гэтай мэты ажыццяўляецца ў ходзе вырашэння наступных задач: засваенне рацыянальных прыёмаў і спосабаў самастойнага пошуку інфармацыі ў адпаведнасці з узнікаючымі ў ходзе навучання задачамі; авалоданне метадамі аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі інфармацыі; вывучэнне і практыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нае выкарыстанне тэхналогіі падрыхтоўкі і афармлення вынікаў самастойнай вучэбнай і пазнавальнай дзейнасці (падрыхтоўка сачыненняў, вучэбных рэфератаў, дакладаў і г. д.).

Выкладанне зместу кожнага раздзела, кожнай тэмы курса прадугледжвае арыентацыю на актыўнае выкарыстанне сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, магчымасцей персанальнага камп'ютара ў рабоце з інфармацыяй. Як вынікае з мэт і задач, складу і структуры курса, ён прызваны стаць асновай рацыянальнай арганізацыі вучэбнай работы навучэнцаў. Гэта абумоўлена тым, што курс цалкам падпарадкаваны задачам інфармацыйнага забеспячэння вучэбнага працэсу.

Хаця ў амерыканскіх і расійскіх навукоўцаў і практыкаў няма адзінага падыходу да вызначэння зместу інфрмацыйнай пісьменнасці і інфармацыйнай культуры, пры суаднясенні іх вывадаў мы можам назіраць як падабенствы, так і адрозненні. Замежныя навукоўцы ствараюць разнастайныя нацыянальныя сістэмы, дзе выпрацоўваюцца канцэпцыі інфармацыйнай пісьменнасці, уласцівыя культурным традыцыям іх дзяржаў (да прыкладу, A. Paterson).

Для вырашэння праблем інфармацыйнай пісьменнасці ў нашай краіне быў створаны Камітэт па інфармацыйнай культуры пры Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі. Ён і падрыхтаваў рэспубліканскі конкурс па выяўленні ўзроўню валодання інфармацыйнай культурай сярод школьнікаў і студэнтаў. Асноўная мэта конкурсу – садзейнічанне бібліятэчным установам у развіцці дзейнасці, накіраванай на фарміраванне інфармацыйнай культуры школьнікаў і студэнтаў.

Задачы конкурсу – выўленне нацыянальнага рэсурсу ў галіне інфармацыйнай культуры школьнікаў і студэнтаў; шырокае інфармаванне і папулярызацыя вынікаў конкурсу; стварэнне агульнадаступнай базы даных па інфармацыйнай культуры; кансалідацыя спецыялістаў і ўсіх, хто цікавіцца гэтымі пытаннямі, у супольнасць пад эгідай Камітэта Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі. Для правядзення конкурсу быў створаны арганізацыйны камітэт, а для ацэнкі работ і падвядзення вынікаў – журы, куды ўвайшлі вядучыя спецыялісты ў дадзенай галіне.

На нашу думку, конкурс спраўдзіў чаканні. Быў закладзены падмурак матэрыялаў па інфармацыйнай культуры школьнікаў і студэнтаў, вызначаны ўзровень патрабаванняў, сабрана вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

датная калекцыя дакументаў, дзякуючы якой можна праводзіць заняткі па інфармацыйнай культуры.

Але конкурс выявіў і сур'ёзныя прабелы. Далёка не ўсе яго ўдзельнікі валодаюць на належным узроўні такімі камп'ютарнымі праграмамі, як Windows, Word, PowerPoint, Excel, не кажучы ўжо аб Photoshop; Corel; элементамі Web-mastering. Некаторыя файлы, дасланыя на конкурс, немагчыма было ацаніць па прычыне іх недасканалага афармлення. Недастаткова былі адлюстраваны беларускія рэаліі.

Зыходзячы з першага вопыту, на базе ББА была створана школа інфармацыйнай культуры (ШІК). У ёй навучаюцца бібліятэкары школьных, дзіцячых бібліятэк і бібліятэк ВНУ, у чыіх руках знаходзіцца навучанне інфармацыйнай культуры школьнікаў і студэнтаў.

Школа па інфармацыйнай культуры збіраецца 1 раз у год (у канцы сакавіка, інакш кажучы, на школьных вакацыях, калі бібліятэкарам лягчэй патрапіць на вучобу) і ўключае наступныя кірункі:

– **Тэорыя інфармацыйнай культуры.** Мяркуецца выступленне беларускіх бібліятэкараў і гасцей з-за мяжы. Яны будуць дзяліцца сваімі напрацоўкамі і дасягненнямі сваіх краін.

– **Бібліятэчна-інфармацыйная тэорыя.** Гэты кірунак прадугледжвае выкарыстанне неабходных элементаў з курсаў маркетынгу, менеджменту, кіраўніцтва дзіцячым чытаннем, гісторыі кнігі і бібліятэчнай справы і інш.

– **Камп'ютарныя тэхналогіі**. Тут будуць выкладацца магчымасці Microsoft Office (Windows, Word, PowerPoint, Excel, Internet).

– **Графічны дызайн.** Мяркуецца знаёмства з такімі праграмамі, як Photoshop; Corel; Web-mastering; Шрыфты; Колер; Фатаграфія; Відэаздымка; Кніжны дызайн і інш.).

Першая школа інфармацыйнай культуры праходзіла 26–28 сакавіка 2007 г. для бібліятэкараў школьных і дзіцячых бібліятэк. Мэтавую групу на дадзеным семінары склалі ў першую чаргу ўдзельнікі конкурсу інфармацыйнай культуры, якія паказалі добрыя вынікі. Праграма школы была досыць насычанай. Былі зроблены наступныя даклады: «Праграма па інфармацыйнай культуры для школьнікаў Рэспублікі Беларусь» – Т. А. Квасава, начальнік навукова-метадычнага аддзела Навуковапедагагічнай бібліятэкі НМУ Нацыянальнага інстытута адука-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыі; «Гульні і інфармацыйная пісьменнасць» – Лора Хоман, аташэ па бібліятэчных пытаннях пасольства ЗША ў Рэспубліцы Беларусь; «Стандарты інфармацыйнай пісьменнасці ЗША» – М. В. Шубіна, дырэктара інфармацыйнага цэнтра пасольства ЗША ў Беларусі [2].

Удзельнікам былі прапанаваны наступныя заняткі: «MS Windows», «PowerPoint і інфармацыйная культура»; «Інтэрнэт і інфармацыйная культура»; «Выкарыстанне Photoshop для заняткаў па інфармацыйнай культуры»; «Майстар-клас па інфармацыйнай культуры»; «Аналіз конкурсных прац»; «Дзейнасць школьнай бібліятэкі па інфармацыйнай культуры».

Другая школа інфармацыйнай культуры праходзіла 26–29 сакавіка 2008 г. Дацэнт У. А. Акуліч зрабіў кароткі аналіз прац, прадстаўленых на конкурс. Былі прачытаны даклады школьных бібліятэкараў і студэнтаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый: «З досведу працы школьных бібліятэк “Шчасце чытаць”», «Выкарыстанне кнігі-гульні ў інфармацыйнай культуры школьнікаў», «Гульня – алгарытм для інтэлектуалаў і не толькі», «Выдатнік», «Пагуляем у Google!!!», «Пасвячэнне ў чытачы», «Асновы інфармацыйнай культуры студэнта», «Як стварыць блог школьнаму бібліятэкару», «Стварэнне школы дыстанцыйнага навучання», «Выкарыстанне гульняў у правядзенні заняткаў па інфармацыйнай культуры», «Аўтаматызаваная біблятэчна-інфармацыйная сістэма “МАРК-SQL” для школьных бібліятэк: асноўныя магчымасці і характарыстыкі», «Майстар-клас па стварэнні баз даных па інфармацыйнай культуры».

Напрыканцы намі было праведзена ананімнае апытанне, якое паказала запатрабаванасць ведаў у рамках школы інфармацыйнай культуры, належны ўзровень выкладання і неабходнасць працягваць школу, значна пашыраючы кола ўдзельнікаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Акулич, В. А.* Информационная культура школьников Республики Беларусь: состояние и перспективы / В. А. Акулич // Научная коммуникация и сотрудничество между национальными библиотеками: новые идеи и перспективы. 6–7 декабря 2006 г., Минск. – Национальная библиотека Беларуси.

2. *Акулич, В. А.* Авторская программа по информационной культуре школьников Республики Беларусь / В. А. Акулич // Бібліятэка прапануе. – 2006. – № 1. – С. 27–29.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Бордовская, Н. В.* Педагогика : учеб. курс для творческого саморазвития / Н. В. Бордовская, А. А. Реан. – Казань, 2007. – С. 6.

4. *Information* Literacy–An Emerging Global Priority Hannelore B. Rader UNESCO, the U.S. National Commission on Libraries and Information Science, and the National Forum on Information Literacy. – URL: http://www.nclis.gov/libinter/infolitconf&meet/papers/ rader-fullpaper.pdf.

5. *Педагогические* теории, системы и технологии: опыт организации творчества. – М. : Моск. педагог. ун-т, 2005.– С. 84.

6. *Программа* ЮНЕСКО «Информация для всех». – URL: http://www.ifap.ru.

7. *Рапацевич, Г. М.* Педагогика в системе наук о человеке / Г. М. Рапацевич. – М., 1998. – С. 23.

8. *Формирование* информационной культуры личности: теоретическое обоснование и моделирование содержания учебной дисциплины / Н. И. Гендина, Н. И. Колкова, Г. А. Стародубова, Ю. В. Уленко – М., 2008. – С. 129.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. КАДРАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ БІБЛІЯТЭЧНА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ

## 4.1. Прафесійная педагагічная падрыхтоўка бібліятэчнага спецыяліста ў сістэме вышэйшай адукацыі

Бібліятэчна-інфармацыйная адукацыя з’яўляецца адной з важнейшых сфер сацыяльна-культурнага жыцця грамадства. Яе задачы і змест абумоўліваюцца станам і тэндэнцыямі развіцця эканомікі, навукі, культуры. У сваю чаргу, ведавы патэнцыял, прафесійныя ўменні, навыкі, асобасныя характарыстыкі бібліятэчных спецыялістаў садзейнічаюць выкананню бібліятэчнымі ўстановамі інфармацыйнай, адукацыйнай, культурнай функцый, якія дэтэрмінуюць далейшае развіццё ўсіх сфер грамадскага жыцця.

Працэс аптымізацыі падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў вызначаецца станам, праблемамі і перспектывамі развіцця бібліятэчнай тэорыі і практыкі. Перыядычны перагляд грамадскіх функцый бібліятэк, сутнасці бібліятэчнай прафесіі, змены асяроддзя функцыянавання, ускладненне бібліятэчных тэхналогій прад’яўляюць новыя патрабаванні да асобы і прафесіі бібліятэчнага спецыяліста, што патрабуе карэкціроўкі адукацыйнага працэсу.

Праблемы ўдасканалення бібліятэчнай адукацыі з’яўляюцца працяглы час прадметам вывучэння многіх спецыялістаў. Агульнатэарэтычныя і метадалагічныя асновы распрацоўвалі: К. І. Абрамаў, А. М. Ванееў, А. С. Чачко, А. І. Капцераў, А. В. Сакалоў, А. П. Коршунаў, У. І. Цярошын; змястоўныя, дыдактычныя аспекты: Л. В. Трапезнікава, Н. А. Сляднева, Н. І. Гендзіна, Т. І. Ключэнка, В. А. Калегіна, З. А. Сафіуліна, І. С. Пілко, Л. Я. Савіч, Н. І. Калкова, Ю. П. Мяленцьева, У. К. Клюеў, В. У. Шлыкава, А. А. Мядзведзева; педагагічныя аспекты бібліятэчнай прафесіі: Н. І. Гендзіна, Т. М. Яфрэменка, Г. А. Іванова, П. П. Церахаў, В. І. Чарнічэнка, В. П. Чудзінава, І. М. Немчына, Т. Д. Полазава, І. І. Ціхамірава і інш.; пытанні інтэграцыі і дыферэнцыяцыі прафесійнай галіновай адукацыі: У. І. Цяро-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шын, У. Т. Клапіюк, К. Л. Варанко, Р. І. Фацеева, І. А. Івашова; замежны вопыт падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў: А. А. Набатнікава, Н. Ю. Дзяменцьева; бесперапыннасць як фактар удасканалення бібліятэчнай адукацыі: Т. В. Абалімава, Н. П. Абакумава, А. Я. Вадалазская, Я. К. Высоцкая, Ю. М. Дрэшар, Т. А. Жданава, Н. У. Збароўская, Т. Я. Кузняцова, Т. Л. Садоф'ева, Э. Р. Сукіасян; рэгіянальныя аспекты бібліятэчнай адукацыі: А. М. Дулатава, К. Л. Кудрына, І. І. Горлава, Г. Г. Габдзельганеева, В. Е. Лявончыкаў, С. В. Зыгмантовіч, В. М. Бігеза, М. А. Яцэвіч, О. М. Морава, С. Д. Барадзіна; канцэптуальныя палажэнні пераходу падрыхтоўкі спецыялістаў на еўрапейскую мадэль адукацыі (кампетэнтнасны падыход) у працах В. І. Байдэнкі, І. А. Зімняй, А. В. Хутарскога, В. А. Калегінай, В. Л. Жук, А. В. Макарава.

Пералік аўтараў прац па пытаннях бібліятэчнай адукацыі можна было б працягнуць, і пры гэтым, на нашу думку, важна звярнуць увагу на дысертацыйныя даследаванні, у якіх разглядаюцца праблемы спецыяльнай падрыхтоўкі кадраў для работы з падрастаючым пакаленнем, прафесійная дзейнасць якіх базіруецца на педагогіцы і псіхалогіі. Сярод такіх прац адзначым доктарскую дысертацыю В. І. Чарнічэнка [16], у якой вызначаны канцэптуальны падыход да вышэйшай адукацыі. Па яе сцвярджэнні, асноўная мэта вышэйшай школы заключаецца ў фарміраванні светапогляду цэльнай асобы, якая здольна адэкватна рэагаваць на эканамічную, палітычную і іншую сітуацыю ў краіне, зыходзячы з маральна-этычных каштоўнасцей. Навуковая навізна даследавання заключаецца ў тэарэтыка-метадычным абгрунтаванні прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў для бібліятэчнай работы з падрастаючым пакаленнем; паказаны магчымасці курса педагогікі ў прафесіяналізацыі студэнтаў.

Фундаментальнай працай з'яўляецца і доктарская дысертацыя Г. А. Івановай [8], у якой уведзена і абгрунтавана паняцце «бібліятэчна-педагагічная адукацыя», уведзены ў бібліятэказнаўства новыя веды аб прафесійнай адукацыі бібліятэкараў дзіцячых і школьных бібліятэк як спецыялістаў педагагічнага профіля, прапаноўваецца неабходнасць распрацоўкі Дзяржаўнага адукацыйнага стандарта вышэйшай прафесійнай адукацыі па спецыяльнасці «Бібліятэчна-педагагічная дзейнасць».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. П. Чудзінава вывучала дзейнасць і асобу спецыяліста дзіцячай бібліятэкі, абгрунтавала патрабаванні, якія прад'яўляюцца да падрыхтоўкі студэнтаў у вузах культуры [18].

Працэс адаптацыі студэнтаў і выпускнікоў да прафесійна-педагагічнай дзейнасці ў дзіцячых і юнацкіх бібліятэках разглядзела І. М. Немчына [10].

Асобую актуальнасць разгляд педагагічнага складніка бібліятэчнай прафесійнай дзейнасці набывае і з фарміраваннем новых уяўленняў аб бібліятэцы як установе, якая павінна выступаць ініцыятарам, арганізатарам, суб'ектам фарміравання інфармацыйнай культуры асобы ў розныя перыяды яе станаўлення – у школьным, у перыяд прафесійнага навучання, на далейшых этапах прафесіяналізацыі [4]. Па прагнозах футуролагаў, бібліятэказнаўцаў вядучых краін, у інфармацыйным грамадстве ўсё большую сацыяльную значнасць будзе займаць такая функцыя бібліятэчна-бібліяграфічных работнікаў, як навучанне ўсяго насельніцтва прыёмам работы з інфармацыяй, фарміраванне інфармацыйнай культуры насельніцтва.

Паспяховасць вырашэння названай задачы, на думку некаторых даследчыкаў, залежыць ад узроўню прафесійнай педагагічнай падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў, здольных на прафесійнай аснове весці заняткі з рознымі катэгорыямі навучэнцаў, якія валодаюць як адпаведнай прадметнай галінай, што характарызуе феномен інфармацыйнай культуры, так і ведаюць асаблівасці ўзроставай псіхалогіі, методыкі выкладання курсаў «Асновы інфармацыйнай культуры», «Інфармацыйная культура спецыяліста», магчымасці ажыццяўлення педагагічнага ўплыву ў працэсе штодзённых зносін з карыстальнікамі, у працэсе даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання і г. д. Адным са шляхоў падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў да паспяховага выканання гэтых функцый з'яўляецца навучанне будучых бібліятэкараў па здвоенай спецыяльнасці «бібліятэкар-выкладчык» [6]. Аб запатрабаванасці педагагічных ведаў, уменняў, навыкаў у прафесійнай дзейнасці бібліятэкараў сведчыць арганізацыя і правядзенне ў нашай краіне такой формы павышэння кваліфікацыі ў сістэме дадатковай адукацыі, як «Зімняя школа» для бібліятэкараў, занятых работай па фарміраванні інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк [13].

Псіхолага-педагагічная кампанента прафесійнай дзейнасці разглядаецца таксама ў навуковых даследаваннях бібліятэка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаўцаў і ў дачыненні да кіраўнікоў бібліятэк, якія павінны валодаць спецыяльнымі кампетэнцыямі для паспяховай адаптацыі да ўмоў шматролевай прафесійнай дзейнасці, праектавання і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі і бібліятэчнага калектыву, валодаць уменнямі эфектыўна будаваць міжасобасныя, дзелавыя, прафесійныя, сацыяльныя ўзаемаадносіны з калегамі па працы, спажыўцамі бібліятэчна-бібліяграфічных паслуг, спонсарамі, прадстаўнікамі ўлады і іншымі кантактнымі аўдыторыямі знешняга асяроддзя, фарміраваць карпаратыўную культуру бібліятэкі, эфектыўна ажыццяўляць усе працэсы кадравага менеджменту з выкарыстаннем вынікаў тэорыі і практыкі сацыяльнага кіравання і г. д. [14].

Аналіз спецыяльнай літаратуры, практыкі бібліятэк сведчыць, што ў сучасных умовах педагагічныя функцыі ў дзейнасці спецыялістаў бібліятэчнай сферы значна павышаюцца і ўскладняюцца і ў сувязі з такімі прычынамі, як, па-першае, гуманізацыя і дэмакратызацыя грамадскага жыцця, неабходнасць вырашэння сродкамі бібліятэчна-бібліяграфічнай работы праблем дэгуманізацыі грамадства, фарміравання грамадскай супольнасці, удзел у фарміраванні прававой культуры грамадства і асобы (артыкул у дадзеным выданні І. А. Чупраковай), удзел у садзейнічанні ўстойліваму развіццю грамадства праз фарміраванне экалагічнай культуры насельніцтва (артыкул у дадзеным выданні В. А. Какшынскай), талерантнасці ў чалавечых адносінах, павышэнне ўвагі да чалавечых патрэбнасцей, чаканняў; па-другое, рэалізацыя новай парадыгмы бібліятэчнага абслугоўвання, пабудаванага на супрацоўніцтве бібліятэкара – чытача (карыстальніка бібліятэкі); па-трэцяе, развіццё саміх бібліятэк, бібліятэчная практыка стварае мноства арганізацыйна-педагагічных інавацый, што абумоўлівае неабходнасць іх пастаяннага вывучэння і авалодання імі.

Як бачым, прафесійная педагагічная падрыхтоўка бібліятэчных кадраў з’яўляецца ключавой у шэрагу навуковых даследаванняў. Іх аналіз дазваляе зрабіць высновы, што педагогіка выступае ў ролі стрыжня, дзейснага кампанента бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, таму што інфармацыйныя задачы, пытанні функцыянавання інфармацыі і ведаў (іх фарміраванне, збор, захоўванне, распаўсюджванне, перадача і засваенне), сацыяльных адносін у групах і калектывах, арганізацыі бібліятэчна-бібліяграфічнага асяроддзя, самаактуалізацыі асобы чы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тача і бібліятэкара-бібліёграфа вырашаюцца ў асноўным педагагічнымі метадамі.

У паняцці «прафесійна-педагагічная» падрыхтоўка ўжо заключаны прынцып інтэграцыі педагогікі з бібліятэказнаўствам, які забяспечвае выкананне агульных важных функцый па развіцці як асобы чытача, так і бібліятэкара-бібліёграфа.

Прафесійна-педагагічная дзейнасць бібліятэкара, на думку В. І. Чарнічэнка, – «гэта такая дзейнасць, якая накіравана на выхаванне, адукацыю, развіццё асобы чытача спецыфічнымі сродкамі і метадамі бібліятэчнай работы, пад уздзеяннем пэўных фактараў, важнейшымі з якіх з'яўляюцца кніга і сам бібліятэкар як педагог» [17, с. 457]. Менавіта таму ў дзейнасці бібліятэкара вызначаюць тры вядучых кампанента: канструктыўны, арганізацыйны, камунікатыўны.

<u>Канструктыўная дзейнасць</u> – гэта праектаванне асобы і зместу будучай дзейнасці чытача як сістэмы і паслядоўнасці ўдзельнікаў зносін.

<u>Арганізатарская дзейнасць</u> – здзяйсняецца ў цесным адзінстве з дзейнасцю канструктыўнай, бо ў рабоце бібліятэкара як педагога, выхавацеля кожнае педагагічнае дзеянне носіць арганізатарскі характар.

<u>Камунікатыўная дзейнасць</u> – прадугледжвае ўстанаўленне педагагічна мэтазгодных зносін паміж чытачом і бібліятэкарам. Гэта дзейнасць мае непасрэдны выхаваўчы характар і таму прадугледжвае наяўнасць у бібліятэкара пэўных прафесійна-педагагічных якасцей асобы [17, с. 458].

Псіхолага-педагагічная сутнасць бібліятэкара праяўляецца ў выкананні важнейшых функцый выхавання, адукацыі, развіцця асобы з улікам інтарэсаў дзяцей, падлеткаў, дарослых, а таксама ў дапамозе чытачам у іх самарэалізацыі і сацыяльнай адаптацыі, інфармацыйна-асветніцкай рабоце, актыўным далучэнні насельніцтва да працэсу бесперапыннай адукацыі і ў забеспячэнні для гэтага ўмоў, у сацыяльна-педагагічнай падтрымцы людзей з асаблівасцямі фізічнага развіцця і г. д.

Важнасць псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці ў русле фарміравання псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці навучэнцаў шматгранна разглядаецца шэрагам навукоўцаў (У. Г. Зазыкін, Э. Ф. Зеер, І. А. Зімняя, С. В. Шыраеў, І. С. Якіманская і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адпаведна перакананням У. А. Нікіціна, неад'емным кампанентам прафесійнай падрыхтоўкі кадраў сацыякультурнай сферы з'яўляюцца псіхолага-педагагічны кампанент, духоўна-маральнае і сацыякультурнае развіццё спецыялістаў. «Не можа быць высокакласным спецыялістам той, хто не мае агульначалавечых і грамадзянскіх якасцей, неабходных псіхалагічных і педагагічных здольнасцей арганізацыі міжасобасных зносін» [11, с. 78].

Пад зместам псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці бібліятэчнага спецыяліста мы разумеем прысутнасць прафесійна важных тэарэтычных ведаў у сферы псіхалогіі і педагогікі, сфарміраванасць практычных уменняў і навыкаў, а таксама пэўны ўзровень развіцця прафесійна важных якасцей асобы, якія адлюстроўваюць гатоўнасць і здольнасць спецыяліста вырашаць з высокай эфектыўнасцю ўвесь комплекс псіхолага-педагагічных задач, якія ўзнікаюць у працэсе яго прафесійнай дзейнасці.

Адным са складнікаў кампетэнтнаснага падыходу ў падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў з'яўляецца фарміраванне псіхолага-камунікатыўнай кампетэнтнасці. На думку вядомага спецыяліста доктара педагагічных навук, прафесара А. С. Чачко, практыка асобасна-арыентаваных тэхналогій бібліятэчных зносін і абслугоўвання абапіраецца на педагагічны складнік культуралагічнай канцэпцыі М. М. Бахціна – У. С. Біблера, якая ўтрымлівае ідэю ўсеагульнасці дыялога як асновы чалавечай свядомасці [15, с. 72].

На наш погляд, фундаментальная падрыхтоўка па педагогіцы і псіхалогіі неабходна студэнтам, якія атрымліваюць дадатковую адукацыю «выкладчык». Гэта будзе садзейнічаць фарміраванню прафесіяналізму, развіццю ў будучых спецыялістаў матывацыйна-каштоўнасных адносін да адукацыі, творчасці, патрэбнасці ў пазнанні, самаўдасканаленні, здольнасці да аналізу і творчага вырашэння складаных прафесійных праблем.

Сучасныя бібліятэчныя спецыялісты на падставе вывучэння цыкла псіхолага-педагагічных дысцыплін павінны валодаць, на нашу думку, гуманітарнымі педагагічнымі тэхналогіямі, ведамі аб псіхалагічным развіцці чалавека, умець выстройваць праграму свайго прафесійна-асобаснага самаразвіцця, педагагічныя асновы іх прафесійнай дзейнасці павінны грунтавацца на эле-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ментах педагагічнай тэорыі аб прынцыпах, змесце, метадах, шляхах і сродках работы ў соцыуме.

Акрамя таго, як сцвярджае расійскі педагог, прафесар С. В. Бялова, веды спецыяліста аб «асобе наогул», аб псіхіцы чалавека аказваюцца нядзейснымі, калі ён не разумее спецыфіку існавання суб’ектыўнай рэльнасці і не ўмее адэкватна ўзаемадзейнічаць з унутраным светам індывіда [1].

У цэлым, адзначаючы важкасць прафесійнай педагагічнай падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў у сістэме вышэйшай адукацыі, нам падаецца неабходным звярнуць увагу ў адукацыйным стандарце новага пакалення на наступныя аб’ектыўна неабходныя спецыялісту інтэгратыўныя педагагічныя веды і ўменні: псіхолага-педагагічныя, сацыяльна-педагагічныя, арганізацыйна-педагагічныя, уласна педагагічныя ў галіне выхавання, у галіне стварэння педагагічна-арганізаванага здароўезберагальнага асяроддзя і падтрымкі здаровага ладу жыцця, карэкцыйна-педагагічныя [3, с. 118].

Сучасны этап развіцця вышэйшай бібліятэчнай адукацыі прадугледжвае ўвядзенне кампетэнтнаснага падыходу. Шматлікія даследаванні канстатуюць, што кампетэнтнасны падыход узаемазвязаны з педагагічнымі падыходамі (кагнітыўным, асобасна-арыентаваным, асобасна-дзейнасным, кантэксным, сітуацыйна-праблемным), якія выкарыстоўваюцца як пры арганізацыі цэласнага адукацыйнага працэсу, так і пры рэалізацыі асобных яго кампанентаў [5, с. 98].

Кампетэнтнасна-арыентаваная прафесійная адукацыя – аб’ектыўная з’ява, якая выклікана да жыцця сацыяльна-эканамічнымі, палітыка-адукацыйнымі і педагагічнымі перадумовамі. Новыя сацыяльна-эканамічныя абставіны прад’яўляюць да сучаснага спецыяліста зусім новыя патрабаванні, якія вызначаюцца ўніверсальнасцю і фарміруюцца на аснове ключавых кампетэнцый (кампетэнцыі ў сферы пазнавальнай дзейнасці, грамадскай, у сферы працоўнай дзейнасці, у бытавой сферы, у сферы культурнай дзейнасці) [12, с. 8].

Названыя ключавыя кампетэнцыі знайшлі адлюстраванне ў адукацыйным стандарце вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, згодна з якім падрыхтоўка спецыяліста павінна забяспечваць фарміраванне наступных груп кампетэнцый: акадэмічных кампетэнцый – уключаюць веды і ўменні па засвоеных дысцыплінах, здольнасці і ўменні вучыцца; сацыяльна-асобасных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кампетэнцый – уключаюць культурна-каштоўнасныя арыентацыі, веданне ідэалагічных, маральных каштоўнасцей грамадства і ўменне кіравацца імі; прафесійных кампетэнцый – уключаюць веды і ўменні фармуляваць праблемы, вырашаць задачы абранай сферы прафесійнай дзейнасці. Названыя кампетэнцыі, якія выкарыстоўваюцца пры кампетэнтнасным падыходзе да падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў, безумоўна, прадвызначаюць сфарміраванасць у асобы ўнутранай матывацыі, псіхалагічнай і практычнай гатоўнасці для дасягнення як мага больш якасных вынікаў у сваёй прафесійнай дзейнасці, сацыяльным жыцці.

Актуальныя мэты падрыхтоўкі спецыяліста сёння прадугледжваюць фарміраванне і развіццё сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці, якая дазваляе спалучаць акадэмічныя, прафесійныя, сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі для вырашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці.

Фарміраванне названых кампетэнцый павінна ажыццяўляцца комплексна і вырашацца ў ВНУ ў ходзе ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу, у якім нельга жорстка замацаваць канкрэтныя дысцыпліны альбо віды дзейнасці «адказнымі» за вырашэнне названых задач. Разам з тым відавочна асобая роля ў дадзеных адносінах розных груп дысцыплін. Так, сацыяльна-гуманітарным дысыплінам належыць прыярытэтная роля ў фарміраванні сацыяльных кампетэнцый пазнавальнай дзейнасці, у развіцці інтэлектуальнай дапытлівасці, а таксама ў навучанні жыццю – праз агульнае развіццё, творчасць, мастацка-эстэтычную падрыхтоўку і інш.

Падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў да педагагічнай дзейнасці здзяйсняецца комплексна ў працэсе вывучэння агульнапрафесійных дысцыплін, асабліва псіхолага-педагагічных: «Педагогіка», «Агульная псіхалогія», «Узроставая псіхалогія», «Сацыяльная псіхалогія». Менавіта псіхолага-педагагічным дысцыплінам належыць сістэмаўтваральная функцыя ў фарміраванні педагагічнай кампетэнтнасці будучых бібліятэчных спецыялістаў. Пры выкладанні курса «Педагогіка» звяртаецца ўвага на асновы фарміравання асобы як суб’екта выхаваўчага працэсу, выхаваўчую работу ва ўстановах адукацыі і культуры, педагагічнае майстэрства і шляхі яго ўдасканалення. У курсе «Псіхалогія» (агульная, сацыяльная, узроставая) звяртаецца ўвага на псіхалогію асобы, творчае засваенне асобай навакольнага свету, зносіны як сацыяльна-псіхалагічную праблему са-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыялізацыі асобы: стадыі, інстытуты і механізмы сацыялізацыі, сацыяльна-псіхалагічныя якасці асобы; праблемы і метады ўзроставай псіхалогіі; заканамернасці псіхічнага развіцця асобы; асаблівасці псіхічнага развіцця асобы на розных узроставых этапах жыцця чалавека і г. д.

Аб’ём гадзін унутры названых дысцыплін для студэнтаў ФІДК размеркаваны з улікам самастойнай работы студэнтаў наступным чынам: «Педагогіка» – 88 гадзін; «Агульная псіхалогія» – 52 гадзіны; «Сацыяльная псіхалогія» – 38 гадзін; «Узроставая псіхалогія» – 40 гадзін, гэта значыць што цыкл псіхолага-педагагічных дысцыплін вывучаецца на ФІДК у аб’ёме 228 гадзін (з іх аўдыторных – 112 гадзін). У параўнанні з папярэднім адукацыйным стандартам аб’ём гадзін, непасрэдна накіраваных на псіхолага-педагагічную падрыхтоўку бібліятэчных спецыялістаў, значна скараціўся.

Педагагічны патэнцыял зместу агульнапрафесійных, спецыяльных дысцыплін, дысцыплін спецыялізацый у прафесійнай псіхолага-педагагічнай падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў неаднолькавы. Найбольш адпавядаюць прынцыпу пераемнасці педагагічнай падрыхтоўкі такія спецыяльныя дысцыпліны, як «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк», «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы», «Менеджмент бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці», «Маркетынг бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці». Іх вывучэнне дазваляе студэнтам засвоіць канцэпцыі і прынцыпы бібліятэчнага абслугоўвання, яго прыярытэтныя кірункі, сістэму і структуру абслугоўвання, псіхолага-педагагічныя асновы ўзаемадзеяння бібліятэкара з чытачом у працэсе абслугоўвання, асаблівасці індывідуальнага, групавога і франтальнага абслугоўвання, асновай якога сёння з’яўляецца здзяйсненне канцэптуальных падыходаў у сістэме «бібліятэкар – педагог – чытач». Разам з аваладваннем кіраўніцкімі кампетэнцыямі, якія прадугледжваюць выпрацоўку здольнасцей адносна вывучэння і аналізу бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, курсы кіраўніцкага цыклу накіраваны на фарміраванне ўменняў ладзіць эфектыўныя ўнутрыбібліятэчныя камунікацыі, кіраваць прафесійнымі інавацыямі, таксама выкарыстоўваць навуковыя метады маркетынгу па зборы і апрацоўцы эмпірычнай інфармацыі пры даследаванні бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці і г. д., за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сваенне студэнтамі псіхолага-педагагічных аспектаў бібліятэчнага менеджменту і маркетынгу.

Важна падкрэсліць, што прафесійная педагагічная падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў паглыбляецца ў час вывучэння дысцыплін спецыялізацыі. Прыкладам таму з'яўляюцца такія дысцыпліны, як «Дзіцячае чытачазнаўства і бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей, падлеткаў, юнацтва», «Бібліяграфія літаратуры для дзяцей і юнацтва», «Фарміраванне інфармацыйнай культуры школьнікаў», «Сусветная і беларуская дзіцячая літаратура» і інш. (спецыялізацыя «Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і падлеткаў»); «Бібліяпсіхалогія», «Бібліятэчная сацыяномія», «Сацыяльна-культурнае праектаванне ў бібліятэках» і інш. (спецыялізацыя «Культурна-дасугавая дзейнасць бібліятэк»). Вывучэнне названых дысцыплін паглыбляе псіхолага-педагагічныя веды студэнтаў адносна валодання прыёмамі вывучэння і рашэння псіхалагічных праблем чытання і звязаных з ім бібліятэчных зносін, а таксама псіхолага-педагагічных асноў узаемадзеяння бібліятэкара з чытачом у працэсе бібліятэчнага абслугоўвання, абслугоўвання карыстальнікаў з псіхічнымі і фізічнымі асаблівасцямі, прыцягнення іх да чытання, уплыву на дзіцячае чытанне, фарміраванне культуры чытання, выкарыстанне сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу бібліятэрапіі ў рабоце з дзецьмі і г. д. Студэнты таксама засвойваюць вопыт кіравацца ў сваёй дзейнасці дыдактычнымі прынцыпамі, якія разглядаюцца сучаснымі педагогікай і псіхалогіяй у непарыўным адзінстве.

Праведзены намі аналіз зместу педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў паказвае, што сярод найбольш прагрэсіўных тэндэнцый у рашэнні праблемы ўдасканалення зместу прафесійнай адукацыі можна вылучыць інтэграцыю педагагічных і бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў, уменняў і навыкаў у вучэбна-выхаваўчым працэсе. Інтэграцыя можа ажыццяўляцца ў розных формах: псіхолага-педагагічная падрыхтоўка з'яўляецца змястоўным ядром ведаў (педагогіка, псіхалогія і інш.); асноўны змест складае бібліятэчна-педагагічны кампанент (абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк, псіхалогія кіравання, бібліятэчная педагогіка, бібліятэчная псіхалогія, фарміраванне інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк, дзіцячае чытачазнаўства і інш.); у змест часткова ўключаны элементы пе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дагагічнай падрыхтоўкі (бібліятэчны менеджмент, бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і інш.).

Аналіз магчымасцей розных дысцыплін (розных цыклаў, прызначэння) дазваляе зрабіць высновы аб неабходнасці ўдакладнення зместу кожнай дысцыпліны с пазіцый накіраванасці на фарміраванне педагагічнай кампетэнтнасці будучых бібліятэчных спецыялістаў; неабходнасці больш глыбокага вывучэння рэальнай, патэнцыяльнай і прагнастычнай псіхолага-педагагічнай інтэгратыўнасці вывучаемых дысцыплін; вызначэння мэты інтэграцыі як неабходнасці фарміравання прафесійнай накіраванасці, вопыту псіхолага-педагагічнай арыентацыі, якая забяспечвае гатоўнасць да бібліятэчна-педагагічнай дзейнасці як у тыповых сітуацыях, так і ў непрадбачаных.

Інтэграцыя псіхолага-педагагічных ведаў, уменняў і навыкаў у базавы кампанент прафесійнай бібліятэчна-бібліяграфічнай падрыхтоўкі садзейнічае павышэнню матывацыі студэнтаў і як вынік – павышэнню якасці засваення вучэбнага матэрыялу. Асноўнай фігурай у працэсе правядзення інтэгрыраваных заняткаў з'яўляецца сам выкладчык, галоўную ролю адыгрываюць яго прафесійнае метадычнае майстэрства, яго патэнцыял, псіхолага-педагагічная самастойнасць і зацікаўленасць у новых педагагічных тэхналогіях.

Кампетэнтнасны падыход да бібліятэчна-педагагічнай адукацыі патрабуе актыўнага выкарыстання сучасных прадукцыйных тэхналогій, якія актывізуюць мысленне, выхоўваюць інтэлектуальную самастойнасць. Традыцыйныя дыдактычныя інструменты – рэпрадуктыўнае навучанне, заснаванае на дзеяннях па ўзоры – не эфектыўны ў фарміраванні кампетэнцый. Прынцыпы прадукцыйнага навучання павышаюць выніковасць навучання дзякуючы кампанентам вучэбнага працэсу, якія забяспечваюць развіццё асобы: праблема; мэтапалажэнне; распрацоўка альтэрнатыў; дыялог (выкладчык – студэнт); рэфлексія [9].

Змястоўная трансфармацыя вучэбнага працэсу, арыентаваная на развіццё студэнта, прадугледжвае не толькі знаёмства, засваенне зместу пэўных вучэбных дысцыплін, але і актывізацыю яго самастойнай пазнавальнай дзейнасці. У працэсе выкладання гэтых дысцыплін ставіцца задача сфарміраваць не толькі прафесійныя ўменні і навыкі, але і такія якасці, як прафесійная адказнасць, шматварыятыўнасць мыслення, здоль-

насць да творчага вырашэння задач, уменне працаваць у калектыве, камунікатыўныя здольнасці і навыкі прафесійных зносін.

Актыўна-развіваючы характар выкладання спецыяльных дысцыплін знаходзіць сваё адлюстраванне як у змесце, так і ў выкарыстоўваемых актыўных і інтэрактыўных формах навучання, накіраваных на прымяненне і рэалізацыю асобаснага патэнцыялу навучэнцаў. Акрамя лекцый, семінарскіх, традыцыйных лабараторных і практычных заняткаў, усё больш выкарыстоўваюцца ў практыцы выкладання спецыяльных дысцыплін такія актыўныя формы, як ролевыя і дзелавыя гульні, трэнінгі, рашэнне вытворчых сітуацый, дыялогава-дыскусійныя метады, навучанне ў парах, падрыхтоўка мерапрыемстваў для канкрэтнай мэтавай групы карыстальнікаў, метады «кэйсаў», індывідуальныя заданні і інш., якія накіраваны на стымуляванне як інтэлектуальнага, так і асобаснага станаўлення студэнтаў. Гэтыя формы прадугледжваюць таксама развіццё эмацыянальнай сферы будучых спецыялістаў (задаволенасці ад выкананага задання, пачуцця прафесійнай годнасці, упэўненасці ў сабе і самапрыняцця, пазітыўнага стаўлення да сваіх сакурснікаў, будучай прафесійнай дзейнасці, навакольнага свету, матывацыі далейшай самаактуалізацыі і самаўдасканалення).

Такі тып бібліятэчнай адукацыі фарміруе арыентацыю студэнтаў на праблемныя сітуацыі, на самастойны пошук шляхоў вырашэння сітуацый. Безумоўна, гэта патрабуе ад выкладчыка высокага прафесійнага ўзроўню, творчага падыходу да правядзення лекцыйных, семінарскіх, практычных заняткаў, стымулявання актыўнай самастойнай работы студэнтаў з улікам індывідуальных асаблівасцей кожнага студэнта.

Асобасна-арыентаваная мадэль адукацыі, што абапіраецца на прыярытэт асобы, якая развіваецца, стварае вялікія магчымасці для інавацыйнай творчасці пры рашэнні многіх бібліятэчных, педагагічных праблем, пашырае магчымасці самарэалізацыі асобы ў прафесійнай сферы.

У мэтах павышэння практыка-арыентаванага характару працэсу навучання практыкуецца правядзенне заняткаў у рамках вучэбна-навукова-вытворчага комплексу (напрыклад, паміж кафедрай менеджменту ІДС і Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкай імя М. Астроўскага), што, з аднаго боку, дазваляе студэнтам пазнаёміцца з інавацыйнай дзейнасцю бібліятэкі, замацаваць атрыманыя веды, уменні і навыкі, у тым ліку і псіхолага-педа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гагічнага зместу, непасрэдна на практыцы, выкарыстаць сучасную рэсурсную базу бібліятэк і адаптавацца да зносін з карыстальнікамі ў рэальнай працы. З другога боку, устаноўка на развіццё творчасці асобы студэнта прадугледжвае змяненне і характару вучэбных заданняў, вынікі якіх маюць пэўную практычную значнасць для сучаснай дзейнасці бібліятэкі. Гэта, напрыклад, падрыхтоўка студэнтамі бібліяграфічных дапаможнікаў, прэзентацый бібліятэчна-бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, сцэнарыяў мерапрыемстваў, падрыхтоўка праектаў для канкрэтных бібліятэк, правядзенне разнастайных мерапрыемстваў на базе бібліятэк і г. д.

Далейшае развіццё інавацыйных падыходаў да падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі нам бачыцца ў неабходнасці асэнсавання кожным выкладчыкам значнасці інавацыйнага падыходу ва ўсіх відах дзейнасці, стварэнні ўмоў і распрацоўцы сістэмы матывацыі развіцця інавацыйных працэсаў на розных узроўнях – ВНУ, факультэта, кафедры, асобнага выкладчыка; устанаўленні і рэалізацыі міждысцыплінарных сувязей пры выкладанні разнастайных дысцыплін, накіраваных на фарміраванне ў тым ліку і псіхолага-педагагічных кампетэнцый; укараненні інавацыйных педагагічных тэхналогій у працэс выкладання. На нашу думку, інавацыйная адукацыя павінна грунтавацца на індывідуалізацыі і быць скразной, пачынаючы са школы [2, 7].

Такім чынам, на падставе вышэйадзначанага можна канстатаваць, што ў наш час мае канцэптуальнае значэнне пераарыентацыя працэсу навучання шляхам прымянення кампетэнтнаснага падыходу, які праяўляецца ў фарміраванні кампетэнцый – мэтанакіраванага комплексу ведаў, уменняў, навыкаў, асобасных характарыстык – і накіраваны на развіццё навучэнца як прафесіянала і асобы. Дадзены падыход адносіцца да педагагічных інавацый, таму што ўключае навучэнца ў актыўны навучальны працэс з прымяненнем механізмаў самаадукацыі, самаразвіцця, самарэалізацыі.

Пры гэтым мы ўпэўніліся таксама, што пры падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў значная ўвага павінна надавацца педагагічна-прафесійнай падрыхтоўцы, якая базіруецца на авалодванні будучымі прафесіяналамі псіхолага-педагагічнымі кампетэнцыямі. Гэта дазволіць зрабіць спецыяліста запатраба-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваным, павысіць прэстыж прафесіі і бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі наогул.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Белова, С. В.* «Сгоревший» учитель на фоне «Живого» компьютера, или Проекты в образовании: иллюзии и реальность / С. В. Белова // Народное образование. – 2008. – № 1. – С. 122–131.

2. *Бігеза, В. М.* Інавацыйная адукацыйная дзейнасць па бібліяграфічнай падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў вышэйшай адукацыі: навукова-метадычнае забеспячэнне / В. М. Бігеза, С. В. Зыгмантовіч // Навукова-метадычнае і інфармацыйнае суправаджэнне падрыхтоўкі кадраў для сферы культуры і мастацтва: матэрыялы навук.-метад. канф. (3 лютага 2010 г.) / рэдкал.: Р. А. Ровіна (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2010. – С. 15–21.

3. *Витвар, О. И.* Педагогическая компетентность как интегральная характеристика профессионализма специалиста социокультурной сферы / О. И. Витвар // Вестник МГУКИ. – 2009. – № 5. – С. 115–120.

4. *Гендина, Н. И.* Образование для общества знаний и проблемы формирования информационной культуры личности / Н. И. Гендина // НТБ. – 2007. – № 3. – С. 40–48.

5. *Жук, О. Л.* Педагогическая подготовка студентов: компетентностный подход / О. Л. Жук. – Минск : РИВШ, 2009. – 335 с.

6. *Зыгмантовіч, С. В.* Інавацыйныя падыходы да падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі / С. В. Зыгмантовіч // Бібліятэкі і музеі ў сістэме інавацыйнай дзейнасці: матэрыялы міжнарод. навук.-практ. канф.– Мінск : БДУКМ, 2010. – С. 200–210.

7. *Зыгмантовіч, С. В.* Педагагічная падрыхтоўка бібліятэкараў у сістэме вышэйшай адукацыі / С.В. Зыгмантовіч // Сацыяльна-гуманітарныя навукі ў сістэме вышэйшай школы: матэрыялы навук.-метад. канф. – Мінск : БДУ культуры, 2003. – С. 91–92.

8. *Иванова, Г. А.* Профессиональное образование библиотекарей как специалистов по работе с детьми : автореф. дис. … д-ра пед. наук / Г. А. Иванова ; МГУКИ. – М., 2002. – 282 с.

9. *Ли, М. Г.* Проектирование и внедрение образовательных технологий в практику высшей библиотечной школы : автореф. дис…. канд. пед. наук / М. Г. Ли. – Челябинск, 2010. – 26 с.

10. *Немчина, И. М.* Профессионально-педагогическая адаптация студентов и выпускников вузов культуры к работе с читателями-детьми (теория и практика) : автореф. дис. … канд. пед. наук / И. М. Немчина; МГУКИ. – М., 1999. – 16 с.

11. *Никитин, В. А.* Начало социальной педагогики: учеб. пособие / В. А. Никитин. – 2-е изд. – М., 1999. – 178 с.

12. *Паршукова, Г. Б.* Библиотечные дисциплины: подготовка кадров : учеб.-метод. пособие / Г. Б. Паршукова. – М., 2009. – 155 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. *Стрелкова, И. Б.* Об актуальных проблемах непрерывного библиотечного образования: по итогам работы международной Зимней школы / И. Б. Стрелкова // Бібліятэчны свет. – 2003. – № 3. – С. 29–31; Стрелкова, И. Б. Третья международная Зимняя школа: традиции и новации / И. Б. Стрелкова // Бібліятэчны свет. – 2005. – № 3. – С. 27–30.

14. *Стрелкова, И. Б.* Формирование кадровых ресурсов вузовских библиотек Республики Беларусь : автореф. дис. … канд. пед. наук / И. Б. Стрелкова. – Минск, 2009. – 26 с.

15. *Чачко, А. С.* Библиотекарь – актуальная профессия информационного общества / А. С. Чачко // Вестник БАЕ. – 2003. – № 1. – С. 70–73.

16. *Черниченко, В. И.* Профессионально-педагогическая деятельность современного библиотекаря: принцип интеграции / В. И. Черниченко // Библиотеки и ассоциации в меняющемся мире: новые технологии и новые формы сотрудничества : труды конференции. – М., 2001. – Т. 1. – С. 456–458.

17. *Черниченко, В. И.* Теоретические и методические основы профессионально-педагогической подготовки специалистов в вузе культуры и библиотечной работы с подрастающим поколением : автореф. дис. … д-ра пед. наук / В. И. Черниченко; МГУК. – М., 1994. – 32 с.

18. *Чудинова, В. П.* Современная профессиограмма специалиста детской библиотеки как основа совершенствования подготовки кадров по работе с детьми : автореф. дис. … канд. пед. наук / В. П. Чудинова; МГУК. – М., 1996. – 16 с.

19. *Ширяев, С. В.* Формирование психолого-педагогической компетентности менеджера социально-культурной деятельности в условиях социокультурной практики : автореф. дис. … канд. пед. наук / С. В. Ширяев. – Омск, 2008. – 16 с.

## 4.2. Матывацыя бібліятэчнай дзейнасці ў структуры прафесійнага самавызначэння будучых спецыялістаў бібліятэчнай справы

У рэаліях пачатку XXI ст. дастаткова выразна бачна замкнёнае кола праблем бібліятэчнай адукацыі і бібліятэчнай прафесіі: нізкі прэстыж прафесіі бібліятэкара прыводзіць да паступлення на бібліятэчныя спецыяльнасці слабага, немэтанакіраванага абітурыента з няўстойлівым прафесійным самавызначэннем, што дэтэрмінуе кадравыя праблемы ў галіне.

Вывучэнне матывацыі працоўнай дзейнасці работнікаў бібліятэк, пытанняў, звязаных з іх прафесійным самавызначэннем, адаптацыяй на працоўных месцах, пытанняў павышэння кваліфікацыі бібліятэкараў з'яўляецца адным з асноўных кірункаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследаванняў у бібліятэчнай прафесіялогіі (К. Бэйкуэл, Т. А. Жданава, С. Р. Матліна, А. В. Сакалоў, І. Б. Стралкова, Э. Р. Сукіасян і інш.). Не меней значным становіцца і вывучэнне матывацыі выбару прафесіі бібліятэкара студэнтамі, матываў навучання гэтай прафесіі.

Прафесійнае развіццё чалавека антагенетычна звязана з асноўнымі відамі яго дзейнасці, якія адпавядаюць узроставым перыядам. Узроставае развіццё чалавека як суб'екта працы Я. А. Клімаў уяўляе ў выглядзе трох перыядаў (перыяд дашкольнага развіцця, перыяд «выбару прафесіі», перыяд прафесійнай падрыхтоўкі і наступнага станаўлення прафесіянала), у кожным з якіх вылучае і характарызуе стадыі развіцця прафесійнага станаўлення, якія можна разглядаць як этапы прафесійнага самавызначэння [4].

У перыяд «выбару прафесіі» на стадыі аптацыі – 14–18 гадоў – адбываюцца авалоданне сістэмай сацыяльна значных каштоўнасных уяўленняў, ідэалаў (разумовых узораў ладу жыцця, дзейнасці, прафесійнага шляху), актыўнае засваенне сістэмы належных зносін з людзьмі, актыўны самааналіз і суаднясенне сваёй асобы са светам дарослых, спробы рэальнага планавання сваёй будучыні. У гэты час асабліва інтэнсіўна і актыўна фарміруюцца інфармацыйныя асновы маральнай, сацыяльнай і, такім чынам, прафесійнай накіраванасці асобы. Дадзеная стадыя завяршаецца афармленнем спецыфічнага для яе псіхічнага наватвора ў структуры суб'екта дзейнасці (у яго самасвядомасці) – рэалістычнага ўяўлення аб некаторай «рэферэнтнай» прафесійнай супольнасці, у якую яна ўключае сябе ў будучыні.

Прафесійнае самавызначэнне – гэта вызначэнне чалавекам сябе адносна выпрацаваных у грамадстве крытэрыяў прафесіяналізму. Яно пачынаецца з выбару прафесіі, але не заканчваецца на гэтым, бо чалавек на працягу жыцця сутыкаецца з бесперапыннымі прафесійнымі выбарамі. Прафесійнае самавызначэнне – гэта працэс і вынік фарміравання гатоўнасці самастойна планаваць, карэкціраваць і рэалізоўваць перспектывы свайго адукацыйна-прафесійнага «маршруту», выяўляць унутраныя і знешнія праблемы самаразвіцця ў рамках вызначанага часу, прасторы.

Умоўна можна вылучыць наступныя асноўныя тыпы самавызначэння: прафесійнае, жыццёвае і асобаснае. Хутчэй за ўсё для бібліятэкара (як і для прадстаўнікоў іншых гуманітарных і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчых прафесій) асобаснае самавызначэнне будзе звязана, у першую чаргу, з асноўнай справай жыцця, бо ў гэтых прафесіях у спецыяліста ёсць шчаслівая магчымасць рэалізаваць лепшыя свае творчыя памкненні.

Працэс прафесійнага самавызначэння ўключае развіццё самасвядомасці асобы. У педагогіцы сутнасць і функцыі самасвядомасці даследуюцца з пазіцыі працэсу фарміравання асобы, самасвядомасць вывучаецца як працэс, у якім чалавек спазнае сябе і ставіцца да сябе. Самасвядомасць у юнацкім узросце звязана з неабходнасцю ацаніць якасці сваёй асобы з улікам пэўных жыццёвых імкненняў.

Кампанентам цэласнай самасвядомасці асобы з’яўляецца прафесійная самасвядомасць. Прафесійная самасвядомасць студэнтаў фарміруецца дзякуючы развіццю мыслення, самастойнасці і іншых якасцей і ўласцівасцей асобы і выяўляецца ва ўсведамленні сябе як суб’екта будучай прафесійнай дзейнасці. Прафесійную самасвядомасць можна вызначыць як якасць асобы, якая праяўляецца ў накіраванасці суб’екта на самога сябе ў мэтах прафесійнага самавызначэння, суаднясення патрабаванняў прафесіі са сваімі магчымасцямі.

Кампанентамі прафесійнага самавызначэння з’яўляюцца прафесійная матывацыя і прафесійная ідэнтыфікацыя. Па меркаванні Я. Р. Яфрэмава, К. Б. Шыныбаевай, прафесійная ідэнтыфікацыя разумеецца як працэс самаатаясамлівання і атаясамлівання сябе з іншымі прадстаўнікамі прафесійнага асяроддзя (рэальнымі і ідэальнымі) на падставе ўстойлівай эмацыйнай сувязі [2, с. 116]. Вынікам працэсу прафесійнай ідэнтыфікацыі з’яўляецца прафесійная ідэнтычнасць асобы, гэта значыць якасная вызначанасць прафесійнай ролі, пазіцыі. Аб’ектыўным паказчыкам прафесійнай ідэнтычнасці выступае паспяховасць прафесійнай дзейнасці.

Значэнне самаідэнтыфікацыі для бібліятэкара выяўляецца ў стварэнні кагнітыўных канструкцый (асобасна і грамадска значных) і іх параўнанні адносна спецыфікі прафесіі бібліятэкара, а таксама ў стварэнні максімальна камфортных умоў для інтэграцыі ў прафесію. Раскрыццё асобаснага аспекту прафесійнай ідэнтыфікацыі магчыма толькі тады, калі вядома сістэма асобасных сэнсаў бібліятэкара адносна сістэмы прафесійных каштоўнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрмін «матывацыя» ўяўляе сабой больш шырокае паняцце, чым тэрмін «матыў». Матывацыю можна вызначыць як сукупнасць фактараў псіхалагічнага характару, якія тлумачаць паводзіны чалавека, яго накіраванасць і актыўнасць.

Матывацыя абумоўлівае паводзіны і дзейнасць і, тым самым, аказвае ўплыў на прафесійнае самавызначэнне, на задаволенасць чалавека сваёй прафесіяй. Прафесійная матывацыя – гэта дзеянне пэўных стымулаў, якія абумоўліваюць выбар прафесіі і працяглае выкананне абавязкаў, звязаных з гэтай прафесіяй.

Праблема матывацыі бібліятэчнай дзейнасці з'яўляецца адной з найболей складаных у бібліятэчнай прафесіялогіі. Важна разумець, што матывы могуць быць усвядомленымі і асэнсаванымі, а могуць і не ўсведамляцца, – асабліва маладымі людзьмі, якія не маюць дастатковага досведу ў асэнсаванні сваіх паводзін. Вядучым прафесійным матывам з'яўляецца суб'ектыўны вобраз выніку прафесійнай рэалізацыі. Гэты вобраз можа змяняцца; ён можа адпавядаць характарыстыкам прафесіі, а можа супярэчыць ім; і, як ужо было паказана, ён можа знаходзіцца на розных узроўнях усвядомленасці і асэнсавання.

Аналіз матываў, якія ўплываюць на выбар бібліятэчнай прафесіі першакурснікамі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (па выніках даследавання 2010 г.), дазваляе вызначыць іх значнасць:




Калі аб'яднаць матывы, звязаныя са схільнасцямі да бібліятэчнай дзейнасці, цікавасцю да інфармацыі і зносінамі з людзь-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мі, то можна заўважыць, што іх доля ў агульнай структуры матываў даволі вялікая, што дазваляе гаварыць аб прафесійнай накіраванасці асобы многіх першакурснікаў.

Сярод удзельнікаў анкетавання свядома і мэтанакіравана абралі прафесію бібліятэкара-бібліёграфа 53%:




Даследаванні мінулых гадоў [1] сведчаць, что свядомым выбар прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа быў толькі для 19% студэнтаў. Але у 2010/2011 навучальным годзе была і тэндэнцыя зніжэння колькасці паступаючых на бібліятэчныя спецыяльнасці – конкурс пры паступленні на факультэт быў 0,8 чалавека на месца.

На пытанне «Якіх якасцей, на ваш погляд, патрабуе прафесія бібліятэкара-бібліёграфа?» удзельнікі анкетавання стварылі суб'ектыўны вобраз бібліятэкара-бібліёграфа, для якога характэрны: уменне працаваць з літаратурай, уменне мець зносіны з людзьмі, спагадлівасць, уседлівасць, шырокі светапогляд, у меншай ступені – мэтанакіраванасць. Сярод якасцей, якія непасрэдна ёсць у апытваемых для выдатнай працы бібліятэкарам-бібліёграфам, большасць вылучыла: уменне ладзіць зносіны з людзьмі, спагадлівасць, уменне працаваць з літаратурай (інфармацыяй), уседлівасць. Паказаныя даныя сведчаць, што ў большасці студэнтаў незалежна ад матываў выбару прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа ёсць суб'ектыўныя перадумовы паспяховай працы па абранай прафесіі.

Яшчэ адзін фактар – матывацыйны ўзрост. Псіхолагі сцвярджаюць, што наймацнейшай матывацыяй валодаюць маладыя людзі ва ўзросце 20–35 гадоў. 35 гадоў – першы пік кар'еры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасля матывацыя пачынае зніжацца. У шматлікіх выпадках, калі работа не прыносіць маральнага задавальнення, чалавек яе мяняе. Паніжэнне матывацыі часта адбываецца, калі чалавек занадта доўга працуе на адным месцы. Лічыцца мэтазгодным кожныя 4–5 гадоў мяняць месца сваёй працы. Іншы важны фактар захавання матывацыі – пастаянныя навучанне і сама-адукацыя. Інфармацыя, атрыманая падчас навучання, прымушае чалавека рухацца да новых вяршынь. Але найважнейшым фактарам у падтрыманні матывацыі на высокім узроўні з'яўляецца сталы самааналіз сваіх уласных псіхічных і фізічных рэсурсаў і свайго цяперашняга становішча на кар'ерных усходах.

У сувязі з тым, што матывы актуальна не ўсведамляюцца суб'ектам, трэба шукаць ускосны спосаб вызначэння ўзроўню значнасці асобных матываў, якія ўдзельнічаюць у арганізацыі палiматываванай сістэмы прафесійнай дзейнасці. У якасці такога спосабу магчыма вывучэнне пастаноўкі суб'ектам прафесійных мэт і працэсу іх дынамікі ў пэўнай дзейнасці. Мэты – асэнсаваныя, іх сістэма можа быць зафіксавана. Мэты звязаны з матывамі, і па змяненні мэт пры рэалізацыі дзейнасці можна гаварыць і аб зменах у матывацыі.

В. І. Суслава сцвярджае, што найважнейшымі педагагічнымі ўмовамі, якія садзейнічаюць эфектыўнаму фарміраванню матывацыйнага кампанента прафесійнага станаўлення будучых спецыялістаў, з'яўляюцца: 1) усведамленне студэнтамі мэты прафесійнай падрыхтоўкі, якое дазваляе ўплываць на каштоўнасна-сэнсавыя стасункі, што вызначаюць прафесійна-асобасную пазіцыю; 2) псіхолага-педагагічнае суправаджэнне працэсу прафесійнай падрыхтоўкі, што прадугледжвае дыягностыку асобаснага і інтэлектуальнага развіцця, аказанне дапамогі ў вырашэнні розных праблем; 3) практыка-арыентаваны характар навучання, арганізацыя якога дазваляе прайграць прадметны і сацыяльны змест прафесійнай працы і сістэмы прафесійных адносін; 4) развіццё прафесійнай зацікаўленасці, якая падахвочвае да самаразвіцця і самарэалізацыі асобы ў пэўнай практычнай дзейнасці [5, с. 9].

Выбар бібліятэчнай прафесіі ў адпаведнасці з тым або іншым матывам (дзеля чаго?) шмат у чым вызначае і матывы навучання. Калі прыняць да ўвагі, што матыў – гэта не што іншае, як прадмет запатрабавання, то, па даных даследавання



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

першакурснікаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, для будучых бібліятэкараў такімі прадметамі з'яўляюцца: пазнавальная цікавасць да дысцыплін (17,4%), пачуццё абавязку і адказнасці (17,4%), жаданне атрымліваць падвышаную стыпендыю (16,6%), жаданне лепш падрыхтавацца да самастойнай дзейнасці (14,5%), імкненне пазбегнуць нараканняў з боку выкладчыкаў і бацькоў (12,3%), жаданне заняць прэстыжнае месца ў групе, на факультэце, ва ўніверсітэце (9,8%), жаданне атрымаць пахвалу (6,4%), імкненне быць у лідарах сярод аднакурснікаў (5,1%), адсутнасць матываў (0,4%).

Падраздзяленне матываў на вядучыя (дамінантныя) і сітуатыўныя (матывы-стымулы), знешнія і ўнутраныя дазваляе з вялікай доляй верагоднасці меркаваць, што як для будучых бібліятэкараў навучанне, так і для тых бібліятэкараў, якія ўжо працуюць, дзейнасць працякаюць як ланцуг сітуацый, адны з якіх выступаюць як мэтанакіраванае прыцягненне. Мэта дзейнасці і матыў у дадзеным выпадку супадаюць. Іншыя сітуацыі ўспрымаюцца як мэтанакіраваны прымус, калі мэта і матыў не супадаюць. Да мэты бібліятэчнай дзейнасці бібліятэкар у гэтым выпадку можа ставіцца абыякава і нават негатыўна.

У сітуацыях першага тыпу бібліятэкары працуюць з захапленнем, натхнёна і прадуктыўна. У другім выпадку – цяжка, з непазбежнай напругай і звычайна не маюць добрых вынікаў. Але бібліятэчная дзейнасць звычайна дэтэрмінуецца некалькімі матывамі, якія адрозніваюцца па сіле, асабістай і сацыяльнай значнасці. Палiматываванасць бібліятэчнай дзейнасці – з'ява звычайная: бібліятэкар можа добра працаваць дзеля дасягнення высокіх вынікаў, але ў той жа час задавальняць іншыя свае запатрабаванні (прызнанне калег, маральнае і матэрыяльнае заахвочванне і інш.).

Вучэбная дзейнасць дэтэрмінуецца, першым чынам, унутраным матывам, калі пазнавальныя патрэбнасці «сустракаюцца» з прадметам дзейнасці і, у той жа час, самымі рознымі знешнімі матывамі – прэстыжнасці, абавязку, неабходнасці і інш. Матывы інтэлектуальнага плану асэнсаваныя, рэальна дзейсныя. Яны ўсведамляюцца чалавекам як прага да ведаў, неабходнасць у іх прысваенні, імкненне да пашырэння светапогляду, паглыблення, сістэматызацыі ведаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння даследчыкам ужо не прыходзіцца сумнявацца ў тым, што паспяховасць навучання залежыць у асноўным ад развіцця вучэбнай матывацыі, а не толькі ад прыродных здольнасцей. Пры вызначаных умовах (у прыватнасці, пры высокай памкнёнасці асобы да пэўнай дзейнасці) можа ўключацца так званы кампенсаторны механізм. Недахоп здольнасцей пры гэтым папаўняецца развіццём матывацыйнай сферы (цікавасць да прадмета, усвядомленасць выбару прафесіі), і студэнт дамагаецца значных поспехаў.

Даследаванні паказваюць, што моцныя і слабыя студэнты адрозніваюцца зусім не па інтэлектуальных паказчыках, а па тым, у якой ступені ў іх развітая прафесійная матывацыя. Вядома, гэта не азначае, што здольнасці не з'яўляюцца фактарам вучэбнай дзейнасці. Падобнае можна растлумачыць тым, што сістэма конкурснага адбору ў ВНУ, так або інакш, праводзіць селекцыю абітурыентаў на ўзроўні агульных інтэлектуальных здольнасцей. Тыя, хто вытрымлівае адбор і трапляе ў лік першакурснікаў, у цэлым валодаюць прыкладна аднолькавымі здольнасцямі. У гэтым выпадку на першае месца выступае фактар прафесійнай матывацыі; адну з кіроўных роляў у фарміраванні «выдатнікаў» пачынае адыгрываць сістэма ўнутраных падахвочванняў асобы да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ў ВНУ. У самой сферы прафесійнай матывацыі найважнейшую ролю адыгрывае станоўчае стаўленне да прафесіі, паколькі гэты матыў звязаны з канчатковымі мэтамі навучання.

Калі студэнт разбіраецца ў тым, што за прафесію ён выбраў, і лічыць яе годнай і значнай для грамадства, гэта, безумоўна, уплывае на тое, як складаецца яго навучанне. Матывы з'яўляюцца, як вядома, фактарам зацікаўленага стаўлення да вучобы як асновы прафесійнай дзейнасці. Можна сцвярджаць, што актыўным у прафесійным навучанні будзе той студэнт, які ўсвядоміць патрэбу ў ведах, неабходных у будучай прафесійнай дзейнасці, а сваю прафесію ўсвядоміць як адзіную або асноўную крыніцу задавальнення сваіх матэрыяльных і духоўных запатрабаванняў.

Паспяховае рашэнне праблем прафесійнага самавызначэння студэнтаў прадугледжвае сфарміраванасць унутранай гатоўнасці да ўсвядомленай і самастойнай пабудовы, карэкціроўкі і рэалізацыі перспектыў свайго развіцця (адэкватны выбар жыццёвага шляху, у тым ліку прафесійнага) і гатоўнасці разглядаць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сябе як асобу, якая развіваецца ў часе і самастойна знаходзіць асобасна значныя сэнсы ў пэўнай прафесійнай дзейнасці (матывацыя да абранай дзейнасці).

Працэс прафесійнага станаўлення прадугледжвае фарміраванне ў свядомасці, уяўленнях студэнтаў прывабнага вобраза спецыяліста і адначасова фарміраванне на гэтай аснове яго прафесійнай самаідэнтыфікацыі. Асноўнымі складнікамі механізма самаідэнтыфікацыі выступаюць станоўчыя, зацікаўленыя адносіны студэнта да выбранай прафесіі, успрыняцце яе як умовы самаразвіцця і жыццёвай самарэалізацыі, усебаковае вывучэнне яе спецыфікі, мэт і значнасці ў грамадскім развіцці, выяўленне ўмоў паспяховага ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці, асэнсаванне сваіх прафесійных магчымасцей і адэкватнае суаднясенне сябе з канкрэтна прафесійна значнымі характарыстыкамі.

Такім чынам, самаідэнтыфікацыя выконвае функцыі інтэграцыі базавых прафесійных і асобасных характарыстык будучага спецыяліста, устараняе абязлічанасць, фармалізм працэсу навучання і становіцца важным фактарам фарміравання сацыяльнай і прафесійнай сталасці асобы.

Педагагічная сістэма ВНУ павінна стымуляваць самаідэнтыфікацыю студэнта. Апошняя разгортваецца ў трох вымярэннях як духоўна-светапоглядная, камунікатыўная і прафесійная самаідэнтыфікацыя. У сваю чаргу, прафесійная самаідэнтыфікацыя вызначаецца як працэс эмацыянальна-кагнітыўнага атаясамлівання асобы з будучай прафесійнай дзейнасцю, успрыняцце сябе як актыўнага суб’екта гэтай дзейнасці. Гэта своеасаблівае паглыбленне, перанясенне сябе ў прастору, абставіны будучай сферы дзейнасці, што вядзе да глыбокага разумення і засваення яе ўнутранай логікі, місіі, прызначэння, а таксама забяспечвае самапазнанне асобы. Вядучай дамінантай у дадзеным працэсе з’яўляецца не прыняцце суб’ектам зададзенага знешняга свету прафесійнай дзейнасці як мадэлі пэўных паводзін, а выяўленне ў ім асабістага сэнсу, раскрыццё перспектыў для праяўлення асобаснай унікальнай сутнасці і каштоўнасці.

Вырашэнню гэтай задачы спрыяе ўкараненне ў практыку педагагічнай дзейнасці сучасных педагагічных канцэпцый падрыхтоўкі спецыялістаў, і ў прыватнасці асобасна-арыентаванай, кампетэнтнаснай, калі развіццё асобы студэнта разгля-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даецца як фундаментальная аснова яго прафесійнай і жыццёвай самаарганізацыі.

У кантэксце паказаных палажэнняў прадстаўляецца неабходным засяродзіць увагу на двух аспектах: па-першае, што менавіта перад выкладчыкамі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый стаіць задача ўжо ў працэсе вучэбнага, выхаваўчага працэсу сфарміраваць поўны і адэкватны вобраз спецыяліста-прафесіянала, раскрыць сацыяльную запатрабаванасць прафесіі бібліятэкара, сфарміраваць дамінантную матывацыю да паспяховай пазнавальнай і прафесійнай дзейнасці, а, па-другое, актуальным з'яўляецца выяўленне педагагічна найбольш мэтазгодных падыходаў да арганізацыі прафесійнай самаідэнтыфікацыі будучых бібліятэкараў на працягу падрыхтоўкі ў навучальнай установе. Да такой высновы прыводзяць як даныя даследаванняў абітурыентаў аб іх уяўленні наконт прывабнасці прафесіі бібліятэкара, абмежаваныя такімі характарыстыкамі, як магчымасць чытаць розную літаратуру, атрымліваць любую інфармацыю, мець зносіны з іншымі людзьмі, так і вынікі даследаванняў аб іміджы бібліятэк, бібліятэкараў і бібліятэчнай прафесіі ў грамадстве, які мала змяніўся на працягу цэлага стагоддзя і застаецца міфалагізаваным і незразумелым для прадстаўнікоў іншых прафесій і насельніцтва.

У сувязі з адзначаным спецыяльную ўвагу неабходна надаваць працы са студэнтамі першага курса, працэсу іх адаптацыі да ўмоў ВНУ. Выкладчыкам неабходна імкнуцца забяспечыць іх прафесійную адаптацыю да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, да зместу і асобных кампанентаў вучэбнага працэсу, асаблівасцей выбранай прафесіі ў адпаведнасці з асобаснымі якасцямі і каштоўнаснымі арыентацыямі; дыдактычную адаптацыю, якая спрые пераемнасці ў сістэме «школа – ВНУ», фарміраванне самастойнасці ў вучэбнай і навуковай дзейнасці, патрэбы ў самакантролі, самаадукацыі і самавыхаванні; сацыяльна-псіхалагічную адаптацыю шляхам фарміравання добрых міжасобасных стасункаў з членамі вучэбнай групы, студэнтамі старэйшых курсаў факультэта, выкладчыкамі [3].

Значную ролю ў рэалізацыі гэтых форм адаптацыі павінны адыграць: курс «Уводзіны ў спецыяльнасць», прафесійна-выхаваўчая накіраванасць выкладання спецыяльных дысцыплін як на змястоўным, так і на працэсуальным узроўнях, выхаваўчая работа куратараў, спецыяльных кафедр са студэнтамі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Улічваючы той факт, што ў курсе «Уводзіны ў спецыяльнасць» толькі нязначная колькасць гадзін адводзіцца на знаёмства студэнтаў з будучай прафесіяй, мяркуюцца неабходнымі распрацоўка і ўвядзенне ў вучэбны план такога курса, як «Бібліятэчная прафесіялогія». Прапануемая дысцыпліна магла б даць студэнтам комплекснае ўяўленне аб самой навуцы «бібліятэчная прафесіялогія», а таксама гісторыі бібліятэчнай прафесіі, ролі і месцы гэтай прафесіі ў грамадстве ў розныя перыяды, яе сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцях, ведах, уменнях, навыках, асабістых якасцях, якія патрабуюцца для бібліятэкара-прафесіянала, аб арыентацыі на прафесію. Значная ўвага пры выкладанні курса можа быць удзелена і пытанням бібліятэчнай прафесіяналізацыі: раскрыццю кірункаў фарміравання бібліятэчнага спецыяліста шляхам розных форм арганізаванага навучання і паслядыпломнага прафесійнага ўдасканалення і шляхам фарміравання прафесійнай свядомасці і самасвядомасці кожнага спецыяліста, адкрыцця магчымасцей дасягнення ў прафесіі майстэрства, высокага прафесіяналізму, творчасці. Важнае месца зоймуць таксама і пытанні прафесійнай культуры бібліятэкара (этычнай, інфармацыйнай, псіхолага-педагагічнай, экалагічнай, прававой, эканамічнай); пытанні функцыянавання прафесійных камунікацый у бібліятэчнай сферы. Такім чынам, мэта гэтага курса – фарміраванне ў студэнтаў прафесійнай свядомасці, глыбокага разумення сутнасці, значнасці, норм і асаблівасцей бібліятэчнай прафесіі. Курс прадугледжвае не толькі тэарэтычную і практычную падрыхтоўку, але і накіраваны на прывіццё любові да прафесіі бібліятэкара, кампенсацыю слабай інфармаванасці студэнтаў у давузаўскі перыяд пры прафесійным самавызначэнні.

Адначасова з набыццём ведаў аб вобразе прафесіянала неабходна забяспечыць яго напаўненне асобасным сэнсам, эмацыянальным складнікам, спалучыць з назапашаным вопытам суб’екта, што з’яўляецца базай для цэласнага ўяўлення свайго прафесійнага шляху кожным студэнтам, калі грамадскае і асабістае выступаюць як узаемазвязаныя і ўзаемастымулюючыя кампаненты і з’яўляюцца асновай фарміравання вобраза Я-прафесіянал.

Напрамкамі фарміравання вобраза прафесіянала як умовы для ажыццяўлення самаідэнтыфікацыі студэнтаў сёння на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларуска-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў выступаюць педагагічна мэтанакіраваныя падыходы, прыёмы і метады: асобасна-дзейнасны падыход да арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу; праектны метад навучання; выкарыстанне актыўных форм навучання (дзелавая гульня, рашэнне вытворчых, сітуацыйных задач, публічная абарона падрыхтаваных праектаў і інш.), а таксама форм вучэбнай дзейнасці, арыентаваных на калектыўную (камандную) падрыхтоўку і абмеркаванне, якія дазваляюць комплексна развіваць пазнавальны, эмацыянальны, валявы, матывацыйны складнікі псіхічнай сферы студэнтаў; практыка-арыентаваная тэматыка розных відаў заданняў, падрыхтоўка праектаў, курсавых, дыпломных работ па заказах бібліятэк і выкарыстанне вынікаў вучэбнай дзейнасці ў практыцы работы бібліятэк краіны; правядзенне заняткаў на базе лепшых бібліятэк краіны ў межах функцыянавання вучэбна-навукова-вытворчых комплексаў; падрыхтоўка студэнтамі эсэ, прэзентацый аб бібліятэчнай прафесіі, паслугах бібліятэк, рэкламнай інфармацыі аб бібліятэках, бібліятэкарах для СМІ, удзел у прафарыентацыйнай рабоце; сустрэчы з вядучымі спецыялістамі бібліятэчнай сферы як нашай краіны, так і замежных; правядзенне выхаваўчых, культурна-масавых, адукацыйных мерапрыемстваў студэнтамі-старшакурснікамі для студэнтаў першага курса («Пасвячэнне ў студэнты», «Першаліст», «Дзень факультэта»), вучняў школ і інш.

Пэўныя ўяўленні аб выніковасці работы факультэта ў разглядаемым кірунку могуць даць вынікі лакальных сацыялагічных даследаванняў, якія характарызуюць станоўчую дынаміку змянення задаволенасці выпускнікоў і маладых спецыялістаў выбранай спецыяльнасцю: у 65,8% рэспандэнтаў уяўленні аб спецыяльнасці на працягу вучобы змяніліся ў лепшы бок, ласны выбар лічаць сапраўдным 65,5%; працягваць работу па спецыяльнасці плануюць 60% маладых спецыялістаў [3].

Відавочна, што ў кола праблем, звязаных з вывучэннем стаўлення студэнтаў да выбранай прафесіі, павінен быць уключаны цэлы шэраг пытанняў. Гэта задаволенасць прафесіяй; дынаміка задаволенасці прафесіяй ад курса да курса; фактары, якія ўплываюць на фарміраванне задаволенасці: сацыяльна-псіхалагічныя, псіхолага-педагагічныя, дыферэнцыяльна-псіхалагічныя, у тым ліку і полаўзроставыя; праблемы прафесійнай матывацыі, або, іншымі словамі, сістэма і іерархія матываў, якія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вызначаюць пазітыўнае або негатыўнае стаўленне да выбранай прафесіі.

Стаўленне да прафесіі, матывы яе выбару (якія адлюстроўваюць запатрабаванні, інтарэсы, перакананні, ідэалы) – надзвычай важныя (а пры некаторых умовах і вызначальныя) фактары. У. Д. Шадрыкаў заўважыў, што прыняцце прафесіі параджае жаданне выканаць яе вызначаным спосабам, параджае вызначаную дэтэрмінуючую тэндэнцыю і служыць зыходным момантам фарміравання псіхалагічнай сістэмы дзейнасці [1, с. 8].

Такім чынам, можна стварыць абагульнены партрэт матыву выбару прафесіі «бібліятэкар-бібліёграф». Згодна з указаннямі методыкі вызначэння асноўных матываў выбару прафесіі Я. М. Паўлюценкава заўважым, што значнымі для студэнтаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў пры выбары прафесіі бібліятэкара з'яўляюцца сацыяльныя, маральныя, эстэтычныя, пазнавальныя, творчыя матывы. Разам з тым даволі значнымі з'явіліся і ўтылітарныя матывы выбару прафесіі. На сучасным этапе цікавасць да вышэйшай адукацыі сярод моладзі, і асабліва ў сферы інфармацыйна-бібліятэчнай адукацыі, на жаль, мае прагматычную аснову і не можа ў поўнай меры спрыяць фарміраванню вучэбна-прафесійнай матывацыі і прафесійнай накіраванасці будучых спецыялістаў. Дыплом аб вышэйшай адукацыі для студэнтаў набывае ўсё больш вялікую каштоўнасць, а каштоўнасць ведаў падае. Таму, як ніколі, значнай з'яўляецца работа выкладчыкаў факультэта па фарміраванні ў студэнтаў паважлівых адносін да прафесіі бібліятэкара, дзейнасці, якую ён выконвае, мэт і задач, якія кіруюць прафесійнай дзейнасцю.

Сёння адзначаецца крызіс бібліятэкі як сацыяльнага інстытута, падае прэстыж бібліятэчнай прафесіі, у маладых спецыялістаў бібліятэк даволі часта ў структуры самаідэнтыфікацыі не назіраецца прафесійны элемент. Тым не менш у тэорыі сінэргетыкі паказваецца, што станаўленне мацнейшай, новай сістэмы адбываецца ва ўмовах яе адкрытасці, знаходжання ў крызісным, крытычным або біфуркацыйным стане, які характарызуецца няўстойлівасцю, нелінейнасцю. Пры гэтым новая структура падчас эвалюцый і суправаджальных адхіленняў, выпадковасцей павінна самастойна «выжыць», каб дасягнуць належнай устойлівасці. Самаарганізацыя, у тым ліку і бібліятэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кі, і бібліятэкара, і студэнта бібліятэчнай спецыяльнасці, – гэта ўласцівасць любой сістэмы да самаразвіцця праз выдзяленне з сябе новых, больш жыццеўстойлівых структур і, адпаведна, якасна новых матываў, ідэй, сэнсаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Диагностические* методики выявления профессиональных склонностей учащихся / сост. В. Д. Скаковский, А. Н. Беленков. – Минск : РИВШ, 2007. – 97 с.

2. *Ефремов, Е. Г.* Феномен профессиональной идентификации и его динамика в период профессионального обучения / Е. Г. Ефремов, К. Б. Шиныбаева // Сибирский психологический журнал. – 1999. – № 11. – С. 114–121.

3. *Зыгмантович, С. В.* Мотивация выбора профессии библиотекаря и профориентационная работа / С. В. Зыгмантович // Библиотечное дело – 2004: всеобщая доступность информации : материалы IX Междунар. науч. конф. (Москва, 22–24 апреля 2004 г.). – М., 2004. – С. 47–49.

4. *Климов, Е. А.* Психология профессионального самоопределения / Е. А. Климов. – Ростов н/Д, 1996. – 512 с.

5. *Суслова, О. И.* Формирование мотивационного компонента профессионального становления будущих педагогов-психологов : автореф. дис. … канд. пед. наук / О. И. Суслова. – Саратов, 2007. – 24 с.

## 4.3. Педагагічныя праблемы прафесійнай адаптацыі бібліятэчнага персаналу

Напрыканцы XX ст. наша грамадства ўступіла ў эпоху глабальнай інфарматызацыі. Інфармацыйнае грамадства – новая гістарычная фаза развіцця цывілізацыі, дзе галоўным прадуктам вытворчасці з’яўляюцца інфармацыя і веды. Глыбокія сацыяльна-палітычныя, інфармацыйныя, культурныя і эканамічныя змены, што адбываюцца ў беларускім грамадстве, развіццё рыначнай эканомікі абумовілі змены ва ўмовах існавання ўсіх сацыяльных інстытутаў, у тым ліку і бібліятэк. У новай эканамічнай сітуацыі неад’емным элементам становяцца змены і пераўтварэнні ва ўсіх сферах жыццядзейнасці.

Перад сучаснымі бібліятэкамі, з аднаго боку, стаіць задача захавання сябе як сацыяльнага інстытута, які выконвае традыцыйныя функцыі арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання. З другога боку, з развіццём інфармацыйна-тэхналагічнага асяроддзя, што характарызуецца інфарматызацыяй усіх сфер вы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчасці і кіравання, дыверсіфікацыяй інфармацыйных патрэбнасцей, узрастаючымі магчымасцямі доступу да інфармацыі, перад бібліятэкамі паўстаюць новыя важныя і складаныя задачы. Гэта і фарміраванне размеркаваных інфармацыйных рэсурсаў, уваходжанне ў адзіную інфармацыйную прастору, выхад на новы тэхналагічны і якасны ўзровень працэсаў атрымання, апрацоўкі і размеркавання ствараемых інфармацыйных рэсурсаў. Навуковыя бібліятэкі, якія займаюцца акумуляцыяй і распаўсюджаннем навукова-тэхнічнай інфармацыі, з'яўляюцца неад'емнай часткай і адначасова – неабходнай умовай развіцця інавацыйнай дзейнасці. Сучасная прафесійная сітуацыя сведчыць аб павышэнні актуальнасці інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці ў грамадстве і ў той жа час – аб яе больш складаным характары. Бібліятэчныя спецыялісты вымушаны прымаць новыя ўмовы дзейнасці і непазбежна праходзіць працэсы адаптацыі. Вывучэнне пытанняў прафесійнай адаптацыі спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы ва ўмовах узрастання інтэнсіўнасці змен і павышэння складанасці інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці заслугоўвае асобай увагі з боку даследчыкаў і практыкаў. Эфектыўная адаптацыя ўяўляе сабой адну з найважнейшых перадумоў паспяховай прафесійнай дзейнасці.

Прафесійная адаптацыя разглядаецца як працэс узаемнага прыстасавання супрацоўніка і арганізацыі. Аднак існуе шэраг разнастайных падыходаў да разгляду і трактоўкі феномена прафесійнай адаптацыі. Найбольш дакладны і абгрунтаваны падыход, на наш погляд, належыць такім навукоўцам, як Ю. А. Александроўскі, К. А. Абульханава-Слаўская, П. К. Анохін, М. А. Бернштэйн, М. І. Дзьячэнка, Л. А. Кандыбовіч, Я. А. Клімаў, Л. Ф. Мірзаянава, У. М. Мясішчаў, А. А. Рэан і інш. Па іх разуменні, прафесійная адаптацыя не зводзіцца толькі да ўзаемнага прыстасавання работніка і арганізацыі. Акцэнт ставіцца на актыўным, мэтанакіраваным узаемным прыстасаванні асобы і прафесійнага асяроддзя, стварэнні новых стэрэатыпаў, фіксаваных спосабаў паводзін на падставе перабудовы наяўных уласцівасцей і якасцей асобы.

Грунтуючыся на дадзеным падыходзе, мы ў сваім даследаванні разглядаем прафесійную адаптацыю бібліятэкараў навуковых бібліятэк як актыўны працэс прыстасавання асобы бібліятэкара да новых, зменлівых умоў прафесійнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дадзены працэс з’яўляецца крыніцай фарміравання комплексу ведаў, якасцей, уменняў і навыкаў, у выніку чаго асоба дасягае стану адаптаванасці да сацыяльна-вытворчых умоў працы, што дазваляе ёй выконваць з пэўным поспехам сваю прафесійна-функцыянальную ролю. Больш таго, сама адаптацыя з’яўляецца стымулам для развіцця асобы.

Адаптацыя да прафесійнай дзейнасці ўяўляе сабой складаную і шматбаковую з’яву, утрымлівае разнастайныя аспекты ўзаемнага прыстасавання адаптанта і адаптуючага асяроддзя, таму дастаткова складаным уяўляецца выбар крытэрыя да яе класіфікацыі. Асновай класіфікацыі відаў прафесійнай адаптацыі мы прапануем канцэптуальныя палажэнні феномена адаптацыі з пункту гледжання выдзеленых намі трох асноўных аспектаў – працэсу, выніку і крыніцы фарміравання новых якасцей адаптанта (гл. табл.).

Табліца. Класіфікацыя відаў прафесійнай адаптацыі

| Асновы класіфікацыі | Віды адаптацыі | Змест |
|---|---|---|
| У адносінах суб’ект – аб’ект | Адаптацыя работніка | Працес прыстасавання работніка да арганізацыі |
| | Адаптацыя арганізацыі | Працэс прыстасавання прафесійнага асяроддзя да работніка |
| Па дынаміцы ўзаемадзеяння | Актыўная | Удзельнік адаптацыі імкнецца ўздзейнічаць на асяроддзе з тым, каб змяніць яго |
| | Пасіўная | Работнік, альбо арганізацыя, не імкнецца да зменаў у прафесійным асяроддзі, не ўздзейнічае на яго |
| Па выніках уздзеяння | Прагрэсіўная | На ўдзельніка адаптацыі было аказана станоўчае ўздзеянне |
| | Рэгрэсіўная | Адаптацыя да асяроддзя з адмоўным зместам |
| Па ўзроўні | Першасная | Адаптацыя работніка без працоўнага вопыту на этапе ўваходжання ў прафесійнае асяроддзе |
| | Другасная | Адаптацыя работнікаў, маючых працоўны стаж |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| Па сферы ўздзеяння зменлівых умоў дзейнасці | Кіраўнічая адаптацыя | Адаптацыя да асаблівасцей кіраўніцкай дзейнасці работнікаў, прызначаных на кіраўніцкую пасаду |
| | Да новай пасады | Увядзенне работніка ў новую пасаду |
| | Да паніжэння ў пасадзе | Адаптацыя работнікаў, паніжаных у пасадзе |
| | Рэадаптацыя | Адаптацыя работнікаў, зноў прыступіўшых да выканання сваіх абавязкаў (жанчын пасля дэкрэтнага адпачынку, работнікаў пасля доўгатэрміновых камандзіровак і г. д.) |
| | Да звальнення | Адаптацыя звальняемых работнікаў (пошук новых працоўных месцаў, арганізацыя падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі і г.д.) |
| Па выніках адаптацыі | Поўная | Характарызуецца высокімі паказчыкамі адаптацыі работніка ва ўсіх яе аспектах |
| | Частковая | Работнік прыстасаваўся толькі да асобных аспектаў прафесійнага асяроддзя |
| | Дэзадаптацыя | Работнік не змог прыстасавацца ні да аднаго з аспектаў работы ў арганізацыі |
| Па крытэрыі – аспекты прафесійнага асяроддзя | Псіхафізіялагічная | Прыстасаванне да новых фізічных і псіхалагічных нагрузак, фізіялагічных умоў працы |
| | Сацыяльна-псіхалагічная | Уключэнне ў сістэму ўзаемаадносін калектыву з яго традыцыямі, сістэмай каштоўнасцей і г. д. |
| | Прафесійная | Непасрэднае засваенне прафесійнай дзейнасці, набыццё неабходных практычных ведаў і навыкаў |
| | Арганізацыйная | Прыняцце свайго арганізацыйнага статусу ў бібліятэцы, яе структуры, эканамічных механізмаў, сістэмы матывацыі, кіраўніцкіх механізмаў |
| | Асобасная | Прадугледжвае асабісты рост, самаразвіццё, імкненне да далейшага інтэлектуальнага, фізічнага і маральна-этычнага самаўдасканалення |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фактычна адаптацыйныя працэсы разгортваюцца на розных этапах прафесійнага развіцця асобы бібліятэчнага спецыяліста. Прафесійная адаптацыя пачынаецца ў перыяд прафесійнай падрыхтоўкі, калі не толькі засвойваюцца веды, навыкі, правілы і нормы паводзін, але складаецца ўласцівы бібліятэчным работнікам лад працоўнага жыцця. З неабходнасцю адаптацыі чалавек сутыкаецца і на этапе ўваходжання ў прафесійную дзейнасць. Затым узнікае неабходнасць адаптацыі да зменлівых умоў рэалізацыі дзейнасці, якія могуць быць звязаны з перамяшчэннямі па кар'ернай лесвіцы, зменамі прафесійных роляў, з арганізацыйнымі пераўтварэннямі ў бібліятэцы, удасканаленнямі і інавацыямі ў тэхналогіях і г. д. Ва ўсіх выпадках адаптацыя можа спадарожнічаць са значнымі затратамі інтэлектуальных і фізічных сіл, нервова-псіхічнай энергіі, з неабходнасцю засваення новых ведаў. Усё гэта патрабуе распрацоўкі адаптацыйных мерапрыемстваў, якія дазваляюць прадухіліць альбо вырашыць праблемы, якія ўзнікаюць у ходзе адаптацыі работніка.

У якасці адаптацыйных мерапрыемстваў традыцыйна выкарыстоўваецца навучанне супрацоўнікаў. Распрацоўка эфектыўнай праграмы навучання ў працэсе адаптацыі патрабуе разумення сутнасці навучання дарослых, авалодання тэорыяй навучання, ведання патрабаванняў да эфектыўнасці, розніцы паміж фармальным і нефармальным навучаннем, асэнсавання ролі навучання на рабочым месцы, разумення бесперапыннага развіцця, ідэі самакіруемага навучання. Такім чынам, арганізацыя эфектыўнага навучання ў працэсе прафесійнай адаптацыі бібліятэкараў навуковых бібліятэк павінна будавацца на сучасных дасягненнях педагогікі дарослых. Істотны ўклад у развіццё тэорыі і практыкі адукацыі дарослых унеслі замежныя навукоўцы Дж. Дзіві, Э. Ліндэман, М. Ш. Ноулз, М. Тайт, Э. Гусерль, Р. Ган'е, Д. Мезіраў, П. Жарвіс, Д. Колб, П. Фрэйрэ і інш. Вельмі поўны і глыбокі аналіз замежных даследаванняў у дадзеным напрамку быў праведзены расійскім навукоўцам і педагогам С. І. Змеевым, якога па праву лічаць заснавальнікам андрагогікі ў Расіі.

Асноўнымі мэтамі адукацыі дарослых з'яўляюцца: забеспячэнне сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці і мабільнасці дарослых; аказанне дапамогі ў асэнсаванні працэсаў, што адбываюцца ў грамадстве і свеце; стымуляванне фарміравання

супольнасці на розных этапах жыцця; фарміраванне адчування незавершанасці і незавяршаемасці адукацыйнага працэсу. Адукацыя дарослых разглядаецца як адзін з важнейшых фактараў грамадскага прагрэсу і развіцця асобы.

Аналіз асэнсавання паняцця «дарослы чалавек», вызначэнне адрозненняў паміж навучэнцам дарослым і недарослым дазваляе акрэсліць асаблівасці навучання дарослых. Так, для арганізацыі эфектыўнага навучання ў бібліятэках і пры распрацоўцы адукацыйных праграм неабходна ўлічваць наступныя асаблівасці:

– дарослы чалавек павінен быць матываваны да навучання, бачыць яго сэнс, абгрунтоўваць для сябе яго неабходнасць; мець жаданне вучыцца і быць упэўненым ва ўласных магчымасцях авалодаць гэтымі ведамі і навыкамі;

– навучэнец павінен атрымліваць задавальненне ад навучання, быць упэўненым у своечасовасці, актуальнасці і неабходнасці навучання; разумець практычную накіраванасць навучання, бачыць шляхі ўжывання атрымліваемых ведаў і навыкаў у жыцці;

– варта выдзяляць час на засваенне новых навыкаў, бо дарослы чалавек спалучае тое, што вывучаецца, з мінулым, наяўным і будучым вопытам;

– правільныя паводзіны навучэнца павінны падмацоўвацца. У доўгатэрміновых праграмах навучання патрабуюцца прамежкавыя крокі, каб навучэнец замацоўваў веды самастойнымі практычнымі дзеяннямі;

– у навучэнца павінна быць кіраўніцтва і зваротная сувязь аб тым, як ён вучыцца;

– навучанне – актыўны, а не пасіўны працэс. Неабходна, каб навучэнцы былі ў захапленні ад сваіх выкладчыкаў, калег і прадметаў праграмы навучання;

– метады навучання павінны быць разнастайнымі;

– неабходна разумець, што існуюць розныя ўзроўні навучання і што яны патрабуюць розных метадаў і займаюць розны час.

Сёння існуе шэраг прычын, па якіх навучанне на працоўным месцы становіцца актуальным працэсам для многіх арганізацый, у тым ліку і для бібліятэк. Па-першае, яно дазваляе непасрэдна на працоўным месцы праводзіць розныя віды прафесійнага навучання; па-другое, навучанне становіцца штодзённай часткай работы і ўбудоўваецца ў руцінныя задачы. Супрацоў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нікі развіваюць навыкі, веды, калі сутыкаюцца са складанымі праблемамі ў працэсе работы. Гэта значыць – навучанне не патрабуе асобнага часу, па-за межамі вытворчай дзейнасці, яно становіцца сутнасцю вытворчай дзейнасці. Такое навучанне па праву можна назваць бесперапынным навучаннем.

У якасці форм педагагічнага суправаджэння працэсу адаптацыі мы прапануем выкарыстоўваць такія метады навучання на працоўным месцы, як budding – уключэнне навучэнца ў працэс дзейнасці іншага чалавека, shadowing – назіранне за працэсам работы, secondment – стажыроўкі, ратацыі, mentoring – настаўніцтва, coaching – коўчынг, цьютарства, трэнерства. Стажыроўкі, ратацыі, настаўніцтва актыўна выкарыстоўваюцца і сёння ў навуковых бібліятэках Беларусі як метад навучання ў працэсе прафесійнай адаптацыі як першаснай, так і другаснай, у той час як цьютарства, коўчынг – з’явы дастаткова новыя для бібліятэчнай практыкі. Цьютарства прадугледжвае стварэнне індывідуальнай адукацыйнай праграмы, а цьютар – выступае ў якасці пасрэдніка, які суправаджае працэс навучання. Метады коўчынга (ад англійскага «coaching» – «трэніроўка» альбо «сумеснае дасягненне») заключаюцца ў эфектыўных пытаннях, актыўным слуханні, захапленні і зваротнай сувязі (М. Армстронг. Практика управления человеческими ресурсами: пер. с англ. / под ред. С. К. Мордовина. – СПб. : Питер, 2005. – 832 с. : ил. – (Классика МВА)). Асноўнае адрозненне настаўніцтва ад коўчынга заключаецца ў тым, што коўчынг развівае патэнцыял асобы, а настаўніцтва прадугледжвае рабіць так, як цябе навучылі. Настаўніцтва мэтазгодна выкарыстоўваць пры першаснай адаптацыі, а коўчынг з’яўляецца эфектыўным метадам пры кіраўніцкай адаптацыі.

Існаванне разнастайных метадаў навучання, якія можна выкарыстоўваць у якасці адаптацыйных мерапрыемстваў у навуковых бібліятэках, абумоўлівае неабходнасць валодання адукацыйнымі тэхналогіямі і педагагічнымі кампетэнцыямі непасрэднымі кіраўнікамі, метадыстамі і іншымі супрацоўнікамі бібліятэкі, якія займаюцца навучаннем.

## 4.4. Фарміраванне камунікатыўнай кампетэнтнасці як фактар прафесійнай самарэалізацыі бібліятэкара

Рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу ў сферы вышэйшай адукацыі ўяўляе сабой сістэму патрабаванняў да арганізацыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыйнага працэсу такім чынам, каб ён садзейнічаў практыка-арыентаванаму характару прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў, узмацненню ролі іх самастойнай дзейнасці, стварэнню ўмоў для вырашэння задач і сітуацый, якія імітуюць сацыяльна-прафесійныя праблемы [12, с. 8]. Разам з тым, нягледзячы на выкарыстанне паняццяў «кампетэнтнасць», «кампетэнцыя» і «кампетэнтнасны падыход» на дзяржаўным узроўні ў адукацыйных стандартах, стаўленне спецыялістаў да іх у цэлым супярэчлівае. Так, В. Л. Жук былі дапоўнены і канкрэтызаваны ўзаемасувязі кампетэнтнаснага падыходу з іншымі падыходамі, якія рэалізуюцца ў адукацыі: сістэмным, гуманістычным, культуралагічным, кагнітыўным, асобасна-арыентаваным, асобасна-дзейнасным, кантэкстным і сітуацыйным. Кампетэнтнасны падыход адносіцца да трэцяга ўзроўню метадалагічнага аналізу – канкрэтна-навуковага. Галіна яго ўжывання ўключае асноўныя кампаненты адукацыйнага працэсу (мэты, змест, вынікі) і цэласную сістэму адукацыі. Дадзеная адукацыйная канцэпцыя, па-першае, рэалізуецца ў складанай узаемасувязі з больш маштабнымі падыходамі (сістэмным, культуралагічным, гуманістычным). Па-другое, яна ўзаемазлучана з уласна педагагічнымі падыходамі (кагнітыўным, асобасна-арыентаваным, асобасна-дзейнасным, кантэкстным, сітуацыйна-праблемным, задачным), якія выкарыстоўваюцца як пры арганізацыі цэласнага адукацыйнага працэсу, так і пры рэалізацыі асобных яго кампанентаў. Сукупнасць рэалізуемых падыходаў адрозніваецца дынамічнасцю і можа падлягаць зменам за кошт укаранення новых падыходаў, або пераарыентацыі, паслаблення ўплыву раней выкарыстоўваемых падыходаў і прынцыпаў [13, с. 98].

Кампетэнтнасць у зносінах – камунікатыўная кампетэнтнасць, з’яўляецца фактарам, які ў высокай ступені спрыяе праяве значных у прафесійнай сферы асобасных якасцей бібліятэкара, а таксама з’яўляецца абавязковай умовай эфектыўнасці яго працы. Аналіз выкананых да цяперашняга часу даследаванняў і нашы матэрыялы сведчаць аб тым, што патрэбу ў фарміраванні камунікатыўнай кампетэнтнасці маюць як маладыя бібліятэкары, так і работнікі са стажам. Негатыўныя з’явы ва ўзаемадзеянні бібліятэкара з чытачом шмат у чым абумоўлены адсутнасцю ў сістэме падрыхтоўкі кадраў адпрацаваных механізмаў развіцця камунікатыўных якасцей бібліятэкара,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што зніжае яго гатоўнасць да прафесійных зносін у зменлівых умовах.

Варта падкрэсліць, што да гэтага часу праблема фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці бібліятэкара не з'яўлялася прадметам комплекснага даследавання і аналізу. Асобныя аспекты праблемы знаходзяць адлюстраванне ў працах беларускіх вучоных (В. В. Бушуева – камунікатыўная культура бібліятэкара, Л. А. Дзямешка, В. В. Дрыбін, С. В. Зыгмантовіч, Н. У. Клімянкова, С. А. Паўлава – бібліятэчныя зносіны). Яны разглядаліся таксама ў шматлікіх публікацыях расійскіх даследчыкаў: В. А. Азаравай, Г. А. Алтуховай, І. А. Багданавай, В. А. Барадзіной, Л. В. Губіна, М. Я. Дворкінай, С. А. Езавай, Л. Ф. Красінскай – і ўкраінскіх калег: І. А. Мейжыс, Г. М. Нядзельча, А. С. Чачко.

Ускосна камунікатыўная прырода бібліятэчнай прафесіі закраналася ў даследаваннях, звязаных з падрыхтоўкай прафесійных бібліятэчных кадраў у Беларусі (С. В. Зыгмантовіч, В. Е. Лявончыкаў, І. Б. Стралкова і інш.). У Расіі дадзеная праблема вывучалася Ю. Б. Аўраевай, С. І. Галаўко, М. В. Збароўской, Т. Б. Лаўковой, Э. Р. Сукіасянам і інш.

Нягледзячы на дасягнуты ўзровень даследаванасці азначаных пытанняў, існуюць пэўныя праблемы ў далейшым удасканаленні развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці бібліятэкара, у прыватнасці, у аспектах, якія тычацца ролі камунікатыўнай кампетэнтнасці ў яго прафесійнай дзейнасці. Няма дакладнай фармулёўкі дадзенага тэрміна і ўдакладнення структурных элементаў ключавога паняцця. Не надаецца дастатковай увагі таксама асаблівасцям рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў фарміраванні камунікатыўнага складніка падрыхтоўкі спецыяліста інфармацыйна-дакументнай сферы. Аналіз існуючай практыкі вузаўскай падрыхтоўкі бібліятэкараў сведчыць аб адсутнасці цэласнай сістэмы фарміравання камунікатыўных якасцей, неабходных для паспяховай самарэалізацыі бібліятэкара ў сферы прафесійнай дзейнасці.

Прадпрымаліся спробы паказаць спецыфіку псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння бібліятэкара і карыстальніка ў працэсе абслугоўвання [1; 4; 17]. Мы лічым, што межы педагагічнага ўздзеяння вызначаюцца, у канчатковым выніку, выключна самім бібліятэкарам і залежаць, у першую чаргу, ад узроўню яго

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

прафесіяналізму, агульнай культуры і камунікатыўнай кампетэнтнасці.

Аналіз шматлікіх крыніц дазваляе сцвярджаць, што не існуе адназначнай трактоўкі паняцця «камунікатыўная кампетэнтнасць», а тым больш – «камунікатыўная кампетэнтнасць бібліятэкара». Аднак вывучэнне дэфініцый дазваляе зрабіць наступныя высновы.

Па-першае, з'яўляючыся значнай і адносна самастойнай падсістэмай у структуры прафесійнай кампетэнтнасці, камунікатыўная кампетэнтнасць уяўляе сабой здольнасць індывіда асаблівым чынам і ў пэўных умовах ўзаемадзейнічаць з іншымі людзьмі. Паняцце «камунікатыўная кампетэнтнасць» – гэта комплекснае паняцце, таму яго нельга абмяжоўваць ні здольнасцямі асобы, ні дасведчанасцю чалавека ў сферы псіхалогіі зносін, ні ансамблем асобасных рыс і г. д., бо пры гэтым трактоўка аказваецца аднабокай.

Па-другое, камунікатыўную кампетэнтнасць асобы варта разглядаць як складаную цэласна-асобасную структуру, якая ўключае ў сябе гуманістычныя арыентацыі, камунікатыўныя каштоўнасці, сукупнасць асобасных якасцей, якія забяспечваюць гатоўнасць да дыялагічных зносін, веданне асноў зносін, культуру ўзаемадзеяння ў працэсе зносін, а таксама практычны вопыт прымянення дадзенай сукупнасці ведаў, уменняў і навыкаў.

Сістэмны аналіз камунікатыўнай кампетэнтнасці як інтэгратыўнай якасці асобы дае падставу вылучыць наступныя яе кампаненты: каштоўнасна-асобасны, кагнітыўны, аперацыянальна-дзейнасны.

*Каштоўнасна-асобасны* кампанент уключае гуманістычныя арыентацыі, камунікатыўныя каштоўнасці асобы, сукупнасць асобасных якасцей, якія забяспечваюць гатоўнасць да дыялагічных зносін. *Кагнітыўны* кампанент аб'ядноўвае веды аб заканамернасцях зносін, камунікатыўных уласцівасцях асобы, вопыт аперыравання гэтымі ведамі, вопыт фармулявання задач зносін і мадэліравання камунікатыўных паводзін. *Аперацыянальна-дзейнасны* кампанент уключае ўменні і навыкі зносін, што абумоўліваюць культуру ўзаемадзеяння.

Структурныя кампаненты камунікатыўнай кампетэнтнасці ўзаемазвязаны і ўзаемазалежны. Вызначальнае месца займаюць гуманістычныя арыентацыі і камунікатыўныя каштоўнасці,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія прадвызначаюць наяўнасць таго ці іншага матыву паводзін, аказваюць значны ўплыў на дзеянні ў непасрэдных зносінах, стымулююць узнікненне патрэбнасці асобы ў набыцці прафесійна значных камунікатыўных ведаў. Каштоўнасныя арыентацыі, асобасны сэнс прафесіі маюць прынцыповае значэнне для фарміравання індывідуальнага стылю прафесійнай дзейнасці, вызначаючы яго характар [20].

У бібліятэказнаўчых публікацыях утрымліваюцца асобныя нататкі пра камунікатыўную кампетэнтнасць бібліятэкара. Напрыклад, І. А. Багданава ў сваім даследаванні пад камунікатыўнай кампетэнтнасцю разумее антагенетычна фарміруемую ў чалавека сістэму правіл маўленчых і немаўленчых паводзін у розных камунікатыўных сітуацыях [5]. Але ж кампетэнтнасць не зводзіцца толькі да наяўнасці правіл, а прадугледжвае ўменне іх выкарыстоўваць у розных сітуацыях зносін.

І. А. Мейжыс вызначае паняцце камунікатыўнай кампетэнтнасці наступным чынам: гэта сукупнасць уменняў, якія дазваляюць бібліятэкару эфектыўна размаўляць з карыстальнікамі ў любых сітуацыях інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання [18]. У дадзеным азначэнні адсутнічае кагнітыўны кампанент, што значна збядняе змест паняцця «камунікатыўная кампетэнтнасць бібліятэкара».

Пад тэрмінам «камунікатыўная кампетэнтнасць бібліятэкара» мы прапануем разумець сукупнасць камунікатыўных здольнасцей, ведаў, уменняў і навыкаў бібліятэкара, а таксама вопыт іх практычнага прымянення, які дазваляе яму паспяхова выконваць прафесійныя задачы і ажыццяўляць міжасобасныя кантакты. Пры гэтым камунікатыўныя здольнасці бібліятэкара – гэта індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці асобы, якія забяспечваюць эфектыўнасць зносін чалавека і ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі [3, с. 33].

Валоданне сістэмай навыкаў, ведаў, уменняў, якія складаюць яго прафесійную кампетэнтнасць, з'яўляецца неабходнай умовай для ўстанаўлення і падтрымання высокага ўзроўню міжасобасных зносін. У прафесійную кампетэнтнасць, на думку Р. А. Алтуховой, уваходзяць такія ўменні, як здольнасць разумець асобу, веданне правілаў паводзін у розных сітуацыях, уменне выбіраць правільны тон размовы, дакладную лінію паводзін, адчуваць эмацыйны стан партнёра па зносінах [2, с. 41]. Як бачым, многія з пералічаных уменняў адлюстроўваюць ка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мунікатыўны аспект асобасных характарыстык бібліятэчнага спецыяліста.

Зносіны ва ўсіх іх відах з'яўляюцца неад'емнай часткай прафесійнай дзейнасці бібліятэкара. Валоданне сістэмай навыкаў, ведаў, уменняў, якія складаюць яго прафесійную кампетэнтнасць, – неабходная ўмова для ўстанаўлення і падтрымання высокага ўзроўню міжасобасных зносін.

У зносінах вылучаюць тры ўзаемазвязаныя бакі: камунікатыўны (абмен інфармацыяй паміж людзьмі); інтэрактыўны (арганізацыя ўзаемадзеяння паміж людзьмі (пры ўзгодненасці дзеянняў, размеркаванні функцый з мэтай уплыву на паводзіны, настрой, перакананні); перцэптыўны (уключае працэс успрымання адзін аднаго партнёрамі па зносінах і ўстанаўленне на гэтай аснове узаемаадносін) [7, с. 31]. У аснове бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ляжыць задавальненне і развіццё інфармацыйных запатрабаванняў суб'екта. У гэтым сэнсе камунікатыўны бок выступае як мэта бібліятэчных зносін; перцэптыўны – як умова; інтэрактыўны – як сродак.

У практыцы зносін усе бакі ўзаемазвязаны паміж сабой. Дадзеная ўзаемасувязь забяспечвае эфектыўнасць сумеснай дзейнасці і якасць абслугоўвання. У бібліятэчных зносінах значнымі з'яўляюцца ўсе аспекты. Так, перцэпцыя дазваляе ўлічваць псіхалагічныя асаблівасці ўспрымання і разумення ў працэсе зносін, у станаўленні паразумення і стварэнні цэласнага вобраза партнёра, зыходзячы з яго знешняга аблічча і паводзін. Найбольш значным уяўляецца камунікатыўны аспект – ён адлюстроўвае прафесійную накіраванасць зносін паміж бібліятэкарам і чытачом. Камунікатыўная кампетэнтнасць бібліятэчнага спецыяліста ўключае ў сябе таксама псіхатэхнічныя веды і ўменні. Інтэракцыя ў зносінах прадугледжвае абмен не толькі ведамі, але і дзеяннямі суб'ектаў у розных сітуацыях [8, с. 37].

Пры разглядзе камунікатыўнай кампетэнтнасці, прыняўшы за аснову вядучыя кампаненты зносін, можна вылучыць наступныя блокі прафесійных камунікатыўных уменняў бібліятэкара:

– *сацыяльна-псіхалагічны* (уключае ўменні: схіляць чытачоў да зносін, рабіць спрыяльнае ўражанне, адэкватна ўспрымаць і разумець своеасаблівасць асобы кожнага карыстальніка, прагназаваць развіццё міжсуб'ектных зносін, выкарыстоўваць псіхалагічныя сродкі: вербальныя і невербальныя);



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– *маральна-этычны* (уключае ўменні: будаваць зносіны на гуманнай, дэмакратычнай аснове, кіравацца прынцыпамі і правіламі прафесійнай этыкі і этыкету, арганізоўваць творчае супрацоўніцтва з кожным чытачом, падтрымліваць спрыяльны маральны клімат зносін);

– *эстэтычны* (уключае ўменні: быць артыстычным, эстэтычна выразным, далучаць чытачоў да высокай культуры зносін, актывізаваць іх эмацыйны тонус і аптымістычнае светаадчуванне, перажыванне радасці зносін, пачуццё цудоўнага);

– *тэхналагічны* (уключае ўменні: выкарыстоўваць разнастайнасць форм узаемадзеяння, выбіраць аптымальны стыль зносін, прытрымлівацца такту, забяспечваць эфектыўнасць камунікатыўнага ўздзеяння).

З паняццем «камунікатыўная кампетэнтнасць» цесна звязана такое паняцце, як «камунікатыўнае ядро асобы». Гэты тэрмін увёў у навуковы абыходак А. А. Бадалёў. Ён вызначае камунікатыўнае ядро асобы як адзінства адлюстравання, адносін і паводзін, якое праяўляецца пры ўзаемадзеянні з рознымі людзьмі і супольнасцямі, з якімі даводзіцца ўступаць у прамыя або апасродкаваныя кантакты. Паколькі кожны чалавек з'яўляецца суб'ектам зносін, то ў структуры асобы павінна быць аснова, якая дазваляе ёй рэалізоўвацца больш ці менш паспяхова. Яна прысутнічае ў асобе як дарослага, так і дзіцяці і можа быць вызначана як камунікатыўнае ядро. У камунікатыўнае ядро ўваходзяць асобасныя ўласцівасці і якасці. Менавіта яны, у канчатковым выніку, вызначаюць стыль і накіраванасць зносін. Камунікатыўнае ядро асобы аказвае значны ўплыў на развіццё кантактаў, вызначэнне пазіцый і на працэс прафесійнай дзейнасці [20]. Унікальнасць прафесіі бібліятэкара выяўляецца ў тым, што яго асобасныя характарыстыкі з'яўляюцца прафесійна значнымі. Уплыў камунікатыўнага ядра асобы на камунікатыўную кампетэнтнасць узаемныя. З аднаго боку, камунікатыўнае ядро асобы вызначае ўзровень развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці, а з другога – спецыяльна арганізаванае навучанне, накіраванае на развіццё камунікатыўнай кампетэнтнасці, здольна змяніць некаторыя якасці асобы, якія ўваходзяць у склад камунікатыўнага ядра Аснову любой кампетэнтнасці, у тым ліку і камунікатыўнай, складаюць асобасныя якасці спецыяліста [10, с. 81].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прапаноўваецца разглядаць кампетэнцыі бібліятэкара па ступені іх выяўленасці: негатыўны ўзровень, узровень разумення, базавы ўзровень, узровень вопыту, узровень майстэрства. Усе гэтыя ўзроўні цесна звязваюцца з адпаведнымі ўзроўнямі ведаў і ўменняў, якімі валодае бібліятэчны спецыяліст [11].

Кампетэнтнасць, у разуменні даследчыкаў, уяўляе сабой прафесійныя стандарты, яны ўтрымліваюць апісанне задач і працэсаў, якія бібліятэчны спецыяліст павінен умець вырашаць і выконваць, каб заняць пэўную пасаду. Кампетэнцыя – гэта інтэлектуальны рэсурс бібліятэчнага работніка, выражаны ў яго здольнасці прымяняць свае веды, уменні і навыкі ў адпаведнасці з неабходнасцю рашэння вытворчых праблем у зменлівых умовах. Кампетэнцыя бібліятэчнага спецыяліста падразумявае, што ён (спецыяліст), валодае такімі індывідуальнымі асаблівасцямі, як майстэрства і асабістая эфектыўнасць пры ажыццяўленні прафесійнай дзейнасці, пэўным наборам навыкаў, а таксама высокай матывацыяй да працы [11, с. 120].

Мы прапануем пры выдзяленні ўзроўняў камунікатыўнай кампетэнтнасці бібліятэкара выкарыстаць дзве асноўныя формы навуковага пазнання – эмпірычную і тэарэтычную [19]. Па меры развіцця і ўдасканалення дадзеных узроўняў прасочваецца ўзаемасувязь больш поўнай прафесійнай рэалізацыі бібліятэкара з удасканаленнем ўзроўня камунікатыўнай кампетэнтнасці. Гэтыя ўзроўні ўяўляюцца наступным чынам.

Першы – стыхійны. У спецыяліста, які знаходзіцца на дадзеным узроўні, не развіты навыкі эфектыўных зносін з людзьмі, не сфарміраваны ўяўленні аб камунікатыўнай кампетэнтнасці, узнікаюць шматлікія цяжкасці ў зносінах, што абумоўлена дэфіцытам камунікатыўных ведаў і ўменняў. Ён дэманструе эгацэнтрызм у розных праявах, слаба арыентуецца ў невербальных сродках зносін. На гэтым узроўні ў бібліятэкара толькі фарміруецца ўменне адаптавацца да розных сацыяльных сітуацый, усталёўваць і падтрымліваць неабходныя кантакты з людзьмі, дабівацца аптымальных ўзаемаадносін з карыстальнікамі.

Другі – эмпірычны, на якім у спецыяліста ўжо зараджаюцца эмпірычныя веды па камунікатыўнай кампетэнтнасці, ён усведамляе ўласныя асобасныя рысы, што абцяжарваюць працэс зносін. Такі бібліятэкар валодае вербальнымі і невербальнымі сродкамі зносін, мае ўяўленне аб камунікатыўных здольнасцях.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У яго афармляецца імкненне браць на сябе і выконваць розныя сацыяльныя ролі, фарміруецца ўменне правільна ўспрымаць чытачоў як асоб, замацоўваюцца навыкі адаптацыі да розных сітуацый бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, фарміруюцца здольнасці ўплываць на людзей і дасягаць пастаўленых мэт у міжасобасным і інфармацыйным узаемадзеянні.

Трэці – тэарэтыка-прыкладны, на якім у бібліятэкара складаецца цэласная сістэма ведаў і ўменняў у галіне камунікатыўнай кампетэнтнасці. Ён здольны паспяхова функцыянаваць у любых сітуацыях бібліятэчнага абслугоўвання, ведае правілы рэгуляцыі камунікатыўных паводзін, бачыць камунікатыўныя бар’еры і ўмее іх пераадольваць, валодае метадамі фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці, можа аналізаваць і ацэньваць сітуацыю міжасобасных ўзаемадзеянняў з любым карыстальнікам. Такі спецыяліст эфектыўна арганізоўвае міжасобасную прастору ў працэсе зносін, знаёмы са сродкамі карэкцыі камунікатыўных паводзін, плануе ўласныя камунікатыўныя дзеянні ў зносінах з людзьмі, умее праяўляць эмпатыю. У яго развіта здольнасць ацэньваць свае камунікатыўныя ўменні, усталёўваць сувязі паміж рознымі элементамі ведаў і ўменняў, паміж ведамі і ўменнямі ў цэлым.

Усталяванне псіхалагічнага кантакту з карыстальнікам, партнёрскіх узаемаадносін на аснове паразумення – абавязковая ўмова выканання задач бібліятэчнага абслугоўвання. Пры гэтым ад спецыяліста патрабуюцца не толькі веданне інфармацыйных рэсурсаў і ўменне ажыццяўляць пошук неабходных крыніц інфармацыі, але і наяўнасць пэўных навыкаў зносін: умення зразумець чытача, высвятліць узровень яго інфармацыйнай культуры, матывы звароту да інфармацыі, здольнасці даступна растлумачыць, данесці да партнёра сэнс паведамлення, плённа ажыццяўляць сумесную дзейнасць. Камунікатыўная кампетэнтнасць бібліятэкара сёння прызнаецца не меней важнай, чым наяўнасць прафесійных ведаў, уменняў, навыкаў [9].

З пункту гледжання сучаснай педагогікі вядома, што ў выніку адукацыі ў чалавека павінна быць сфарміравана нейкая цэласная сацыяльна-прафесійная якасць, якая дазваляе яму паспяхова выконваць вытворчыя задачы, узаемадзейнічаць з іншымі людзьмі. Гэта якасць можа быць вызначана як цэласная сацыяльна-прафесійная кампетэнтнасць чалавека. Ідэалізаваная яе мадэль прадстаўлена рознапарадкавымі блокамі: база-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вым, асобасным, сацыяльным і прафесійным. І. А. Зімняя адзначае, што «ўсе кампетэнтнасці сацыяльныя ў шырокім сэнсе слова, бо яны выпрацоўваюцца, фарміруюцца ў соцыуме. Яны сацыяльныя па сваёй сутнасці, яны выяўляюцца ў гэтым соцыуме» [14, с. 11].

Уваходзячы ў лік сацыяльных, камунікатыўная кампетэнтнасць вылучаецца сваёй універсальнасцю і поліфункцыянальнасцю з прычыны немінучай значнасці, як у развіцці асобнага індывіда, так і чалавечага грамадства ў цэлым. Камунікатыўная кампетэнтнасць з'яўляецца практычным увасабленнем у дзеянні камунікатыўнай культуры чалавека. Яна забяспечвае гатоўнасць асобы да самарэалізацыі і самавызначэння, з'яўляецца сродкам стварэння і ўзбагачэння ўнутранага свету чалавека, умовай дасягнення гармоніі з сабой і навакольнай рэчаіснасцю [16].

Усё вышэйпададзенае дае падставу лічыць, што камунікатыўная кампетэнтнасць з'яўляецца ключавым элементам прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкара. Камунікатыўная кампетэнтнасць спецыяліста інфармацыйна-дакументнай сферы фарміруецца ў выніку адукацыі і наступнай прафесійнай адаптацыі, а таксама назапашвання жыццёвага вопыту.

Самарэалізацыя ўяўляе сабой працэс і вынік развіцця, характарызуецца аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі паказчыкамі, назіраецца ў сталай асобе і можа праяўляцца як у прафесійнай сферы, так і ў асабістым жыцці чалавека. Павелічэнне ўвагі да феномена самарэалізацыі тлумачыцца ўзрастаючым разуменнем яе вядучай ролі ў жыццядзейнасці асобы. Такое разуменне дазваляе выявіць сутнасць дадзенага феномена, пабудаваць схему псіхалагічных катэгорый, якія раскрываюць яго змест і псіхалагічныя дэтэрмінанты. Нягледзячы на дасягнуты ўзровень развіцця даследуемых пытанняў, зараз маюцца пэўныя прабелы ў далейшым удасканаленні сістэмы развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці бібліятэкараў, у прыватнасці ў пытаннях, якія тычацца сувязі камунікатыўнай кампетэнтнасці і асобаснай і прафесійнай самарэалізацыі.

У нашым даследаванні ўпершыню камунікатыўная кампетэнтнасць і самарэалізацыя разглядаюцца як узаемаабумоўленыя пераменныя (якасць зносін вызначае ўласны асобасны рост бібліятэкара, а здольнасць да самарэалізацыі, у сваю чаргу, адбіваецца на асаблівасцях зносін). Самарэалізацыя, як і ўся чалавечая дзейнасць, уключае мэту і сродкі яе дасягнення. Мэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тай самарэалізацыі з'яўляюцца выяўленне і ўдасканаленне сутнасных сіл чалавека.

Сродкі самарэалізацыі – гэта пэўныя віды дзейнасці, у якіх адбываецца самарэалізацыя асобы. Рэалізацыя сутнасных сіл чалавека магчыма і ў выглядзе прадметна накіраванай дзейнасці. Зыходзячы з гэтага, можна выдзеліць чатыры асноўныя сферы дзейнасці самарэалізацыі (вытворчую, бытавую, дасугавую, камунікатыўную) [21, с. 9]. Самарэалізацыя – ажыццяўленне самаго сябе ў штодзённым жыцці, зацвярджэнне свайго асобага шляху. Яна даступная кожнаму чалавеку, уключанаму ў соцыум. Аднак ступень яе выражанасці, самаацэнка чалавекам сваёй самарэалізаванасці залежаць ад многіх сацыяльных фактараў, такіх як пол, узрост, узровень адукацыі і інш [21, с. 38].

З пазіцыі педагогікі, па меркаванні С. Гершунскага, жыццёвая самарэалізацыя асобы можа быць разгледжана на сённяшні момант у якасці мэты адукацыі. Пры гэтым самарэалізацыя магчыма пры ўмове, калі чалавек:

а) свядома і глыбока верыць у гэту жыццёвую мэту, верыць у сваё індывідуальна непаўторнае прызначэнне, бачыць у ім вышэйшы сэнс жыцця і надзею на працяг уласнага Я, у залежнасці ад вынікаў сваіх намераў і спраў на працягу ўсяго жыцця;

б) усведамляе свае здольнасці, інтарэсы, жыццёвыя перавагі і матывы паводзін і кіруецца імі ў разнастайных жыццёвых сітуацыях; адчувае сябе часткай прыроды, чалавечага грамадства; здольны да сяброўскага ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі незалежна ад іх індывідуальных альбо калектыўных светапоглядных, ментальных асаблівасцей;

в) валодае ведамі, уменнямі, навыкамі і творчымі здольнасцямі, якія дазваляюць яму найбольш поўна рэалізаваць сябе ў прафесійнай дзейнасці і разнастайных грамадскіх стасунках;

г) здольны да мэтанакіраваных і эфектыўных валявых намаганняў, неабходных для паўнацэннай самарэалізацыі на ўсіх этапах жыццёвага шляху [6, с. 6].

Ажыццяўленне камунікацый шляхам вербальных зносін паміж людзьмі садзейнічае раскрыццю патэнцый чалавека, выступае неабходнай умовай яго развіцця і самавыяўлення. У той жа час пры пэўных абставінах яны могуць і ўскладняць працэс самарэалізацыі. Гэта мае месца ў тых выпадках, калі чалавек фарміруецца ва ўмовах збяднелага моўнага асяроддзя (у сям'і,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школе, у непасрэдным асяроддзі), з прычыны чаго недаразвіваюцца вербальныя здольнасці, асоба дэфармуецца, абцяжарваецца ўключэнне ў некаторыя сацыяльныя структуры, і ў выніку яна нясе страты самарэалізацыі [15, с. 124].

Магчыма выдзеліць наступныя крытэрыі, альбо паказчыкі, самарэалізацыі асобы ў прафесійнай дзейнасці. Найбольш вядомым паказчыкам паспяховасці альбо непаспяховасці самарэалізацыі чалавека ў працы з'яўляецца паказчык знешняй прадуктыўнасці дзейнасці. Гаворка ідзе пераважна аб колькасных паказчыках, вядома, пры захаванні некаторага патрабуемага якаснага ўзроўню. Часта аб самарэалізацыі мяркуюць пераважна па гэтым паказчыку. Для грамадства сапраўды важна, які быў фармальны вынік, у якой колькасці прадукцыі ён выражаецца і ў якой меры гэта прадукцыя неабходна для існавання і росквіту грамадства. Аднак судзіць аб тым, ці спраўдзілася самарэалізацыя чалавека ў працы, на падставе толькі адных гэтых паказчыкаў было б некарэктна. Пры такім падыходзе не ўлічваюцца індывідуальныя асаблівасці, здольнасці чалавека, а таксама шэраг іншых фактараў.

Асноўным суб'ектыўным крытэрыем самарэалізацыі даследчыкі лічаць, у першую чаргу, не толькі і не столькі грамадскае прызнанне дасягненняў пэўнага чалавека, а яго задаволенасць вынікамі гэтага працэсу. Калі чалавек дасягне высокіх вынікаў, але пры гэтым не атрымае задавальнення, няма падстаў казаць аб паспяховай самарэалізацыі. У штодзённым жыцці часта ствараецца менавіта такая сітуация, калі чалавек дэманструе высокія вынікі, але не адчувае пры гэтым задавальнення ад працэсу. Толькі ў тым выпадку, калі высокія вынікі падмацоўваюцца ўнутранай задаволенасцю, з'яўляюцца важкія (але яшчэ недастатковыя) падставы, каб гаварыць аб тым, што самарэалізацыя спраўдзілася [15, с. 95]. Таму спалучэнне знешняй прадуктыўнасці з унутранай задаволенасцю – толькі неабходная, але недастатковая ўмова самарэалізацыі.

Наступным, не менш важным паказчыкам самарэалізацыі з'яўляецца нервова-псіхічная «цана», якую чалавек вымушаны плаціць за сваю выніковасць і задаволенасць. Нават пры высокай прадуктыўнасці і задаволенасці наўрад ці можна казаць аб паспяховай самарэалізацыі, калі чалавек вымушаны расплачвацца за яе сваім фізічным альбо псіхічным здароўем.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, самарэалізацыя мае месца, калі ў наяўнасці: высокая прадуктыўнасць (выніковасць), задаволенасць сваёй працай – пры адсутнасці разбуральных нервова-псіхічных затрат. Па спалучэнні гэтых трох паказчыкаў можна меркаваць аб меры самарэалізацыі чалавека ў прафесійнай дзейнасці.

Улічваючы, што самарэалізацыя прадугледжвае найбольш поўнае раскрыццё здольнасцей, талентаў, магчымасцей чалавека, што ажыццяўляецца шляхам уключэння яго ў сацыяльныя структуры, яна немагчыма без ажыццяўлення працэсу камунікацыі. Дзейнасць бібліятэкара камунікатыўная па сваёй прыродзе. Аднак фарміраванню камунікатыўных якасцей бібліятэкара не надаецца дастатковай увагі ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў.

Высокі ўзровень развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці можна ахарактарызаваць наступнымі параметрамі. У бібліятэкара складаецца цэласная сістэма ведаў і ўменняў у галіне камунікатыўнай кампетэнтнасці. Ён здольны паспяхова функцыянаваць у любых сітуацыях бібліятэчнага абслугоўвання, ведае правілы рэгуляцыі камунікатыўных паводзін, бачыць камунікатыўныя бар'еры і ўмее іх пераадольваць, валодае метадамі фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці, можа аналізаваць і ацэньваць сітуацыю міжасобаснага ўзаемадзеяння з любым карыстальнікам. Такі спецыяліст граматна арганізуе міжасобасную прастору ў працэсе зносін, знаёмы са сродкамі карэкцыі камунікатыўных паводзін, плануе ўласныя камунікатыўныя дзеянні ў зносінах з людзьмі, умее праяўляць эмпатыю. У яго развітая здольнасць ацэньваць свае камунікатыўныя ўменні, устанаўліваць сувязі паміж рознымі элементамі ведаў і ўменняў, наогул паміж ведамі і ўменнямі. Як бачым, пералічаныя камунікатыўныя веды, уменні, здольнасці забяспечваюць найбольш аптымальныя ўмовы для эфектыўнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк, для вядзення гарманічнага дыялогу з любым чытачом (у тым ліку і праблемным), і магчыма прасачыць узаемасувязь больш поўнай прафесійнай самарэалізацыі бібліятэкара, непасрэдна кантакуючага з чытачом, з павышэннем узроўню развіцця яго камунікатыўнай кампетэнтнасці.

Прафесійная падрыхтоўка бібліятэкара павінна быць арыентавана на выкарыстанне магчымасцей сваёй прафесіі для фарміравання ў чытача такіх сацыяльных кампетэнцый, як камунікатыўная і інфармацыйная. Зразумела, што і сам бібліятэкар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павінен валодаць імі на дастаткова высокім узроўні. З мэтай вырашэння вышэйапісанай задачы намі прапануецца ў сістэме вузаўскай падрыхтоўкі бібліятэкараў рэалізаваць курс па выбары «Камунікатыўная кампетэнтнасць бібліятэкара», які прадугледжвае развіццё кампетэнтнасці ў зносінах у маладых спецыялістаў, выпускнікоў вышэйшай навучальнай установы. Пры распрацоўцы дадзенага курса мы абапіраліся на асноўныя палажэнні кампетэнтнаснага падыходу, а таксама выкарысталі некаторыя магчымасці іншых падыходаў у адукацыі (асобаснаарыентаванага, дзейнаснага, кагнітыўнага). Эфектыўнасць дадзенага курса забяспечваецца сістэмай арганізацыйна-педагагічных і псіхолага-педагагічных умоў развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці будучых бібліятэкараў. Асноўным складнікам з’яўляецца развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі: спосабы зносін, камунікатыўныя ўменні, навыкі і веды. Педагагічны эксперымент, праведзены сярод студэнтаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, дазволіў праверыць эфектыўнасць прымянення дадзенага курса ў сістэме вучэбна-выхаваўчага працэсу ВНУ і паказаў павышэнне ўзроўню развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці будучых бібліятэчных спецыялістаў і, такім чынам, магчымасць павышэння эффектыўнасці бібліятэчнага абслугоўвання.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Азарова, В. А.* Обслуживание читателей: техника профессионального поведения библиотекаря / В. А. Азарова. – Самара : СГАКИ, 1998. – 145 с.

2. *Алтухова, Г. А.* Профессиональная этика библиотекаря / Г. А. Алтухова. – М. : МГУКИ : Профиздат, 2002. – 101 [2] с. – (Современная библиотека).

3. *Библиотековедение,* библиографоведение и информатика / сост. И. Ю. Акифьева [и др.] ; науч. ред. М. Г. Вохрышева. – М. : Либерея-Бибинформ, 2007. –101 [2] с. – (Библиотекарь и время. XXI век; вып. 61).

4. *Библиотечное* обслуживание: теория и методика / под ред. А. Я. Айзенберга. – М. : МГУК, 1996. – 199 с.

5. *Богданова, И. А.* Библиотечный диалог: аспекты речевого общения / И. А. Богданова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 117 с. (Библиотекарь и время).

6. *Гершунский, В. С.* Концепция самореализации личности в системе обоснования ценностей и целей образования / В. С. Гершунский // Педагогика. – 2003. – № 10. – С. 3–7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Доморацкая, Е. М.* Психология межличностного взаимодействия в высшей школе / Е. М. Доморацкая. – Минск : БГУИР, 2005. – 65 с.

8. *Дыченко, Л. Ф.* Психология и библиотекарь / Л. Ф. Дыченко. – М. : Либерея, 2006. – 143 с.

9. *Езова, С. А.* Библиотекарь и читатель: типы поведения / С. А. Езова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2009. – 109 с.

10. *Езова, С. А.* Коммуникативная компетентность / С. А. Езова // Советское библиотековедение. – 1992. – № 2. – С. 72–78.

11. *Елепов, Б. С.* Компетентность и компетенции библиотечного специалиста: как и зачем их оценивать / Б. С. Елепов, Е. М. Крючкова // Библиотековедение. – 2009. – № 3. – С. 117–124.

12. *Жук, О. Л.* Педагогика : практикум на основе компетентностного подхода / О. Л. Жук, С. Н. Сиренко. – Минск : РИВШ, 2007. – 191 с.

13. *Жук, О. Л.* Педагогическая подготовка студентов: компетентностный подход / О. Л. Жук. – Минск : РИВШ, 2009. – 335 с.

14. *Зимняя, И. А.* Ключевые компетентности как результативно-целевая основа компетентностного подхода в образовании / И. А. Зимняя. – М. : Исслед. центр проблем качества подготовки специалистов, 2004. – 40 с.

15. *Зобов, Р. А.* Самореализация человека: введение в человекознание / Р. А. Зобов, В. Н. Келасьев. – СПб. : СПбГУ, 2001.–324 с.

16. *Исаева, Т. Е.* Классификация профессионально-личностных компетенций вузовского преподавателя / Т. Е. Исаева // Педагогики. – 2006. – № 9. – С. 55–60.

17. *Красинская, Л. Ф.* Профессиональное общение библиотекаря: психолого-педагогический аспект : автореф. дис. … канд. пед. наук / Л. Ф. Красинская. – М., 1993. – 16 с.

18. *Мейжис, И. А.* Социально-психологические основы библиотечного обслуживания / И. А. Мейжис. – Николаев, 1994. – 192 с.

19. *Мельник, Е. В.* Содержание коммуникативной компетентности педагога / Е. В. Мельник // Психология и школа. – 2004. – № 4. – С. 36–42.

20. *Родевич, Т. Н.* Самореализация личности в процессе социокультурной деятельности : автореф. дис. … / Т. Н. Родевич. – Минск, 2003. – 22 с.

21. *Тимашкова, Л. Н.* Формирование коммуникативной компетентности будущих педагогов : монография / Л. Н. Тимашкова. – Минск : БГПУ, 2003. – 121 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.5. Фарміраванне прававой кампетэнцыі будучага бібліятэкара-бібліёграфа вышэйшай кваліфікацыі

Змены ў разуменні сутнасці адукацыйнага працэсу, закладзеныя Балонскай дэкларацыяй 1999 г., трансфармацыя парадыгмы адукацыі ад традыцыйнай да асобасна-арыентаванай абумовілі паступовы пераход ад кваліфікацыйнай мадэлі падрыхтоўкі спецыяліста да кампетэнтнаснай. На сучасным этапе сі-

стэмаўтваральным фактарам у мадэлі спецыяліста з'яўляецца яго кампетэнтнасць, якая фарміруецца і развіваецца на аснове кампетэнцый у арганічным адзінстве з каштоўнаснымі арыентацыямі асобы пры ўмове яе матываванасці, актуалізацыі эмацыйна-валявой сферы і самарэгуляцыі.

Існуе мноства азначэнняў паняццяў «кампетэнтнасць» і «кампетэнцыя». Пазіцыі шматлікіх даследчыкаў зыходзяцца ў тым, што кампетэнтнасць мае інтэгратыўны, дзейнасны, асобасны характар і выступае як адзінства ведаў і вопыту, накіраваных на паспяховую дзейнасць [7, с. 88]. Паводле І. А. Зімняй, кампетэнтнасць – гэта актуальная, фарміруемая асобасная якасць як заснаваная на ведах, інтэлектуальна і асобасна абумоўленая сацыяльна-прафесійная характарыстыка чалавека [9, с. 23]. Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь па цыклу сацыяльна-гуманітарных дысцплін [1] вызначае «кампетэнтнасць» як выражаную здольнасць прымяняць свае веды і ўменні. «Кампетэнцыя» вучонымі разумеецца як абагульненая характарыстыка прафесіяналізму спецыяліста [7, с. 88] і ўяўляе сабой веды, уменні і вопыт, неабходныя для вырашэння тэарэтычных і практычных задач [1, с. 2].

Адпаведна ОС РБ 1-23 01 11-2008 «Спецыяльнасць 23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)» падрыхтоўка будучага бібліятэкара-бібліёграфа вышэйшай кваліфікацыі павінна забяспечваць фарміраванне наступных груп кампетэнцый: акадэмічных, якія ўключаюць веды і ўменні па засвоеных дысцыплінах, здольнасці і ўменні вучыцца; сацыяльна-асобасных, якія ўключаюць культурна-каштоўнасныя арыентацыі, веданне ідэалагічных, маральных каштоўнасцей грамадства і дзяржавы і ўменне кіравацца імі; прафесійных, якія ўключаюць веды і ўменні фармуляваць праблемы, рашаць задачы, распрацоўваць планы і забяспечваць іх выкананне ў выбранай сферы прафесійнай дзейнасці [2, с. 4].

Развіццё ў студэнтаў дадзеных груп кампетэнцый забяспечвае канчатковы інтэграваны вынік адукацыі – фарміраванне ў выпускніка сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці. І. А. Зімняя пад сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасцю цалкам разумее асобасную, інтэграваную якасць, якая фарміруецца і праяўляецца ў рашэнні стандартных і нестандартных задач, адэкватных усёй разнастайнасці сацыяльных і прафесійных сітуацый [10].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значнае месца сярод кампетэнцый сучаснага спецыяліста займае прававая кампетэнцыя. З аднаго боку, гэта абумоўлена патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да ўзроўню прававой падрыхтоўкі ўсіх членаў грамадства, а з другога – прававая кампетэнцыя – гэта неад'емны элемент любой прафесійнай дзейнасці, які забяспечвае яе ўстойлівае функцыянаванне. У дадзеным кантэксце ўяўляе інтарэс канцэпцыя прафесіяналізму Э. М. Каліцкага і Н. Г. Ганчарык [11], заснаваная на структуры паняцця «прафесія», якая разумеецца як мноства семантычных палёў. Вызначаюцца наступныя семантычныя палі паняцця «прафесія»:

– інфармацыйнае – прастора ведаў, інфармацыйныя сувязі і патокі ўнутры і па-за прафесіяй, неабходныя для яе функцыянавання;

– прававое – нарматыўнае асяроддзе для выканання функцый, сукупнасць паўнамоцтваў і адказнасці, якімі надзяляецца пасада;

– дзейнасна-тэхналагічнае – змест асноўных задач, функцый і кірункаў дзейнасці, тэхналагічнасць;

– антрапалагічнае – здольнасці і якасці чалавека, неабходныя для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці [11].

Канцэпцыя дазваляе абгрунтавана сцвярджаць, што прававая кампетэнцыя з'яўляецца адным са значных складнікаў агульнай кампетэнтнасці спецыяліста.

У класіфікацыі кампетэнцый, складзенай па матэрыялах даследаванняў у заходнееўрапейскіх краінах і прыведзенай у дапаможніку В. І. Байдэнка [5, с. 37–40], прававая кампетэнцыя адлюстравана ў адной з груп кампетэнцый, якімі павінны валодаць выпускнікі, – «каштоўнасна-сэнсавыя і палітыка-прававыя кампетэнцыі» (разам з дадзенай групай выдзяляюцца кампетэнцыі сацыяльнага ўзаемадзеяння; сістэмна-дзейнасныя; самаарганізацыі і самакіравання; самастойнай пазнавальнай дзейнасці).

Неабходнасць прававой падрыхтоўкі бібліятэкара-бібліёграфа закладзена на ўзроўні дзяржаўных патрабаванняў да прафесійных кампетэнцый. У кваліфікацыйным даведніку «Пасады служачых, занятых у культуры і мастацтве» [3] паступова ад пасады да пасады (галоўны бібліятэкар, галоўны бібліёграф і г. д.) прадугледжваецца неабходнасць ведаць нарматыўныя прававыя акты, якія вызначаюць развіццё культуры, а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іншыя кіраўнічыя матэрыялы вышэйстаячых органаў па пытаннях бібліятэчнай работы. У сваю чаргу, у ОС РБ 1-23 0 11-2008, дзе ўтрымліваецца кваліфікацыйная характарыстыка спецыяліста бібліятэкара-бібліёграфа і групы кампетэнцый, якія фарміруюцца пры яго падрыхтоўцы, сярод патрабаванняў да прафесійных кампетэнцый указваецца «ўменне працаваць з юрыдычнай літаратурай, валодаць заканадаўчай, нарматыўна-прававой і адміністратыўнай сістэмай кіравання бібліятэчнай справай краіны» [2].

У дачыненні да спецыяліста бібліятэкара-бібліёграфа нам неабходна вызначыць, якое месца займае прававая падрыхтоўка ў агульнай сістэме падрыхтоўкі бібліятэкара-бібліёграфа. У ОС РБ 1-23 0 11-2008 «Спецыяльнасць 23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)» прыводзяцца патрабаванні да акадэмічных, сацыяльна-асобасных кампетэнцый, прафесійных кампетэнцый праз прызму такіх катэгорый, як «умець», «валодаць», «быць здольным». Пералік ключавых кампетэнцый па кожнай з груп не разглядаецца. Адпаведна неабходна акрэсліць кола кампетэнцый бібліятэкара-бібліёграфа і месца ў дадзенай сістэме прававой кампетэнцыі.

Прававая кампетэнцыя не з’яўляецца статычнай, яна фарміруецца паступова на розных узроўнях і этапах станаўлення і развіцця асобы. У ВНУ яна – прафесійна канкрэтызуецца. Так, да абітурыента, які паступае на спецыяльнасць «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», прад’яўляецца шэраг патрабаванняў да базавых кампетэнцый. У адпаведнасці з патрабаваннямі да папярэдняга ўзроўню падрыхтоўкі, закладзенымі ў ОС РБ 1-23 0 11-2008, абітурыент павінен быць падрыхтаваны па дысцыпліне «Чалавек. Грамадства. Дзяржава». У яго на пэўным узроўні павінна быць сфарміравана адна з ключавых сацыяльных кампетэнтнасцей – кампетэнтнасць грамадзянскасці.

Адпаведна карце «Кампетэнтнасці грамадзянскасці», распрацаванай А. М. Князевым [6, с. 59–63], старшы школьнік з пункту гледжання такога кампанента, як *«веды»*, – дасведчаны адносна прававой структуры грамадства і дзяржавы, правоў чалавека і грамадзяніна; валодае звесткамі аб асаблівасцях сацыяльных стасункаў у грамадстве і дзяржаве; ведае абавязкі грамадзяніна сваёй краіны, яго адказнасць за іх невыкананне; ведае нормы сацыяльнага і грамадзянскага жыцця; мае звесткі адносна правоў і абавязкаў грамадзян некаторых іншых краін



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свету; мае ўяўленне аб механізме рэалізацыі грамадзянскіх правоў і абавязкаў і інш. З пункту гледжання кампанента *«ўменні, вопыт»* – ён выкарыстоўвае нормы, мадэлі, правілы паводзін у грамадстве, якія забяспечваюць адаптацыю асобы; умее выбудоўваць суб'ектыўныя, асэнсаваныя паводзіны, якія адпавядаюць пэўным нормам і каштоўнасцям, і інш. Зыходзячы з кампанента *«каштоўнасна-сэнсавыя адносіны да зместу кампетэнтнасці»*, для старшага школьніка з'яўляецца значнай здольнасць ацэньваць сацыяльныя і асобасныя адносіны, аналізаваць іх; ёсць разуменне значнасці эмацыянальна-пазітыўных адносін да асноўных сацыяльных, грамадзянскіх і дзяржаўных каштоўнасцей.

Такім чынам, абітурыент, які паступіў на спецыяльнасць «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», мае пэўны ўзровень сфарміраванасці прававой кампетэнцыі, якая ў ВНУ павінна атрымаць далейшае развіццё, і ў той жа час, з пункту гледжання прафесіі, – быць прафесійна з'арыентаванай.

На наш погляд, прававая кампетэнцыя не можа лакалізавацца толькі ў адной з груп кампетэнцый, што фарміруюцца ў працэсе падрыхтоўкі будучага бібліятэкара-бібліёграфа вышэйшай кваліфікацыі. Яна паўнапраўна з'яўляецца элементам як акадэмічных і сацыяльна-асобасных кампетэнцый, так і прафесійных кампетэнцый. У кожнай з названых груп яна змястоўна трансфармуецца да мэт і задач фарміравання канкрэтнай кампетэнцыі і, адпаведна, ад групы да групы праяўляецца на розных узроўнях асэнсавання.

Акадэмічныя кампетэнцыі ўключаюць веды і ўменні па засвоеных дысцыплінах, здольнасці і ўменні вучыцца [2]. Прававы кампанент тут павінен разглядацца ў кантэксце засвоеных дысцыплін, гэта значыць для студэнта першакурсніка – гэта дысцыпліна «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» і г. д.

Разглядаючы сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі (культурна-каштоўнасныя арыентацыі, веданне ідэалагічных, маральных каштоўнасцей грамадства і дзяржавы і ўменне кіравацца імі) [2], неабходна звярнуцца да РД РБ 02100.5.227-2006 «Адукацыйны стандарт. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін». У стандарце дакладна акрэслены пералік сацыяльна-асобасных кампетэнцый, якія выпускнік вышэйшай навучальнай установы пры падрыхтоўцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па адукацыйнай праграме першай ступені павінен набыць: кампетэнцыі культурна-каштоўнаснай і асобаснай арыентацыі; кампетэнцыі грамадзянскасці і патрыятызму; кампетэнцыі сацыяльнага ўзаемадзеяння; кампетэнцыі камунікацыі; кампетэнцыі здароўезберажэння; кампетэнцыі самаўдасканалення [1].

Сярод вылучаных кампетэнцый для нас прадстаўляе цікавасць кампетэнцыя грамадзянскасці і патрыятызму, у межах фарміравання якой прадугледжваецца вывучэнне прававых дысцыплін «Асновы права», «Правы чалавека». У РД РБ 02100.5.227-2006 сфармуляваны патрабаванні да кампетэнцый выпускніка па дадзеных дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыкла [1, с. 18–19] (табл. 4.4.1).

Табліца 4.4.1. Патрабаванні да кампетэнцый выпускніка па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыкла «Асновы права» і «Правы чалавека»

| АСНОВЫ ПРАВА | |
|---|---|
| *ведаць* | *умець* |
| – сутнасць дзяржавы і права, суадносіны закона і права;<br>– змест Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;<br>– змест грамадзянскіх правоў, парадак іх абароны;<br>– паняцце юрыдычнай адказнасці, яе віды;<br>– сістэму заканадаўства і віды нарматыўных прававых актаў | – характарызаваць асноўныя функцыі і прынцыпы права;<br>– характарызаваць правапарушэнні;<br>– характарызаваць асобныя галіны заканадаўства;<br>– характарызаваць прававое палажэнне дзяржаўных органаў;<br>– аналізаваць склад правапарушэнняў, мэты і прызначэнне пакарання і вызваленне ад яго;<br>– аналізаваць асобныя нарматыўныя прававыя акты;<br>– аналізаваць юрыдычныя праблемы ў сферы працоўных, сямейных і жыллёвых адносін;<br>– выкарыстоўваць нарматыўныя прававыя акты, якія адносяцца да будучай дзейнасці |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА | |
|---|---|
| *ведаць* | *умець* |
| – асноўныя канцэпцыі правоў чалавека, усеагульны і ўніверсальны характар правоў чалавека, іх агульначалавечую каштоўнасць;<br>– узаемасувязь правоў і абавязкаў чалавека, суадносіны правоў чалавека і правоў сацыяльных супольнасцей;<br>– сістэму нацыянальнай і міжнароднай абароны правоў чалавека;<br>– ролю правоў чалавека ў фарміраванні грамадзянскага грамадства і прававой сацыяльнай дзяржавы | – находзіць найбольш эфектыўныя, адпаведныя праву і маралі шляхі і метады абароны правоў чалавека пры рашэнні сацыяльных і прафесіянальных задач;<br>– выкарыстоўваць атрыманыя веды для выхоўвання моладзі ў духу міру, узаемаразумення і павагі асноўных правоў і свабод чалавека;<br>– аналізаваць стан і тэндэнцыі рэалізацыі асноўных правоў і свабод чалавека ў сучасным свеце;<br>– разглядаць правы чалавека ў кантэксце ідэалогіі беларускай дзяржавы |

Пасля ўважлівага азнаямлення са змястоўным напаўненнем групы сацыяльна-асобасных кампетэнцый становіцца відавочным, што дадзеная група не прадугледжвае паглыбленага вывучэння прававых аспектаў дзейнасці бібліятэк, прафесійна-арыентаваных норм і асаблівасцей іх разумення і выканання. Можна дапусціць, што прафесійна-арыентаваную бібліятэказнаўчую прававую кампетэнцыю неабходна фарміраваць у рамках трэцяй групы – групы прафесійных кампетэнцый. Але тут узнікае метадалагічная цяжкасць – права не з’яўляецца прафесійнай дысцыплінай для бібліятэкара-бібліёграфа, а прававая кампетэнцыя, па сутнасці, не з’яўляецца яго прафесійнай кампетэнцыяй.

У гэтай сітуацыі, на наш погляд, мэтазгодна звярнуцца да існуючых класіфікацый прафесійна-арыентаваных кампетэнцый і іх груп, бо дзеючы Макет адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі першай ступені [4] і ОС РБ 1-23 01 11-2008 прадугледжваюць у ходзе прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста толькі адну групу кампетэнцый – прафесійных. Міжпрадметныя кампетэнцыі цяжка ўпісваюцца ў дадзеную сістэму.

У адукацыйнай практыцы не існуе адзінага падыходу да класіфікацыі кампетэнцый выпускніка ВНУ. Як правіла, у прафесійнай сферы адрозніваюць некалькі відаў кампетэнцый: прад-



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

метна-спецыялізаваныя (прафесійныя: інварыянтныя і варыятыўныя) ці спецыяльныя (прадметныя), якія вызначаюць валоданне непасрэдна прафесіянальнай дзейнасцю; агульнапрафесійныя (агульнапрадметныя), звязаныя з некалькімі прадметнымі галінамі ці відамі прафесійнай дзейнасці, якімі павінен авалодаць выпускнік у рамках сваёй прафесіі; ключавыя (базавыя, універсальныя, агульныя, надпрафесійныя, сацыяльна-асобасныя), якія садзейнічаюць эфектыўнаму рашэнню разнастайных задач шматлікіх галін і выкананню сацыяльна-прафесійных роляў і функцый на аснове адзінства абагульненых ведаў і ўменняў, універсальных здольнасцей [5, с. 23, 36, 43; 7, с. 89].

У навуковых публікацыях апошняга часу выдзяляецца яшчэ адзін від кампетэнтнасці – экстрэмальная прафесійная кампетэнтнасць, якую спецыяліст праяўляе ў раптоўна ўскладненых абставінах [7, с. 89–90].

Асноўны акцэнт у работах беларускіх (А. В. Макараў, В. Т. Федзін і інш.), расійскіх (В. І. Байдэнка, І. А. Зімняя, Ю. Г. Татур, В. Д. Шадрыкаў і інш.) і замежных спецыялістаў робіцца на ключавыя (агульныя) кампетэнцыі. Яшчэ ў 1996 г. на сімпозіуме ў Берне па праграме Савета Еўропы [14; 15] адзначалася, што для рэформ адукацыі істотным з’яўляецца вызначэнне ключавых кампетэнцый (key competencies).

Падыходы да выяўлення прафесійных (інварыянтных і варыятыўных) кампетэнцый адрозніваюцца. Адзінства ў вызначэнні месца прафесійных кампетэнцый у агульнай сістэме кампетэнцый няма. Прафесійныя кампетэнцыі дастаткова часта адносяцца да ключавых разам з сацыяльнымі, камунікатыўнымі, інфармацыйнымі і адукацыйнымі. І. А. Зімняя разглядае кампетэнцыі, якія адносяцца да дзейнасці чалавека, у складзе ключавых сацыяльных кампетэнцый [8; 10]. Адпаведна яна выдзяляе сацыяльна-прафесійную кампетэнтнасць выпускніка і прыводзіць чатыры блокі мадэлі сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці: *базавы*, які вызначае інтэлектуальныя здольнасці выпускніка (аналіз, супастаўленне і інш.); *асобасны*, які вызначае асобасныя якасці, такія як самастойнасць, арганізаванасць і г. д.; *сацыяльны*, які вызначае жыццядзейнасць выпускніка і яго ўзаемадзеянне з навакольнымі людзьмі; *прафесійны*, які вызначае здольнасць вырашаць прафесійныя задачы [10, с. 285].

У сваю чаргу, у мадэлі спецыяліста (бакалаўра і магістра), распрацаванай у Расійскай Федэрацыі ў кантэксце рэалізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Канцэпцыі і Праграмы развіцця вышэйшай педагагічнай адукацыі на 2005–2010 гг., кампетэнцыі, якія тычацца прафесійнай дзейнасці, размеркаваны па дзвюх групах і вылучаюцца разам з сацыяльна-асобаснымі. У прапанавай мадэлі ўвогуле ўтрымліваюцца тры групы кампетэнцый, імі характарызуецца выпускнік, які засвоіў адукацыйную праграму бакалаўра (магістра)-спецыяліста: сацыяльна-асобасныя; агульнапрафесійныя (напрыклад, інфармацыйныя, кіраўнічыя, арганізацыйныя, эканамічныя і г. д.); спецыяльныя. Фундаментам у дадзенай мадэлі з’яўляюцца сацыяльна-асобасныя і агульнапрафесійныя кампетэнцыі, якія дазваляюць выпускніку гнутка арыентавацца на рынку працы [12, с. 94–95].

Як ужо адзначалася вышэй, адпаведна ОС РБ 1-23 01 11-2008 падрыхтоўка будучага бібліятэкара-бібліёграфа вышэйшай кваліфікацыі забяспечваецца пры дапамозе фарміравання акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый [2, с. 4]. Аднак, на наш погляд, лакалізацыя прафесійна-арыентаваных кампетэнцый толькі ў адной групе – «прафесійныя кампетэнцыі» выключае міжпрадметныя сувязі і ўпускае комплекс кампетэнцый, якія фарміруюцца на стыку розных галін ведаў (напрыклад, права і бібліятэказнаўства, эканоміка і бібліятэказнаўства і г. д.). Зыходзячы з гэтага, бачыцца мэтазгодным выдзяленне дзвюх груп кампетэнцый, арыентаваных на прафесію:

– міжпрадметных прафесійна-арыентаваных кампетэнцый, якія паўстаюць на стыку некалькіх галін ведаў і практычнай дзейнасці і з’яўляюцца значнымі для шырокага кола прафесій (як правіла, абавязковым элементам такіх кампетэнцый будзе права і/ці эканоміка, якія выступаюць часткай семантычных палёў кожнай прафесіі). У залежнасці ад сферы дзейнасці (прафесіі) міжпрадметныя кампетэнцыі прафесійна арыентуюцца, прывязваюцца да пэўнага віду прафесійнай дзейнасці. У нашым выпадку – гэта бібліятэказнаўча-прававая кампетэнцыя, гэта значыць прававая кампетэнцыя, але прафесійна з’арыентаваная на спецыяльнасць «бібліятэказнаўства і бібліяграфія»;

– спецыяльных, ці прафесійна-функцыянальных, кампетэнцый, якія прадугледжваюць вузкапрафесійную арыентацыю з канкрэтнай прывязкай да прафесійнай дзейнасці і яе спецыфікі. Можна меркаваць, што для бібліятэчнай справы гэта будуць, у прыватнасці, бібліятэказнаўчая кампетэнцыя, бібліяграфазнаўчая кампетэнцыя і г. д.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адпаведна сістэма кампетэнцый, фарміруемых пры падрыхтоўцы будучага бібліятэкара-бібліёграфа вышэйшай кваліфікацыі, магла б быць прадстаўлена наступным чынам: акадэмічныя кампетэнцыі; сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі (культурна-каштоўнаснай і асобаснай арыентацыі, грамадзянскасці і патрыятызму, сацыяльнага ўзаемадзеяння, камунікацыі, здароўезберажэння, самаўдасканалення); міжпрадметныя прафесійна-арыентаваныя кампетэнцыі (бібліятэказнаўча-прававая і інш.); прафесійна-функцыянальныя кампетэнцыі (бібліятэказнаўчая, бібліяграфазнаўчая і інш.)

Найбольш выяўленая неабходнасць фарміравання прававога кампанента ў працэсе падрыхтоўкі будучага бібліятэкара-бібліёграфа ўзнікае пры фарміраванні сацыяльна-асобасных кампетэнцый, а іменна – кампетэнцыі грамадзянскасці і патрыятызму, а таксама прафесіянальна-арыентаванай міжпрадметнай бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі. Як ужо адзначалася вышэй, прававы кампанент акадэмічных кампетэнцый трэба разглядаць у кантэксце засвоеных дысцыплін. Што датычыцца прававога кампанента прафесійна-функцыянальных кампетэнцый – то ён будзе прысутнічаць на ўзроўні дэталізацыі ў дачыненні да пэўных прыватных асаблівасцей тых ці іншых адносін, рэгулюемых канкрэтнымі нормамі права.

Пасля вызначэння месца лакалізацыі бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі ў сістэме кампетэнцый, фарміруемых у будучага бібліятэкара-бібліёграфа, нам неабходна выявіць сутнасць дадзенай кампетэнцыі, яе структурны і змястоўны склад.

Бібліятэказнаўча-прававая кампетэнцыя – як прафесійна-арыентаваная на спецыяльнасць «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» – заснавана на прадметных, дзейнасных і каштоўнасна-сэнсавых ведах, уменнях і вопыце, неабходных для вырашэння тэарэтычных і практычных задач, якія датычацца прававога поля функцыянавання бібліятэкі, рэалізацыі правоў і абавязкаў суб’ектаў праваадносін у сферы дзейнасці бібліятэк. Яе характэрная асаблівасць – патрэбнасць у пастаяннай актуалізацыі.

Звяртаючыся да структуры кампетэнцый, перш за ўсё трэба адзначыць, што ў навуковай літаратуры, як правіла, разглядаюцца структурныя кампаненты «кампетэнтнасці». Адным з найбольш аўтарытэтных меркаванняў з’яўляецца погляд на дадзеную праблему І. А. Зімняй, якая вылучыла ў структуры сацыяльнай кампетэнтнасці наступныя блокі: матывіровачны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(гатоўнасць да праяўлення кампетэнтнасці); кагнітыўны (валоданне ведамі прадметнага зместу кампетэнтнасці); працэсуальна-дзейнасны (вопыт праяўлення кампетэнтнасці ў розных сітуацыях); каштоўнасна-сэнсавы (адносіны да зместу кампетэнтнасці і аб'екта яе дачынення), выступае і як матывіровачны блок; эмацыйна-валявы (рэгуляцыя і самарэгуляцыя працэсу і выніку праяўлення кампетэнтнасці: самастойнасць, адказнасць, арганізаванасць, мэтанакіраванасць) [13, с. 9].

Прапанаваны І. А. Зімняй кампанентны склад сацыяльнай кампетэнтнасці выкарыстоўваецца шматлікімі спецыялістамі як інварыянтны пры апісанні структурных блокаў іншых відаў кампетэнтнасці.

У структурным складзе «кампетэнцый» вылучаемыя элементы некалькі адрозніваюцца ад элементаў «кампетэнтнасці». Так, у еўрапейскім праекце TUNING вылучаюцца тры кампаненты «кампетэнцыі»: «…*веды і разуменне* (тэарэтычныя веды акадэмічнай галіны, здольнасць ведаць і разумець), *веданне як дзеянне* (практычнае і аператыўнае прымяненне ведаў да канкрэтных сітуацый), *веданне, як быць* (каштоўнасці як неад'емная частка спосабу ўспрымання і жыцця з іншымі ў сацыяльным кантэксце). Кампетэнцыі ў дадзенай трактоўцы ўяўляюць сабой спалучэнне характарыстык (што адносяцца да ведаў і іх прымянення, да пазіцый, навыкаў і адказнасці) і апісваюць узровень ці ступень, да якой некаторая асаба здольна гэтыя кампетэнцыі рэалізаваць» [5, с. 10].

В. І. Байдэнка, звяртаючыся да складу «кампетэнцый», таксама аперыруе трыма складнікамі «кампетэнцыі»: *кагнітыўнай* (веды і разуменне), *дзейнаснай* (практычнае і аператыўнае прымяненне ведаў) і *каштоўнаснай* (каштоўнасці як арганічная частка спосабу ўспрымання жыцця з іншымі ў сацыяльным кантэксце) [5, с. 40]. Дадзены кампанентны склад кампетэнцый, на наш погляд, мэтазгодна скарыстаць і да апісання структурных кампанентаў прафесійна-арыентаванай бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі.

Звяртаючыся да змястоўнага складу прафесійна-арыентаванай бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі, неабходна вызначыць, для якіх відаў дзейнасці яна карысна. Адным з агульных патрабаванняў ОС РБ 1-23 01 11 2008 да ўзроўню падрыхтоўкі спецыяліста з'яўляецца патрабаванне ведаць прававыя нормы, умець улічваць іх у сваёй жыццядзейнасці (п. 6.1.2). Дадзенае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палажэнне развіваецца ў патрабаваннях да прафесійных кампетэнцый (п. 6.4): выпускнік павінен выкарыстоўваць і пры неабходнасці распрацоўваць сумесна з іншымі падраздзяленнямі бібліятэкі арганізацыйна-распараджальныя, нарматыўныя і тэхналагічныя дакументы дзейнасці бібліятэкі (навукова-метадычная дзейнасць); выпускнік павінен умець працаваць з юрыдычнай літаратурай, валодаць заканадаўчай, нарматыўна-прававой і адміністратыўнай сістэмай кіравання бібліятэчнай справай краіны (арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць) [2].

Акрамя арганізацыйна-кіраўніцкай і навукова-метадычнай дзейнасці, прафесіянальна-арыентаваныя прававыя веды, уменні і вопыт неабходны бібліятэкару-бібліёграфу і ў працэсе яго камунікатыўнай дзейнасці: у сістэме адносін бібліятэкар-бібліёграф (далей – спецыяліст) – карыстальнік бібліятэкі; спецыяліст – спецыяліст; спецыяліст – знешнія партнёры па дзейнасці. У працэсе функцыянавання бібліятэк узнікае шэраг адносін, якія рэгулююцца прававымі нормамі і прадугледжваюць рэалізацыю пэўных правоў і абавязкаў усіх бакоў ва ўзаемадзеянні. Гэта, безумоўна, сведчыць аб тым, што будучы бібліятэкар-бібліёграф павінен ведаць свае правы і абавязкі, правы і абавязкі карыстальнікаў бібліятэк, аўтарскія правы і парадак іх выканання і інш.

Фарміраванне бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі ў студэнта, які навучаецца на бібліятэкара-бібліёграфа, неабходна ажыццяўляць у межах агульных мэт падрыхтоўкі дадзенага спецыяліста, фарміравання і развіцця яго сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці для вырашэння задач у сферы прафесійнай дзейнасці.

Асноўнымі задачамі прафесійна-арыентаванай прававой падрыхтоўкі будучага бібліятэкара-бібліёграфа павінны быць:

– фарміраванне на аснове міждысцыплінарнага падыходу сістэмных ведаў аб бібліятэцы як суб’екце прававога рэгулявання; правах і абавязках суб’ектаў праваадносін у сферы дзейнасці бібліятэк (дзяржавы, бібліятэк, карыстальнікаў, работнікаў бібліятэк і г. д.); базавых праваадносінах, якія ўзнікаюць у працэсе дзейнасці бібліятэк; прынцыпах, якія ляжаць у аснове прававога рэгулявання дзейнасці бібліятэк; структуры бібліятэч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага заканадаўства; сістэме інстытутаў улады і грамадска-прафесійных інстытутаў, адказных за распрацоўку, прыняцце і рэалізацыю нарматыўных прававых актаў у сферы дзейнасці бібліятэк; фактарах, якія ўплываюць на фарміраванне прававой базы дзейнасці бібліятэк і, увогуле, на іх прававое забеспячэнне; сусветных тэндэнцыях у галіне бібліятэчнага заканадаўства і асаблівасцях прававога рэгулявання дзейнасці бібліятэк за мяжой; працэсах уніфікацыі замежнага бібліятэчнага заканадаўства; праблемах у галіне прававога забеспячэння дзейнасці бібліятэк у Рэспубліцы Беларусь; аб'ектах і суб'ектах аўтарскага права, пытаннях здзяйснення аўтарскіх праў у працэсах фарміравання бібліятэчных фондаў і бібліятэчнага абслугоўвання; комплексе лакальных нарматыўна-прававых дакументаў, якія забяспечваюць арганізацыйную дзейнасць бібліятэчнай установы;

– фарміраванне ўмення прымяняць прававыя веды, прававыя нормы для вырашэння прафесійных задач, у тым ліку ўмення аказваць кансультатыўна-прававую дапамогу ў працэсе абслугоўвання ў цэнтрах прававой інфармацыі, якія функцыянуюць пры бібліятэках;

– фарміраванне разумення важнасці дамінанты прававога характару паводзін у сацыяльных і прафесійных стасунках;

– развіццё здольнасці да пастаяннай самаадукацыі, у тым ліку ў дачыненні да прававых ведаў, і эфектыўнай самарэалізацыі ў прафесіі.

Змястоўна-дзейнасныя патрабаванні да бібліятэказнаўча-прававой кампетенцыі выпускніка неабходна адлюстроўваць праз такія кампаненты кампетэнцыі, як «веды» і «ўменні» (табл. 4.4.2).

Табліца 4.4.2. Агульныя патрабаванні да бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі выпускніка па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства-бібліяграфія»

| *Ведаць* | *Умець* |
|---|---|
| – тэарэтычныя асновы прававога забеспячэння дзейнасці бібліятэк;<br>– заканадаўчую і адміністратыўную сістэму кіравання бібліятэчнай справай краіны; | – працаваць з юрыдычнай літаратурай, прававымі базамі даных;<br>– выкарыстоўваць і распрацоўваць арганізацыйна-распарадчыя і нарматыўныя дакументы; |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| – прынцыпы, якія ляжаць у аснове прававога рэгулявання дзейнасці бібліятэк;<br>– правы і абавязкі суб'ектаў прававога рэгулявання ў сферы дзейнасці бібліятэк;<br>– прававы статус бібліятэкара-бібліёграфа і прававы статус яго партнёраў па зносінах;<br>– сістэму праваадносін, якія ўзнікаюць у працэсе функцыянавання бібліятэк;<br>– профільныя нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць дзейнасць бібліятэк, а таксама акты сумежнага заканадаўства;<br>– комплекс лакальных нарматыўна-прававых актаў, якія забяспечваюць арганізацыйную дзейнасць бібліятэкі;<br>– асаблівасці прававога рэгулявання адносін, якія ўзнікаюць з прычыны стварэння, ліквідацыі, развіцця бібліятэк і бібліятэчных сетак;<br>– асаблівасці прававога рэгулявання адносін, якія ўзнікаюць у сувязі з фарміраваннем фондаў бібліятэк;<br>– асаблівасці прававога рэгулявання адносін, якія ўзнікаюць наконт бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў;<br>– асаблівасці прававога рэгулявання адносін, якія ўзнікаюць з прычыны ўзаемадзеяння работадаўца з персаналам (кадрамі);<br>– асаблівасці прававога рэгулявання адносін, якія ўзнікаюць у сувязі з фарміраваннем і выкарыстаннем матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк | – ствараць лакальны пакет прававых дакументаў, рэгулюючых дзейнасць бібліятэчна-інфармацыйных устаноў;<br>– рэалізоўваць і абараняць правы і інтарэсы бібліятэкі, а таксама паважаць і абараняць правы і інтарэсы карыстальнікаў бібліятэк і іншых суб'ектаў грамадскіх адносін, што ўзнікаюць у працэсе функцыянавання бібліятэкі;<br>– аказваць кансультатыўна-прававую дапамогу ў працэсе абслугоўвання ў цэнтрах прававой інфармацыі, якія функцыянуюць пры бібліятэках;<br>– інтэграваць тэарэтычныя прававыя веды, звязаныя з дзейнасцю бібліятэк, з практычнай дзейнасцю |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фарміраванне і развіццё прафесійна-арыентаванай бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі выпускніка ВНУ не могуць быць рэалізаваны выключна праз выкладанне адпаведных адукацыйных дысцыплін. Значным складнікам гэтага працэсу

з'яўляецца выкарыстанне разнастайных арганізацыйных форм вучэбнага працэсу, тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і кіравання ведамі, набыцця вопыту самастойнага рашэння задач (напрыклад, тэхналогій праблемна-модульнага навучання, камунікатыўных тэхналогій, кейс-тэхналогіі і г. д.), а таксама методык і тэхналогій дыягностыкі сфарміраванасці кампетэнцыі.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. *РД РБ 02100.5.227-2006.* Образовательный стандарт. Высшее образование. Первая ступень. Цикл социально-гуманитарных дисциплин. – Взамен РД РБ 02100.5.277-99; введ. 01.09.2006. – URL: http://www.sporteducation.by.

2. *ОС РБ 1-23 01 11-2008.* Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць Е 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках). Кваліфікацыя – Бібліятэкар-бібліёграф. – Узамен РД РБ 02100.5.211-98; уведз. 12.06.2008. – URL: http://edubelarus.info.

3. *Об утверждении* квалификационного справочника «Должности служащих, занятых в культуре и искусстве» : постановление Министерства труда и социальной защиты Респ. Беларусь от 29.12.2001 г. № 25. – URL: http://www.bankzakonov.com.

4. *Макет* образовательного стандарта высшего образования первой ступени: утв. Министерством образования Респ. Беларусь 13.06.2006 г., № 374]. – URL: http://www.nihe.by/info/standart.php.

5. *Байденко, В. И.* Выявление состава компетенций выпускников вузов как необходимый этап проектирования ГОС ВПО нового поколения: метод. пособие / В. И. Байденко. – М. : Исслед. центр проблем качества подготовки специалистов, 2006. – 72 с.

6. *Дроздова, Н. В.* Компетентностный подход как новая парадигма студентоцентрированного образования / Н. В. Дроздова, А. П. Лобанов. – Минск : РИВШ, 2007. – 100 с.

7. *Жук, О. Л.* Педагогическая подготовка студентов: компетентностный подход / О. Л. Жук. – Минск : РИВШ, 2009. – 336 с.

8. *Зимняя, И. А.* Ключевые компетенции – новая парадигма результата образования / И. А. Зимняя // Высшее образование сегодня. – 2003. – № 5. – С. 34–42.

9. *Зимняя, И. А.* Компетентностный подход. Каково его место в системе современных подходов к проблеме образования? (Теоретико-методологический аспект) / И. А. Зимняя // Высшее образование сегодня. – 2006. – № 8. – С. 20–26.

10. *Зимняя, И. А.* Социально-профессиональная компетентность как целостный результат профессионального образования / И. А. Зимняя // Высшая школа: проблемы и перспективы : материалы 7-й Междунар. науч.-метод. конф., Минск, 1–2 ноября 2005 г. – Минск, 2005. – С. 283–286.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. *Калицкий, Э. М.* Современная концепция профессионализма / Э. М. Калицкий, Н. Г. Гончарик //Адукацыя і выхаванне. – 2002. – № 10. – С. 19–26.

12. *Педагогическое* образование в Республике Беларусь: аналитические материалы : практ пособие / П. Д. Кухарчик [и др.]; под общ. ред. И. И. Цыркуна. – Минск : БГПУ, 2007. – 235 с.

13. *Становление* ключевых социальных компетентностей на разных уровнях образовательной системы (дескрипторная характеристика как база оценивания) : материалы XI симп. «Квалиметрия в образовании: методология, методика, практика», Москва, 16–17 марта 2006 г. / под науч. ред. И. А. Зимней. – М., 2006. – 82 с.

14. *Hutmacher, W.* Key competencies for Europe / Walo Hutmacher // European Journal of Education. Vol. 32. – 1997. – N 1. – P. 45. – URL: http://www.jstor.org/pss.

15. *Hutmacher, W.* Key competencies for Europe / Walo Hutmacher // Report of the Symposium Berne, Switzerland 27–30 March, 1996. Council for Cultural Co-operation (CDCC) a Secondary Education for Europe. – Strasburg, 1997. – URL: http://www.eric. ed.gov/ERICWebPortal.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Сярод разнастайных канцэпцый інфармацыйнага грамадства: тэхналагічнай, эканамічнай, прафесійнай, культурнай і інш. – найбольш плённымі для нашага даследавання сталі культурная і прафесійная, у межах якіх і разглядаюцца сацыяльна-педагагічная дзейнасць бібліятэкі, трансфармацыя сацыяльных роляў бібліятэкараў і сістэмы падрыхтоўкі прафесійных кадраў. Развіццё бібліятэкі ажыццяўляецца пад уздзеяннем двух фактараў: наяўнай сацыяльнай палітыкі грамадства і патэнцыялу інфармацыйных тэхналогій, што і пабуджае да пошуку новых форм відаў абслугоўвання.

Як вядома, бібліятэка традыцыйна зацікаўлена і ўважліва ставіцца да патрэб і запатрабаванняў людзей з абмежаванымі магчымасцямі і ўлічвае гендарную накіраванасць, прадастаўляючы ўсім, без выключэння, карыстальнікам запатрабаваныя імі інфармацыю і паслугі. Унікальнае спалучэнне інфармацыйных рэсурсаў і разнастайных паслуг бібліятэкі садзейнічае развіццю сацыяльнай інтэграцыі. Усё гэта патрабуе глыбокага тэарэтычнага асэнсавання і навуковага абгрунтавання сацыяльна-педагагічных аспектаў бібліятэчнага абслугоўвання.

Захаванне і памнажэнне базавых гуманістычных каштоўнасцей бібліятэчнай прафесіі пабуджае таксама і да пошуку шляхоў удасканалення сістэмы падрыхтоўкі кадраў з улікам глабалізацыі, інфарматызацыі і сацыяльнай інтэграцыі.

Сацыяльна-педагагічная дзейнасць бібліятэкі непарыўна звязана з яе гуманістычнай місіяй. Фарміраванне каштоўнасных арыентацый карыстальнікаў сродкамі інфармацыйных і інтэлектуальных рэсурсаў, якія маюцца ў распараджэнні бібліятэкі, з’яўляецца адной з асноўных задач бібліятэчнага абслугоўвання. Гэтай дзейнасцю, у той ці іншай меры, займаюцца ўсе публічныя бібліятэкі.

Сацыяльна-педагагічная дзейнасць ляжыць у аснове фарміравання новых прафесійных патрабаванняў, якім павінен адпавядаць сучасны бібліятэкар, што прадугледжвае наяўнасць пэўным чынам падрыхтаваных кадраў. Прычым асобая ўвага павінна надавацца фарміраванню камунікатыўнай кампетэнтнас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ці будучых работнікаў інфармацыйна-дакументнай сферы і стварэнню сістэмы павышэння псіхолага-педагагічнай культуры тых, хто ўжо працуе.

Разуменне ролі сацыяльнага педагога як спецыяліста, які прызваны вырашаць штодзённыя сацыяльныя праблемы людзей, няздольных, па той ці іншай прычыне, справіцца з імі самастойна, пабуджае весці навуковыя даследаванні па праблемах узаемадзеяння бібліятэкара і карыстальніка з абмежаванымі псіхафізіялагічнымі і сацыяльнымі магчымасцямі, абапіраючыся на дасягненні педагогікі і псіхалогіі, з улікам бібліятэчнай спецыфікі.

У выніку прадзеланай работы тэорыя і практыка бібліятэчнай справы папоўніліся новымі ведамі аб сучасных падыходах да педагагічнай дзейнасці бібліятэк, аб новых кірунках прафесіяналізацыі і прафесійнай адаптацыі бібліятэчных кадраў, што знайшло адлюстраванне ў публікацыях выканаўцаў навукова-даследчай тэмы, падрыхтоўцы курсаў лекцый і вучэбных дапаможнікаў, выкарыстанні інавацыйных прыёмаў выкладання вучэбных дысцыплін на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКМ, у сістэме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Навуковае выданне*

# САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ І ІХ КАДРАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

Рэдактар В. В. Каташвілі
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2012. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 13,69. Ул.-выд. арк. 12,94. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ